[32] Гл.: Снапкоўскі Уладзімір Еўдакімавіч: Да 60-годдзя з дня нараджэння і 35-годдзя навукова-педагагічнай дзейнасці. Біябібліяграфічны паказальнік / склад. У. Е. Снапкоўскі ; пад рэд. А. А. Чалядзінскага. Мінск, 2015. С. 28. У заключэнні рэдактара рукапіс быў ацэнены як бедны па змесце, без аўтарскіх разважанняў, з трафарэтнымі і агульнавядомымі высновамі. Аўтару была прапанавана «карэнная перапрацоўка ў стылі публіцыстычнага твора, узбагачэнне яе цікавымі фактамі, глыбокім аналізам з'яў». Заключэнне рэдакцыі разыходзілася з рэкамендацыяй рукапісу да друку Вучоным саветам Інстытута гісторыі АН БССР, дзе рэцэнзентамі выступалі акадэмік І. М. Ігнаценка і доктар гістарычных навук С. Д. Вайтовіч. – Архіў аўтара.

[33] Першы вопыт падобнай перыядызацыі ажыццявіў Ю. П. Броўка. Гл. *Бровка Ю. П.* Белорусская ССР – суверенный участник ... С. 34–80.

Предметом исследования должен стать анализ взглядов авторов из западных стран по вопросам международной деятельности БССР. Специальных работ на эту тему на Западе нет, есть лишь разделы в книгах по истории БССР. В одной из таких книг под названием «Белоруссия под советским управлением» И. Любачко, выходец из Беларуси, писал, что несмотря на вступление БССР в ООН и провозглашение белорусского суверенитета в Конституции СССР, этот суверенитет «оказался полностью иллюзорным». В качестве доказательства данного утверждения И. Любачко отмечал, что «белорусские делегаты [в ООН] всегда следовали за русскими»[34]. Аналогичные тезисы повторяются и в других работах западных исследователей. Действительно, за всю историю участия БССР в работе ООН мы не встретим случая, когда белорусская делегация голосовала бы не так, как делегация СССР. Однако это не может служить главным основанием для тезиса об «иллюзорности суверенитета БССР». Другое дело, что ни в конституционных изменениях 1944 г., ни в Конституции БССР 1978 г. не раскрыто понятие суверенитета Белорусской ССР, что позволяло западным дипломатам и авторам спекулировать на этом вопросе. Четкое определение понятия суверенитета республики было сделано 27 июля 1990 г. принятием Верховным Советом БССР Декларации о государственном суверенитете БССР, а затем принятием Конституции Республики Беларусь 15 марта 1994 г.

**Перестройка внешнеполитических связей союзных республик**. Многие трудности исследования деятельности БССР на международной арене имели объективный, не зависящий от ученых характер, что объясняется непростыми политико-правовыми проблемами развития и управления международными связями союзных республик. По признанию ряда министров иностранных дел союзных республик, выступивших в 1988–1989 гг. на страницах журнала «Международная жизнь», МИД СССР, Верховные Советы и Советы Министров союзных республик уделяли недостаточное внимание деятельности республиканских МИД, удовлетворению их запросов и нужд[35]. Министр иностранных дел РСФСР В. М. Виноградов сказал, что такое положение «было глубоко ошибочным и даже вредным, оно наносило ущерб нашей внешнеполитической деятельности...», «наши центральные общественные органы не использовали весьма большие возможности союзных республик в подкреплении общесоюзной внешнеполитической линии весьма конкретными делами – внешними связями республики»[36]. Еще категоричнее выска-

---

[34] *Lubachko I.* Belorussia under Soviet rule, 1917–1957. Kentucky, 1972. P. 185.

[35] *Шмагин Е.*, *Братчиков И.* Пазнач. твор. С. 53–55.

[36] *Виноградов В.* Дипломатия России // Междунар. жизнь. 1989. № 1. С. 62 ; пра дзейнасць МЗС саюзных рэспублік гл.: Там жа, с. 66–68.

зался министр иностранных дел Литовской ССР В. К. Микучяускас, отметивший, что за более чем 40-летний период существования республиканских МИД они «в основном влачили формальное существование»[37].

Министр иностранных дел Казахской ССР М. Исиналиев, подчеркнув сложность и неоднозначность вопросов расширения участия республик в международных делах в области политики, экономики, культуры, гуманитарных контактов, пришел к заключению, что «в стране никто всерьез, планомерно не изучал эти вопросы. Отстала, на мой взгляд, и наша наука, особенно международники-правовики, которые могли бы разработать юридические аспекты участия союзных республик в международных отношениях в качестве субъектов международного права, коль скоро Конституцией ССР им дано право на такое участие»[38].

Значительные трудности испытывали историки в доступе к архивным материалам, относящимся к международной деятельности БССР, немалая часть которых находится в ведомственных архивах. Не было публичного доступа и ко всем материалам ООН, поскольку Государственная библиотека БССР им. В. И. Ленина, являющаяся депозитарием ооновских документов, имеет их, начиная только с 1970-х гг. Подборкой важных документов располагал МИД БССР, однако доступ к ним был затруднен даже исследователям. С серьезными, порой неразрешимыми проблемами сталкивались авторы в издательствах при подготовке к печати своих трудов. В застойные времена из работ историков по международной проблематике исключались любые критические замечания или высказывания, не говоря уже о более взвешенных и объективных подходах, касающихся социалистических международных отношений и внешней политики СССР, международных связей БССР; изымались фамилии бывших государственных и партийных деятелей социалистических стран. Так, помимо воли ученых обесценивался научный уровень и обеднялось содержание их публикаций. Да и в 1989 г. процесс подготовки рукописи к изданию по данной тематике оставался многотрудным.

В ходе перестройки внешнеполитических связей союзных республик МИД СССР принималмеры по более активному их подключению к реализации внешнеполитического курса СССР. Предусматривалось расширение консульского представительства союзных республик, что должно было

---

[37] *Микучяускас В.* Выступление на конференции консульских работников МИД СССР 28 декабря 1988 г. // Междунар. жизнь. 1989. № 2. С. 24. У 1987 г. яго папярэднік міністр замежных спраў ЛССР В. Зянкявічус адзначаў: «В недавнем прошлом МИД СССР перегружал себя разными функциями, которые по существу входили в компетенцию МИД союзных республик». – *Зенкявичус В., Григутис Ю.* Деловые контакты // Аргументы и факты. 1987. № 49. С. 2.

[38] *Исиналиев М.* Дипломатия Казахстана // Междунар. жизнь. 1989. № 3. С. 60.

способствовать активизации работы с соотечественниками за рубежом[39]. Перестраивались внешнеэкономические связи БССР, более содержательными и конкретными становились партнерские контакты с побратимами из социалистических стран, проводился конструктивный диалог с представителями общественно-политических, деловых и культурных кругов различной политической и идеологической ориентации и капиталистических и развивающихся стран, активизировалась «народная дипломатия».

Реформа в области национально-государственного строительства Союза ССР, направленная на расширение полномочий союзных республик в политической, социально-экономической и культурной жизни, открывала широкие возможности для реализации внешнеполитической деятельности БССР[40]. Это стимулировало возросший интерес общественности и широких кругов населения к истории международных связей БССР, содействовало проведению исследований по «белым пятнам» этой истории, отказу от изживших себя догм и представлений, внедрению в методологию и методику исследований новых подходов, а в итоге созданию целостной картины прошлого и настоящего внешнеполитической деятельности БССР как активного участника международных отношений.

**О достижениях в исследовании внешнеполитической деятельности Беларуси в 1990-х – начале 2000-х гг.** В указанный период белорусские исследователи опубликовали ряд содержательных историографических статей о внешнеполитической деятельности и международных связях БССР, в которых с новаторских позиций отразили как достижения, так и проблемы и трудности разработки этого нового направления в изучении новейшей истории Беларуси. Среди авторов следует выделить А. В. Гурина, В. А. Острогу, С. Ф. Свилас, В. Е. Улаховича[41].

---

[39] Внешнеполитическая и дипломатическая деятельность СССР (апрель 1985 – октябрь 1989 гг.). Обзор МИД СССР // Междунар. жизнь. 1989. № 12. С. 33.

[40] Резолюция «О некоторых неотложных мерах по практическому осуществлению реформы политической системы страны» // Материалы XIX Всесоюзной конференции Коммунистической партии Советского Союза. 28 июня – 1 июля 1988 года. М., 1988. С. 139.

[41] *Гурын А. В.* Гістарыяграфія знешнепалітычнай гісторыі Беларусі ў 1980–2003 гг. // Гуманітар.-экан. весн. 2004. № 1. С. 70–84 ; *Яго ж.* Даследаванне гісторыі міжнародных адносін у Беларусі ў 1980–2003 гг. : аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук. Мінск, 2005 ; *Свилас С. Ф.* Историография и источники по истории внешнеполитической деятельности Белорусской ССР в 1954–1990 гг. // Белорус. журн. междунар. права и междунар. отношений. 2003. № 4. С. 40–44 ; *Улахович В.* Исследования в области внешнеполитической деятельности Беларуси во второй половине XX века // Весн. М-ва замеж. спраў Рэсп. Беларусь. 2003. № 4. С. 152–155.

Наиболее полно и всесторонне партийно-государственную политику в области изучения международных отношений истории Нового и Новейшего времени, институциональные, кадровые и проблемно-тематические изменения в исследовании внешнеполитической деятельности БССР в 1919–1991 гг. проанализировал в своей глубокой монографии В. А. Острога. Им на основе предыдущих работ белорусских историков, в том числе автора этих строк[42], сделан вывод о том, что в 1960-е гг. начало формироваться новое научное направление – история международной деятельности и двусторонних связей БССР с зарубежными странами, в первую очередь социалистическими. В его рамках ученые стали изучать общие вопросы международных отношений и внешней политики СССР, внешнеполитической и внешнеэкономической деятельности БССР, участия республики в работе ООН и ее специализированных учреждений[43].

Более чем 30-летний период, прошедший после публикации нашей статьи, показывает, что многие сформулированные в ней цели и задачи успешно решены или находятся в стадии воплощения. Вышли в свет серьезные монографические исследования, циклы статей, материалы конференций по ряду ключевых проблем внешнеполитической и дипломатической активности белорусских национальных государств (БНР и БССР). О становлении белорусской советской государственности, внешних факторах образования БССР, ее выходе на международную арену написали работы Л. А. Ковалева, В. А. Круталевич, А. В. Тихомиров, В. Е. Снапковский и другие авторы[44]. Отношениям БССР

---

[42] *Михнюк В. Н.*, *Петриков П. Т.* Историческая наука Белорусской ССР. 80-е годы. Минск, 1987. С. 101 ; *Снапкоўскі У. Е.* Аб навуковых даследаваннях аддзела ...

[43] *Острога В. А.* Развитие научных и образовательных центров по новой и новейшей истории в Белорусской ССР. 1919–1991 гг. Минск, 2016. С. 256–261.

[44] *Ковалева Л. А.* Внешнеполитическая деятельность Советской Белоруссии в 1919–1929 гг. : автореф. дис. ... канд. ист. наук. Минск, 1993 ; *Круталевич В. А.* История Беларуси: становление национальной державности (1917–1922 гг.). 2-е изд., доп. Минск, 2003 ; *Снапкоўскі У. Е.* Знешнепалітычная дзейнасць Беларускай ССР (1919–1929 гг.) // Беларус. гіст. часоп. 2001. № 3. С. 28–41 ; *Ціхаміраў А. В.* Беларусь у сістэме міжнародных адносін перыяду пасляваеннага ўладкавання Еўропы і польска-савецкай вайны (1918–1921 гг.). Мінск, 2003.

с европейскими государствами (Великобританией, Германией, Латвией, Литвой и внешнеэкономической деятельности республики) в 1920–30-е гг. посвятили исследования С. В. Боголейша, Э. Екабсон, М. Г. Королев, В. А. Космач, Д. А. Мигун, А. И. Осипович, Д. В. Романовский[45]. Место и роль Беларуси в восточноевропейской политике изучили О. М. Боровская, Г. Г. Лазько, Н. Н. Мезга, А. В. Тихомиров и другие авторы коллективных работ[46]. Белорусские исследователи значительно продвинулись в разработке вопросов, связанных с новым выходом БССР на международную арену в 1944–1945 гг. и ее участием во внешнеполитической деятельности СССР (В. В. Борисенко, А. Ф. Великий, С. Ф. Свилас, В. Е. Снапковский, О. А. Тихонов и др.[47]). Цикл кандидатских диссертаций, выполненных О. Н. Важник, Л. Г. Короленок, С. В. Ксензовым, Л. В. Ляхович, посвящен связям БССР с зарубежными государствами (Великобританией, Польшей, Францией, группой восточноевропейских стран), при этом ряд авторов продолжили свои исследования уже на опыте отношений Республики Беларусь с избранными государства-

---

[45] *Багалейша С. В.* Беларуска-літоўскія ўзаемаадносіны ў 1915–1924 гг. Мінск, 2014 ; *Королёв М.*, *Екабсон Э.* Консульство и консулы Латвии в Витебске. 2-е изд. Витебск, 2017 ; *Космач В. А.*, *Романовский Д. В.* Советская Беларусь и Германия в 1917–1932 гг.: кампании солидарности, торговля, культурный обмен (уроки истории для современности). Витебск, 2001 ; *Мигун Д. А.* Германия и Беларусь: уроки истории (1914–1922 годы). Минск, 2001 ; *Яго ж.* Беларусь в германо-советских отношениях (ноябрь 1918 – июнь 1941 гг.). Минск, 2013 ; *Яго ж.* Германия и Беларусь в межвоенный период. Saarbrücken, 2013 ; *Осипович А. И.* БССР и Великобритания: пролетарская солидарность и гуманитарные контакты, экономические, научные и культурные связи в 1921–1938 гг. : автореф. дис. ... канд. ист. наук. Минск, 2004 ; *Романовский Д. В.* Внешнеэкономические связи БССР с зарубежными странами (на примере работы Госторгбела в 1922–1931 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук. Минск, 2003.

[46] *Бароўская В. М.* Беларускае пытанне на савецка-польскіх перагаворах 1918–1921 гг. Мінск, 2017 ; *Лазько Р. Р.*, *Кротаў А. М.*, *Мязга М. М.* Беларусь у еўрапейскай палітыцы: 1918–1925 гг. : нарысы. Гомель, 2003 ; *Ціхаміраў А. В.* Беларусь у сістэме міжнародных адносін ... ; Рижский мир в судьбе белорусского народа: 1921–1953 гг. : в 2 кн. / А. А. Коваленя [и др.]. Минск, 2014.

[47] *Борисенко В. В.* Участие Беларуси во внешнеэкономических связях Советского Союза 1971–1985 гг. : автореф. дис. ... канд. ист. наук. Минск, 2001 ; *Тихонов О. А.* Участие Белорусской ССР в деятельности экономических органов ООН (1945–1983 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук. Минск, 1984.

ми[48]. Опубликовано несколько обобщающих работ о белорусско-российских и белорусско-польских отношениях и границах Беларуси в XX в.[49]

Представленная краткая информация о достижениях белорусских ученых в исследовании внешнеполитической деятельности Беларуси в XX – начале XXI в., в которую уже закономерно входят три формы национальной государственности (БНР, БССР и Республика Беларусь), позволяет утверждать, что к началу 2020-х гг. в нашей стране сложилось крупное и самостоятельное научное направление исторической науки и формирующейся в Беларуси науки о международных отношениях, которое можно называть как «история внешней политики Беларуси» или «внешнеполитическими исследованиями Беларуси».

## 1.2. Аб знешнепалітычных даследаваннях у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі (1960–90-я гг.)[50]

**Аб пачатках дзейнасці сектара гісторыі еўрапейскіх сацыялістычных краін.** У даваенны перыяд існавання Інстытута гісторыі АН БССР знешнепалітычная праблематыка не знайшла адлюстравання ў даследаваннях

---

[48] *Важник О. Н.* БССР и Польская Народная Республика: экономические, научно-технические и культурные связи в 1949–1979 гг. Минск, 2008 ; *Короленок Л. Г.* Беларусь и Великобритания: экономические, научно-технические и культурные связи в 1970–2003 гг. : автореф. дис. ... канд. ист. наук. Минск, 2004 ; *Ксензов С. В.* Сотрудничество Белорусской ССР и восточноевропейских стран (на материале общественно-политических организаций Белоруссии, 80-е годы) : автореф. дис. ... канд. ист. наук. Минск, 1992 ; *Ляхович Л. В.* Франция и Беларусь: экономические, научно-технические и культурные связи в 1971–1999 гг. : автореф. дис. ... канд. ист. наук. Минск, 2001.

[49] *Снапкоўскі У. Е.* Беларуска-польскія адносіны (1918–1989 гг.): Даследаванні, дакументы, ілюстрацыі і карты. Мінск, 2013 ; *Яго ж.* Шлях скрозь стагоддзе: беларуска-польскія адносіны 1918–2017 гг. Мінск, 2017 ; *Чигринов П. Г.* Белорусско-российские отношения: История и современность. Минск, 1999 ; *Хомич С. Н.* Территория и государственные границы Беларуси в XX веке. От незавершенной этнической самоидентификации и внешнеполитического произвола к современному status quo. Минск, 2011.

[50] Друкуецца паводле артыкула: *Снапкоўскі У. Е.* Аб навуковых даследаваннях аддзела нацыянальных і міжнародных адносін Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі (1960–1990-я гг.) // Беларус. часоп. міжнар. права і міжнар. адносін. 2000. № 1. С. 72–75.

яго супрацоўнікаў. У другой палове 1940-х – пачатку 1950-х гг. былі зроблены спробы стварыць у інстытуце падраздзяленне, якое займалася б праблемамі ўсеагульнай гісторыі, у тым ліку міжнароднымі адносінамі. У 1945–1946 гг. дзейнічаў сектар сусветнай гісторыі, перайменаваны ў 1946–1950 гг. у сектар усеагульнай гісторыі (загадчык – акадэмік М. Н. Нікольскі), які ў 1951–1952 гг. называўся сектарам навейшай гісторыі (загадчык – канд. гіст. навук Э. М. Пазднякʼ). Аднак з-за адсутнасці кадраў і неадпаведнасці асноўным напрамкам навуковай дзейнасці Інстытута гісторыі АН Беларусі, якімі з'яўляліся вывучэнне «ўнутранай» гісторыі БССР, гэтыя навуковыя падраздзяленні не змаглі разгарнуць сваю працу і былі хутка скасаваны[51]. Пытанні знешнепалітычнай дзейнасці і міжнародных сувязей Беларусі навейшага часу заставаліся паза ўвагай вучоных інстытута, у тым ліку іх абагульняючых прац па гісторыі Беларускай ССР, што былі выдадзены ў 1950–60-я гг. Пра гэта прама было сказана намеснікам дырэктара Інстытута гісторыі АН БССР Н. В. Каменскай у пастановачным артыкуле часопіса «Вопросы истории» (1960), дзе адзначалася «слабое раскрытие исследователями внешнеполитических аспектов истории Белоруссии, исторических связей белорусского народа с народами зарубежных стран»[52].

Указаны недахоп трэба было выпраўляць як на тэматычным, так і арганізацыйным узроўні. Развіццё грамадска-палітычных, эканамічных і культурных сувязей СССР і БССР з краінамі сацыялістычнага лагера, узрастанне цікавасці грамадскасці да пытанняў будаўніцтва сацыялізму ў краінах Еўропы і Азіі патрабавалі пашырэння тэматыкі навуковых даследаванняў і стварэння ў рэспубліканскай Акадэміі навук падраздзяленняў, якія займаліся б пытаннямі гісторыі замежных краін і міжнародных сувязей БССР. Адпаведную тэматыку сталі распрацоўваць два супрацоўнікі сектара гісторыі Беларусі пасляваеннага перыяду Інстытута гісторыі АН БССР, якія абаранілі першыя кандыдацкія дысертацыі па замежных сувязях БССР. Гэта былі С. Д. Вайтовіч («Белорусская ССР в борьбе за мир и сотрудничество между народами (1945–1962)», абаронена ў 1963 г.) і В. С. Талстой («Сотрудничество Белорусской ССР и Польской Народной Республики (1944–1963)», абаронена ў 1964 г.). У другой палове 1960-х гг. яны надрукавалі асобныя манаграфіі на аснове абароненых дысертацый. Кнігі С. Д. Вайтовіча і В. С. Талстога – першыя навуковыя працы па знешнепалітычнай дзейнасці Беларусі, выдадзеныя ў рэспубліцы. У 1964 г. у Маскве выйшла ў свет кніга «Белорусская ССР

[51] *Острога В. А.* Развитие научных и образовательных центров ... С. 150, 162–165.

[52] *Каменская Н. В.* О некоторых вопросах развития исторической науки в Белоруссии // Вопр. истории. 1960. № 11. С. 160.

на международной арене», падрыхтаваная калектывам супрацоўнікаў МЗС БССР пад кіраўніцтвам міністра замежных спраў К. В. Кісялёва. Яна разглядала пераважна актыўнасць рэспублікі ў ААН. Такім чынам, у 1960-х гг. з'явіліся перадумовы для фарміравання акадэмічнага падраздзялення па вывучэнні міжнароднай дзейнасці БССР.

Гэтыя перадумовы былі рэалізаваны фактам стварэння ў структуры Інстытута гісторыі АН БССР у 1969 г. сектара гісторыі замежных сацыялістычных краін. Галоўнымі прычынамі ўтварэння сектара з'яўляліся не столькі навуковыя, колькі палітычныя матывы. Пасля падзей у Чэхаславакіі ў 1968 г. савецкае кіраўніцтва нібыта зразумела неабходнасць навуковага даследавання «брацкіх» сацыялістычных краін, якія час ад часу сутрасаліся ад вострых палітычных крызісаў. З улікам геаграфічнай блізкасці Беларусі да гэтых краін бюро ЦК КПБ, выконваючы адпаведныя рэкамендацыі ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР, прыняло рашэнне аб стварэнні сектара. Перад ім ставіліся задачы «распрацоўкі пытанняў, што датычыліся месца БССР на міжнароднай арэне, яе ўдзелу ў супрацоўніцтве СССР з замежнымі дзяржавамі, а таксама некаторых аспектаў сацыялістычнага будаўніцтва ў брацкіх краінах і заканамернасцей развіцця сусветнай сацыялістычнай сістэмы»[53]. Асноўнымі кірункамі даследаванняў былі зацверджаны пытанні навейшай гісторыі краін Усходняй і Цэнтральнай Еўропы, двухбаковых сувязей Беларускай ССР з сацыялістычнымі краінамі і яе дзейнасці ў ААН. Нягледзячы на назву, прыярытэтным напрамкам сектара адразу вызначаўся аналіз замежных сувязей БССР[54].

Незабяспечанасць сектара кваліфікаванымі кадрамі па спецыялізацыі асобных краін Усходняй Еўропы, іх адток у ВНУ па прычыне больш высокай аплаты працы, цяжкасці з выданнем навуковай прадукцыі па праблематыцы еўрапейскіх сацыялістычных краін (гэта лічылася прэрагатывай маскоўскіх акадэмічных устаноў) прывялі да таго, што з пачатку свайго існавання СГЕСК сканцэнтраваўся на даследаванні двух- і шматбаковых сувязей БССР з асобнымі краінамі сацыялістычнай садружнасці і дзейнасці рэспублікі ў ААН. Але задача вывучэння навейшай (асабліва пасля 1945 г.) гісторыі асобных еўрапейскіх сацыялістычных краін, падрыхтоўкі кандыдатаў навук і замацавання іх за адпаведнымі краінамі не здымалася.

У 1971 г. сектар быў перайменаваны ў сектар гісторыі еўрапейскіх сацыялістычных краін (СГЕСК), а яго кірункамі даследаванняў вызначаліся

---

[53] Архіў аўтара.

[54] *Острога В. А.* Изучение истории нового и новейшего времени в Институте истории АН БССР. 1969–1991 гг. // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А. Гуманитар. науки. 2016. № 2.

пытанні навейшай гісторыі Польшчы, Балгарыі, Чэхаславакіі і ГДР, агульныя праблемы развіцця еўрапейскіх сацыялістычных краін і гісторыі замежных сувязей БССР. Каардынацыя навуковых даследаванняў у рэспубліцы па праблемах гісторыі еўрапейскіх сацыялістычных краін была ўскладзена на Інстытут гісторыі АН БССР, а адпаведную секцыю Навуковага праблемнага савета ўзначальваў загадчык сектара. Секцыя гісторыі еўрапейскіх сацыялістычных краін павінна была ажыццяўляць сувязь і каардынацыю навуковых даследаванняў паміж установамі АН БССР і вузаўскімі кафедрамі. Аднак спачатку цесных кантактаў у супрацоўнікаў сектара з кафедрай гісторыі новага і навейшага часу БДУ не склалался. У 1980-я гг. яны набылі больш трывалы характар[55]. Творчыя сувязі падтрымліваліся з вядучым спецыялістам па Балгарыі прафесарам Д. Б. Мельцарам, дацэнтамі М. Г. Елісеевым і Л. В. Лойкам, супрацоўнік сектара У. Е. Снапкоўскі вёў выкладчыцкую працу па кафедры гісторыі новага і навейшага часу БДУ, сектар папоўнілі лепшыя выпускнікі кафедры і гістарычнага факультэта БДУ: Л. У. Языковіч, А. М. Рэзнік і А. В. Ціхаміраў.

У 1970-я гг. па тэматыцы еўрапейскіх сацыялістычных краін абаранілі кандыдацкія дысертацыі чатыры супрацоўніка сектара: А. Е. Пятруннікаў (удзел камсамола Балгарыі ў сацыялістычным будаўніцтве 1960–1965 гг.), М. Г. Крэканэ (прафсаюзы Румыніі ў 1945–1947 гг.), А. С. Кароль (дапамога СССР антыфашысцка-дэмакратычным сілам Усходняй Германіі ў 1945–1947 гг.), У. Е. Снапкоўскі (палітыка ГДР адносна ФРГ у 1970-я гг.). Тым не менш асноўным напрамкам працы сектара з'яўляліся пытанні знешнепалітычнай дзейнасці і міжнародных сувязей Беларусі пасля 1944 г., калі БССР разам з іншымі саюзнымі рэспублікамі атрымала знешнепалітычныя паўнамоцтвы. У 1970–80-я гг. удзел БССР у працы ААН у галіне забеспячэння міжнароднага міру і бяспекі грунтоўна даследаваў С. Д. Вайтовіч. Ён таксама вывучаў сувязі БССР з развівальнымі краінамі і яе замежныя эканамічныя адносіны. Усяго па гэтай тэматыцы вучоны надрукаваў сем індывідуальных манаграфій і адну ў суаўтарстве. У 1978 г. С. Д. Вайтовіч абараніў у Маскве доктарскую дысертацыю па тэме «Беларуская ССР у барацьбе Савецкага Саюза супраць каланіялізму, за незалежнасць, прагрэс і бяспеку краін, якія развіваюцца (1945–1970 гг.)» і стаў першым у рэспубліцы доктарам навук па праблематыцы міжнароднай дзейнасці БССР.

У 1970 г. С. Д. Вайтовіч, М. С. Верабей і В. С. Талстой выпусцілі кнігу «Сотрудничество Белорусской ССР с социалистическими странами»,

---

[55] *Острога В. А.* Развитие научных и образовательных центров ... С. 167–169.

якая з'яўлялася першай манаграфіяй супрацоўнікаў СГЕСК. Пачалося вывучэнне двухбаковых сувязей рэспублікі з усходнееўрапейскімі краінамі. Л. П. Мірачыцкі падрыхтаваў кандыдацкую дысертацыю аб супрацоўніцтве БССР і Чэхаславакіі ў 1956–1961 гг. і апублікаваў у 1981 і 1992 гг. дзве манаграфіі аб беларуска-чэхаславацкіх і беларуска-югаслаўскіх культурных і навуковых сувязях. В. П. Жукаў выдаў у 1974 г. кнігу аб удзеле БССР у супрацоўніцтве СССР з ГДР у 1956–1972 гг., падрыхтаваную на аснове кандыдацкай дысертацыі. Г. Г. Сяргеева абараніла кандыдацкую дысертацыю аб беларуска-балгарскіх узаемасувязях і надрукавала ў 1976 г. адпаведную манаграфію, якая ахоплівала перыяд 1960–1975 гг. Кандыдацкая дысертацыя В. П. Галубовіча была прысвечана беларуска-венгерскаму супрацоўніцтву 1960–70-х гг., адпаведная праца А. М. Рэзніка – узаемасувязям БССР і ГДР у 1970–80-я гг., А. А. Лашкевіча – развіццю вышэйшай школы Ба лгарыі ў 1944 – пачатку 1960-х гг. Такім чынам, да канца 1970-х гг. супрацоўнікі сектара даследавалі двухбаковае супрацоўніцтва БССР з шэрагам еўрапейскіх краін «сацыялістычнай садружнасці» – Польшчай, ГДР, Балгарыяй, Чэхаславакіяй і Венгрыяй.

Паралельна вялася распрацоўка пытанняў шматбаковага супрацоўніцтва БССР з сацыялістычнымі краінамі. Э. А. Лейкін вывучаў інтэрнацыянальныя сувязі беларускай моладзі, А. С. Ляднёва – рабочага класа, Г. Г. Сяргеева – навуковае супрацоўніцтва, І. А. Захарчанка – трансгранічнае супрацоўніцтва абласцей БССР і адпаведных адміністратыўна-тэрытарыяльных адзінак еўрапейскіх сацыялістычных краін. Па гэтай тэматыцы яны (І. А. Захарчанка ў суаўтарстве з М. С. Вераб'ём) апублікавалі адпаведныя манаграфіі. У 1980-я гг. пашырылася даследаванне знешнепалітычнай дзейнасці рэспублікі ў галіне міжнароднага міру і бяспекі, якое разглядалася праз прызму ўдзелу БССР у ажыццяўленні знешняй палітыкі Савецкага Саюза. Гэтая праблематыка знайшла адлюстраванне ў манаграфічнай прадукцыі Э. А. Лейкіна (барацьба БССР за мір, раззбраенне і міжнародную бяспеку), У. Е. Снапкоўскага (дзейнасць БССР у ААН у 1945–1985 гг.), Л. У. Языковіч (БССР і ЮНЕСКА).

**Праца сектара ў гады перабудовы.** Пэўным падсумаваннем дваццацігадовай працы сектара, які з 1983 г. стаў называцца сектарам гісторыі замежных сувязей БССР, з'явілася выданне ў канцы 1980-х гг. дзвюх калектыўных манаграфій. У кнізе «БССР и социалистические страны: укрепление дружбы, сотрудничества, братства (1945–1987 гг.)» прааналізаваны грамадска-палітычныя, у тым ліку і на міжнароднай арэне, эканамічныя, культурныя і навуковыя сувязі рэспублікі з сацыялістычнымі краінамі. Праца «В едином строю борцов за мир» разглядала ўдзел беларускай грамадскасці ў руху прыхільнікаў міру.

Трэба адзначыць, што гэтыя, як і іншыя, працы супрацоўнікаў сектара не былі пазбаўлены сур'ёзных метадалагічных недахопаў, аднабаковасці, спрошчанасці, параднасці, схематызму, скажэнняў, зададзенасці вынікаў даследавання, замоўчвання адных і штучнага выпячвання іншых гістарычных падзей. Гэтыя хібы тэарэтычнага і метадычнага характару былі ўласцівы для ўсёй савецкай гістарычнай навукі, у тым ліку для школы даследчыкаў знешняй палітыкі СССР і міжнародных адносін.

З разгортваннем працэсаў перабудовы, дэмакратызацыі і галоснасці навукоўцы аддзела рабілі захады па павышэнні навуковага ўзроўню даследаванняў, набліжэнні іх да рэальных патрэб беларускага грамадства. У снежні 1989 г. У. Е. Снапкоўскі надрукаваў у акадэмічнай газеце «За передовую науку» артыкул «Мы многого еще не знаем», дзе крытычна разгледзеў стан вывучэння міжнароднай дзейнасці БССР, выказаўся за даследаванне яе «белых плямаў», адмову ад старых догмаў і стэрэатыпаў, укараненне новых падыходаў у даследчыцкай працы[56]. Новыя канцэптуальныя палажэнні ў гэтай галіне гістарычнай навукі былі вылучаны У. Е. Снапкоўскім і Г. Г. Сяргеевай у шэрагу іх артыкулаў і падсумаваны ў сумесным артыкуле «Знешнепалітычныя аспекты суверэнітэту Беларусі: гістарычны агляд»[57]. На рубяжы 1980–90-х гг. адбываўся пераход даследчыкаў знешнепалітычнай дзейнасці Беларусі на пазіцыі нацыянальна-дзяржаўнай канцэпцыі гісторыі Беларусі.

Супрацоўнікі аддзела не стаялі ў баку ад бурлівага грамадскага жыцця. Некаторыя іх грамадска-палітычныя акцыі патрабавалі грамадзянскай мужнасці. Старшыя навуковыя супрацоўнікі аддзела Л. П. Мірачыцкі і В. С. Талстой былі ў ліку 28 прадстаўнікоў творчай і навуковай інтэлігенцыі рэспублікі, што падпісалі 15 снежня 1986 г. ліст на імя Генеральнага сакратара ЦК КПСС М. С. Гарбачова ў абарону беларускай мовы[58]. З канца 1980-х гг. супрацоўнікі аддзела пачалі паступова пераходзіць на беларускую мову ў сваёй даследчай працы і публічных зносінах і выступленнях. У 1990 г. упершыню штогадовая справаздача аддзела была падрыхтавана па-беларуску. З 1990 г. пераважная большасць публікацый аддзела друкуецца на беларускай мове.

У пачатку 1990-х гг. у сувязі са змяненнем структуры Інстытута гісторыі сектар гісторыі замежных сувязей БССР быў рэарганізаваны ў аддзел гісторыі нацыянальных адносін і культуры Беларусі савецкага перыяду. У 1993 г. са складу аддзела вылучыўся сектар нацыянальна-культур-

---

[56] Гл. раздз. 1.1.

[57] Гл. раздз. 2.1.

[58] Лісты да Гарбачова. Лондан, 1987. С. 1–5.

нага развіцця Беларусі XX ст. і аддзел стаў называцца аддзелам нацыянальных і міжнародных адносін Беларусі. З моманту стварэння аддзела яго загадчыкамі былі: доктар гістарычных навук, прафесар А. М. Мацко (1969–1973); кандыдат гістарычных навук В. С. Талстой (1973–1982); кандыдат гістарычных навук Г. Г. Сяргеева (1982–1995). У 1995–2000 гг. аддзел узначальваў па сумяшчальніцтве доктар гістарычных навук, прафесар У. Е. Снапкоўскі, які з верасня 1993 г. перайшоў па асноўным месцы працы на кафедру міжнародных адносін БДУ.

Тэматыка аддзела прыцярпела значныя змены ў сувязі з набыццём Беларуссю незалежнасці і неабходнасцю вывучэння мала ці зусім недаследаваных праблем навейшай гісторыі Беларусі. Адной з такіх «белых плям» з'яўлялася гісторыя беларускай дыяспары. У 1990–1995 гг. аддзел выканаў тэму «Гісторыя беларускай эміграцыі», па выніках якой падрыхтавана і здадзена ў выдавецтва абагульняючая праца па гісторыі беларускай эміграцыі ад часоў ВКЛ да 1991 г. Быў падрыхтаваны таксама зборнік дакументаў і матэрыялаў па гісторыі беларускай дыяспары ў двух тамах, які ахоплівае перыяд з другой паловы XIX ст. да 1991 г. У 1995–1999 гг. аддзел выканаў тэму «Сучасная беларуская дыяспара», прааналізаваўшы культурна-нацыянальнае жыццё беларусаў Расіі, Украіны, краін Балтыі, Польшчы, узаемадачыненні паміж дыяспарай і Бацькаўшчынай у 1990-я гг.

Упершыню прафесійныя гісторыкі Беларусі правялі комплекснае вывучэнне жыцця і дзейнасці беларусаў замежжа як важнай і неад'емнай часткі беларускага этнасу. Тым самым быў ліквідаваны істотны прагал у беларускай гістарычнай навуцы, распрацавана метадалогія і методыка даследавання беларускай дыяспары і эміграцыі з пазіцый нацыянальна-дзяржаўнай канцэпцыі гісторыі Беларусі. Завершанае даследаванне мае не толькі навукова-пазнавальную, але і сацыяльна-практычную значнасць. Яно закладвае навуковы фундамент як пад распрацоўку нацыянальнай канцэпцыі «Беларуская дыяспара», так і пад рэалізацыю ўзважанай урадавай палітыкі Рэспублікі Беларусь адносна беларускіх арганізацый замежжа, якая павінна быць накіравана на кансалідацыю беларускага нацыянальнага супольніцтва.

У 1990-я гг. супрацоўнікі аддзела дасягнулі значных вынікаў у вывучэнні асобных праблем гісторыі знешняй палітыкі Беларусі і беларускай эміграцыі. У 1993 г. У. Е. Снапкоўскі абараніў доктарскую дысертацыю па тэме «Знешнепалітычная дзейнасць Беларускай ССР (1944–1953 гг.)», па выніках якой надрукаваў дзве манаграфіі аб шляху Беларусі ў ААН і яе дыпламатычнай актыўнасці ў азначаны перыяд. У гэтых працах упершыню ў айчыннай і постсавецкай гістарыяграфіі знешнепалітычная дзейнасць саюзнай рэспублікі разглядаецца не як ілюстрацыя да агуль-

насаюзнай дыпламатыі, а як самастойны прадмет даследавання праз прызму нацыянальных інтарэсаў Беларусі. Аспірантка аддзела Л. А. Кавалёва абараніла кандыдацкую дысертацыю аб знешнепалітычнай дзейнасці БССР у 1919–1929 гг. У 1994 г. А. В. Ціхаміраў абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме «Беларуская эміграцыя. 90-я гг. XIX ст. – 1917 г.», у якой першым у Беларусі прааналізаваў этапы і тэндэнцыі эміграцыйных працэсаў у Беларусі, а таксама арганізацыйныя формы жыцця эміграцыі на чужыне. Пазней У. Е. Снапкоўскі і А. В. Ціхаміраў аб'ядналі свае намаганні ў распрацоўцы навукова-папулярнага нарыса па гісторыі геапалітыкі і дыпламатыі Беларусі XX ст., які, аднак, не дайшоў да публікацыі. У 1999 г. А. В. Ціхаміраў завяршыў цікавае, наватарскае даследаванне па знешнепалітычных аспектах станаўлення беларускай дзяржаўнасці ў перыяд пасля завяршэння Першай сусветнай вайны у лістападзе 1918 г. да заключэння Рыжскага міру ў сакавіку 1921 г.[59]

Г. Г. Сяргеева плённа вывучала гістарычныя і сучасныя пытанні жыцця і дзейнасці беларускай дыяспары, у тым ліку яе ўзаемаадносіны з Бацькаўшчынай, дзяржаўнай міграцыйнай палітыкі Рэспублікі Беларусь і становішча беларусаў у Расійскай Федэрацыі. А. С. Ляднёва аналізавала дзейнасць беларускай нацыянальнай школы за мяжой пасля Другой сусветнай вайны. Л. У. Языковіч займалася асвятленнем рэлігійнага жыцця эміграцыі і беларускага нацыянальнага руху ў Польшчы з 1944 па 1980-я гг. Л. П. Мірачыцкі разглядаў беларускую дыяспару ў краінах Балтыі і гісторыка-культурныя сувязі народаў Беларусі і Балтыі. А. М. Рэзнік працаваў над вывучэннем грамадска-палітычных і навукова-культурных поглядаў прадстаўнікоў БНР у 1918–1925 гг. і дзейнасці беларускай эміграцыі ў Еўропе ў 1925–1939 гг. Т. А. Папоўская даследавала беларускую эміграцыю ў Францыі, Аргенціне і іншых краінах.

Сіламі супрацоўнікаў аддзела нацыянальных і міжнародных адносін напісаны тэксты па праблематыцы беларускай дыпламатыі і дыяспары для «Нарысаў гісторыі Беларусі» (Мінск, 1995. Ч. 2), 4–6-й кніг даследчага праекта «Гісторыі Беларусі» ў 6 кнігах, які завершаны на аўтарскім узроўні калектывам Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Тэматыка аддзела шырока прадстаўлена яго навукоўцамі на старонках «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі», універсальнай «Беларускай энцыклапедыі», «Беларусікі-Альбарутэнікі» і іншых навуковых і папулярных выданняў.

Аддзел ажыццяўляў падрыхтоўку прапаноў і экспертызу дакументаў па сваім профілі, што паступалі ў НАН Беларусі з боку дзяржаўных ор-

[59] Яно апублікавана ў 2003 г.: *Ціхаміраў А. В.* Беларусь у сістэме міжнародных адносін ...

ганаў – Міністэрства замежных спраў, Дзяржкамітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей, Вярхоўнага Савета і Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА і інш. Ён забяспечваў рэалізацыю навуковай часткі дзяржаўнай праграмы «Беларусы ў свеце», што была зацверджана ўрадам Рэспублікі Беларусь (выконвалася ў 1993–1997 гг.). У 1998 г. падрыхтавана разгорнутае заключэнне на праект канцэпцыі «Беларуская дыяспара», што быў распрацаваны па заказе Дзяржкамітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей. Супрацоўнікі аддзела ўдзельнічалі ў экспертнай падрыхтоўцы дакументаў Першага і Другога з’ездаў беларусаў свету, сустрэч беларусаў блізкага замежжа. Аддзел падтрымліваў цесныя сувязі з вышэйшай школай, выдавецтвам «Беларуская энцыклапедыя» і іншымі навукова-асветнымі і грамадска- культурнымі ўстановамі і арганізацыямі.

Разам з тым у навукова-даследчай, арганізацыйнай і выдавецкай працы аддзела існуюць пэўныя хібы і аб’ектыўныя цяжкасці. Кіраўніцтву інстытута і аддзела ўдалося захаваць, нягледзячы на значныя скарачэнні, кадравы патэнцыял навукоўцаў, хоць некаторыя з іх працавалі на палову стаўкі. У 1995–1999 гг. склад аддзела стабілізаваўся на ўзроўні васьмі навуковых супрацоўнікаў, у ліку якіх былі адзін доктар і шэсць кандыдатаў навук. У сувязі з натуральным працэсам змены кадраў узнікла праблема папаўнення аддзела кваліфікаванымі супрацоўнікамі ў працаздольным узросце. З боку выдавецтваў, рэдакцый часопісаў і газет назіралася тэндэнцыя ахалоджання інтарэсу да праблематыкі беларускай дыяспары, пэўнага суб’ектывізму пры ацэнцы рукапісаў. Змены ў гістарычнай палітыцы дзяржавы, у якой адносіны да замежных суайчыннікаў, асабліва ў дзяржавах Захаду, станавіліся ўсё больш крытычнымі, разам з фінансавымі цяжкасцямі Інстытута гісторыі не дазволілі давесці да стадыі публікацыі рукапісы калектыўнай манаграфіі па гісторыі беларускай эміграцыі і зборніка дакументаў па дыяспары.

За 30-гадовую гісторыю свайго існавання аддзел нацыянальных і міжнародных адносін Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусіператварыўся ў адзін з вядучых навуковых цэнтраў краіны па праблемах гісторыі знешняй палітыкі Беларусі XX ст. і беларускай дыяспары. На яго базе склалася аўтарытэтная школа даследчыкаў, якая аказала прыкметны ўплыў на стан гістарычных ведаў і адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь па вышэйазначанай тэматыцы. У пачатку XXI ст. знешнепалітычныя даследаванні ў Інстытуце гісторыі прыцярпелі арганізацыйныя і тэматычныя змены. У 2001 г. аддзел нацыянальных і міжнародных адносін Беларусі быў перайменаваны ў аддзел усеагульнай гісторыі новага і навейшага часу, які ў 2016 г. стаў называцца цэнтрам усеагульнай гісторыі

і міжнародных адносін. Яго супрацоўнікі займаюцца вывучэннем асобных праблем сярэдневяковай, новай і навейшай гісторыі еўрапейскіх краін і замежных сувязей Рэспублікі Беларусь. У 2014 г. створаны таксама цэнтр гісторыі геапалітыкі, які даследуе выбраныя пытанні адносін Беларусі з Польшчай, балтыйскімі дзяржавамі, краінамі Цэнтральнай Еўропы і тэматыку беларускай дыяспары. Інстытут гісторыі падтрымлівае цесныя сувязі ў даследаванні міжнародных адносін з іншымі акадэмічнымі інстытутамі НАН Беларусі, універсітэцкімі кафедрамі, даследчымі цэнтрамі і ўстановамі Беларусі і замежжа, каардынуе выкананне дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў і ўносіць свой уклад у вывучэнне гістарычных і сучасных аспектаў знешнепалітычнай дзейнасці Беларусі і міжнародных адносін.

## 1.3. Даследаванне міжнародных адносін у Беларускім дзяржаўным універсітэце: ад зараджэння традыцый да сучасных інавацый[60]

**Зараджэнне традыцый міжнародных даследаванняў.** Вытокі вывучэння гісторыі міжнародных адносін у БДУ бяруць пачатак ад стварэння ўніверсітэта. Першы рэктар БДУ У. І. Пічэта ў сваіх працах («Гісторыя Беларусі». Ч. 1. М. ; Л., 1924, «Белоруссия и Литва, XV–XVI вв.» і інш.) і лекцыях па гісторыі Беларусі, Польшчы, паўднёвага і заходняга славянства асвятляў знешнепалітычныя сюжэты, звязаныя з узаемаадносінамі паміж ВКЛ і Польшчай, Рэччу Паспалітай і Расіяй, усходнімі, заходнімі і паўднёвымі славянамі. Яго першая праца па гісторыі Беларусі – артыкул па знешнепалітычнай тэматыцы ў зборніку, прысвечанаму В. В. Ключэўскаму, «Литовско-польские унии и отношение к ним литовско-русской шляхты» (1909)[61]. У працы «Литовско-Русское государство» (1910) гэты тады яшчэ расійскі гісторык адзначаў, што беларускія і ўкраінскія землі

[60] Друкуецца паводле артыкулаў: *Гурын А. В.*, *Снапкоўскі У. Е.* Даследаванне міжнародных адносін у Беларускім дзяржаўным універсітэце // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 3, Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. Мінск, 2006. № 3. С. 23–30 ; *Снапкоўскі У. Е.* Развіццё міжнародных даследаванняў у БДУ: ад зараджэння традыцый да сучаснасці // Роль университетского образования и науки в современном обществе : материалы междунар. науч. конф., Минск, 26–27 февр. 2019 г. Минск, 2019. С. 139–148.

[61] *Яноўскі А. А.*, *Зельскі А. Г.* Гісторыя Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў біяграфіях яго рэктараў. Мінск, 2001. С. 13.

былі ўключаны ў склад ВКЛ не прымусова, як лічыла пераважная большасць тагачасных расійскіх вучоных, а дагаворным шляхам. У 1920–1921 гг. У. Пічэта быў экспертам па этнаграфічных пытаннях і сакратаром камісіі па апрацоўцы і падрыхтоўцы матэрыялаў для вядзення перамоў з палякамі ў складзе расійска-ўкраінскай дэлегацыі на савецка-польскай мірнай канферэнцыі ў Рызе. У 1928 г. ён апублікаваў вялікі артыкул «Польска-савецкія адносіны і Рыжскі мір» у трох нумарах часопіса «Полымя»[62], дзе асвятліў узаемаадносіны паміж Польшчай і РСФСР, усходнюю палітыку Польшчы, падзеі польска-савецкай вайны і мірных перамоў у Мінску і Рызе.

Вядомы беларускі гісторык У. М. Ігнатоўскі, які працаваў прафесарам БДУ з 1921 г., у працы «Кароткі нарыс гісторыі Беларусі» (у 1919–1926 гг. выйшла чатыры выданні) паклаў у аснову перыядызацыі гісторыі Беларусі прынцып дзяржаўнай прыналежнасці беларускіх зямель, г. зн. па сутнасці знешнепалітычны прынцып, які адлюстроўваў гістарычную зменлівасць уваходжання тэрыторыі Беларусі ў склад розных дзяржаў, эвалюцыі яе міжнароднага становішча сярод іншых дзяржаў і народаў Усходняй Еўропы. У прадмове да 3-га выдання гэтай кнігі (1921) ён акрэсліў сваё метадалагічнае крэда адносна вывучэння Расіі і Беларусі як буйной і малой па памерах краін. Гаворачы аб ігнараванні ў самадзяржаўнай Расіі ўсяго таго, «што насіла на сабе адзнакі мясцовага ці нацыянальнага характару», У. М. Ігнатоўскі развіваў думку наступным чынам: «Усё вялікае, агульнае ставілася замест дробнага, мясцовага і нацыянальнага. Панавала ідэя імперыялізму. З афіцыйнага боку існавала палітычна і культурна толькі адзіная і непадзельная Расія, якая ведала і падтрымлівала адзіную і непадзельную гісторыю, агульна-рускую гісторыю царска-панскага кірунку»[63]. Задачу беларускіх гісторыкаў ён бачыў у тым, каб «з гары спусьціцца ўніз, каб тут, унізе, а не з вышыні птушынага лёту, рабіць нашу працу», «каб працаваць над тым, што здаецца нам невялікім і дробным»[64]. Такім чынам, адзін з заснавальнікаў беларускай гістарычнай школы падкрэсліў важнасць і неабходнасць даследавання гісторыі і такіх адносна невялікіх краін, як Беларусь.

Яшчэ адзін «Нестар» беларускай гістарычнай навукі М. В. Доўнар-Запольскі па запрашэнні У. І. Пічэты чытаў у 1925/26 навучальным годзе лекцыі па гісторыі Беларусі на педагагічным факультэце БДУ, што пазней ляглі ў аснову падрыхтаванага ім рукапісу «Гісторыя Беларусі»,

---

[62] *Пічэта У.* Польска-савецкія адносіны і Рыжскі мір // Полымя. 1928. № 4–6.
[63] *Ігнатоўскі У. М.* Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. 5-е выд. Мінск, 1991. С. 21.
[64] Там жа.

якi здолеў убачыць свет толькі ў 1994 г. У гэтай кнізе можна знайсці шэраг знешнепалітычных сюжэтаў, у тым ліку аб знешнепалітычных фактарах утварэння Літоўска-Рускай дзяржавы (ВКЛ) (глава III), яе адносінах да Польшчы і Люблінскай уніі (глава V), перыядзе падзелаў Рэчы Паспалітай (глава XII), «ладзе Беларусі ў пачатковую эпоху рускага панавання» (глава XIII), агульным аглядзе рускай палітыкі на тэрыторыі Беларусі (глава XV)[65].

У 1920-я гг. былі закладзены пэўныя навуковыя традыцыі і тэарэтычныя падыходы да даследавання знешнепалітычнай гісторыі Беларусі, міжнароднага становішча і дыпламатыі ВКЛ і Рэчы Паспалітай, палітыкі Рускай дзяржавы і Расійскай імперыі ў дачыненні да Беларусі. Але асобных даследаванняў па знешнепалітычных аспектах гісторыі Беларусі розных перыядаў у БДУ, як і ва ўсёй рэспубліцы, у міжваенны перыяд не праводзілася. У гэты ж час у БДУ закладваліся традыцыі выкладання і даследавання ў галіне дзяржаўнага і міжнароднага права (дзейнасць і працы прафесараў У. М. Дурдзенеўскага і М. М. Краўчанкі).

Большых поспехаў гісторыкі БДУ здолелі дабіцца ў галіне вывучэння гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі замежных дзяржаў. У БДУ на гэту тэматыку выходзілі кафедра ўсеагульнай гісторыі (дзейнічала ў 1921–1933 гг.) і кафедра новай гісторыі, створаная ў 1937 г. Напярэдадні вайны тэматыка прац па ўсеагульнай гісторыі (гісторыя Еўропы, славянскіх краін, асабліва Польшчы, нацыянальна-вызваленчага руху народаў Азіі і Афрыкі) звузілася да вывучэння знешняй палітыкі еўрапейскіх дзяржаў у XIX – пачатку XX ст. (Л. М. Шнеерсон, У. М. Перцаў, Г. В. Яфімаў). Жудасны ўплыў на навуковую і адукацыйную дзейнасць аказалі сталінскія рэпрэсіі. Па падліках В. А. Астрогі, па стане на 1941 г., колькасць ахвяр палітычных рэпрэсій сярод беларускіх даследчыкаў новай і навейшай гісторыі замежных краін разам з аўтарамі публіцыстычных артыкулаў складала 80–85 % з паўтары сотні чалавек, асабліва даследчыкаў польскай тэматыкі[66]. Як пазней было ўстаноўлена, усе абвінавачванні адносна гісторыкаў не мелі падстаў і былі сфабрыкаваны НКУС. Да вайны ў гэтай галіне гістарычнай навукі не было кандыдатаў навук, першым у 1946 г. стаў загадчык кафедры новай гісторыі даследчык міжнародных адносін у Еўропе XIX ст. Л. М. Шнеерсон.

У пасляваенныя гады цэнтрам міжнародных даследаванняў у Беларусі стала кафедра гісторыі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта БДУ. Асноўным навуковым кірункам яе дзейнасці было вывучэнне гісторыі міжнародных адносін у Еўропе ў XIX–XX стст. Па гэтай

---

[65] *Доўнар-Запольскі М. В.* Гісторыя Беларусі. Мінск, 1994.
[66] *Острога В. А.* Развитие научных и образовательных центров ... С. 25.

праблематыцы спецыялізаваліся прафесары кафедры дактары гістарычных навук Д. С. Клімоўскі (германа-польскія адносіны міжваеннага часу[67]), М. П. Палетыка (прычыны Першай сусветнай вайны[68]), Р. М. Трухноў (знешняя палітыка Веймарскай Германіі і савецка-германскія адносіны 1920-х гг.[69]), Л. М. Шнеерсон (міжнародныя адносіны ў Еўропе ў апошняй трэці XIX ст.[70]). Прафесар доктар гістарычных навук У. С. Кошалеў займаўся вывучэннем унутраных і знешніх аспектаў барацьбы Егіпта за незалежнасць, прафесар кафедры гісторыі БССР доктар гістарычных навук Д. Б. Мельцар аналізаваў савецка-балгарскія адносіны міжваеннага часу, беларуска-балгарскія гістарычныя сувязі[71]. Праблематыку адносін паміж ГДР і ФРГ, усходнюю палітыку Свабоднай дэмакратычнай партыі Германіі распрацоўваў дацэнт кафедры гісторыі новага і навейшага часу кандыдат гістарычных навук М. Г. Елісееў[72].

У 1980-я гг. тэматыка вывучэння міжнародных адносін у БДУ пашырылася на ўсе перыяды ўсеагульнай гісторыі, пачынаючы ад Антычнасці і працягваючы Сярэдневякоўем. Прафесар кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў доктар гістарычных навук К. А. Равяка даследаваў гісторыю і гістарыяграфію Пунічных войнаў[73]. Другі прафесар гэтай кафедры доктар гістарычных навук Ю. Я. Івонін працаваў у галіне гісторыі еўрапейскай дыпламатыі XV–XVI стст.[74] Дацэнт кафедры

---

[67] *Климовский Д. С.* Германия и Польша в локарнской системе международных отношений: Из истории зарождения второй мировой войны. Минск, 1978.

[68] *Полетика Н. П.* Возникновение Первой мировой войны. М., 1964.

[69] *Трухнов Г. М.* Поучительные уроки истории. Три советско-германских договора (1922–1926 гг.). Минск, 1979 ; *Яго ж.* Рапалло в действии: из истории советско-германских отношений (1926–1929 гг.). Минск, 1982.

[70] *Шнеерсон Л. М.* Австро-прусская война 1866 г. Минск, 1963 ; *Яго ж.* В преддверии франко-прусской войны (франко-германский конфликт из-за Люксембурга). Минск, 1969 ; *Яго ж.* Франко-прусская война. Минск, 1976 ; *Яго ж.* На перепутье европейской политики: Австро-русско-германские отношения 1871–1875 гг. Минск, 1984.

[71] *Мельцер Д. Б.* Советско-болгарские отношения (1917–1935 гг.). Минск, 1975 ; *Яго ж.* Белоруссия и Болгария: дружба вечная, нерушимая. Минск, 1981.

[72] *Елисеев М. Г.* Бонн и ГДР: Как потерпела провал на международной арене политика правительств ХДС/ХСС, направленная против ГДР (1949–1969). Минск, 1975 ; *Яго ж.* Между конфронтацией и разрядкой. СвДП в партийной системе ФРГ: проблемы «восточной политики». Минск, 1989.

[73] *Ревяко К. А.* Пунические войны. Минск, 1988 ; Яго ж. Войны Рима с Карфагеном: основные тенденции и направления историографии. Минск, 2000.

[74] *Ивонин Ю. Е.* У истоков европейской дипломатии нового времени. Минск, 1984 ; *Яго ж.* Становление европейской системы государств. Англия и Габсбурги на рубеже двух эпох. Минск, 1989.

гісторыі СССР кандыдат гістарычных навук А. Б. Кузняцоў аналізаваў дыпламатычную барацьбу Расіі за бяспеку сваіх паўднёвых межаў у першай палове XVI ст.[75] Даследаванні міжнародных адносін праводзіліся таксама на кафедры навуковага камунізму (дацэнт кандыдат філасофскіх навук А. М. Байчораў вывучаў праблематыку неакаланіялізму і міжнароднага тэрарызму[76]) і агульнаўніверсітэцкай кафедры гісторыі КПСС (дацэнт кандыдат гістарычных навук А. А. Разанаў аналізаваў ідэалогію і палітыку антыкамунізму, ідэалагічную барацьбу на міжнароднай арэне[77]). Загадчык кафедры гісторыі БССР член-карэспандэнт АПН СССР, доктар гістарычных навук прафесар Л. С. Абэцэдарскі апублікаваў манаграфіі і зборнікі дакументаў па гісторыі руска-беларускіх сувязей у XVI–XVII стст.[78]

У 1980-х – пачатку 1990-х гг. развіццё міжнародных даследаванняў у БДУ сутыкнулася з пэўнымі цяжкасцямі, выкліканымі зменай пакаленняў вучоных, ад’ездам з Беларусі шэрагу прафесараў, якія займаліся гэтай тэматыкай, значным памяншэннем фінансавання навуковых даследаванняў, скарачэннем абарон кандыдацкіх дысертацый. Пайшлі з жыцця прафесары Д. С. Клімоўскі (1982) і Р. М. Трухноў (1986), у 1992 г. у ЗША пераехаў Д. Б. Мельцар, а ў 1994 г. – Л. М. Шнеерсон. За межы Беларусі таксама выехалі прафесар Ю. Я. Івонін і дацэнт доктар гістарычных навук А. Б. Кузняцоў. Практычна перасталі распрацоўвацца навуковыя кірункі, якія ўзначальвалі згаданыя гісторыкі. У выніку адбылося скарачэнне абароненых кандыдацкіх дысертацый па гісторыі міжнародных адносін. Калі ў першай палове 1980-х гг. такіх дысертацый было дзевяць, то ў другой палове – толькі тры. Аналіз надрукаваных у гэты перыяд манаграфій і навуковых артыкулаў дае падставы гаварыць аб

---

75 *Кузнецов А. Б.* Дипломатическая борьба России за безопасность своих южных границ (первая половина XVI ст.). Минск, 1986.

76 *Байчоров А. М.* Неоколониализм: социально-политические цели и методы экспансии. Минск, 1984 ; *Яго ж.* Неоколониализм и международный терроризм. Минск, 1985.

77 *Розанов А. А.* Политика мира и мифы «советологии»: критика буржуазных фальсификаций внешней политики КПСС. Минск, 1985 ; *Яго ж.* Антикоммунизм на службе милитаризма. Минск, 1987 ; *Яго ж.* Проблема разоружения и борьба идей. Минск, 1988.

78 *Абецедарский Л. С.* Белорусы в Москве XVII в.: из истории русско-белорусских связей. Минск, 1957 ; *Яго ж.* Белоруссия и Россия: очерки русско-белорусских связей XVI–XVII вв. Минск, 1978 ; Русско-белорусские связи: сборник документов: (1570–1667 гг.) / отв. ред. Л. С. Абецедарский, М. Я. Волков. Минск, 1963.

скарачэнні міжнародных даследаванняў на кафедры гісторыі новага і навейшага часу БДУ ў канцы 1980-х гг.[79]

**Даследчыя напрамкі кафедры міжнародных адносін**. Канец 1980-х – пачатак 1990-х гг. можна лічыць пераломным момантам для беларускай гістарычнай навукі. Пачалося стварэнне нацыянальнай канцэпцыі гісторыі Беларусі. Вучоныя сталі адыходзіць ад марксісцка-ленінскай метадалогіі і пераходзіць да тэарэтыка-метадалагічных канцэпцый сусветнай гістарычнай навукі. У БДУ была створана першая ў Беларусі структурная адзінка па вывучэнні міжнароднай праблематыкі і падрыхтоўцы дыпламатычных кадраў – кафедра міжнародных адносін.

Кафедра была заснавана на гістарычным факультэце 1 верасня 1992 г. для падрыхтоўкі спецыялістаў для Міністэрства замежных спраў і іншых дзяржаўных структур, якія мелі выхад на міжнародную арэну[80]. Яна сабрала ў сваім складзе вядомых вучоных Беларусі, якія прафесійна займаліся вывучэннем знешнепалітычных праблем. З моманту стварэння кафедры на ёй працавалі дактары гістарычных навук прафесары А. В. Шарапа (загадчык кафедры і адначасова дэкан факультэта міжнародных адносін з моманту стварэння факультэта 1 кастрычніка 1995 г.), А. А. Разанаў і А. А. Чалядзінскі. З верасня 1993 г. у яе склад увайшоў доктар гістарычных навук прафесар У. Е. Снапкоўскі. З першых гадоў існавання кафедры тут працавалі кандыдаты гістарычных навук дацэнты Н. Я. Аблава, Л. В. Лойка, С. Ф. Свілас, Л. М. Хухлындзіна. Пазней калектыў кафедры папоўніўся кандыдатамі гістарычных навук дацэнтамі А. А. Гардзейчыкам, У. А. Ялфімавым, А. М. Садоўскай, А. У. Селіванавым, Р. М. Турарбекавай, У. В. Фральцовым, А. В. Ціхаміравым, М. Э. Часноўскім, Д. Л. Шэвялёвым, В. Г. Шадурскім, кандыдатамі палітычных навук дацэнтамі А. А. Дастанкай і Ю. І. Малевіч і іншымі.

На рубяжы стагоддзяў адбыліся першыя абароны доктарскіх дысертацый па новай для Беларусі спецыяльнасці «Гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі». У 2000 г. гэта зрабілі дацэнты М. Э. Часноўскі і В. Г. Шадурскі, у 2003 г. – загадчык кафедры дыпламатычнай і консульскай службы факультэта міжнародных адносін Л. В. Лойка, у 2010 г. – загадчык кафедры міжнароднага турызму Л. М. Гайдукевіч. У 2005 г.

---

[79] *Гурын А. В.* Даследаванні гісторыі міжнародных адносін у Беларусі ... С. 10, 14–15 ; *Острога В. А.* Проблемы внешней политики и международных отношений в белорусской советской историографии (1953–1991 гг.) // Журн. междунар. права и междунар. отношений. 2011. № 4. С. 49–54.

[80] *Шарапо А. В.* 25 лет кафедре международных отношений // Исследование международных отношений в Республике Беларусь: состояние и перспективы : материалы респ. науч.-практ. конф., посвящ. 25-летию каф. междунар. отношений БГУ. Минск, 2018. С. 11–18.

доктарскую дысертацыю па палітычных навуках абараніла дацэнт Ю. І. Малевіч. Новая хваля абарон доктарскіх дысертацый пачалася ў 2015 г. загадчыкам кафедры дыпламатычнай і консульскай службы і адначасова дацэнтам кафедры міжнародных адносін А. У. Русаковічам, у 2016 г. яна прадоўжылася дацэнтам У. В. Фральцовым, у 2018 г. – загадчыкам кафедры мытнай справы В. А. Астрогай і дацэнтам кафедры міжнародных адносін С. Ф. Свілас. Адбыліся змены і ў кіруючым складзе факультэта і кафедры: з 2008 г. дэканам ФМА стаў прафесар В. Г. Шадурскі, прафесар А. В. Шарапа працягваў працаваць загадчыкам кафедры міжнародных адносін да 2015 г., калі яго змяніў прафесар М. Э. Часноўскі.

На 1 студзеня 2020 г. у складзе кафедры на штатнай аснове працавалі 9 дактароў і 11 кандыдатаў навук. Па сваім кадравым патэнцыяле кафедра міжнародных адносін з’яўляецца адным з самых кваліфікаваных падраздзяленняў БДУ і ўсёй сістэмы вышэйшых навучальных устаноў Беларусі. Гэта вядучы вучэбна-метадычны і навуковы цэнтр Рэспублікі Беларусь у справе выкладання і вывучэння гісторыі, тэорыі і актуальных праблем міжнародных адносін, знешняй палітыкі Беларусі і замежных дзяржаў.

Асноўнымі напрамкамі навуковых даследаванняў у галіне міжнародных адносін на кафедры і факультэце міжнародных адносін з’яўляюцца: гісторыя знешняй палітыкі Беларусі і знешнепалітычнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь; асобныя гістарычныя і сучасныя праблемы міжнародных адносін і знешняй палітыкі замежных краін; гісторыя дыпламатычнай і консульскай службы Беларусі; гістарыяграфія міжнародных адносін у Беларусі.

У межах азначаных напрамкаў супрацоўнікі кафедры засяроджваюць свае намаганні на распрацоўцы наступных буйных даследчыцкіх праблем: фарміраванне новай сістэмы еўрапейскай і міжнароднай бяспекі і геапалітычныя аспекты міжнародных адносін (Л. М. Гайдукевіч, А. А. Разанаў, У. В. Фральцоў, Л. М. Хухлындзіна, А. А. Чалядзінскі)[81]; гісторыя знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага (А. В. Дземідовіч, В. І. Лазоркіна, С. А. Лашкевіч)[82] і знешняй палітыкі Беларусі ў XX ст. (С. Ф. Свілас, У. Е. Снапкоўскі, А. В. Ціхамiраў,

---

[81] *Розанов А. А.*, *Шарапо А. В.* Безопасность: подходы Запада. Минск, 1994 ; *Розанов А. А.* Европейская безопасность и НАТО. Минск, 2002 ; *Гайдукевич Л. М.*, *Фрольцов В. В.*, *Хухлындина Л. М.* Геополитика. Минск, 2002; 2-е изд., перераб. и доп. Минск, 2011.

[82] *Дземідовіч А. В.* Вялікае княства Літоўскае ў знешнепалітычных адносінах Рэчы Паспалітай з Расіяй і Швецыяй у першай трэці XVII ст. : аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук. Мінск, 2012 ; *Лазоркина О. И.* Дипломатическая служба Великого княжества Литовского во внешнеполитическом механизме Речи Посполитой в 1600–1697 гг. : автореф. дис. ... канд. ист. навук. Минск, 2009 ; *Лашкевіч С. А.* Асаблівасці знешнепалітычнай актыўнасці Вялікага княства Літоўскага (1569–1600 гг.). Мінск, 2010 ; *Яго ж.* Усходні накірунак дыпламатычнай дзейнасці Вялікага княства Літоўскага ў апошняй трэці XVI ст. Мінск, 2010.

В. Г. Шадурскі)[83]; знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь (А. М. Байчораў, А. А. Разанаў, У. Е. Снапкоўскі, У. Я. Улаховіч, А. В. Ціхаміраў, М. Э. Часноўскі, В. Г. Шадурскі, А. В. Шарапа)[84]; інтэграцыйныя працэсы ў Еўропе і міжнародныя арганізацыі (А. А. Дастанка, А. А. Разанаў, А. П. Рубо, Л. М. Хухлындзіна, А. М. Садоўская, А. У. Селіванаў[85]; беларуска-расійскія адносіны (А. А. Разанаў, У. Е. Снапкоўскі, А. А. Чалядзінскі, А. В. Шарапа)[86]; беларуска-германскія адносіны (А. У. Русаковіч, У. В. Фральцоў, А. В. Шарапа)[87]; беларуска-польскія адносіны і міжнародныя адносіны ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе (Л. В. Лойка, У. Е. Снапкоўскі, А. В. Ціхаміраў, М. Э. Часноўскі[88]; тэарэтычныя аспекты міжнародных адносін, у тым ліку праблема правоў чалавека ў міжнароднай палітыцы другой паловы XX ст. (А. М. Байчораў, Ю. І. Малевіч, У. В. Фральцоў,

---

[83] *Свилас С. Ф.* Деятельность Белорусской ССР в ЮНЕСКО (1954–1964 гг.). Минск, 2013 ; *Снапковский В. Е.* Путь Беларуси в ООН: 1944–1945 гг. Минск, 1994 ; *Яго ж.* Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі ў 1944–1953 гг. Мінск, 1997 ; *Ціхаміраў А. В.* Беларусь у сістэме міжнародных адносін ... ; *Шадурский В. Г.* Культурные связи Беларуси со странами Центральной и Западной Европы (1945–1990-е гг.). Минск, 2000.

[84] *Тихомиров А. В.* Внешняя политика Республики Беларусь (1991–2011 гг.). Минск, 2014 ; *Яго ж.* Внешняя политика Республики Беларусь (1991–2015 гг.). Минск, 2017 ; *Улахович В. Е.* Формирование основ внешней политики Республики Беларусь (1991–2005 гг.). Минск, 2009 ; *Шарапо А. В.* Республика Беларусь в контексте геополитики XXI века. Минск, 2012.

[85] *Довгань Е. Ф.*, *Розанов А. А.* Организация Договора о коллективной безопасности (2002–2009 гг.). Минск, 2010 ; *Достанко Е. А.* Европейская интеграция: процессы углубления и расширения. М., 1999 ; *Яе ж.* Общеевропейский процесс. Минск, 1999 ; *Яе ж.* Расширение Европы в 1990-е гг.: теория и практика. М., 2003 ; *Розанов А. А.* НАТО: проблемы трансформации и расширения. Минск, 1996 ; *Рубо О. П.* Внешнеполитический курс Европейского Союза по отношению к Китайской Народной Республике (1975–2016 гг.). Минск, 2018 ; *Садовская А. Н.* Политика Европейского Союза в отношении развивающихся государств в 1990-е – 2000-е годы. Минск, 2010 ; *Селиванов А. В.* УВКБ ООН и формирование системы защиты беженцев в Республике Беларусь. Минск, 2006 ; *Хухлындина Л. М.* Европейский Союз: становление и развитие. Минск, 2004.

[86] *Снапкоўскі У. Е.* Беларуска-расійскія адносіны : зб. навук. артыкулаў. Мінск, 2009.

[87] Гл. дадатак 1, паз. 59, 60, 88, 103, 104.

[88] *Лойко Л. В.* Политическое развитие Польши в 70–80-е гг. XX в. Минск, 2002 ; *Снапкоўскі У. Е.* Беларуска-польскія адносіны (1918–1989 гг.) ... ; *Яго ж.* Шлях скрозь стагоддзе ... ; *Часноўскі М. Э.* Краіны Сярэдняй Еўропы ў 1990-я гг.: сістэмныя пераўтварэнні : вучэб. дапам. Мінск, 2002 ; *Яго ж.* Постсацыялістычныя краіны на шляху пераўтварэнняў і еўрапейская інтэграцыя. Мінск, 1997 ; *Яго ж.* Сістэмныя пераўтварэнні ў Рэспубліцы Польшча (1989–1999). Мінск, 2000 ; *Яго ж.* Страны Средней Европы в международных отношениях (1989–2014 гг.) : в 2 ч. Ч. 2 : Страноведческий аспект. Минск, 2016.

А. А. Чалядзінскі)[89]; знешняя палітыка асобных замежных дзяржаў (Германіі, ЗША, Кітая, Францыі)[90] і рэгіёнаў (Афрыка, Блізкі і Сярэдні Усход, Паўднёвая Азія, Лацінская Амерыка): (М. У. Даніловіч, С. А. Лашкевіч, Ф. С. Салум, Р. М. Турарбекава, У. В. Фральцоў, А. А. Чалядзінскі, Д. Л. Шавялёў)[91]; гістарыяграфія знешняй палітыкі Беларусі і міжнародных адносін (В. А. Астрога, А. В. Гурын, С. Ф. Свілас, У. Е. Снапкоўскі, В. Г. Шадурскі, А. В. Шарапа, М. Э. Часноўскі)[92].

---

[89] *Байчоров А. М.* Мировая политика. Минск, 2017 ; *Малевич Ю. И.* Права человека в мировой политике (2-я половина XX в.). Минск, 2001 ; *Яе ж.* Права человека в глобальном мире (вторая половина XX в.). М., 2004 ; *Малевич Ю. И., Малевич И. А.* Инновационные стратегии глобализации. Минск, 2015 ; *Челядинский А. А.* Теория международных отношений. Курс лекций. Минск, 2004 ; *Фрольцов В. В.* Политические теории мирового развития. Минск, 2018.

[90] *Аблова Н. Е.* История КВЖД и российской эмиграции в Китае (первая половина XX в.). Минск, 1999 ; *Байчоров А. М.* Китаизация: последствия роста мощи Китая для мира в XXI веке. М., 2013 ; *Данилович М. В.* Центральноазиатский вектор внешней политики КНР в 2001–2013 гг. : автореф. дис. ... канд. ист. наук. Минск, 2014 ; *Розанов А. А.* Военная политика США в начале XXI века. Минск, 2006 ; *Яго ж.* Внешняя политика США: актуальные аспекты. Минск, 2008 ; *Шадурский В. Г.* Внешняя политика Франции. 1945–2002. Минск, 2004 ; *Шарапо А. В.* ФРГ, Австрия и Швейцария: политические системы и внешняя политика. Минск, 2005.

[91] *Лашкевич С. А.*, *Челядинский А. А.* Африка в современном мире. Минск, 2010 ; *Челядинский А. А.* Актуальные проблемы внешней политики стран Латинской Америки и Африки : в 2 ч. Минск, 2005. Ч. 1 : Актуальные проблемы внешней политики стран Латинской Америки и Африки ; *Яго ж.* Актуальные проблемы внешней политики Ближнего и Среднего Востока и Южной Азии : в 2 ч. Минск, 2005. Ч. 1 : Южная Азия в современных международных отношениях. Минск, 2005 ; *Яго ж.* Бразилия в современном мире. Минск, 2012 ; *Шевелев Д. Л.* Переписка Мак-Магона – Хусейна 1915–1916 гг. и вопрос о Палестине : док. и материалы. М., 2008.

[92] Исследование международных отношений в Республике Беларусь: состояние и перспективы : материалы Респ. науч.-практ. конф., посвящ. 25-летию кафедры международных отношений БГУ. Минск, 2018 ; *Гурын А. В.* Даследаванні гісторыі міжнародных адносін у Беларусі ... ; *Яго ж.* Падрыхтоўка навуковых кадраў па міжнародных адносінах у саветах па абароне дысертацый (1992–2017 гг.) // Исследование международных отношений в Республике Беларусь. С. 73–75 ; *Острога В. А.* Развитие научных и образовательных центров ... С. 150–175, 254–261 ; *Нефедов В. В., Острога В. А.* Проблемы новой и новейшей истории в современной белорусской историографии // Новая и новейшая история. 2017. № 5. С. 166–176 ; *Свилас С. Ф.* Историография и источники по истории внешнеполитической деятельности БССР в 1954–1990 гг. ; *Яе ж.* Историография истории международных отношений XIX – XX вв. Минск, 2006 ; *Снапкоўскі У. Е.* Аб навуковых даследаваннях аддзела ... (гл.раздз. 1.2) ; *Шарапо А. В.* 25 лет кафедре международных отношений. С. 11–18.

Галоўны вынік гэтай працы – дзясяткі манаграфій, дысертацый і сотні артыкулаў у беларускіх і замежных навуковых выданнях. У 2012–2016 гг. выкладчыкамі кафедры апублікаваны 29 манаграфій, у тым ліку 9 за мяжой, 238 артыкулаў, у тым ліку 36 за мяжой, 9 вучэбных дапаможнікаў[93]. Вучоныя кафедры прымалі актыўны ўдзел у падрыхтоўцы артыкулаў для «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі», універсальнай «Беларускай энцыклапедыі», «Дыпламатычнага слоўніка-даведніка» і іншых энцыклапедычных выданняў.

Супрацоўнікамі кафедры выдадзены першыя ў Беларусі навучальныя дапаможнікі для вышэйшай школы па гісторыі міжнародных адносін, гісторыі знешняй палітыкі Беларусі, геапалітыцы, сусветнай палітыцы, тэорыі міжнародных адносін, рэгіянальных падсістэмах міжнародных адносін (Байчораў, Снапкоўскі, Фральцоў, Чалядзінскі, Часноўскі і іншыя калектыўныя працы). У 2004–2018 гг. аўтарскі калектыў супрацоўнікаў кафедры выдаў навучальны дапаможнік «История международных отношений» у чатырох частках. Чацвёртая частка выйшла ў чатырох кнігах, дзе змяшчаюцца дакументы і матэрыялы. У працы ўпершыню прадстаўлена беларуская версія гісторыі міжнародных адносін ад канца XVIII ст. да канца XX ст. з чатырма кнігамі дакументаў і матэрыялаў[94]. У. Е. Снапкоўскі апублікаваў навучальны дапаможнік «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі» (у дзвюх частках на беларускай мове і асобнай кнігай на рускай мове), дзе сістэматычна выкладаецца гісторыя беларускай знешняй палітыкі і дыпламатыі ад пачаткаў дзяржаўнасці да канца XX ст.[95] А. В. Ціхаміраў надрукаваў вучэбна-метадычны комплекс «Беларусь в международных отношениях 1772–2002 гг.», дзе раскрыты вузлавыя моманты гісторыі развіцця беларускай дзяржаўнасці і дыпламатыі ў адзначаны перыяд[96] А. А. Чалядзінскі выдаў курс лекцый па тэорыі міжнародных адносін[97].

Важным напрамкам дзейнасці кафедры міжнародных адносін стала праца над падрыхтоўкай і выданнем гісторыка-дакументальных зборнікаў дыпламатычных дакументаў. З 1997 г. вялося выданне шмат-

[93] *Шарапо А. В.* 25 лет кафедре международных отношений. С. 15.

[94] Гл. дадатак 1, паз. 28.

[95] *Снапкоўскі У. Е.* Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі : вучэб. дапам. : у 2 ч. Мінск, 2003–2004. Ч. 1 : Ад пачаткаў дзяржаўнасці да канца XVIII ст. 2003 ; Ч. 2 : Ад канца XVIII да пачатку XXI ст. 2004 ; *Яго ж.* История внешней политики Беларуси. Минск, 2013.

[96] *Тихомиров А. В.* Беларусь в международных отношениях 1772–2002 гг. : учеб.-метод. комплекс. Минск, 2003.

[97] *Челядинский А. А.* Теория международных отношений ...

томнага зборніка дакументаў і матэрыялаў па знешняй палітыцы Беларусі, пачынаючы з 1917 г., якое ажыццяўлялася БДУ (кафедрай міжнародных адносін) сумесна з Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь і Беларускім навукова-даследчым інстытутам дакументазнаўства і архіўнай справы. У 2014 г. выданне завершана выхадам дзясятага тома, які ахоплівае 2006–2010 гг.[98] У 2005–2008 гг. часовы творчы калектыў супрацоўнікаў кафедры і вучоных з іншых навучальных і навуковых устаноў Беларусі выканаў буйны інавацыйны даследчы праект «Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.)» у чатырох тамах. У 2008–2015 гг. чатырохтомны збор быў апублікаваны ў выдавецтве «Юніпак» пад грыфам БДУ, МЗС і Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь[99]. У 2012–2013 гг. супрацоўнікі кафедры міжнародных адносін (У. Е. Снапкоўскі, А. В. Ціхаміраў, А. В. Шарапа) пры ўдзеле работнікаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь выдалі двухтомнае выданне «Государственные границы Беларуси», якое ахоплівае 1917–2010 гг.[100]

**Даследчая праца на факультэце міжнародных адносін і ў іншых падраздзяленнях БДУ**. Міжнародныя даследаванні ажыццяўляліся на іншых кафедрах факультэта міжнародных адносін БДУ. Супрацоўнікі кафедры дыпламатычнай і консульскай службы, створанай у 1996 г., спецыялізуюцца на вывучэнні гісторыі дыпламатычнай і консульскай службы Беларусі, знешняй палітыкі Польшчы. Палітычнае развіццё Польшчы ў 1970–80-я гг., асаблівасці трансфармацыі камуністычнай партыі ў сацыял-дэмакратычную і знешнюю палітыку гэтай дзяржавы даследаваў Л. В. Лойка. Ён жа выдаў падручнік «Асновы дыпламатыі»[101]. Цяперашні загадчык кафедры А. У. Русаковіч займаецца даследаваннем адносін паміж Рэспублікай Беларусь і ФРГ і міжнароднымі адносінамі на постсавецкай прасторы[102]. Знешнюю палітыку Рэспублікі Беларусь

---

[98] Знешняя палітыка Беларусі : зб. дак. і матэрыялаў : у 10 т. Мінск, 1997–2014. *Снапкоўскі У. Е.* Да выхаду ў свет 10-томнага выдання «Знешняя палітыка Беларусі: Зборнік дакументаў і матэрыялаў» // Журн. междунар. права и междунар. отношений. 2015. № 1. С. 30–36.

[99] *Снапкоўскі У. Е.* Да выхаду ў свет 4-томнага выдання «Беларусь у палітыцы заходніх і суседніх дзяржаў (1914–1991 гг.): зборнік дакументаў і матэрыялаў» // Журн. междунар. права и междунар. отношений. 2016. № 1–2. С. 35–43.

[100] Гл. дадатак 1, паз. 17.

[101] *Лойко Л. В.* Пазнач. твор ; *Яго ж.* От коммунизма к социал-демократии: трансформация левой партии в Польше (1970–2000 гг.) : автореф. дис. ... д-ра ист. наук. Минск, 2003.

[102] *Русакович А. В.* Интеграционные процессы на постсоветском пространстве : курс лекций. Минск, 2019.

і яе адносіны з Польшчай асвятляе дацэнт кандыдат гістарычных навук В. І. Лазоркіна, знешнепалітычную дзейнасць БССР і сучасную знешнюю палітыку ЗША і ЕС – дацэнт кандыдат гістарычных навук І. М. Аўласенка. Загадчык кафедры міжнароднага турызму Л. М. Гайдукевіч вывучае праблемы геапалітыкі і міжнароднага турызму ў краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы[103], загадчык кафедры мытнай справы В. А. Астрога – беларускую гістарыяграфію новай і навейшай гісторыі і міжнародных адносін[104], дацэнт кафедры кандыдат гістарычных навук У. С. Ляхоўскі – адукацыйную палітыку Германіі на тэрыторыі Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны[105], загадчык кафедры мовазнаўства і краіназнаўства Усходу В. Р. Баравы – знешнюю палітыку Кітая і іншых азіяцкіх дзяржаў[106].

Прафесар кафедры міжнароднага права доктар юрыдычных навук Ю. П. Броўка даследаваў станаўленне і развіццё міжнароднай праватворчай дзейнасці Беларускай ССР і Рэспублікі Беларусь, інтэграцыйныя працэсы на постсавецкай прасторы, міжнародна-прававыя і палітычныя пытанні стварэння і функцыянавання саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі[107]. Прафесар кафедры міжнароднага права доктар юрыдычных навук Е. Ф. Доўгань займаецца дзейнасцю міжнародных арганізацый (ААН, АБСЕ, НАТА, АДКБ і інш.) па падтрыманні міжнароднага міру і бяспекі і апублікавала манаграфіі, у тым ліку за мяжой, у суаўтарстве з А. Разанавым і А. Русаковічам[108]. Дацэнт гэтай жа кафедры кандыдат

[103] *Гайдукевич Л. М.* Международный туризм в системе взаимодействия стран Центральной и Восточной Европы в конце XX – начале XXI века. Минск, 2007.

[104] *Острога В. А.* Развитие научных и образовательных центров ...

[105] *Ляхоўскі У. В.* Адукацыя Беларусі падчас нямецкай акупацыі 1915–1918 гг. Беласток ; Вільня, 2010.

[106] *Боровой В. Р.* Политика КНР в Ценральной Азии (90-е гг. XX в. – начало XXI в.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук. Минск, 2005.

[107] *Бровка Ю. П.* Становление и развитие международной правотворческой деятельности Белорусской ССР : автореф. дис. ... д-ра юрид. наук. Минск, 1990 ; *Яго ж.* Беларусь и Россия: перспективы развития межгосударственных отношений // Актуальные проблемы международного публичного и международного частного права : сб. науч. тр. Минск, 2010. Вып. 2. С. 5–19 ; *Яго ж.* Международная правотворческая деятельность Республики Беларусь. Минск, 2013.

[108] *Довгань Е. Ф.* Международные организации и поддержание международного мира и безопасности. Минск, 2016 ; *Douhan A. F.* Regional Mechanisms of Collective Security: The New Face of Chapter VIII of the UN Charter? Paris, 2013 ; Collective Security Treaty Organization – contingency planning after 2014 / ed. by A. F. Douhan, A. V. Rusakovich. Geneva ; Minsk, 2016.

гістарычных навук Т. Я. Паўлава вывучала знешнепалітычную дзейнасць БНР у 1918–1920 гг.[109]

Развіццю навуковых даследаванняў у галіне міжнародных адносін садзейнічалі новыя формы арганізацыі навуковай дзейнасці. У снежні 1996 г. выйшаў першы нумар «Беларускага часопіса міжнароднага права і міжнародных адносін» (зараз – «Часопіс міжнароднага права і міжнародных адносін»). У гэтым выданні, якое хутка стала аўтарытэтнай трыбунай навуковай думкі беларускіх вучоных-міжнароднікаў, актыўна друкуюцца супрацоўнікі кафедр міжнародных адносін[110], міжнароднага права, дыпламатычнай і консульскай службы, міжнародных эканамічных адносін, міжнароднага турызму факультэта міжнародных адносін, а таксама іншыя айчынныя і замежныя спецыялісты-міжнароднікі. На факультэце выдаюцца зборнікі навуковых прац студэнтаў, аспірантаў і выкладчыкаў «Беларусь і свет», «Навуковыя працы ФМА», «Інфармацыйны бюлетэнь», часопіс БДУ «Міжнародныя адносіны» (на англійскай мове), у якіх па матэрыялах беларускіх і замежных крыніц асвятляюцца актуальныя праблемы сучасных міжнародных адносін.

У 1998 г. быў створаны Савет па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый па спецыяльнасці «Гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі» пры БДУ (старшыня – праф. А. В. Шарапа). У 1998–2005 гг. на пасяджэннях Савета абаронены 4 доктарскія і 26 кандыдацкіх дысертацый. Пасля спынення дзейнасці Савета абарона дысертацый па вышэйзгаданай спецыяльнасці (і тром іншым гістарычным спецыяльнасцям) адбывалася ў іншым спецсавеце БДУ (старшыня – П. І. Брыгадзін), дзе ў 2006–2017 гг. па спецыяльнасці «Гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі» абаронена 4 доктарскія і 14 кандыдацкіх дысертацый[111]. Акрамя гэтай спецыяльнасці абарона дысертацый па міжнароднай тэматыцы ажыццяўлялася ў Беларусі ў межах спецыяльнасцей «Айчынная гісторыя» і «Сусветная гісторыя»; у 1992–2010 гг. былі абаронены 4 доктарскія і 34 кандыдацкія дысертацыі. Усяго, па падліках А. В. Гурына, у 1992–2017 гг. па міжнароднай тэматыцы ў нашай краіне абаронена 12 доктарскіх і больш за 70 кандыдацкіх дысертацый[112].

---

[109] *Павлова Т. Я.* Внешнеполитическая деятельность Белорусской Народной Республики в 1918–1920 гг. : автореф. дис. ... канд. ист. наук. Минск, 2001.

[110] *Селиванов А. В.* Публикационная активность кафедры международных отношений в «Журнале международного права и международных отношений» // Исследование международных отношений в Республике Беларусь. С. 23–25.

[111] *Гурын А. В.* Падрыхтоўка навуковых кадраў ... С. 74–75.

[112] *Гурын А. В.* Падрыхтоўка навуковых кадраў ... С. 75.

Развіццю міжнароднага супрацоўніцтва садзейнічала рэалізацыя шэрагу міжнародных навукова-адукацыйных праектаў, у тым ліку праекта ТЭМПУС «Інтэграцыя еўрапейскіх даследаванняў у сістэму выкладання міжнародных адносін»[113], замежныя паездкі супрацоўнікаў БДУ. У 1998–2007 гг. вучоныя факультэта міжнародных адносін правялі цыкл штогадовых круглых сталоў з супрацоўнікамі Інстытута міжнародных эканамічных і палітычных даследаванняў РАН, пазней Інстытута эканомікі РАН па пытаннях беларуска-расійскіх адносін. Матэрыялы асобных «круглых сталоў» былі апублікаваны[114]. Вучоныя-міжнароднікі БДУ ўсталявалі цесныя кантакты з польскімі даследчыкамі з Польскага інстытута міжнародных спраў у Варшаве (з 2003 г.) і Інстытута міжнародных спраў Вроцлаўскага ўніверсітэта (з 2004 г.), вынікам чаго стаў шэраг сумесных публікацый[115].

Супрацоўнікі факультэта ўсталявалі дзелавыя кантакты з іншымі беларускімі дзяржаўнымі і недзяржаўнымі цэнтрамі даследавання міжнародных адносін: Цэнтрам міжнародных даследаванняў БДУ, Інстытутам гісторыі НАН Беларусі, кафедрай знешняй палітыкі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Аналітычным цэнтрам «Стратэгія» і інш. Прафесары кафедры міжнародных адносін Ю. І. Малевіч, А. А. Разанаў, У. Е. Снапкоўскі, А. А. Чалядзінскі, В. Г. Шадурскі, М. Э. Часноўскі былі ці застаюцца членамі Саветаў па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый па гістарычных і палітычных навуках пры БДУ. А. А. Разанаў,

---

[113] Учебные программы курсов по проблемам внешней политики европейских государств и европейской интеграции. Минск, 2004.

[114] Российско-белорусские отношения: проблемы и перспективы : материалы «круглого стола» российских и белорусских ученых. М., 1998 ; Белорусско-российские отношения: проблемы и перспективы : материалы Второго «круглого стола» белорусских и российских ученых (Минск, 26–27 янв. 1999 г.). Минск, 2000 ; Российско-белорусские отношения: проблемы и перспективы : материалы «круглого стола» (Москва, 1–3 февраля 2000 г.). М., 2001 ; *Снапкоўскі У. Е.* Беларуска-расійскія адносіны ...

[115] Беларусь і Польшча. Polska i Białoruś. Warszawa, 2003 ; Polska i Białoruś po rozszerzeniu Unii Europejskiej. Warszawa, 2005 ; Беларусь – Польшча: шлях да супрацоўніцтва : матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 11 лістапада 2004 г. Мінск, 2005 ; Беларусь между Востоком и Западом: современные тенденции : материалы междунар. круглых столов, Минск, 26 окт. 2017 г. / редкол.: В. Г. Шадурский [и др.]. Минск, 2017 ; Многовекторность во внешней политике Республики Беларусь : материалы междунар. круглых столов, Минск, окт. – нояб. 2016 г. / под ред. А. В. Русаковича ; редкол.: В. Г. Шадурский [и др.]. Минск, 2016 ; Проблемы внешней политики и безопасности: Беларусь – Польша: история и перспективы сотрудничества. Минск, 2009.

У. Е. Снапкоўскі, А. А. Чалядзінскі прымалі ўдзел у распрацоўцы праекта Канцэпцыі знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, які быў падрыхтаваны і прадстаўлены ў МЗС Рэспублікі Беларусь у канцы 2001 г. Гэты дакумент быў выкарыстаны для падрыхтоўкі Закона «Аб зацвярджэнні асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь» (2005).

У 2000 г. пры БДУ быў створаны Цэнтр міжнародных даследаванняў (ЦМД; дырэктар – У. Я. Улаховіч), галоўнай задачай якога стала падтрымка развіцця нацыянальнай школы міжнародных даследаванняў шляхам стварэння эфектыўнага камунікацыйнага асяроддзя для навукоўцаў, экспертаў і дыпламатаў, замацавання сувязей акадэмічнай навукі і знешнепалітычнай практыкі. Цэнтрам ажыццяўляецца каардынацыя навукова-даследчай і інфармацыйна-аналітычнай работы ў галіне знешняй палітыкі і міжнародных адносін; праводзяцца навукова-практычныя канферэнцыі і семінары па знешнепалітычнай тэматыцы. Выдадзена серыя матэрыялаў навуковых канферэнцый і круглых сталоў, зборнікаў навуковых артыкулаў «Актуальные проблемы международных отношений и глобального развития», а таксама грунтоўная манаграфія У. Я. Улаховіча аб фарміраванні асноў знешняй палітыкі незалежнай Беларусі[116].

Развіццё міжнародных даследаванняў у БДУ працягваецца на гістарычным факультэце, дзе вывучаюцца асобныя пытанні з гісторыі міжнародных адносін у перыяд Кіеўскай Русі, гісторыі знешняй палітыкі ВКЛ, Рэчы Паспалітай, Расіі і міжнародных адносін ва Усходняй Еўропе ў XV–XVI стст. (працы Л. В. Мікалаевай, Л. Л. Міхайлоўскай, У. А. Падалінскага, С. В. Пазняка, В. М. і С. М. Цемушавых, А. А. Яноўскага і В. І. Бобышава і інш.[117]).

---

[116] Вопросы внешней политики Республики Беларусь. Минск, 2001 ; Приоритеты внешней политики Республики Беларусь. Минск, 2001 ; Внешняя политика Беларуси в исторической ретроспективе : материалы международной научной конференции 24–25 мая 2002 г. Минск, 2002 ; Актуальные вопросы международных отношений и внешней политики Беларуси : материалы научных семинаров, янв. – дек. 2002 г. Минск, 2003 ; *Улахович В. Е.* Пазнач. твор.

[117] *Падалінскі У. А.* Прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме 1569 года: удзел у працы першага вальнага сойма Рэчы Паспалітай. Мінск, 2017 ; *Позняк С. В.* История внешней политики России (1856–1914 гг.). Минск, 2001 ; *Темушев В. Н.* Гомельская земля в конце XV – первой половине XVI в.: территориальные трансформации в пограничном регионе. М., 2009 ; *Яго ж.* Первая Московско-литовская пограничная война: 1486–1494. 3-е изд., перераб. М., 2017 ; *Темушев С. Н.* Образование Древнерусского государства. 3-е изд., перераб. М., 2017 ; *Цемушаў В.* На ўсходняй мяжы Вялікага Княства Літоўскага (сярэдзіна XIV – першая палова XVI ст.). Смаленск, 2014 ; *Яновский О. А.*, *Бобышев В. И.* Дипломатия и дипломаты России (от Ивана III до Петра Великого). Минск, 2000.

Супрацоўнікамі кафедр гісторыі Расіі і паўднёвых і заходніх славян даследаваны пытанні гісторыі беларуска-чэшскіх, беларуска-польскіх і беларуска-рускіх культурных сувязей (С. С. Александровіч, Л. А. Козік, В. В. Рэпін і В. А. Сімакова), палітычнай гісторыі і міжнародных адносін у Паўднёва-Усходняй Еўропе ў першай палове XX ст. (М. С. Даўгяла[118]). Загадчык кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян кандыдат гістарычных навук А. П. Салькоў выдаў фундаментальную манаграфію аб месцы і ролі нацыянальна-тэрытарыяльных канфліктаў у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе ў знешняй палітыцы СССР, падрыхтаваў шэраг кандыдатаў навук па гэтай тэматыцы[119]. Значэнне заходняга пагранічнага рэгіёна ў ваенна-стратэгічных планах Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XIX ст.) прааналізаваў А. М. Лукашэвіч, міжнароднае становішча Беларусі ў 1920–30-я гг. адлюстравалі ў сумеснай манаграфіі У. Ф. Ладысеў і П. І. Брыгадзін[120]. Загадчык кафедры новага і навейшага часу У. С. Кошалеў рэалізуе свой творчы інтарэс да гісторыі міжнародных адносін XX – пачатку XXI ст. плённай падрыхтоўкай дактароў і кандыдатаў навук для беларускіх універсітэтаў, выданнем падручнікаў для сярэдняй школы па сусветнай гісторыі і вучэбных дапаможнікаў для сістэмы вышэйшай адукацыі[121]. Аўтарытэтным выданнем стаў навуковы штогоднік «Российские и славянские исследования», дзе друкуюцца артыкулы, падборкі дакументаў, рэцэнзіі і агляды па міжнароднай і знешнепалітычнай тэматыцы.

Даследаванні міжнародных адносін з пазіцый розных сацыяльных навук ажыццяўляюцца ў БДУ на іншых факультэтах: філасофіі і сацыяльных

---

[118] *Давгяло М. С.* Политическая история зарубежных славянских стран новейшего времени : справочник. Минск, 2006 ; Историко-культурные аспекты чешско-белорусских связей / [С. С. Александрович и др.]. Минск, 2019.

[119] *Сальков А. П.* Национально-территориальные конфликты в Центрально-Восточной Европе во внешней политике СССР (1938–1949 гг.). Минск, 2019.

[120] *Ладысеў У. Ф.*, *Брыгадзін П. І.* Паміж Усходам і Захадам: станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939 гг.). Мінск, 2003 ; Демаркация западной границы Российской империи (1796) : док. и материалы / авт.-сост. : А. М. Лукашевич, Н. А. Заикин. Минск, 2005 ; *Лукашевич А. М.* Западный пограничный регион в военно-стратегических планах Российской империи (конец XVIII в. – 1812 г.) : в 3 кн. Минск, 2012 ; *Яго ж.* Политическая ситуация в белорусско-польском пограничье и ее оценка российским руководством: по данным разведки и контрразведки (1801–1812 гг.). Минск, 2009.

[121] *Кошелев В. С.*, *Самосюк Т. В.* Европейская интеграция в документах и материалах. Минск, 2017 ; *Кошелев В. С.*, *Острога В. А.* Кафедра истории нового и новейшего времени БГУ. Минск, 2010 ; Профессор В. С. Кошелев. Во славу просвещения и науки: к 70-летию со дня рождения / сост. : В. А. Острога, Д. Г. Ларионов. Минск, 2017.

навук (кафедра сацыялогіі і кафедра сацыяльных камунікацый), факультэце журналістыкі (кафедра міжнароднай журналістыкі), юрыдычным факультэце (кафедра паліталогіі), эканамічным факультэце (кафедра міжнароднай палітычнай эканоміі). Міжнародныя даследаванні ва ўніверсітэце ўяўляюць сабой шырокі і дынамічны пласт навуковых ведаў з гісторыі, паліталогіі, права, эканомікі і іншых галін гуманітарных і сацыяльных дысцыплін. Структурна яны ў асноўным аб’яднаны на факультэце міжнародных адносін. Станаўленне і хуткае развіццё нацыянальнай школы даследаванняў міжнародных адносін звязана з абвяшчэннем незалежнасці Беларусі і яе станаўленнем як новай еўрапейскай дзяржавы.

## 1.4. Знешнепалітычная дзейнасць Беларускай ССР 1944–1991 гг. у матэрыялах беларускіх, расійскіх і ўкраінскіх архіваў[122]

Знешнепалітычная дзейнасць савецкіх саюзных рэспублік у 1944—1991 гг., перш за ўсё Украінскай ССР і Беларускай ССР, уяўляе сабою цікавы феномен у гісторыі савецкай знешняй палітыкі і міжнародных адносін. Гэты феномен тлумачыцца ў першую чаргу асаблівым міжнародна-прававым і палітыка-прававым статусам саюзных рэспублік СССР, вызначаным канстытуцыйнай рэформай 1944 г. і наступнымі палітычнымі і прававымі зменамі ў рамках савецкай федэратыўнай дзяржавы. Галоўнай асаблівасцю знешнепалітычнай дзейнасці саюзных рэспублік у названы перыяд з’яўлялася тое, што яны, з аднаго боку, фармальна-юрыдычна як бы мелі ўсю паўнату знешнепалітычных паўнамоцтваў, а з іншага боку, маглі імі скарыстацца толькі ў мінімальнай ступені. Гэта дало падставы заходнім палітыкам, дыпламатам і спецыялістам у галіне міжнароднага права і міжнародных адносін сцвярджаць, што саюзныя рэспублікі, у тым ліку заснавальніцы ААН (УССР і БССР), з’яўляюцца не паўнапраўнымі суб’ектамі міжнароднага права і міжнародных адносін, а толькі дзяржаўнымі ўтварэннямі асобнага роду з частковай міжнароднай правасуб’ектнасцю. Зразумела, што такая пазіцыя рашуча адвяргалася савецкай

---

[122] Друкуецца ў перакладзе на беларускую мову з выдання: *Снапковськкій В.* Зовнішньополітична діяльність Білоруської РСР (1944—1991) в документах білоруських, російських і українских державних і дипломатичних архівів // Спеціальні історичні дисципліни: питання теорії та методики : збірка наукових праць / відп. ред. Г. В. Боряк ; упоряднік : І. Б. Матяш. Київ, 2017. Число 28. Дипломатични архиви: поняття, институцийна історія, інформаційні потенціал. 2017. С. 50—71.

дактрынай міжнароднага права і міжнародных адносін, у тым ліку ўкраінскімі і беларускімі навукоўцамі і дыпламатамі[123].

Пасля таго як саюзныя рэспублікі ў выніку распаду СССР атрымалі рэальную магчымасць рэалізаваць свае суверэнныя правы ў галіне міжнародных адносін, даследчыкі постсавецкіх дзяржаў, скінуўшы кайданы монаідэалогіі і монаметадалогіі, змаглі прадставіць чытачам больш блізкую да гістарычнай праўды карціну міжнароднай актыўнасці ўжо былых саюзных рэспублік. Гэта датычылася перш за ўсё «дзвюх асноўных савецкіх рэспублік» – УССР і БССР (паводле сталінскай тэрміналогіі)[124], чыя дзейнасць у сферы знешняй палітыкі СССР у названы 47-гадовы перыяд была несумненна больш прыкметнай і выніковай у параўнанні з міжнароднай актыўнасцю астатніх саюзных рэспублік. Сёння гістарычнае палатно, якое адлюстроўвае знешнепалітычную актыўнасць УССР і БССР у 1940–80-я гг., набыло значна больш дакладныя, правільныя і выразныя абрысы, хоць яно, вядома, не завершана. Даследчыя інструменты, дзякуючы якім рэканструюецца нядаўняе гістарычнае мінулае Украіны і Беларусі ў галіне міжнародных адносін, уключаюць у сябе новыя метадалагічныя падыходы і канцэпцыі, адкрыццё новых тэм, падзей і імёнаў (так званае затушаванне «белых плям»), выкарыстанне ўсяго даступнага комплексу апублікаваных і архіўных дакументаў, нарэшце бесцэнзурную публікацыю сваіх даследаванняў і, вядома, іншыя метады і спосабы даследаванняў[125].

---

[123] *Забигайло К. С.* К истории участия Украинской ССР ... ; *Яго ж.* Международно-правовая деятельность Украинской ССР ; *Бровка Ю. П.* Международная правосубъектность БССР ; *Яго ж.* Белорусская ССР – суверенный участник ... ; Курс международного права : в 6 т. М., 1967–1969. Т. 1 : Понятие и сущность современного международного права / [А. С. Бахов и др.]. М., 1967. С. 149–150.

[124] Переписка Председателя Совета Министров СССР с президентами США и премьер-министрами Великобритании во время Великой Отечественной войны 1941–1945 гг. : в 2 т. М., 1976. Т. 2. С. 203.

[125] З абагульняючых і манаграфічных прац, выдадзеных у Беларусі і Украіне ў перыяд незалежнасці па тэматыцы знешнепалітычнай дзейнасці БССР і УССР, у якіх знайшлі адлюстраванне згаданыя вышэй новыя даследчыя прыёмы і падыходы, можна назваць сярод беларускіх аўтараў публікацыі А. Ф. Вялікага, С. В. Свілас, У. Е. Снапкоўскага, В. Г. Шадурскага; сярод украінскіх аўтараў: Нариси з історії дипломатії України / відп. ред. В. А. Смолій. Київ, 2001 ; *Чекаленко Л.* Зовнішня політика України (від давніх часів до наших днів). Київ, 2010. Сярод расійскіх гісторыкаў цікаўнасці да даследавання знешнепалітычнай дзейнасці саюзных рэспублік намі не выяўлена. З работ прадстаўнікоў расійскай міжнародна-прававой навукі вылучаецца кніга: *Кремнева П. П.* Распад СССР: международно-правовые проблемы. М., 2005. Аўтар выступае супраць агульнавядомага тэзіса аб міжнародна-прававой суб'ектнасці савецкіх саюзных рэспублік, у тым ліку УССР і БССР, якую яны, паводле яго думкі, згубілі пасля ўступлення ў склад СССР.

Для таго каб вызначыць значэнне адкрыцця дыпламатычных архіваў, дзе змешчаны знешнепалітычныя дакументы, неабходна правесці інвентарызацыю звестак аб беларускіх знешнепалітычных архіваліях, іншымі словамі зрабіць агляд беларускіх і замежных дыпламатычных (ведамасных) і іншых дзяржаўных архіваў на прадмет утрымання ў іх матэрыялаў па тэме «Знешнепалітычная дзейнасць БССР у 1944–1991 гг.» Мы абмяжуемся апісаннем архіваў трох постсавецкіх дзяржаў – Беларусі, Расіі і Украіны.

**Беларускія архівы**. У Рэспубліцы Беларусь дакументы па гэтай тэме захоўваюцца ў двух архівах: Архіве МЗС Рэспублікі Беларусь (АМЗСРБ) і Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ведамасны архіў МЗС Рэспублікі Беларусь утрымлівае найбольш поўны збор дакументаў па гэтай тэме. Акрамя дакументаў цэнтральнага апарата МЗС БССР у ім захоўваюцца асабістыя фонды і калекцыі дакументаў найстарэйшых дыпламатаў Беларусі і дыпламатаў-ураджэнцаў Беларусі. Цэнтр гісторыі МЗС і беларускай дыпламатычнай службы захоўвае асабліва каштоўныя дакументы, фатаграфіі, экспанаты, музейныя прадметы.

Пасля рассакрэчвання матэрыялаў МЗС БССР у канцы 1990-х гг. з фондам МЗС Рэспублікі Беларусь савецкага перыяду (ф. 907, воп. 1) працавалі некалькі беларускіх даследчыкаў. Найбольш шырока і глыбока гэты фонд даследаваны беларускім гісторыкам С. Свілас, якая апублікавала ў 2014 г. фундаментальную манаграфію «Беларуская ССР у ЮНЕСКА (1954–1964 гг.)». У ёй упершыню ўведзены ў навуковы абарот матэрыялы калегій, рэферэнцкіх нарад рэспубліканскага МЗС, штогадовыя справаздачы МЗС, справаздачы дэлегацый БССР аб удзеле ў сесіях Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА, перапіска МЗС БССР з саюзным МЗС, рэспубліканскімі партыйнымі і дзяржаўнымі органамі, сакратарыятамі ААН і ЮНЕСКА, пастаяннымі прадстаўніцтвамі БССР пры ААН і ЮНЕСКА[126].

Шэраг даследчыкаў выкарыстоўвалі ў сваіх публікацыях зборнікі выступленняў прадстаўнікоў БССР на канферэнцыі ў Сан-Францыска, Падрыхтоўчай камісіі ААН, Парыжскай мірнай канферэнцыі, сесіях Генеральнай Асамблеі і некаторыя іншыя афіцыйныя матэрыялы[127]. Цяпер гэтыя матэрыялы знаходзяцца ў НАРБ. У 2016 г. У. Снапкоўскі паўторна атрымаў магчымасць папрацаваць з дакументамі архіва беларускага МЗС, у прыватнасці з фондам № 907/1, воп. 1. Так былі вывучаны справы перыяду 1970–80-х гг. Гэта зборнікі выступленняў прадстаўнікоў БССР на штога-

---

[126] *Свилас С. В.* Деятельность Белорусской ССР в ЮНЕСКО ...

[127] Яны былі выкарыстаны ў манаграфіях аўтара: *Снапковский В. Е.* Путь Беларуси в ООН ... ; Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі ...

довых сесіях Генеральнай Асамблеі[128], перапіска беларускага МЗС з сакратарыятамі ААН і іншых арганізацый сістэмы ААН, Пастаянным прадстаўніком БССР пры ААН, МЗС СССР. Асаблівую цікавасць для даследчыка ўяўляюць справы, якія адлюстроўваюць дзейнасць БССР як непастаяннага члена Савета Бяспекі ААН у 1974–1975 гг.[129], справаздачы беларускіх дэлегацый аб удзеле ў нарадах загадчыкаў аддзеламі міжнародных арганізацый МЗС сацыялістычных краін па пытаннях падрыхтоўкі да сесіі Генеральнай Асамблеі, інфармацыя Пастаяннага прадстаўніцтва БССР пры ААН аб нарадах групы сацыялістычных краін у ААН[130] і іншыя матэрыялы. Выяўленыя дакументы прадстаўляюць даволі разнастайную карціну ўдзелу БССР у працы ААН і адначасова паказваюць абмежаваныя магчымасці рэспубліканскага МЗС у ажыццяўленні шматбаковай дыпламатыі, скаванага кантролем і ўсталяванай практыкай узаемаадносін з саюзным МЗС і рэспубліканскім ЦК кампартыі.

У НАРБ змяшчаюцца першы і другі вопісы фонду МЗС Рэспублікі Беларусь № 907, перададзеныя туды ў 1990-я гг. Усяго яны складаюць 1083 адзінкі захоўвання. Першы вопіс уключае матэрыялы НКЗС/МЗС БССР за 1944–1966 гг. Гэта выступленні прадстаўнікоў БССР на Сан-Францыскай канферэнцыі і Падрыхтоўчай камісіі ААН, сесіях Генеральнай Асамблеі і іншых органаў ААН, Парыжскай мірнай канферэнцыі, уваходную і выходную перапіску МЗС БССР з МЗС СССР, рэспубліканскімі партыйнымі і дзяржаўнымі органамі, сакратарыятамі ААН і іншых міжнародных арганізацый, пастаяннымі прадстаўніцтвамі БССР пры ААН і іншых міжнародных арганізацыях, матэрыялы аб замежных грамадска-палітычных, эканамічных і культурных сувязях рэспублікі[131]. Асаблівую цікавасць прадстаўляюць пратаколы рэферэнцкіх нарад супрацоўнікаў МЗС, іх справаздачы аб удзеле ў рабоце Генеральнай Асамблеі і іншых органаў ААН (хоць матэрыялаў апошняга роду мала)[132]. Такім чынам, варта адзначыць, што першы вопіс фонду № 907 змяшчаецца ў двух архівах: АМЗСРБ і НАРБ.

Другі вопіс фонду № 907 змяшчае справы, якія адлюстроўваюць дзейнасць партыйнай і прафсаюзнай арганізацый МЗС БССР за 1945–1987 гг. У матэрыялах партыйных сходаў, выступленнях на іх супрацоўні-

---

[128] Архіў МЗС Рэспублікі Беларусь (АМЗСРБ). Ф. 907/1. Воп. 1. Спр. 1214, 1469, 1653, 1743, 2008, 2078, 2470, 2622 і інш.

[129] Там жа. Спр. 2015а.

[130] Там жа. Спр. 1840.

[131] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 907. Воп. 1. Спр. 6, 7, 26, 28, 35, 38, 303, 735, 751, 845 і інш.

[132] Там жа. Спр. 558, 903 і інш.

каў апарату міністэрства, у тым ліку даклады міністраў К. В. Кісялёва і А. Е. Гурыновіча, можна знайсці шэраг цікавых для даследчыка фактаў, меркаванняў і ацэнак, якія характарызуюць атмасферу ў працоўным калектыве МЗС, узаемаадносіны паміж яго супрацоўнікамі, іх стаўленне да грамадска-палітычных працэсаў у Беларусі і СССР, міжнароднай сітуацыі[133].

У гэтым фондзе захоўваюцца ноты МЗС БССР, адрасаваныя замежным дзяржавам, і ноты замежных дзяржаў, накіраваныя ў МЗС БССР; справаздачы дэлегацый БССР аб удзеле ў рабоце міжнародных канферэнцый і нарад; даведкі і праекты выступленняў, падрыхтаваныя супрацоўнікамі міністэрства для міжнародных арганізацый, выступленні прадстаўнікоў БССР на пасяджэннях сесій Генеральнай Асамблеі, канферэнцыях, сімпозіумах міжнародных арганізацый; дакументы аб удзеле БССР у рабоце галоўных органаў ААН (Савета Бяспекі, Эканамічнага і Сацыяльнага Савета, Міжнароднага Суда), спецыялізаваных устаноў і няўрадавых арганізацый. Цікавасць для даследчыкаў уяўляюць дакументы аб ратыфікацыі і дэнансацыі БССР міжнародных дагавораў і пагадненняў, знаходжанні ў БССР урадавых дэлегацый і афіцыйных асоб замежных дзяржаў; перапіска з Пастаянным прадстаўніком БССР пры ААН аб знешнепалітычных, знешнеэканамічных і адміністрацыйна-гаспадарчых пытаннях[134].

Тэматыка знешнепалітычнай дзейнасці БССР 1944–1991 гг. прадстаўлена таксама ў фондах вышэйшых органаў дзяржаўнай улады і кіравання БССР: ЦК Кампартыі Беларусі (№ 4 і 4п), Савета Міністраў БССР/Рэспублікі Беларусь (№ 7), Вярхоўнага Савета БССР/Рэспублікі Беларусь (№ 968). Напрыклад, у фондзе ЦК КПБ знаходзіцца такі ўнікальны дакумент, як справаздача МЗС БССР аб сваёй рабоце ў 1976 г., падпісаны міністрам замежных спраў А. Е. Гурыновічам аб’ёмам 41 маш. стар. З невялікімі выняткамі гэты дакумент быў апублікаваны ў 2004 г. у 6-м томе зборніка дакументаў і матэрыялаў «Знешняя палітыка Беларусі»[135]. Упершыню навуковая грамадскасць атрымала магчымасць азнаёміцца са справаздачай МЗС саюзнай рэспублікі, у якім дастаткова поўна і грунтоўна паказаны ўсе аспекты дзейнасці знешнепалітычнага ведамства БССР у межах яго паўнамоцтваў.

---

[133] НАРБ. Ф. 907. Воп. 2. Спр. 1, 2, 51, 63, 77 і інш.

[134] Международные отношения, экономические и гуманитарные связи с зарубежными странами [Электронны рэсурс] // НАРБ. URL: http://www.narb.by/rus/archives/fond_list/otn/907 (дата звароту: 12.12.2016).

[135] НАРБ. Ф. 4п. Воп. 118. Спр. 19. Арк. 170–210. Апубл.: Знешняя палітыка Беларусі. Т. 6 : (1976–1991 гг.), 2004.

Што ж тычыцца аналагічных штогадовых справаздач МЗС СССР і МЗС УССР, то яны працягваюць, як правіла, знаходзіцца на сакрэтным захоўванні ў адпаведных архівах (АЗПРФ і Архіве МЗС Украіны). З гэтага правіла, праўда, ёсць выключэнні, якімі нам удалося скарыстацца. У Расійскім дзяржаўным архіве навейшай гісторыі ў фондзе рассакрэчаных дакументаў ЦК КПСС ёсць справа, якая змяшчае справаздачу МЗС СССР аб працы савецкай дэлегацыі на XXII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН у 1967 г.[136] Гэты дакумент быў накіраваны міністрам замежных спраў СССР А. А. Грамыкам у ЦК КПСС 8 студзеня 1968 г. Ён працяты духам канфрантацыі з заходнімі дзяржавамі, перш за ўсё па блізкаўсходнім і в'етнамскім пытаннях. Гаворыцца аб адзінай пазіцыі сацыялістычных краін у ААН, з якой выпадалі Куба і Румынія. Характэрна і тое, што ў справаздачы (с. 17) не згадваюцца УССР і БССР, як і супрацоўніцтва дэлегацыі СССР з дэлегацыямі гэтых дзвюх саюзных рэспублік (членаў ААН).

У Архіве МЗС Украіны таксама ёсць адна даступная для даследчыкаў справаздача МЗС УССР за 1979 г.[137], з якой нам удалося пазнаёміцца. Цяжка меркаваць, чаму менавіта гэтая справаздача знята з сакрэтнага захоўвання, але для гісторыка выніковы дакумент такога роду, вядома, ўяўляе цікавасць. Галоўная ўвага ў ім нададзена дзейнасці УССР у ААН і яе спецыялізаваных установах. Пытанні развіцця замежных сувязей, абменаў візітамі, пратакольна-консульскай працы і ўсіх іншых аспектаў дзейнасці міністэрства не ўвайшлі ў змест справаздачы або прагучалі мімаходзь. Гэта тлумачыцца тым, што справаздачы Камісіі УССР па справах ЮНЕСКА, аб консульскай працы і аб працы з кадрамі былі накіраваны ў МЗС СССР асобна. У параўнанні са згаданай справаздачай беларускага МЗС за 1976 г. справаздача МЗС УССР амаль у тры разы меншая па аб'ёме (15 замест 41 старонак). Аднак па змесце яна грунтоўна характарызуе дзейнасць міністэрства па падрыхтоўцы да 34-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН і ўдзелу ўкраінскай дэлегацыі ў яе працы. Справаздача завяршаецца фармуляваннем васьмі змястоўных прапаноў у адрас МЗС СССР[138]. У дакуменце гаворыцца аб супрацоўніцтве дэлегацый Савецкага Саюза, «брацкіх» сацыялістычных краін у ААН, аднак дэлегацыя БССР не згадваецца (як і дэлегацыя УССР у справаздачы МЗС БССР за 1976 г.).

---

[136] Расійскі дзяржаўны архіў навейшай гісторыі (РДАНГ). Ф. 89. Воп. 19. Спр. 44. Арк. 1–17.

[137] Галіновы дзяржаўны архіў МЗС Украіны (ГДАМЗСУ). Ф. 1. Воп. 3. Спр. 3754б. Арк. 1–15

[138] Там жа. Арк. 14–15.

Параўнанне справаздач трох міністэрстваў замежных спраў (СССР, УССР і БССР) паказвае, што на форумах ААН паміж савецкімі дэлегацыямі ажыццяўлялася несумненна самае цеснае дыпламатычнае супрацоўніцтва пад кіраўніцтвам дэлегацыі СССР, аднак нават у сакрэтных дакументах трох міністэрстваў замежных спраў таго часу аб гэтым лічылі за лепшае не згадваць ці не акцэнтаваць увагі. Гэтая заўвага ў першую чаргу тычыцца саюзнага МЗС, якое, верагодна, апасалася абвінавачванняў і папрокаў (небеспадстаўных) у дыктаце, апецы, кантролі над рэспубліканскімі міністэрствамі замежных спраў.

Матэрыялы аб знешнепалітычнай дзейнасці БССР з 1944 г. захоўваюцца таксама ў фондзе Упраўлення па пастаўках ЮНРРА (UNRRA: United Nation Relief and Rehabilitation Administration, у перакладзе на беларускую мову: Адміністрацыя дапамогі і аднаўлення Аб'яднаных Нацый) пры Савеце Міністраў БССР (№ 462, 330 адзінак захоўвання) за 1945–1948 гг.[139] Тэматыка перасялення і рэпатрыяцыі насельніцтва за 1944–1953 гг. прадстаўлена ў некалькіх фондах НАРБ: № 787 (Упраўленне перасялення і рэпатрыяцыі пры Савеце Міністраў БССР) – 103 адзінкі захоўвання, чатыры вопісы, 1944 1953 гг.; № 788 (Галоўны і раённы прадстаўнікі Савета Міністраў БССР па эвакуацыі польскага насельніцтва з тэрыторыі Беларусі, г. Баранавічы) – 260 адзінак захоўвання, два вопісы, 1944 і 1947 гг.; № 789 (Галоўны ўпаўнаважаны прадстаўнік Савета Міністраў БССР па эвакуацыі беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы, г. Беласток) – 228 адзінак захоўвання, два вопісы, 1944 і 1946 гг.; № 814 (Прадстаўніцтва Урада БССР па адсяленні і перасяленні насельніцтва пры Савеце Міністраў СССР) – 148 адзінак захоўвання, адзін вопіс, 1948 г.[140]

Знешнепалітычная тэматыка СССР і БССР адлюстравана ў шэрагу фондаў асабістага паходжання, якія захоўваюцца ў НАРБ. Гэта фонды міністра замежных спраў К. В. Кісялёва (№ 592), першых сакратароў ЦК КПБ: П. К. Панамарэнкі (№ 1466), К. Т. Мазурава (№ 1374), П. М. Машэрава (№ 528), Р. Я. Кісялёва (№ 551), М. М. Слюнькова (№ 1417); старшыняў Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР: С. В. Прытыцкага (№ 1354), І. Я. Палякова (№ 1373), Ф. А. Сурганава (№ 608); старшыні Савета Міністраў БССР М. Я. Аўхімовіча (№ 554), старшыні Савета Міністраў БССР, пазней пасла СССР у Польшчы А. М. Аксёнава (№ 1177) і інш. Асабліва шырока знешнепалітычная актыўнасць БССР прадстаўлена ў фондзе П. М. Машэрава (справы № 208 і 228 першага вопісу). Аса-

[139] Международные отношения, экономические и гуманитарные связи с зарубежными странами [Электронны рэсурс] // НАРБ. URL: http://www.narb.by/rus/archives/fond_list/otn/462 (дата звароту: 12.12.2016).

[140] Фонды Национального архива Республики Беларусь: краткий справочник. Минск, 2012. С. 35.

бістыя фонды ўтрымліваюць шмат фатаграфій, якія адносяцца і да міжнародных сувязей[141]. Багаты ілюстрацыйны матэрыял па гэтай тэматыцы назапашаны ў спецыялізаваным Беларускім дзяржаўным архіве кінафотафонадакументаў[142].

**Украінскія архівы.** Агляд замежнай архіўнай знешнепалітычнай/дыпламатычнай беларусікі будзе заканамерна пачаць з Украіны. БССР і УССР дзейнічалі на міжнароднай арэне з 1944 г. падобным чынам, хоць варта прызнаць і той бясспрэчны факт, што дыпламатычны голас Кіева гучаў грамчэй і выразней, чым голас Мінска. Зыходзячы з таго, што гэтыя дзве саюзныя рэспублікі былі прадстаўлены ў ААН, удзельнічалі ў іншых міжнародных арганізацыях, канферэнцыях і форумах, вырашалі шмат у чым аднолькавыя задачы савецкай знешняй палітыкі (стасункі з Польшчай, краінамі Захаду і інш.), таму іх знешнепалітычныя інтарэсы і функцыі супадалі ці былі блізкія. Механізм знешнепалітычнай каардынацыі і інфармавання ў рамках СССР прадугледжваў абавязковую рассылку дакументаў, якія тычыліся БССР, у МЗС СССР і УССР, а ў шэрагу выпадкаў – і ў іншыя МЗС саюзных рэспублік, пастаянныя прадстаўніцтвы СССР і УССР пры ААН, зацікаўленыя амбасады СССР у замежных дзяржавах. Такім чынам, у Кіеве можна знайсці нямала архіўных матэрыялаў аб знешнепалітычнай дзейнасці БССР і яе замежных сувязях.

Галіновы дзяржаўны архіў МЗС Украіны (ГДАМЗСУ) уключае 56 фондаў, больш за 500 тыс. адзінак захоўвання за 1944–2005 гг.[143] Найбольшую цікавасць для даследчыка знешнепалітычнай дзейнасці УССР (і БССР таксама) уяўляе фонд № 1 (дакументы асноўнай дзейнасці НКЗС/МЗС УССР/Украіны за 1944–2008 гг.). Савецкі перыяд уключае першыя чатыры вопісы. Беларуская тэматыка спецыяльна не вылучаецца, але праходзіць у многіх справах, калі дзве рэспублікі вырашалі агульныя знешнепалітычныя задачы: удзел у Сан-Францыскай канферэнцыі Аб'яднаных Нацый 1945 г., Парыжскай мірнай канферэнцыі 1946 г., сесіях Генеральнай Асамблеі і іншых органаў ААН, заявы ўрадаў УССР і БССР па германскім пытанні 1947 г., выхад з СААЗ у 1949 г., уступленне ў міжнародныя арганізацыі, у тым ліку ў ЮНЕСКА і МАП, у 1954 г., выбар

[141] Фонды личного происхождения [Электронны рэсурс] // НАРБ. URL: http://narb.by/rus/archives/fond_list/lich_pro/fond_lich (дата звароту: 14.12.2016).

[142] Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў (БДАКФФД) [Электронны рэсурс]. URL: http://archives.gov.by/index.php?id=745529 ; Научно-справочный аппарат [Электронны рэсурс]. URL: http://archives.gov.by/index.php?id=220575 (дата звароту: 14.12.2016).

[143] *Колотілова Л. М.*, *Овчаренко І. М.* Галузевий державний архів Міністерства закордонних справ України // Архівні установи України : у 2 т. Київ, 2005–2010. Т. 1 : Державні архіви. 2-е вид., доп. 2005. С. 569–571.

будынка ў Нью-Ёрку для пастаянных прадстаўніцтваў УССР і БССР пры ААН у 1958 г.[144], падпісанне міжнародных дагавораў і пагадненняў, нарады пастаянных прадстаўнікоў сацыялістычных краін пры ААН, пачынаючы з 1959 г.[145], перапіска з МЗС СССР па пытаннях каардынацыі дзейнасці савецкіх дэлегацый у ААН, ратацыі сацыялістычных краін у органах ААН[146] і іншыя пытанні[147]. У гады перабудовы ўкраінскае МЗС было ініцыятарам пашырэння знешнепалітычнай самастойнасці саюзных рэспублік, і гэта адлюстравалі нарады міністраў замежных спраў і іншых адказных работнікаў міністэрстваў замежных спраў саюзных рэспублік у саюзным МЗС[148].

Акрамя фонду № 1, беларускія матэрыялы прадстаўлены ў фондзе дакументаў Генеральнай Асамблеі ААН (фонд № 10). Вопіс 19 змяшчае шэраг спраў (№ 2–7) аб удзеле дэлегацыі УССР у Сан-Францыскай канферэнцыі Аб’яднаных Нацый 1945 г., у тым ліку выніковую справаздачу дэлегацыі, аднак матэрыялаў і згадак аб супрацоўніцтве з дэлегацыяй БССР няшмат[149]. У гэтым жа фондзе знаходзяцца справаздачы дэлегацый УССР і СССР на першых сесіях Генеральнай Асамблеі і іншыя матэрыялы, якія тычацца супрацоўніцтва савецкіх дэлегацый у розных камітэтах Генеральнай Асамблеі[150]. Беларуская тэматыка адлюстравана таксама ў фондах ЮНРРА (у найбольшай ступені), ЮНЕСКА, МАП, іншых спецыялізаваных устаноў ААН, а таксама ў рассакрэчаных справах: «Справаздачы дэлегацый УССР і БССР па пытаннях бежанцаў», «Аб пакаранні ваенных злачынцаў» і інш.

Дакументы і матэрыялы аб знешнепалітычнай дзейнасці БССР можна знайсці і ў Цэнтральным дзяржаўным архіве грамадскіх аб’яднанняў Украіны (фонд № 1 – ЦК КПУ). У прыватнасці, гэта запіска наркама замежных спраў УССР А. Е. Карняйчука старшыні СНК УССР М. С. Хрушчову ад 2 лютага 1944 г. аб праекце плана арганізацыі НКЗС УССР і іншыя матэрыялы, якія ўяўляюць несумненную цікавасць для даследчыка знешнепалітычнай дзейнасці БССР, як і іншых саюзных рэспублік[151]; шэраг спраў па супрацоўніцтве УССР і БССР з ЮНРРА[152]; справаздачу аб рабоце

---

[144] ГДАМЗСУ. Ф. 1. Воп. 2. Спр. 769. Арк. 7–8.
[145] Там жа. Ф. 1. Воп. 2. Спр. 800. Арк. 1–12.
[146] Там жа. Ф. 1. Воп. 2. Спр. 1998. Арк. 12–18.
[147] Там жа. Ф. 1. Воп. 2. Спр. 3084. Арк. 17–25 ; Воп. 3. Спр. 4136и. Арк. 28–29, 49–50.
[148] Там жа. Ф. 1. Воп. 3. Спр. 6091. Арк. 12–15, 18–20.
[149] Там жа. Ф. 10. Воп. 19. Спр. 2–7.
[150] Там жа. Ф. 10. Воп. 19. Спр. 140. Арк. 49–53, 86–87 ; Спр. 408. Арк. 9–12, 139–141.
[151] Цэнтральны дзяржаўны архіў грамадскіх аб’яднанняў Украіны (ЦДАГАУ). Ф. 1. Воп. 23. Спр. 713.
[152] Там жа. Ф. 1. Воп. 23. Спр. 3593, 3594, 3595, 3598.

дэлегацыі УССР на Сан-Францыскай канферэнцыі[153]. Беларуская знешнепалітычная тэматыка адлюстравана і ў Цэнтральным дзяржаўным архіве вышэйшых органаў улады і кіравання Украіны.

**Расійскія архівы.** Паўнавартаснае даследаванне знешнепалітычнай дзейнасці БССР, як і любой іншай саюзнай рэспублікі, немагчыма без вывучэння архіваў Расійскай Федэрацыі, якая атрымала ў спадчыну архівы былога СССР. Аўтар працаваў над гэтай тэматыкай у пяці маскоўскіх архівах: Архіве знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі (АЗПРФ), Расійскім дзяржаўным архіве сацыяльна-палітычнай гісторыі (РДАСПГ), Расійскім дзяржаўным архіве навейшай гісторыі (РДАНГ), Дзяржаўным архіве Расійскай Федэрацыі (ДАРФ) і Навуковым архіве Інстытута расійскай гісторыі РАН (НАІРГРАН).

Найбольш поўны збор беларускіх знешнепалітычных архівалій прадстаўлены ў АЗПРФ, хоць асобнага фонду аб міжнароднай дзейнасці БССР з 1944 г., як і аб знешнепалітычнай актыўнасці савецкіх саюзных рэспубліках у цэлым, у ім няма. У 1989 г. у структуры МЗС СССР быў створаны Аддзел па саюзным рэспублікам СССР, аднак доступ да яго матэрыялаў закрыты. Варта сказаць, што ў архіве існуе фонд № 0215 (Упраўленне ўпаўнаважанага НКЗС СССР у БССР, 1918–1938 гг.). Дакументацыя аб саюзных рэспубліках, у тым ліку БССР, найбольш шырока адлюстравана ў матэрыялах апошняга перыяду Другой сусветнай вайны і першых пасляваенных гадоў[154]. У гэтыя гады, як вядома, рэспублікі выйшлі на міжнародную арэну, заснаваўшы ўласныя наркаматы замежных спраў, і сталі актыўным інструментам савецкай знешняй палітыкі і дыпламатыі. У фондзе міністра замежных спраў СССР В. М. Молатава (№ 6/06) знаходзяцца справы, якія тычацца планаў уключэння шэрагу саюзных рэспублік, у тым ліку БССР і УССР, у склад Камісіі Аб'яднаных Нацый па ваенных злачынствах (1943–1944 гг.)[155]. У гэтым жа фондзе сабрана калекцыя дакументаў па пытанні ўключэння саюзных рэспублік у склад першапачатковых членаў ААН. Гэтая ж праблематыка адлюстравана ў іншых фондах, прысвечаных удзелу СССР у канферэнцыях у Думбартон-Оксе, Ялце (№ 0556) і Сан-Францыска (№ 429[156]), і ў фондах намеснікаў В. М. Молатава, у прыватнасці С. А. Лазоўскага.

Аўтарам былі вывучаны асобныя справы па тэме першапачатковага членства саюзных рэспублік у створанай міжнароднай арганізацыі

[153] ГДАМЗСУ. Ф. 1. Воп. 23. Спр. 1447.

[154] Гл. Справочник по фондам Архива внешней политики Российской Федерации. 1917–1962 гг. М., 2002.

[155] Архіў знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі (АЗПРФ). Ф. 06. Воп. 5. П. 17. Спр. 166.

[156] Там жа. Ф. 429. Воп. 1. П. 1. Спр. 1, 2, 3, 6 ; П. 3. Спр. 8 і інш.

(будучай ААН), сярод якіх найбольшую цікавасць прадстаўлялі матэрыялы з фонду Молатава[157]. Аднак суцэльнай карціны рашэння гэтага важнага пытання яны не давалі. Прарыў адбыўся ў 2015 г., калі на сайце МЗС Расійскай Федэрацыі ў гонар 70-годдзя Перамогі Савецкага Саюза ў Вялікай Айчыннай вайне быў прадстаўлены адкрыты доступ да вялізнага масіву дакументаў, перанесеных на электоронныя носьбіты, з фонду Молатава і міжнародных канферэнцый аб дзейнасці савецкай дыпламатыі ў гады Другой сусветнай вайны[158]. Цяпер кожны даследчык мае магчымасць прасачыць усе перыпетыі дыпламатычнай барацьбы паміж СССР і заходнімі дзяржавамі ў пытанні ўключэння УССР і БССР у склад заснавальнікаў ААН. Праблематыка, звязаная з рознымі аспектамі ўдзелу БССР, УССР і іншых саюзных рэспублік у міжнародных адносінах, адлюстравана ў наступных фондах АЗПРФ, з якімі працаваў аўтар: № 82/082 (рэферэнтура па Германіі)[159], № 430/0430 (маскоўская нарада міністраў замежных спраў у 1945 г.)[160], № 0431/431/1 (1-я сесія Савета міністраў замежных спраў у Лондане 1945 г.)[161] – у гэтых фондах знаходзяцца дакументы, звязаныя з рэпатрыяцыяй савецкіх грамадзян, у тым ліку жыхароў Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, Балтыйскіх дзяржаў (вядома, што заходнія дзяржавы не лічылі іх жыхароў савецкімі грамадзянамі, што з'яўлялася прычынай галоўных супярэчнасцей з СССР па пытанні рэпатрыяцыі). Фонды № 47/047 (аддзел міжнародных арганізацый МЗС СССР) і № 46/046 (аддзел міжнародных эканамічных арганізацый МЗС СССР) утрымліваюць дакументацыю аб удзеле СССР, УССР і БССР у дзейнасці ААН і яе спецыялізаваных установах, у тым ліку аб дапамозе ЮНРРА для Беларусі і Украіны[162], праблеме ўступлення СССР, УССР і БССР у ЮНЕСКА (гэтая ініцыятыва была вылучана міністрам замежных спраў БССР К. В. Кісялёвым на рубяжы 1946–1947 гг.)[163], выхадзе (спыненні актыўнага членства) СССР, УССР і БССР з Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў 1949 г.[164], пералік прапаноў СССР, УССР і БССР, якія

[157] АЗПРФ. Ф. 06. Воп. 7-б. П. 63. Спр. 14, 40, 41 і інш.

[158] СССР и союзники. Документы Архива МИД России о внешней политике и дипломатии ведущих держав антигитлеровской коалиции [Электронны рэсурс] // МИД Российской Федерации. URL: // http://agk.mid.ru/about/ (дата звароту: 22.12.2016).

[159] АЗПРФ. Ф. 082. Оп. 30. П. 128. Д. 13, 15 и др.

[160] Там жа. Ф. 0430. Оп. 1. П. 2. Д. 6–9 и др.

[161] Там жа. Ф. 0431/1. Оп. 1. П. 3. Д. 14, 15, 15а ; П. 1. Д. 1, 2.

[162] Там жа. Ф. 47. Оп. 2. П. 6. Д. 34.

[163] Там жа. Ф. 047. Оп. 2. П. 5. Д. 331.

[164] Там жа. Ф. 47. Оп. 4. П. 17. Д. 29.

ўносіліся ў ААН і яе ўстановы па эканамічных і сацыяльных пытаннях у 1946–1960 гг.[165] і інш.[166]

Фонд 122/0122 (рэферэнтура па Польшчы) захоўвае дакументацыю змешанай савецка-польскай камісіі па дэмаркацыі дзяржаўнай мяжы паміж СССР і Польшчай за 1946–1948 і наступныя гады. Камісія займалася дэмаркацыяй мяжы на беларускім, літоўскім і ўкраінскім участках, і яе дзейнасць уяўляе вялікую цікавасць перш за ўсё для даследчыкаў з Беларусі, Літвы і Украіны. Аднак доступ да яе матэрыялаў абмежаваны, паколькі закранае пытанні ўстанаўлення міждзяржаўных межаў і іншыя палітычныя пытанні. Са справамі згаданай змешанай савецка-польскай камісіі па дэмаркацыі, як і іншымі матэрыяламі, якія маюць дачыненне да ўсталявання мяжы паміж СССР і Польшчай, аўтар атрымаў магчымасць дэталёва азнаёміцца ў Архіве МЗС Польскай Рэспублікі ў 2007 г., у выніку чаго з'явілася публікацыя па гэтай тэме[167].

Шэраг іншых фондаў АЗПРФ, з матэрыяламі якіх не ўдалося азнаёміцца, таксама ўтрымліваюць дакументацыю аб знешнепалітычнай дзейнасці БССР, УССР і іншых саюзных рэспублік. Гэта фонд № 12/012 (сакратарыят У. Г Дэканозава) – перапіска з МЗС саюзных рэспублік за 1946 г., № 24/024 (сакратарыят Б. Ф. Падцэроба) – перапіска з МЗС саюзных рэспублік за 1953 г.; фонды № 14/014 (сакратарыят М. І. Аліева), № 16/016 (сакратарыят А. Е. Карнейчука), № 17/017 (сакратарыят І. М. Майскага) – стварэнне ў структуры НКЗС СССР падраздзяленняў, якія займаюцца знешнепалітычнымі адносінамі саюзных рэспублік. Цікавыя і разнастайныя дакументы па азначанай тэматыцы знаходзяцца ў фондах савецкіх пасольстваў і міжнародных арганізацый: № 129/0129 (рэферэнтура па ЗША) – дзейнасць ЮНРРА на тэрыторыі СССР, матэрыялы, звязаныя са стварэннем ААН, № 432/0432 (Парыжская мірная канферэнцыя 1946 г.) – удзел дэлегацый СССР, УССР і БССР у рабоце канферэнцыі, № 0512 (камісія па падрыхтоўцы мірных дагавораў і пасляваеннага ўладкавання або камісія М. М. Літвінава 1943–1945 гг.) – праблемы вызначэння савецка-польскай мяжы, лінія Керзана, стварэнне Міжнароднай арганізацыі бяспекі і інш.

---

[165] АЗПРФ. Ф. 46. Оп. 22-а. П. 172. Д. 1.

[166] 28 дакументаў з АЗПРФ па гэтай і аналагічнай праблематыцы апублікаваны ў выданні: Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.) : зб. дак. і матэрыялаў : у 4 т. Мінск, 2008–2015. Т. 4 : (4 ліпеня 1944 г. – 25 жніўня 1991 г.) / склад.: У. Е. Снапкоўскі [і інш.]. 2015.

[167] *Снапкоўскі У.* Дзейнасць савецка-польскай дэмаркацыйнай камісіі па пытанні дэмаркацыі беларускага адрэзка савецка-польскай мяжы (1946–1947 гг.) // Stosunki polsko-białoruskie. T. 1 : Historia i polityka / red. naukowa S. Jaczyński, R. Pęksa. Siedlce, 2009. S. 19–30.

Знешнепалітычная дзейнасць СССР і саюзных рэспублік з 1944 г. і да пачатку 1950-х гг. адлюстравана ў некалькіх фондах РДАСПГ: № 17 (ЦК ВКП(б)/КПСС), № 82 (В. М. Молатава), № 558 (І. В. Сталіна) і некаторых іншых. У фондзе № 17 утрымліваюцца матэрыялы Палітбюро ЦК ВКП(б)/КПСС (парадак і пратаколы пасяджэнняў Палітбюро і матэрыялы да іх, у тым ліку «асобныя папкі»), дзе ёсць нямала пытанняў знешняй палітыкі, якія ў апублікаваным выданні «Палітбюро ЦК ВКП(б)/КПСС. Парадак дня пасяджэнняў» звычайна праходзяць пад назвай «Пытанне НКЗС/МЗС СССР». Палітбюро зацвярджала наркамаў замежных спраў БССР і УССР, як і іншых саюзных рэспублік, прысвойвала ім ранг амбасадара, зацвярджала склад дэлегацый СССР, УССР і БССР на Сан-Францыскую канферэнцыю, Парыжскую мірную канферэнцыю, 1-ю і наступныя сесіі Генеральнай Асамблеі і ЭКАСАС ААН, сесіі Савета ЮНРРА, дыпламатычную канферэнцыю па разглядзе праектаў Канвенцый аб абароне ахвяр вайны (1949)[168], дырэктывы дэлегацыі СССР на сесіі Генеральнай Асамблеі, якіх павінны былі прытрымлівацца і дэлегацыі УССР і БССР; прымала шэраг іншых рашэнняў у галіне знешняй палітыкі (па пытаннях рэпатрыяцыі і эвакуацыі насельніцтва, дзейнасці эміграцыі, барацьбы з нацыяналізмам ва Украіне і Беларусі). Можна заўважыць, што ў рабоце Палітбюро ЦК тэматыка знешнепалітычнай дзейнасці саюзных рэспублік была прафілявана слаба і выступала ў кантэксце агульнай знешнепалітычнай лініі СССР. Калі ў 1940-х гг. яна з'яўлялася даволі прыкметнай, што было звязана з выхадам саюзных рэспублік на міжнародную арэну, то ў наступныя дзесяцігоддзі пытанняў дзейнасці МЗС саюзных рэспублік у парадку дня Палітбюро ЦК КПСС станавілася ўсё менш, пакуль яны зусім не зніклі дзесьці напрыканцы 1950-х гг.

Найбольшая колькасць дакументаў аб знешнепалітычнай дзейнасці СССР і саюзных рэспублік знаходзіцца ў фондзе № 82 (воп. 2). Стэнаграма студзеньскага (1944) Пленума ЦК ВКП(б) змяшчае поўны даклад Молатава аб пашырэнні паўнамоцтваў саюзных рэспублік у галіне знешняй палітыкі і абароны, які быў апублікаваны толькі ў пачатку XXI ст.[169] Тут жа можна азнаёміцца з пратаколамі пасяджэнняў Калегіі МЗС СССР за 1950 г.[170], праектамі пастаноў ЦК ВКП(б) аб удзеле дэлегацый СССР, УССР і БССР у 4–7-й сесіях Генеральнай Асамблеі ААН і дырэктывамі для дэлегацыі СССР, даведкамі МЗС СССР і МЗС БССР за 1949–1953 гг.

---

[168] Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі (РДАСПГ). Ф. 17. Воп. 163. Спр. 1523.

[169] Там жа. Ф. 82. Воп. 2. Спр. 48. Апубл.: ЦК ВКП(б) и национальный вопрос : в 2 кн. М., 2005–2009. Кн. 2 (1933–1945). 2009. С. 791–799.

[170] Там жа. Ф. 82. Воп. 2. Спр. 1032, 1033.

па розных пытаннях дзейнасці ААН[171]. У справах аб савецка-польскіх адносінах ёсць дакументацыя аб абмене ўчасткамі тэрыторый у раёне ўкраінска-польскай мяжы (1946–1951 гг.), перадачы ПНР культурных каштоўнасцей з Беларусі (1946–1952 гг.)[172].

У фондзе І. В. Сталіна № 558 (воп. 11) знешнепалітычная тэматыка, звязаная з Беларуссю і Украінай, рэспублікамі Прыбалтыкі і іншымі рэспублікамі (у меншай ступені), праходзіць у справах, дзе змяшчаюцца перапіска і запісы гутарак савецкага кіраўніка з кіраўнікамі ўрадаў, дзяржаўнымі дзеячамі і дыпламатамі заходніх і іншых дзяржаў, кіраўнікамі міжнародных арганізацый. Гэта пытанні першапачатковага членства савецкіх рэспублік у ААН, іх удзелу ў Парыжскай мірнай канферэнцыі, прызнання заходніх межаў СССР і ўстанаўлення межаў СССР з Германіяй, Польшчай, Чэхаславакіяй, рэпатрыяцыі савецкіх грамадзян, дапамогі ЮНРРА для Украіны і Беларусі і інш.[173] У чацвёрты том зборніка «Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.)» уключана 19 дакументаў з фондаў РДАСПГ, шэраг з іх згаданы ў гэтым аглядзе.

У РДАНГ знешнепалітычная тэматыка саюзных рэспублік адлюстравана ў фондах № 3, 5 і 89. У фондах № 3 (Палітбюро ЦК КПСС 1952–1990 гг.) і № 89 (калекцыя копій дакументаў, рассакрэчаных пры выкананні тэматычных запытаў у працэсе навукова-даследчай працы) знаходзяцца рассакрэчаныя пастановы Палітбюро ЦК ВКП(б)/КПСС аб зацвярджэнні дырэктыў дэлегацыі СССР на Падрыхтоўчай камісіі ААН 1945 г., 1-й (1946) і іншых сесіях (1954–1964) Генеральнай Асамблеі ААН[174]; дакументы, якія паказваюць стаўленне і пазіцыю СССР, УССР і БССР і іх дэлегацый да праблематыкі праў чалавека, у тым ліку да Усеагульнай Дэкларацыі праў чалавека, Канвенцыі аб генацыдзе, пактам па правах чалавека[175]. Тут жа знаходзіцца шэраг пастаноў ЦК КПСС, у тым ліку Сакратарыята ЦК КПСС «Аб перабудове работы рэспубліканскіх таварыстваў культурнай сувязі з замежжам» ад 31 ліпеня 1958 г.[176], пастанова Сакратарыята ЦК КПСС «Аб далейшым павелічэнні актыўнасці СССР у дзейнасці ЮНЕСКА» ад 28 жніўня

---

[171] РДАСПГ. Ф. 82. Воп. 2. Спр. 1078, 1079, 1082, 1083, 1087 і інш.

[172] Там жа. Ф. 82. Воп. 2. Спр. 1290, 1293, 1296.

[173] Там жа. Ф. 558. Воп. 11. Спр. 237–238 (конференция СМИД в Лондоне 1945 г.), 255–276 (переписка с У. Черчиллем и К. Эттли), 279–281 (записи бесед с А. Иденом), 283 (записи бесед с У. Черчиллем, А. Иденом и А. Гарриманом), спр. 284 (записи бесед с Крипсом), 374 (прием государственных и общественных деятелей, в том числе генерального директора ЮНРРА Ф. ла Гардиа).

[174] РДАНГ. Ф. 89. Воп. 38. Спр. 64, 65 ; Ф. 3. Воп. 14. Спр. 75.

[175] Там жа. Ф. 89. Воп. 19. Спр. 2, 16, 45, 47.

[176] Там жа. Ф. 89. Воп. 55. Спр. 22.

1979 г.[177], пастанова ЦК КПСС «Аб стратэгічнай лініі СССР у дачыненні да ААН і звязаных з ёй міжнародных арганізацый» ад 28 жніўня 1989 г.[178] і інш. У гэтым фондзе захоўваюцца дакументы аб рэпатрыяцыі савецкіх грамадзян, у тым ліку жыхароў Беларусі і Украіны (Справаздача Упаўнаважанага Савета Міністраў СССР па справах рэпатрыяцыі за 1946 г.[179]), аб выкананні савецка-польскага пагаднення аб рэпатрыяцыі ад 25 сакавіка 1957 г.[180]

У фондзе № 5 (апарат ЦК КПСС 1949—1991 гг.) змешчаны матэрыялы аб рабоце савецкіх амбасадаў у замежных дзяржавах, перш за ўсё ў сацыялістычных краінах у 1950—60-е гг. У справах пасольства СССР у ПНР прадстаўлены розныя аспекты савецка-польскіх адносін, у тым ліку развіццё беларуска-польскіх сувязей і пачатак прыгранічнага супрацоўніцтва паміж БССР і ПНР у другой палове 1950-х гг.[181] У пратаколах пасяджэнняў Палітбюро ЦК КПСС і іншых матэрыялах паказана стаўленне савецкага кіраўніцтва да ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў Венгрыі, Польшчы і Чэхаславакіі ў перыяды крызіснага развіцця гэтых краін у 1950—80-я гг., што дапамагае высвяціць патэнцыяльную і рэальную ролю памежных саюзных рэспублік (БССР, УССР, Літоўскай ССР) як у нармалізацыі становішча ў іх, так і ў стрымліванні шкоднага, з пункту гледжання Масквы, уплыву рэформаў на савецкае грамадства[182]. Асобныя фрагменты адносна знешнепалітычных інтарэсаў Беларусі і Украіны можна сустрэць у дакументах фонду М. С. Хрушчова (№ 52)[183]. Некаторыя з іх, якія маюць дачыненне да ўдзелу кіраўнікоў СССР, УССР і БССР у 15-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН 1960 г., апублікаваны ў мемуарах апальнага лідара[184]. Дакументы знешняй палітыкі, якія захоўваюцца ў фондах Л. І. Брэжнева, Ю. У. Андропава, К. У. Чарненкі, М. С. Гарбачова, у большасці сваёй не выдаюцца даследчыкам.

---

[177] РДАНГ. Ф. 89. Воп. 46. Спр. 45.

[178] Там жа. Ф. 89. Воп. 9. Спр. 26.

[179] Там жа. Ф. 89. Воп. 40. Спр. 5.

[180] Там жа. Ф. 89. Воп. 67. Спр. 2.

[181] Там жа. Ф. 5. Воп. 28. Спр. 296, 396, 397, 461. Дадзеныя архіўныя матэрыялы ўвайшлі ў манаграфію: *Снапкоўскі У. Е.* Беларуска-польскія адносіны (1918—1989 гг.) ...

[182] РДАНГ. Ф. 89. Воп. 66. Спр. 3 ; Воп. 14. Спр. 1—20 ; Воп. 9. Спр. 33 ; Воп. 8. Спр. 74 ; Воп. 46. Спр. 67 і інш. Сярод даследаванняў на гэту тэму гл., напр.: «Пражская весна» 1968 года и советские республики: Реакция власти и общества. Ставрополь, 2009.

[183] РДАНГ. Ф. 52. Воп. 1. Спр. 446. Арк. 29.

[184] *Хрущев Н. С.* Время. Люди. Власть : [(Воспоминания)] : в 4 кн. М., 1999. Кн. 2. С. 443—444, 462—463.

У ДАРФ знешнепалітычная тэматыка БССР, УССР і іншых саюзных рэспублік прадстаўлена ў фондах, дзе назапашаны матэрыялы пра ўзаемаадносіны СССР і ЮНРРА, перш за ўсё аб эканамічнай дапамозе Беларусі і Украіне з боку гэтай міжнароднай арганізацыі. Гэта фонд № 413 (Міністэрства знешняга гандлю СССР, воп. 24), які знаходзіцца ў асацыяваным з ДАРФ Расійскім дзяржаўным архіве эканомікі[185]; фонд № Р4459 (Тэлеграфнае агенцтва Савецкага Саюза пры Савеце Міністраў СССР (ТАСС))[186]; фонд № Р5446 (Савет Міністраў СССР)[187]. Замежныя сувязі саюзных рэспублік у галіне культуры, навукі, адукацыі і іншых сферах адлюстраваны ў фондзе № Р8581 (Савецкае інфармацыйнае бюро (Савінфармбюро) пры Дзяржаўным камітэце па культурных сувязях з замежнымі краінамі пры Савеце Міністраў СССР), фондзе № Р9518 (Камітэт па культурных сувязях з замежнымі краінамі пры Савеце Міністраў СССР) і інш.

Навуковы архіў Інстытута расійскай гісторыі РАН прыцягвае даследчыкаў аб'ёмістымі дасье выразак з замежнай і савецкай прэсы за 1917–1935 і 1941–1947 гг. па ўнутранай і знешняй палітыцы розных дзяржаў свету і міжнародных праблемах. Найбуйнейшая з тэматычных дакументальных калекцый, якая захоўваецца ў архіве, – матэрыялы фонду № 2 (Камісіі па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны). У ім змяшчаюцца выразкі з газет па пытаннях міжнароднага становішча і знешняй палітыкі СССР, у тым ліку аб дзейнасці ЮНРРА, міжнародных канферэнцыях перыяду Другой сусветнай вайны і першых пасляваенных гадоў, адносін СССР з замежнымі дзяржавамі. У гэтых матэрыялах, асабліва з уплывовых і інфармаваных газет ЗША і Вялікабрытаніі («The New York Times», «The New York Gerald Tribune», «The Washington Post», «The Times» і інш.), можна знайсці шмат цікавай і змястоўнай інфармацыі аб унутраным і міжнародным становішчы савецкіх рэспублік, канстытуцыйнай рэформе ў СССР 1944 г., абмеркаванні напярэдадні і ў ходзе Сан-Францыскай канферэнцыі пытання аб уключэнні УССР і БССР у лік першапачатковых членаў будучай ААН, устанаўленні ўсходняй мяжы Польшчы, рэпатрыяцыі савецкіх грамадзян, бежанцах і перамешчаных асобах і іншых пытаннях, якія маюць дачыненне да знешнепалітычнай тэматыкі саюзных рэспублік[188]. Фонд № 22 уяўляе сабой дасье замежнай і савецкай прэсы за 1917–1935 і 1941–1947 гг.

---

[185] Гл. апублікаваны на матэрыялах гэтага фонду артыкул: *Соколов В. В.* ЮНРРА и Советский Союз. 1943–1948 годы (по новым архивным материалам) // Новая и новейшая история. 2011. № 6. С. 24–33.

[186] Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (ДАРФ). Ф. Р4459. Воп. 27. Спр. 4869, 4870, 4940–4942, 6115 і інш.

[187] Там жа. Ф. Р5446. Воп. 48а. Спр. 2223, 2224, 2288, 2337, 2741, 2751 і інш.

[188] Навуковы архіў Інстытута расійскай гісторыі РАН (НАІРГ РАН). Ф. 2. Воп. (раздз.) 13. Спр. 424–431, 436, 440, 503, 505 і інш.

У ім таксама адлюстраваны матэрыялы, аналагічныя тэматыцы фонду № 2, аднак у значна большай ступені асвятляюць унутраную і знешнюю палітыку замежных дзяржаў і міжнародныя адносіны[189].

**Высновы**. Падводзячы вынік агляду дакументацыі аб знешнепалітычнай дзейнасці Беларускай ССР за 1944–1991 гг., што захоўваецца ў беларускіх, расійскіх і ўкраінскіх дзяржаўных і ведамасных (дыпламатычных) архівах, у якіх аўтар працаваў у 1990–2017 гг. (усяго 10 архіваў трох названых дзяржаў), адзначым наступнае.

1. Беларуская знешнепалітычная тэматыка гэтага перыяду цесна звязана з украінскай, асабліва добра гэта бачна ў вопісах расійскіх (былых агульнасаюзных) архіваў. У меншай ступені, хоць таксама даволі выразна, яна праходзіць у вопісах і справах ГДАМЗСУ, што было абумоўлена вялікай вагой і значэннем МЗС УССР у параўнанні з МЗС БССР у пытанні размеркавання Масквой роляў паміж дзвюма саюзнымі рэспублікамі на міжнароднай арэне, яго больш шырокім колам функцыянальных абавязкаў (напр., у Кіеве было каля дзясятка консульстваў замежных дзяржаў, у той час як у Мінску толькі два). Параўнанне архіваў двух рэспубліканскіх міністэрстваў замежных спраў таксама дазваляе прыйсці да высновы, што беларуская знешнепалітычная тэматыка шырэй адлюстравана ў ГДАМЗСУ, чым аналагічная ўкраінская тэматыка – у АМЗСРБ.

2. Уважлівае азнаямленне з вопісамі спраў аднаго, першага фонду Архіва ўкраінскага МЗС[190], паказвае, што знешнепалітычная дзейнасць, і асабліва функцыі знешнепалітычных ведамстваў, УССР, як і БССР (хоць у выпадку з апошняй гэта тычыцца ў меншай ступені), не была такой ужо фармальнай, параднай і цырыманіяльнай, як гэта нярэдка ўяўлялася нават аўтарытэтным заходнім даследчыкам на мяжы 1950–60-х гг.[191] або пазней. Напрыклад, толькі вопіс 2 фонду № 1 ГДАМЗСУ, які змяшчае апісанне спраў за 1958–1978 гг., надрукаваны ў фаліянце на 375 маш. стар. Калі за 1958 г. у вопісе было 70 спраў, то праз 20 гадоў, у 1978 г., іх колькасць перавысіла 200[192]. Варта сказаць, што да фарміравання тэзіса аб поўнай несамастойнасці УССР і БССР на міжнароднай арэне прылажылі руку ў першую чаргу савецкая знешнепалітычная дактрына і асабліва дыпламатычная практыка саюзнага МЗС, які сам больш за ўсё асцерагаўся таго, што дзве рэспублікі, члены ААН, могуць выйсці з-пад кантролю.

---

[189] Матэрыялы замежнай прэсы гэтага архіва выкарыстаны аўтарам у манаграфіі: *Снапковский В. Е.* Путь Беларуси в ООН ... С. 19–28.

[190] Вопісы спраў беларускага і расійскага архіваў адпаведных МЗС даследчыкам не выдаюцца.

[191] *Aspaturian V.* The Union Republics in the Soviet Diplomacy: A Studv of Soviet federalism in the service of Soviet foreign policy. Paris ; Geneve, 1960.

[192] ГДАМЗСУ. Ф. 1. Оп. 2 справ постійного зберігання за 1958–1978 роки. Документи по основній діяльності.

3. У даследчыкаў знешнепалітычнай дзейнасці БССР азначанага перыяду сёння ёсць дастаткова добрыя магчымасці для грунтоўнай распрацоўкі дадзенай тэматыкі на дысертацыйным і манаграфічным узроўнях. Гэтыя магчымасці забяспечваюць перш за ўсё беларускія архівы: НАРБ (перыяд 1944–1966 гг.) і АМЗСРБ (увесь названы перыяд), але толькі ў выпадку допуску да матэрыялаў архіва. Другім па значэнні месцам захоўвання матэрыялаў аб знешнепалітычнай дзейнасці БССР з'яўляецца ГДАМЗСУ, каштоўны тым, што змяшчае вялікія масівы адкрытай і дазволенай для капіравання інфармацыі аб аналагічнай дзейнасці УССР, сярод якой можна вылучыць беларускую тэматыку, выкарыстоўваючы метады параўнання, аналізу, сінтэзу і іншыя даследчыя прыёмы. Несумненна, вельмі важнай крыніцай з'яўляецца АЗПРФ з яго вельмі багатымі фондамі (асабліва міжнародных арганізацый), якія раскрываюць розныя працэсы ўзаемадзеяння, супрацоўніцтва, абмену інфармацыяй, кантролю, апекі, дыктату, падпарадкавання паміж трыма савецкімі дэлегацыямі ў ААН і іншых міжнародных арганізацыях. Аднак, як і ў выпадку з АМЗСРБ, вельмі многае залежыць ад таго, якія і ў якой колькасці матэрыялы атрымае даследчык.

4. Апіраючыся на вышэйсказанае, дазволім сабе зрабіць заключную выснову аб тым, што наспеў час для беларускіх, украінскіх, расійскіх даследчыкаў (ды і для прадстаўнікоў іншых былых савецкіх саюзных рэспублік) аб'яднаць свае намаганні для падрыхтоўкі калектыўных манаграфій і зборнікаў дакументаў аб знешнепалітычнай і дыпламатычнай дзейнасці СССР, УССР і БССР, а таксама іншых саюзных рэспублік.

## 1.5. Беларусь і ЮНРРА: з гісторыі пошукаў, знаходак і адкрыццяў[193]

**Пра ЮНРРА і яе ўклад у аднаўленне Беларусі.** ЮНРРА – гэта міжнародная арганізацыя, створаная ў Вашынгтоне 9 лістапада 1943 г. прадстаўнікамі 44 дзяржаў, у тым ліку СССР. Яе мэта заключалася ў неадкладным задавальненні самых неабходных пасляваенных патрэб краін, якія былі акупіраваны дзяржавамі фашысцкага блока, у харчаванні,

[193] Друкуецца паводле артыкулаў: *Снапкоўскі У. Е.* Маё «адкрыццё» ЮНРРА: аб стане даследаванняў тэматыкі ўзаемаадносін БССР з ЮНРРА ў Беларусі і замежжы // Белорусско-российские отношения на современном этапе: состояние и перспективы развития : материалы круглых столов / редкол.: В. Г. Шадурский (пред.) [и др.]. Минск, 2018. С. 49–52 ; *Яго ж.* Аб пагадненні паміж урадам Беларускай ССР і ЮНРРА ад 18 снежня 1945 года // Беларус. думка. 2018. № 12. С. 46–54.

адзенні, медыкаментах, сельскагаспадарчым і прамысловым абсталяванні. У жніўні 1945 г. у члены ЮНРРА былі прыняты БССР, УССР і Данія, сакавіку 1946 г. – Турцыя. Напрыканцы сваёй дзейнасці арганізацыя налічвала 48 дзяржаў-членаў. Асноўнымі атрымальнікамі дапамогі былі Кітай, Польшча, Чэхаславакія, Грэцыя, Італія, Югаславія, Украінская ССР і Беларуская ССР. Галоўнымі донарамі выступалі краіны, якія не былі акупіраваны ў гады вайны: ЗША, Канада, Вялікабрытанія, Аўстралія і інш.

Юрыдычнай падставай для аказання дапамогі па лініі ЮНРРА для Беларусі і Украіны стала першапачатковае сяброўства дзвюх рэспублік у ААН. 13 жніўня 1945 г. рашэннем Савета ЮНРРА яны былі прыняты ў склад арганізацыі. 20 жніўня старшыня СНК БССР П. Панамарэнка атрымаў тэлеграму з Вашынгтона, дзе паведамлялася аб гэтым рашэнні і ўраду БССР прапаноўвалася паслаць дэлегата ў якасці прадстаўніка БССР[194]. 18 снежня 1945 г. у Вашынгтоне былі падпісаны пагадненні паміж ЮНРРА з аднаго боку і ўрадамі БССР і УССР з другога. Праграма дапамогі савецкім рэспублікам была ў асноўным рэалізавана да сярэдзіны 1947 г. З пачаткам халоднай вайны ўрад ЗША палічыў галоўныя мэты ЮНРРА выкананымі, і арганізацыя спыніла сваё існаванне ў 1949 г.

За няпоўныя два гады актыўнай працы ў Беларусі ЮНРРА аказала беларускаму народу значную дапамогу ў пасляваенным аднаўленні. Памер прадстаўленай рэспубліцы дапамогі складаў 2,6 % ад агульнаеўрапейскага ўзроўню ў цэнавым вымярэнні і 0,9 % у вагавым (у тонах). Доля УССР у пастаўках ЮНРРА для Еўропы складала 7,9 % ад кошту і 1,5 % танажу. У БССР была пастаўлена тавараў на 60 820 000 дол. і 141 853 тон, а ва УССР – на 188 199 300 дол. і 467 049 тон адпаведна. У цэлым рэспубліка атрымала адносна невялікі аб’ём юнрраўскай дапамогі, аднак яна знаходзілася ў групе А, што значыла яе прыярытэтнае становішча сярод іншых краін-атрымальніц[195]. Аднак і таго, што было зроблена гэтай арганізацыяй, аказалася дастаткова, каб перажыць першыя цяжкія гады пасляваеннай разрухі і закласці падмурак для аднаўлення эканомікі. У той час партыйныя і дзяржаўныя дзеячы і дыпламаты СССР, БССР і УССР неаднаразова выказвалі падзяку ЮНРРА за дапамогу, якую атрымалі Беларусь і Украіна[196]. Пазней савецкія ўлады замоўчвалі юнрраўскую да-

[194] НАРБ. Ф. 462. Воп. 5. Спр. 1. Арк. 91 ; Освобождённая Беларусь : док. и материалы : в 2 кн. Кн. 2 : Январь – декабрь 1945 / сост.: В. И. Адамушко [и др.]. Минск, 2005. С. 305.

[195] *Ford R.* UNRRA in Europe 1945–1947. London, 1947. P. 38, 42, 62, 64. (Operational Analysis Papers ; N. 49).

[196] НАРБ. Ф. 907. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 394–395.

памогу і разглядалі гэтую арганізацыю як інструмент знешняй палітыкі ЗША. У незалежнай Беларусі дзейнасць ЮНРРА разглядаюць як важную і незабыўную старонку гуманітарнай салідарнасці з боку міжнароднай супольнасці, аб'яднанай у антыгітлераўскую кааліцыю, і шануюць памяць супрацоўнікаў місіі Адміністрацыі, якія самаахвярна дапамагалі рэспубліцы ў пераадоленні пасляваенных спусташэнняў.

**ЮНРРА ў савецкай гістарыяграфіі.** У савецкія часы ЮНРРА лічылася падазронай ці нелаяльнай да СССР міжнароднай арганізацыяй, дзе ЗША і іншыя заходнія дзяржавы праводзілі рэакцыйную палітыку, імкнучыся падпарадкаваць краіны, якія атрымлівалі дапамогу (дзве савецкія рэспублікі, блізкія да СССР, дзяржавы Усходняй Еўропы – Польшчу, Чэхаславакію, Югаславію, Албанію, іншыя еўрапейскія краіны), сваймy палітычнаму і эканамічнаму ўплыву. Такія ацэнкі змяшчаліся ў артыкуле пра ЮНРРА ў першым выданні савецкага «Дыпламатычнага слоўніка» (1948 г.) пад рэдакцыяй сумнавядомага пракурора і дыпламата А. Вышынскага[197]. У наступных выданнях слоўніка (1950–80-я гг.) пад рэдакцыяй міністра замежных спраў СССР А. Грамыкі гэтыя ацэнкі захаваліся з пэўнай доляй змягчэння[198].

У савецкай гістарыяграфіі ЮНРРА не была спецыяльным прадметам даследавання. Паколькі арганізацыя дзейнічала толькі на тэрыторыі Беларусі і Украіны, агульнасаюзныя навуковыя цэнтры ў Маскве яе не вывучалі, пакідаючы гэту рэспубліканскую тэму на «водкуп» украінскім і беларускім гісторыкам. Ва Украіне праблематыка міжнароднай і знешнепалітычнай дзейнасці УССР, як і іншых саюзных рэспублік, была найбольш распрацавана, а ўкраінскія гісторыкі і спецыялісты ў галіне міжнароднага права адрозніваліся больш смелымі навуковымі падыходамі і імкненнем да адкрыцця новых тэм. Адной з такіх тэм стала пытанне аб дзейнасці ЮНРРА ва Украіне, якое атрымала сваё адлюстраванне ў форме асобнага раздзела ў манаграфіі Л. Лешчанкі аб удзеле УССР у міжнародных адносінах у другой палове 1940-х гг.[199] Паколькі характар адносін ЮНРРА з суседняй БССР быў шмат у чым падобны, то аўтар закранаў і беларускія сюжэты. Пасля Л. Лешчанкі юнрраўская тэматыка пакрыху стала з'яўляцца на старонках абагульняючых прац украінскіх гісторыкаў. У БССР жа да самага канца савецкага перыяду гэта пытанне не знайшло

---

[197] *Вышинский А. Я.* ЮНРРА // Дипломатический словарь : в 2 т. / редкол.: А. Вышинский (гл. ред.) [и др.]. М., 1948–1950. Т. 2 : Л – Я. 1950. С. 975–976. Гл. узважаную ацэнку ў брашуры: *Воскресенский А.* Что такое ЮНРРА. Магадан, 1944.

[198] Дипломатический словарь : в 3 т. 4-е изд., перераб. и доп. / А. А. Громыко (гл. ред.). М., 1984–1986. Т. 1. 1985. С. 16.

[199] *Лещенко Л. О.* Україна на міжнародний арені (1945–1949 рр.). Київ, 1969.

свайго даследчыка, што адзначалася ў гістарыяграфічным аглядзе знешнепалітычнай дзейнасці БССР, зробленым аўтарам у 1989 г.[200]

Адной з новых тэм, якія стала магчымым распрацоўваць у пачатку 1990-х гг., з'явілася дзейнасць ЮНРРА ў Беларусі ў 1945–1947 гг. Дзякуючы працам украінскіх і заходніх аўтараў, а таксама фундаментальнаму трохтомніку пад рэдакцыяй Д. Вудбрайджа, дзе змяшчаецца асобны раздзел пра адносіны Адміністрацыі з дзвюма савецкімі рэспублікамі[201], стала вядома пра дзейнасць ЮНРРА ва Украіне і Беларусі, а потым і ўвогуле пра гісторыю гэтай арганізацыі. Акрамя таго, з'явілася магчымасць пабачыць мікрафільм паводле выдадзенай у 1947 г. працы супрацоўніцы гістарычнай секцыі ЮНРРА М. Рэдмер «Эканамічнае аднаўленне ў Беларусі», прысланы з Масквы ў Цэнтральную навуковую бібліятэку НАН Беларусі[202].

Пасля вывучэння літаратуры былі праведзены архіўныя даследаванні ў Партыйным архіве Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ. У фондзе ЦК КПБ былі прагледжаны матэрыялы бюро і сакратарыята ЦК і знойдзены некалькі пастаноў ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР па пытаннях супрацоўніцтва з ЮНРРА. Увогуле матэрыялаў па дадзенай тэме ў фондзе ЦК КПБ аказалася мала з прычыны як недастаткова глыбокай прапрацоўкі гэтага вялізнага фонду, так і таго, што працэс рассакрэчвання толькі пачынаўся. У Навуковым архіве Інстытута расійскай гісторыі РАН было прагледжана дасье савецкай і замежнай прэсы па пытаннях міжнародных адносін, у тым ліку ўзаемаадносін СССР з ЮНРРА, і выяўлена шмат выразак з газет, асабліва англійскіх і амерыканскіх, па адпаведнай тэме[203]. Толькі некаторыя з іх знайшлі адлюстраванне ў дысертацыі і пазнейшых публікацыях, што пакідае месца для далейшай працы. Пасля рассакрэчвання фонду Упраўлення ЮНРРА ў НАРБе з яго некалькімі вопісамі і 330 справамі ў даследчыкаў з'явілася выдатная магчымасць глыбокага і шырокага вывучэння дзейнасці ЮНРРА ў Беларусі, як і ў больш шырокім плане адносін СССР, УССР і БССР з гэтай арганізацыяй[204].

---

[200] *Снапковский В.* Мы много еще не знаем (гл. раздз. 1.1).

[201] UNRRA. The History of the United Nations Relief and Rehabilitation Administration / ed. by G. Woodbridge. New York, 1950. Vol. III. P. 255–262.

[202] *Redmer M.* Economic Rehabilitation in Byelorussia. London, 1947. 56 p. (Operational Analysis Papers ; N. 48).

[203] Навуковы архіў Інстытута расійскай гісторыі РАН (НАІРГ РАН). Ф. 2. Воп. (раздз.) 13. Спр. 424–431, 436, 440, 503, 505 і інш.

[204] Международные отношения, экономические и гуманитарные связи с зарубежными странами [Электронны рэсурс] // НАРБ. URL: http://www.narb.by/rus/archives/fond_list/otn/462 (дата звароту: 14.04.2018).

Дадзеная магчымасць можа палепшыцца пры атрыманні доступу да Архіва МЗС Рэспублікі Беларусь (матэрыялаў сакратарыята, кантрольна-распарадчай і справаздачнай дакументацыі).

Яшчэ большыя перспектывы для архіўных пошукаў і знаходак адкрываюцца ў сталіцах замежных дзяржаў і Архіве ААН у Нью-Ёрку. У Маскве матэрыялы ЮНРРА знаходзяцца ў ДАРФ (фонд Міністэрства знешняга гандлю СССР) і АЗПРФ (фонд Аддзела міжнародных эканамічных арганізацый[205]). У Кіеве яны размеркаваны паміж ГДАМЗСУ, Цэнтральным дзяржаўным архівам грамадскіх аб'яднанняў Украіны[206] і Цэнтральным дзяржаўным архівам вышэйшых органаў улады і кіравання Украіны. У Лондане асобныя справы па ўзаемаадносінах СССР і ЮНРРА знаходзяцца ў Нацыянальным архіве Вялікабрытаніі (фонд Форын офіса)[207], аналітычныя ж матэрыялы па дзейнасці ЮНРРА ў Беларусі і Украіне і іншыя афіцыйныя публікацыі – у бібліятэцы Лонданскай школы эканомікі і палітычных навук, паколькі Еўрапейскае рэгіянальнае бюро Адміністрацыі размяшчалася ў Лондане і яго матэрыялы пазней былі перададзены ў Архіў жаночай бібліятэкі (The Women's Library Archives) гэтай установы. З матэрыяламі шэрагу названых вышэй архіваў у Маскве, Кіеве і Лондане аўтар працаваў на месцы.

Самы вялікі масіў юнрраўскіх матэрыялаў знаходзіцца ў Архіве ААН у Нью-Ёрку. Вывучэнне вопісаў гэтага архіва праз інтэрнэт паказвае, што там змяшчаецца каля дзвюх соцень спраў па тэме «Беларусь – ЮНРРА», у прыватнасці фонды Беларускай місіі ЮНРРА, бюро[208] і штаб-кватэры Адміністрацыі, офіса гісторыкаў (Office of the historians)[209] і інш. У Бібліятэцы Калумбійскага ўніверсітэта (Butler Library) знаходзіцца рукапісны фонд першага кіраўніка місіі ЮНРРА ў Мінску Р. Скандрэта[210].

---

[205] АЗПРФ. Ф. 047. Воп. 2. П. 5. Спр. 331.

[206] ЦДАГАУ. Ф. 1. Воп. 23. Спр. 3593–3595, 3598.

[207] The National Archives of the Great Britain. Foreign Office 371/58068; 371/51313; 371/51318.

[208] Summary of AG-018-005 Bureau of Administration [Электронны рэсурс] // United Nations – Archives and Records Management Section. URL: https://archives.un.org/sites/archives.un.org/files/files/Finding%20Aids/2015_Finding_Aids/AG-018-005.pdf (дата звароту: 12.02.2018).

[209] Summary of AG-018-040 Office of the Historians [Электронны рэсурс] // United Nations – Archives and Records Management Section. URL: https://archives.un.org/sites/archives.un.org/files/files/Finding%20Aids/2015_Finding_Aids/AG-018-040.pdf (дата звароту: 12.02.2018).

[210] Richard Brown Scandrett papers, 1944–1954 [Электронны рэсурс] // Columbia University Library. URL: https://clio.columbia.edu/catalog/4078523?counter=1 (дата звароту: 12.02.2018).

Пачатак навуковага вывучэння ў беларускай гістарыяграфіі юнрраўскай тэматыкі адносіцца да першай паловы 1990-х гг. і звязаны з нашымі першымі публікацыямі[211]. Пазней у манаграфіі аб знешнепалітычнай дзейнасці БССР у 1944—1953 гг. асобны раздзел быў прысвечаны дзейнасці ЮНРРА ў Беларусі[212]. У пачатку 2000-х гг. артыкулы пра ЮНРРА з'явіліся ў беларускіх энцыклапедыях[213]. У падручніках па гісторыі знешняй палітыкі Беларусі гэта пытанне таксама прадстаўлена як важная частка міжнароднай дапамогі нашай рэспубліцы ў пасляваенныя гады[214]. Асобныя артыкулы па юнраўскай ці блізкай да яе тэматыцы апублікаваныя Г. П. Бушчык, В. А. Вялікай, І. А. Марцынкевіч, Ю. В. Кірчук, дзе разглядаюцца ажыццяўленне харчовай праграмы ЮНРРА, яе дапамога ў справе сацыяльнага забеспячэння інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны[215].

---

[211] *Снапкоўскі У. Е.* Беларусь і ЮНРРА: забытая помач: Аб адной малавядомай старонцы пасляваеннай гісторыі Беларусі // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь : тэзісы дакл. і паведамл. Усебеларус. канф. гісторыкаў / Мінск, 3—5 лют. 1993 г. : у 4 ч. Мінск, 1993. Ч. 1. С. 203—205 ; *Яго ж.* Аб дапамозе ЮНРРА Беларусі (1945—1947) // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь (новыя канцэпцыі і падыходы) : Усебеларус. канф. гісторыкаў : у 2 ч. Ч. 1 : Гісторыя Беларусі. Мінск, 1994. С. 214—219 ; *Яго ж.* На весах справедливости. Деятельность ЮНРРА в Беларуси. 1945—1947 гг. // Нёман. 1993. № 6. С. 159—167.

[212] *Снапкоўскі У. Е.* Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі ... С. 59—75.

[213] *Снапкоўскі У.* ЮНРРА (Адміністрацыя Аб'яднаных Нацый па справах дапамогі і аднаўлення, 1943—1947) // Энцыкл. гісторыі Беларусі : у 6 т. Мінск, 1993—2003. Т. 6 : у 2 кн., кн. 2 : Усвея – Яшын; Дадатак. 2003. С. 694 ; *Яго ж.* ЮНРРА // Республика Беларусь : энциклопедия : в 7 т. Минск, 2005—2008. Т. 7. 2008. С. 694.

[214] *Снапкоўскі У. Е.* Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі. Ч. 2. С. 163—167 ; *Яго ж.* История внешней политики Беларуси. С. 336—339.

[215] *Бушчык Г. П.* Міжнародныя пагадненні аб рэпарацыях і іх паступленне ў БССР у 1945—1946 гг. // Беларус. гіст. часоп. 2005. № 6 ; *Вялікая В. А.* Ажыццяўленне харчовай праграмы ЮНРРА ў Беларусі (1945—1947 гг.) // Вес. БДПУ. Сер. 2. Гісторыя, філасофія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, культуралогія. 2007. № 3. С. 35—37 ; *Кірчук Ю. В.* Дзейнасць Місіі ААН – ЮНРРА ў гады пасляваеннага аднаўлення гаспадаркі Беларусі // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. Мінск, 2012. Вып. 7. С. 78—85 ; *Марцынкевіч І. А.* Месца ЮНРРА ў справе сацыяльнага забеспячэння інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны // Достижения фундаментальной, клинической медицины и фармации : материалы 71-й науч. сессии сотрудников ун-та, 27–28 янв. 2016 г. Витебск, 2016. С. 393—395.

Архіўныя і іншыя матэрыялы аб дзейнасці ЮНРРА ў рэспубліцы ўключаны ў зборнікі дакументаў, апублікаваныя ў Беларусі ў пачатку XXI ст.[216] І калі ў выданні «Освобождённая Беларусь» такіх дакументаў налічвалася толькі тры, то ў зборніку «Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.)» змешчаны 23 дакументы аб дзейнасці ЮНРРА ў Беларусі ў 1945–1947 гг. з архіваў Беларусі, Вялікабрытаніі і Расіі і апублікаваных зборнікаў дакументаў знешняй палітыкі Вялікабрытаніі, ЗША і СССР.

Дзейнасць ЮНРРА і яе адносіны з Савецкім Саюзам атрымалі пэўнае адлюстраванне ў беларускай навуковай, вучэбнай і энцыклапедычнай літаратуры. У апошнія гады ўзрасла цікавасць дыпламатычных колаў да гэтай тэмы, аб чым сведчыць прысваенне імя Рут Уолер (супрацоўніцы місіі ЮНРРА, якая памерла ў Мінску, ратуючы на возеры мясцовых хлопцаў) сярэдняй школе № 130 г. Мінска і адкрыццё памятнай дошкі аб дапамозе ААН у аднаўленні пасляваеннай Беларусі ў Лошыцкім сядзібным доме, дзе размяшчалася місія ЮНРРА[217]. У 2007 г. Прадстаўніцтва ААН у Рэспубліцы Беларусь сумесна з Пасольствам ЗША арганізавала выставу «Місія ААН-ЮНРРА ў Беларусі 1946–1947 гг.» і прагляд дакументальнага фільма «Забытая місія».

**Аб заключэнні пагадненняў БССР і УССР з ЮНРРА.** Адной з маловядомых старонак савецкай дыпламатыі, якая змагалася за інтарэсы саюзных рэспублік, з'яўляецца пытанне аб заключэнні пагадненняў з ЮНРРА. Пры яго даследаванні намі былі знойдзены і апублікаваны цікавыя дакументы і матэрыялы, што пралiваюць святло на пачаткі дыпламатычнай дзейнасці беларускіх прадстаўнікоў у ЗША, іх стыль і метады вядзення перагавораў, нарэшце іх уяўленні аб ідэнтычнасці і беларускай мове. Перагаворы дэлегацый СССР, УССР і БССР з прадстаўнікамі Адміністрацыі ЮНРРА аб заключэнні рамачных пагадненняў дзвюх рэспублік з ЮНРРА пачаліся пасля іх прыняцця ў арганізацыю (жнівень 1945 г.). Яны ішлі цяжка і марудна, найбольшыя разыходжанні выклікала пытанне аб колькасным складзе і паўнамоцтвах місій. ЮНРРА настойвала на дастаткова вялікім колькасным складзе місій, каб яны маглі эфектыўна назіраць і кантраляваць размеркаванне дапамогі. Таксама Адміністрацыя была супраць узгаднення з урадамі рэспублік кандыдатур на пасады кіраўнікоў місій. БССР і УССР, кіруючыся інструкцыямі з Масквы,

[216] Освобождённая Беларусь : в 2 кн. Кн. 2 ; Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў ... Т. 4.

[217] Памятная доска ЮНРРА открыта в Минске 20 октября 2015 г. [Электронны рэсурс]. URL: http://un.by/novosti-oon/v-belarusi/218-ru-8bbfd78c0bd63 (дата звароту: 22.09.2017).

упарта настойвалі на мінімальным складзе місій (ад 5 да 10 супрацоўнікаў) і на немагчымасці кантролю з боку місій за размеркаваннем дапамогі, зводзячы іх паўнамоцтвы да намінальным маніторынгу абстаноўкі ў рэспубліках. Урады рэспублік не хацелі прымаць на сябе абавязкаў, якія б давалі магчымасць супрацоўнікам місій свабодна перасоўвацца па іх тэрыторыі[218]. Але пасля ўльтыматуму ад генеральнага дырэктара Г. Лімана яны былі вымушаны саступіць і прыняць вылучаныя ўмовы, дабіўшыся некаторых паслабленняў[219].

Пагадненні паміж ЮНРРА і ўрадамі БССР і УССР былі падпісаны ў Вашынгтоне 18 снежня 1945 г. У пагадненні адлюстраваны асноўныя кірункі дзейнасці ЮНРРА ў БССР, колькасны склад і паўнамоцтвы місій і шэраг іншых пытанняў. Яно складалася з прэамбулы, дзевяці артыкулаў і тлумачальных лістоў. Дакумент прадугледжваў выкананне заяўкі БССР на пастаўкі тавараў і паслуг на суму ў 61 млн дол. да 30 чэрвеня 1946 г. Ратыфікацыя пагаднення не прадугледжвалася, яно ўступала ў сілу з моманта падпісання. З боку Беларусі пагадненне падпісаў член ЮНРРА ад БССР Л. І. Камінскі, з боку ЮНРРА – яе генеральны дырэктар Г. Ліман. Пагадненні зафіксавалі даволі выразныя абавязацельствы з боку савецкіх рэспублік наконт свабоды назірання за размеркаваннем паставак на ўсіх неабходных стадыях. Больш за тое, прадстаўнік УССР А. М. Бараноўскі на сустрэчы з Г. Ліманам 28 лістапада заявіў ад імя ўрадаў абедзвюх рэспублік, што персанал місій будзе мець поўную свабоду перамяшчэння[220].

Тэкст пагаднення паміж урадам БССР і ЮНРРА ў Беларусі ўпершыню быў апублікаваны ў 2015 г. у чацвёртым томе дакументальнага выдання «Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.)»[221]. У ім змешчаны рускамоўны пераклад тэксту пагаднення (яго завераная копія), які знаходзіцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь[222]. У гэтай жа справе змяшчаецца арыгінал тэксту пагаднення на англійскай мове з подпісамі Лімана і Камінскага і пячаткай ЮНРРА[223]. Англамоўны тэкст пагаднення паміж урадам Украінскай ССР і ЮНРРА быў

---

[218] *Harder A.* The Politics of Impartiality: The United Nations Relief and Rehabilitation Administration in the Soviet Union, 1946–1947 // J. of Contemporary History. 2012. № 47 (2). P. 350–351.

[219] UNRRA. The History of the United Nations Relief and Rehabilitation Administration / comp. by G. Woodbridge. New York, 1950. Vol. II. P. 235.

[220] Ibid. P. 236.

[221] Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў ... Т. 4. С. 136–141.

[222] НАРБ. Ф. 462. Воп. 7. Спр. 12. Арк. 34–44.

[223] Там жа. Арк. 45–57.

апублікаваны ў 1950 г. у афіцыйнай гісторыі ЮНРРА[224], дзе ўказана, што пагадненне з урадам Беларускай ССР мае аналагічны тэкст. У апошнім, IX, артыкуле дакумента адзначаецца: «Настоящее Соглашение составлено в пяти экземплярах, из которых три на английском языке и два на белорусском языке. Оба, как английский, так и белорусский, текста являются аутентичными для договаривающихся сторон»[225].

У 2018 г. Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь атрымала з Архіва ААН у Нью-Ёрку копію арыгінальнага беларускамоўнага тэксту «Згоды паміж Урадам Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай і Адміністрацыяй Дапамогі і Вастанаўлення Аб'яднаных Нацый (ЮНРРА)». У сувязі з гэтым МЗС звярнулася да спецыялістаў з просьбай выказаць меркаванні, дзе можа знаходзіцца беларускамоўны варыянт пагаднення і якія перспектывы яго вяртання ў Беларусь. Аўтар, абапіраючыся на ўласныя крыніцы і дадатковыя даследаванні, у сваім лісце ў адказ прапанаваў шукаць тэкст дакумента ў Архіве ААН у Нью-Ёрку, адкуль была атрымана копія арыгінальнага беларускамоўнага тэксту і дзе намі была выяўлена справа з англійскім і беларускім тэкстамі пагаднення[226], што дазваляе атрымаць копію (альтэрнат) беларускамоўнага тэксту. Такім чынам, пытанне аб знаходжанні беларускамоўнага варыянта пагаднення вырашана, і застаецца зрабіць пэўныя захады для атрымання яго альтэрнату.

**Аб тэксце пагаднення і яго гістарычным значэнні**. У назве тэксту пагаднення на беларускай мове недакладна перададзены статус (назва) гэтага міжнародна-прававога акта: правільна не «згода», а «пагадненне» (англ. Agreement). Рускамоўны пераклад тэксту дакумента неаднаразова выкарыстоўвае тэрмін «Соглашение». Слова «згода» на рускую мову перакладаецца як «согласие». Памылкова дадзена назва ЮНРРА: замест «вастанаўлення» трэба ўсё ж такі «аднаўлення».

У аўтара ёсць свая версія таго, чаму ў назве і адпаведна ў тэксце гэтага акта з'явіліся памылкі і чаму ён падрыхтаваны ў рукапісным, а не ў машынапісным варыянце. Рукапісны тэкст азначае, што ў беларускай

---

224 UNRRA. The History of the United Nations Relief and Rehabilitation Administration. Vol. III. P. 255–262.

225 Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў ... Т. 4. С. 141.

226 Summary of AG-018-015 Byelorussian Mission [Электронны рэсурс] // United Nations – Archives and Records Management Section. URL: https://archives.un.org/sites/archives.un.org/files/files/Finding%20Aids/2015_Finding_Aids/AG-018-015.pdf (дата звароту: 22.09.2017) ; Summary of AG-018-012 Washington D.C. Headquarters [Электронны рэсурс]. URL: https://archives.un.org/sites/archives.un.org/files/files/Finding%20Aids/2015_Finding_Aids/AG-018-012.pdf (дата звароту: 22.09.2017).

дэлегацыі не было пішучай машынкі з беларускім шрыфтам, а чакаць надрукаванага тэксту з Мінска не было часу, улічваючы напружаны і тэрміновы характар перагавораў. Фактарам часу і, магчыма, недастатковым веданнем беларускай мовы можна тлумачыць і памылку, і недакладнасць у назве пагаднення. Да таго ж, невядома, хто перакладаў тэкст (верагодна, з рускай мовы) і хто яго пісаў. Можна меркаваць, што ў беларускай і ўкраінскай дэлегацый быў рускамоўны праект пагаднення, якое яны, несумненна, узгаднялі з дэлегацыяй СССР, і гэты праект быў падрыхтаваны да падпісання. На заключнай стадыі дэлегацыя ЮНРРА, верагодна, запатрабавала, каб тэксты дакументаў былі падрыхтаваны не толькі на англійскай, але і на мовах тытульных нацый УССР і БССР – украінскай і беларускай (хоць, як вядома, у канстытуцыях гэтых рэспублік нічога не гаварылася пра мову зносін на іх тэрыторыі), што і выклікала паспешлівасць беларускай дэлегацыі. Узнікае пытанне, у якой форме (друкаванай ці рукапіснай) быў падпісаны ўкраінскі тэкст пагаднення. Адказ можна знайсці ў зборніку міжнародных дагавораў і пагадненняў, складзеных з удзелам УССР ці да якіх яна далучылася (выданне 1959 г.). У ім тэкст пагаднення паміж урадам УССР і ЮНРРА апублікаваны на ўкраінскай мове[227]. Дарэчы, гэта была першая публікацыя пагаднення ЮНРРА з савецкімі рэспублікамі на тэрыторыі СССР.

Пагадненне было чацвёртым па ліку міжнародным актам, падпісаным БССР пасля аднаўлення знешнепалітычных паўнамоцтваў у лютым 1944 г. Трыма папярэднімі з'яўляліся пагадненне аб рэпатрыяцыі насельніцтва з Польскім камітэтам нацыянальнага вызвалення, дадатковы пратакол да яго і Статут ААН. Несумненна, найважнейшым з іх быў Статут ААН, дзякуючы чаму рэспубліка ўвайшла ў склад дзяржаў – заснавальніц сусветнай міжнароднай арганізацыі. Аднак гістарычнае значэнне гэтай падзеі праявілася пазней, праз гады і дзесяцігоддзі. Падпісанне ж пагаднення з ЮНРРА адразу прынесла адчувальныя вынікі для беларускага народа, паколькі дазволіла аблегчыць цяжар першых пасляваенных гадоў і паскорыць аднаўленне гаспадаркі. Вашынгтонскае пагадненне адрознівалася ад іншых міжнародных актаў (дагавораў, пагадненняў, канвенцыі), заключаных БССР, тым, што яно было падпісана з боку БССР на беларускай, а не на рускай мове, як гэта звычайна рабілася і да яго, і пасля яго на працягу 46 гадоў аж да распаду СССР. І хоць гісторыкі яшчэ не ўстанавілі прычыны таго, чаму канчатковы тэкст пагаднення

[227] Українська РСР у міжнародних відносінах. Міжнародні договори, конвенції, угоди та інші документи, які складзені за участю Української РСР або до яких вона приеднался (1945–1957). Київ, 1959. С. 245–250.

напісаны на беларускай мове і ад рукі, сам факт яго падпісання на мове тытульнай нацыі дзяржавы, ад імя якой ён заключаўся, значыў многае. Міжнародная супольнасць нацый-дзяржаў ці Аб'яднаных Нацый пасля ўключэння дзвюх савецкіх рэспублік у першапачатковыя дзяржавы – удзельніцы ААН зноў засведчыла сваю павагу да нацыянальных праў беларусаў і ўкраінцаў, прызнаўшы іх нацыянальную ідэнтычнасць і асобны статус у складзе шматэтнічнай федэратыўнай дзяржавы Савецкага Саюза.

Тое, што тэкст пагаднення быў падпісаны не на рускай мове (несумненна, рускамоўны варыянт разам з англамоўным быў прадметам перагавораў), можна разглядаць як пэўны закід з боку кіруючых англасаксонскіх колаў ЮНРРА ў адрас агульнасаюзнай дэлегацыі, накіраваны на ўмацаванне самастойнасці толькі што створаных наркаматаў замежных спраў УССР і БССР. З другога боку, саюзная дыпламатыя прадэманстравала гатоўнасць да саступак у далікатным нацыянальным пытанні, дазволіўшы падпісанне пагадненняў аб дапамозе на родных для ўкраінцаў і беларусаў мовах. Тагачасная міжнародная і ўнутрысаюзная атмасфера пераможнага заканчэння вайны і прызнання важнага ўкладу народаў савецкіх рэспублік у барацьбу з ворагам разам са стварэннем наркаматаў замежных спраў саюзных рэспублік і ўваходжаннем «дзвюх асноўных савецкіх рэспублік» (тэрмін І. Сталіна) у склад ААН падштурхоўвалі кіраўнікоў Украіны і Беларусі да большай самастойнасці ў знешнепалітычных справах. Наркамы замежных спраў УССР і БССР Д. Мануільскі і К. Кісялёў адпаведна на прэсканферэнцыях у Сан-Францыска ў маі 1945 г. з аптымізмам казалі пра хуткае ўстанаўленне дыпламатычных адносін сваіх рэспублік з ЗША, Вялікабрытаніяй і іншымі вядучымі дзяржавамі Захаду[228], а ў 1944 г. старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Н. Наталевіч ужыў у сваім дакладзе нечуваны раней у лексіконе беларускай партыйнай наменклатуры тэрмін «знешняя палітыка БССР»[229]. К. Кісялёў у Сан-Францыска адзначаў, што Беларуская рэспубліка з'яўляецца «абсалютна самастойнай у знешніх зносінах»[230].

[228] Правда. 1945. 24 мая. Заявление тов. Д. З. Мануильского на пресс-конференции в Сан-Франциско ; *Снапкоўскі У. Е.* Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі ... С. 18–21.

[229] Шостая сесія Вярхоўнага Савета БССР. 21–24 сакавіка 1944 г. Стэнаграфічная справаздача. Мінск, 1946. С. 217–218.

[230] Знешняя палітыка Беларусі. Т. 4 : (чэрвень 1941 – жнівень 1945 г.) / склад.: Н. М. Дзятчык [і інш.]. Мінск, 2001. С. 276.

Смеласць беларускіх і ўкраінскіх дыпламатаў у пытанні знешнепалітычных паўнамоцтваў рэспублік потым праявілася і ў моўным пытанні. У першым выступленні беларускай дэлегацыі на Сан-Францыскай канферэнцыі, якое зрабіў акадэмік-гісторык У. М. Перцаў, было выказана жаданне агучыць яго на беларускай мове, але з-за адсутнасці перакладчыка, які б мог перакласці прамову на англійскую і французскую мовы, яму, як было сказана, «даводзіцца выступаць на рускай мове»[231]. Пачатак сваёй першай прэс-канферэнцыі ў Сан-Францыска К. Кісялёў зрабіў па-беларуску, а потым выступіў з заявай і адказаў на пытанні па-руску, якія перакладаліся на англійскую мову[232]. Шэраг членаў украінскай дэлегацыі (напр., П. С. Пагрэбняк) выступалі на канферэнцыі паўкраінску, што пацвярджаюць архіўныя дакументы[233]. Такім чынам, можна меркаваць, што беларускія і асабліва ўкраінскія дыпламаты былі пэўным чынам падрыхтаваныя да таго, каб у снежні 1945 г. у Вашынгтоне распрацаваць тэксты пагадненняў з ЮНРРА на мовах тых рэспублік, якія яны прадстаўлялі.

Прэзентуючы ўпершыню тэкст пагаднення ўрада Беларускай ССР з ЮНРРА на беларускай мове, мы аддаём даніну памяці і глыбокай павагі членам беларускай дэлегацыі, што вялі перагаворы, перш за ўсё прадстаўніку БССР Л. І. Камінскаму[234], які падпісаў гэты дакумент, і І. М. Цімчуку, а таксама ўсім, хто меў непасрэднае дачыненне да перагавораў, напісання і перакладу тэксту пагаднення па-беларуску. Пасля больш чым 70 гадоў гэты дакумент вяртаецца да нас з небыцця, каб натхніць дыпламатаў, дзяржаўных служачых, усіх грамадзян незалежнай Рэспублікі Беларусь на новыя здзяйсненні ў імя ўмацавання нацыянальнай ідэнтычнасці беларускага народа на міжнароднай арэне.

Адкрыццё ЮНРРА пачалося з прачытання ў спецхранах Масквы кніг па навейшай гісторыі Украіны на англійскай мове, дзе аўтар даведаўся пра дапамогу гэтай арганізацыі УССР і БССР. Далей па спасылках у гэтых кнігах адбыўся выхад на трохтомную гісторыю ЮНРРА пад рэдакцыяй Д. Вудбрайджа, дзе даволі падрабязна выкладзена праца арганізацыі ў дзвюх савецкіх рэспубліках і змешчаны тэкст пагаднення Адміністрацыі з урадамі рэспублік. Потым ішло паглыбленне ў тэматыку і назапашванне канкрэтна-гістарычнага матэрыялу і нарэшце яго апрацоўка і напісанне тэксту. Наступны этап – апрабацыя вынікаў даследавання, публікацыя артыкулаў, выступленні на канферэнцыях. Да гэтай

[231] НАРБ. Ф. 907. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 17.
[232] Там жа. Ф. 907. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 17 ; Знешняя палітыка Беларусі. Т. 4. С. 278.
[233] ГДАМЗСУ. Ф. 10. Воп. 19. Спр. 7. Арк. 133.
[234] Л. І. Камінскі ў канцы 1940-х гг. стаў ахвярай сталінскіх рэпрэсій.

тэматыкі аўтар неаднаразова вяртаўся пазней, працуючы ў беларускіх і замежных архівах, назапашваючы новыя матэрыялы і друкуючы іх у артыкулах і зборніках дакументаў. На нашым вопыце можна заўважыць, што беларускія гісторыкі спазніліся з вывучэннем ЮНРРА ў параўнанні з украінскімі: кніга Л. Лешчанкі апублікавана ў 1969 г., а першыя публікацыі аўтара выйшлі ў 1993–1994 гг. Аднак потым назіраецца ўзрастанне навуковай і грамадскай цікавасці ў Беларусі да гэтай тэмы, ЮНРРА прызнаецца беларускімі ўладамі як важная міжнародная арганізацыя дапамогі, якая садзейнічала эканамічнаму аднаўленню рэспублікі ў цяжкія пасляваенныя гады. Гэта адкрывае добрыя перспектывы далейшых даследаванняў тэмы «Беларусь – ЮНРРА» на аснове НАРБ і замежных архіваў.

Глава

2

# ГІСТАРЫЧНАЯ ПАЛІТЫКА І БЕЛАРУСКІЯ ГІСТОРЫКІ

## 2.1. Гісторыкі і ўлада: беларуская гістарыяграфія XIX–XX стст. вачыма нямецкага даследчыка[235]

У 1999 г. нямецкі даследчык, навуковы супрацоўнік Універсітэта Канстанцы Райнэр Лінднэр выдаў у Мюнхене фундаментальную працу пад назвай «Гісторык і ўлада: Фарміраванне нацыі і гістарычная палітыка ў Беларусі ў XIX і XX стст.». Назву кнігі можна перадаць яшчэ больш дакладна: «Гісторык і панаванне» ці «Гісторык пад прыгнётам улады», бо нямецкае слова «Herrschaft» азначае перш за ўсё панаванне, прыгнёт і ўціск. Назва кнігі вельмі дакладна адлюстроўвае становішча беларускага гісторыка і яго адносіны з уладай у познія царскія часы, савецкі перыяд і, на жаль, у незалежнай Беларусі.

---

[235] Друкуецца паводле выдання: *Снапкоўскі У. Е.* Беларускі гісторык пад прыгнётам улады: беларуская гістарыяграфія XIX–XX ст. вачыма нямецкага даследчыка // Беларус. гіст. агляд. 2000. Т. 7. Сш. 1 (12). С. 214–227. Рэц. на кн.: Lindner R. Historiker und Herrschaft: Nationsbildung und Geschichtspolitik in Weissrussland im 19. und 20. Jahrhundert. Munchen : R. Oldenburg Verlag, 1999. 536 s. Пазней праца выйшла на беларускай мове: *Ліндnэр Р.* Гісторыкі і ўлада: нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі ў XIX–XX ст. / пер. з ням. Л. Баршчэўскага ; навук. рэд. Г. Сагановіча. СПб., 2003. 540 с.

Праца прысвечана ўзаемаадносінам паміж гістарычнай навукай, гістарычнай культурай і палітычным панаваннем у Беларусі ў перыяд з канца XIX ст. да 1997 г. На прыкладзе Беларусі як нярускай перыферыі царскага самадзяржаўя, СССР і постсавецкай прасторы даследуецца гісторыя адносін паміж фарміраваннем беларускай нацыі, гістарычнай самасвядомасцю насельніцтва і ўладай. Кніга выканана ў шырокім кантэксце палітычнай і духоўнай гісторыі Беларусі, асабліва пасляваенных дзесяцігоддзяў.

Прадметам даследавання ў вузкім сэнсе, як вызначае яго сам аўтар у прадмове, з'яўляецца фарміраванне гістарычнай навукі ў правінцыі, яе інстытуцыянальнае і персанальнае афармленне і развіццё, узаемаадносіны паміж нацыянальнай і інтэгральнай гістарычнай карцінай (маюцца на ўвазе ўзаемаадносіны паміж даследаваннямі па гісторыі Беларусі і ўсеагульнай гісторыі), а таксама ўплыў на гістарыяграфію палітычных актараў. Гэтая кніга – скарочаны і дапрацаваны варыянт доктарскай дысертацыі, абароненай Р. Ліндproperам у 1997 г. на гістарычным факультэце Універсітэта Цюбінгена. Праца пабудавана на багатай крынічнай базе. У ёй шырока выкарыстаны апублікаваныя тэксты гісторыкаў і публіцыстаў, друкаваныя і недрукаваныя дакументы, падручнікі, успаміны, мастацкая літаратура, перыёдыка. Аналізуюцца помнікі архітэктуры, музеі і іншыя сродкі фарміравання гістарычнай культуры і свядомасці. Што датычыцца архіўных крыніц, то, як адзначае аўтар, ён быў першым заходнім даследчыкам, які атрымаў доступ да асобных фондаў былога партархіва, а цяпер Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Выкарыстаны матэрыял бібліятэк Германіі і ЗША, у тым ліку багатыя кніжныя калекцыі Калумбійскага і Гарвардскага ўніверсітэтаў. Яшчэ адным важным момантам афармлення працы з'яўляецца беларускамоўная транскрыпцыя назваў і імёнаў. Р. Ліндэр, як і іншыя сучасныя заходнія даследчыкі-беларусазнаўцы, адмовіўся ад рускамоўнай транскрыпцыі і перайшоў на беларускамоўную транслітэрацыю.

Характарызуючы стан распрацоўкі ўзятай тэмы, аўтар канстатуе, што ні беларускія, ні заходнія даследчыкі пакуль што не вывучалі праблему ўзаемаадносін палітыкі і гістарычнай навукі ў Беларусі. Гэтыя ўзаемаадносіны, як і ўся гісторыя гістарычнай навукі Беларусі, вызначаліся палітычнымі ўмовамі, якія самым непасрэдным чынам уплывалі на гістарычныя даследаванні. На яго думку, усе без выключэння гістарыяграфічныя даследаванні мелі дакладны адбітак палітычных перакананняў іх аўтараў ці палітычнага ўціску знешніх фактараў. Гэта бачна, пачынаючы з У. Пічэты і заканчваючы гістарыёграфамі 1990-х гг. Праўда, гістарыяграфічныя даследаванні паміж 1985 і 1997 гг.

адлюстроўваюць «вельмі асцярожнае дыстанцыраванне ад палітычнага ціску прыстасавання» (с. 11–12).

Паводле аўтара, гістарыяграфія гісторыі Беларусі 1990–2000 гг. пераважна вызначаецца «нацыянальнай гістарыяграфічнай канцэпцыяй» (с. 12–13). Дарэчы, выказванні найбольш яркіх прадстаўнікоў адпаведнай канцэпцыі – М. Біча, М. Касцюка і інш. – выкарыстоўваюцца як эпіграфы да асобных раздзелаў кнігі. Характарызуючы сучаснае становішча на «гістарыяграфічным фронце» краіны, аўтар адзначае, што нацыянальная гістарыяграфія застаецца пад дамінуючым уплывам палітычнай рэальнасці і канфрантуе з афіцыйнай гістарыяграфіяй улады.

Праца складаецца з чатырох частак, у якіх разглядаецца ўплыў нацыянальных гістарычных ведаў і дзяржаўнай палітыкі адносна гістарычнай навукі на «незавершаны працэс фарміравання беларускай нацыі». Чатыры перыяды даследавання падзяляюцца наступным чынам: 1) позні царскія часы (канец XIX ст. – 1917 г.); 2) раннія савецкія часы (1921–1944 гг.); 3) перыяд паміж Другой сусветнай вайной і адлігай (1944–1954 гг.); 4) позні савецкія і постсавецкія часы (1955–1997 гг.). Аўтар падкрэслівае, што гэтыя перыяды даследавання ніяк не звязаны з перыядызацыяй беларускай гістарыяграфіі. Гаворка ідзе аб вылучэнні неўралгічных пунктаў у адносінах паміж гістарычнай навукай і палітыкай адносна гэтай навукі.

Аўтар уводзіць у навуковы абарот тэрмін «палітыка адносна гістарычнай навукі», па-нямецку – «Geschichtspolitik» («гістарычная палітыка»). Гэтаму паняццю даецца наступнае абгрунтаванне. Расколатая гістарычная карціна беларускай гістарыяграфіі стварылася як размежаванне розных гістарычных канцэпцый. Гісторыя як функцыя палітычных ці нацыянальных фактараў не даследавалася, а канструявалася і дэканструявалася, з’яўляючыся прадметам палітычнага гандлю ці проста ўсталёўвалася зверху. Гэты «гандаль» у галіне гістарычнай навукі з боку індывідуальных і калектыўных айчынных і замежных аўтараў можна назіраць на прыкладзе Беларусі ва ўсёй Усходняй Еўропе на пераломе XX і XXI стст. Такая з’ява характарызуецца ў працы як «гістарычная палітыка» (с. 17).

Праблемна-аналітычная частка працы канцэнтруецца на галоўных тэмах беларускай гістарыяграфіі: этнагенэз беларусаў; гісторыя Полацкага княства; гісторыя ВКЛ; XIX ст. з яго «ключавой датай» 1863 г.; гісторыя БССР у «Вялікай Айчыннай вайне» з моцным эмацыянальным акцэнтам на партызанскім руху. Праведзены аўтарам аналіз схіляе яго да высновы, што нацыянальная гістарычная карціна будуецца толькі на выбарцы пэўных эпох ці матываў з агульнай гісторыі нацыі. Аналізуецца польская,

расійская, украінская і заходнееўрапейская (перш за ўсё нямецкамоўная) гістарыяграфія і беларусазнаўства.

У першай частцы, прысвечанай познім царскім часам, разглядаюцца паралельныя працэсы фарміравання нацыі і гістарычнай навукі ў Беларусі. Паказваецца, як прафісійныя гісторыкі, што працавалі ў «Паўночна-Заходнім краі» і за яго межамі, распрацоўвалі гістарычныя канцэпцыі і падыходы, якія знаходзіліся паміж вялікапольскай, вялікарускай і нацыянальнай, беларускай арыентацыяй. Аналіз гістарычых тэкстаў дазваляе аўтару правесці пэўныя паралелі з гістарыяграфіяй кайзераўскай Германіі.

Даследчык вылучае такі вельмі характэрны для гісторыкаў ускраін царскай Расіі феномен, як рамантызаваная «гістарычная фантазія», ці «сіла ўяўлення», якая вынікала з глыбіні нацыянальнай эмацыянальнасці. Гэтым феноменам тлумачыцца тое, што для пераважнай часткі данавукова-публіцыстычнай гістарыяграфіі на беларускай тэрыторыі канца XIX – пачатку XX ст. быў уласцівы нават яшчэ больш моцны, чым для Заходняй Еўропы, паралелізм і падзел на пазітывісцка-дакументальную гістарыяграфію і нацыянальна-рамантызаванае гістарычнае апісанне. Кіруючыся маралізатарскімі, эстэтычнымі і метагістарычнымі катэгорыямі, узнікла мастацка-літаратурнае разуменне гістарычнага працэсу, якое перадавалася сродкамі публіцыстыкі.

У цэнтры другой часткі – беларуская нацыянальная гістарыяграфія ў сталінскія часы паміж 1921 і 1944 гг. Ставіцца пытанне, наколькі глыбока размежаваліся паміж сабой нацыянальная гістарыяграфія, што працягвала існаваць з дасавецкіх часоў, і савецкая гістарыяграфія, якая нараджалася. Паказваюцца два шляхі рэкрутавання прафесійных гісторыкаў: праз традыцыйна неадукаваныя слаі, калі сялянскія сыны без гімназічнай ці вышэйшай адукацыі прэтэндавалі на пасаду дырэктара Інстытута гісторыі ў гуманітарных навуках Беларусі, і праз адносіны ў галіне гістарычнай навукі паміж саюзным цэнтрам і рэспубліканскай правінцыяй. Адзначаецца, што беларуская партыйная наменклатура ўсталявала ў 1920-я гг. у галіне гістарычнай навукі непараўнальна больш жорскую сістэму цэнзуры і пераследу, чым гэтага жадала саюзнае кіраўніцтва ў Маскве і чым гэта было ва Украіне і іншых саюзных рэспубліках.

Трэцяя частка разглядае змяненні гістарычнай карціны і ўяўленняў пад уплывам уз’яднання 1939 г. і Другой сусветнай вайны. Акцэнт у даследаванні робіцца на «міфалагізацыі гісторыі пад знакам партызанскага руху». Аналізуецца праблема прыстасавання інтэлектуалаў да таталітарнай сістэмы. Гэта ажыццяўляецца шляхам параўнання савецкай і нямецкай гістарычнай навукі перыяду 1930–40-х гг. Аўтар

раскрывае адмоўны ўплыў на савецкую гуманітарную навуку ваеннай ідэалогіі і палітычных рэпрэсій і наяўнасць падобных з'яў у нацыянал-сацыялістычнай Германіі. У гэтым сэнсе ўяўляе цікавасць заўвага аб недастатковым вывучэнні пасляваеннай гістарыяграфіі на Захадзе і Усходзе таго, што паміж 1941–1945 гг. вялася не толькі вайна зброяй, але і «вайна гісторыяй» ці гістарычнымі ўяўленнямі (с. 21).

У чацвёртай частцы асвятляюцца працэсы развіцця беларускай гістарыяграфіі ў 1995–1997 гг., якія вызначаюцца як «пастаянства і змены». Галоўная ўвага надаецца станаўленню нацыянальнай гістарыяграфіі ў Рэспубліцы Беларусь. Пытанні аналізуюцца ў кантэксце агульных гістарыяграфічных працэсаў, што адбываліся на постсавецкай прасторы. Як і ў іншых дзяржавах-спадчынніках СССР, у Беларусі пасля дасягнення незалежнасці гісторыя і гістарычная навука сталі прадметам палітычных дыскусій і сродкам фарміравання нацыянальных пачуццяў. Для тлумачэння моцнага ціску перамен, якія адчуваюць на сабе постсавецкія грамадствы і іх гісторыкі, Р. Ліндпэр, як і іншыя заходнія даследчыкі, выкарыстоўвае тэрмін «тэрор гісторыі».

Гістарычная і палітычная рэальнасць сучаснай Беларусі як адной з частак былых расійскай і савецкай імперый (у кнізе ў гэтым сэнсе Беларусь адносіцца да нацыянальных, падзеленых на часткі грамадстваў, якія выйшлі з імперый) дыктуе неабходнасць фарміравання новай тэматыкі гістарычных даследаванняў ці, паводле аўтара, новага «гістарычнага канона». Ідзе актыўны працэс «пераацэнкі гісторыі», які адбываецца пры дапамозе гістарычнай навукі, публіцыстыкі, гістарычнай адукацыі і музейна-помнікавай культуры. Аўтар аналізуе гэтыя складовыя часткі фарміравання гістарычнай свядомасці.

У перыяд незалежнасці яшчэ больш абвастрылася праблема адносін паміж палітычнай уладай і гістарычнай навукай. Беларусь у гэтым сэнсе з'яўляецца, на думку даследчыка, асобным выпадкам. Для нацыянальнага рэнесансу, што назіраўся ў іншых постсавецкіх дзяржавах, палітычны рэжым у Мінску даваў вельмі мала падстаў і магчымасцей. Пасля прыходу да ўлады А. Лукашэнкі нацыянальная гістарыяграфія і дзяржаўная гістарычная палітыка пачалі ісці рознымі шляхамі. З 1996 г. яны ўступілі ў адкрытую спрэчку. Прыхільнікі «нацыянальнай канцэпцыі беларускай гісторыі» канфрантуюць, як іх папярэднікі ў дасавецкія і раннія савецкія часы, з вялікарасійскімі тлумачэннямі мінулага. Гістарыяграфія зноў апынулася ў непрымірымым супрацьстаянні з нацыянальнай і імперскай інтэрпрэтацыі, якія з XIX ст. вызначалі і скажалі гісторыю Беларусі.

Разглядаючы дзяржаўную палітыку ў галіне гістарычнай навукі пры А. Лукашэнку, аўтар выкарыстоўвае паняцце «гістарызацыя палітыкі» («Historisierung der Politik»). Гістарызацыя палітыкі ў Беларусі мае двухба-

ковую прыроду. Па-першае, гісторыя стала для ўсіх публічных актараў рэзервуарам палітычнай аргументацыі. Па-другое, палітычная культура і рыторыка А. Лукашэнкі самі па сабе выглядаюць як «гістарычныя» і несучасныя, а сам ён характарызуецца як «прадаўжальнік савецкай гісторыі» (с. 405). Як толькі пачалася распрацоўка праграм палітычных партый і праекта Канстытуцыі дзяржавы, нацыянальная гісторыя стала звышактуальнай. Гістарычныя палажэнні ўключаны ў праграму БНФ і Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. У сваю чаргу, гістарызацыя палітыкі грамадскага жыцця вяла да палітызацыі гістарычнай навукі.

Афіцыйная арыентацыя на застарэлыя гістарычныя ацэнкі і каноны савецкага грамадства датычыцца не толькі ўвядзення новай дзяржаўнай сімволікі і святочных дзён, пазбаўлення беларускай мовы статусу адзінай дзяржаўнай, пастаяннага прыслугоўвання перад Расіяй, але і прымітыўнага параўнання пазіцыі БНФ з калабарантамі часоў вайны. Палітычная канфрантацыя ў беларускім грамадстве ўсё мацней суправаджаецца гістарычнай атрыбутыкай і параўнаннямі. З іншага боку, гістарычная навука і гісторыкі сталі каментатарамі палітычных падзей (с. 400–413).

Канстатуючы адасабленне афіцыйнай палітыкі ад нацыянальнага разумення гісторыі, аўтар адзначае, што ў такой жа ступені большасць насельніцтва разумее нацыянальныя інтэрпрэтацыі гісторыі і сучаснасці. Стан гістарычнага і светапагляднага вакууму позніх савецкіх часоў не толькі не прывёў посткамуністычных гісторыкаў да нацыянальных і дэмакратычных пазіцый, але, як паказвае беларускі прыклад, садзейнічаў умацаванню нэасавецкіх утопій. Глава змяшчае матэрыял аб адзінай сярод постсавецкіх рэспублік беларускай «гістарычнай спрэчцы» 1996–1997 гг., якая з’яўляецца непасрэдным вынікам усёй дзяржаўнай гістарычнай палітыкі першага беларускага прэзідэнта і зыход якой застаецца адкрытым (с. 422).

Да якіх жа высноў і заключэнняў прыходзіць аўтар кнігі? Вылучым найбольш важныя.

1. У Беларусі не завершаны працэс фарміравання нацыі і не створана прынятая ў заходнім разуменні нацыя-дзяржава. Да канца XX ст. дзяржава і нацыя тут не сустрэліся. Перыяд нацыянальных дзяржаў краіна перажыла як перыферыя імперыі. Сапраўдная беларуская ідэнтычнасць застаецца абмежаванай нацыянальнай элітай і толькі часткова перанесена на іншыя часткі грамадства. З пачатку ўзнікнення нацыянальнай гістарыяграфіі супольнасць гісторыкаў расколата і яе гістарычныя ўяўленні падпарадкаваны палітычнаму кантролю. Пераважная частка беларускіх гісторыкаў знаходзілася з позніх царскіх часоў да канца

існавання СССР у ідэалагічным гравітацыйным полі вышэйстаячых даследчых і ідэалагічных цэнтраў (с. 479).

2. Неразрыўнасць (кантынуітэт) беларускай гістарычнай карціны непарыўна звязана з традыцыямі перад- і раннесавецкага часу. Гэтая карціна складаецца з шэрагу выбраных вузлавых пытанняў беларускай гісторыі. Кантынуітэт беларускай гістарыяграфіі аўтар пацвярджае і тым тэзісам, што канкурэнцыя нацыянальна-гістарычнай канцэпцыі і марксісцка-савецкага разумення свету, якая існавала да канца 1920-х гг., вярнулася ў канцы 1980-х гг. і сёння ўсё яшчэ шырока прадстаўлена ў Беларусі. Таксама рыторыка постсавецкай «спрэчкі гісторыкаў» наўрад ці адрозніваецца ад крытычнага, асуджальнага і выкрывальнага рытуалу савецкага часу. Відавочна, заключае Р. Лінднэр, што кантынуітэт паміж савецкай і постсавецкай гістарыяграфіяй і навуковай культурай аказаўся больш моцным, чым змены, якія прынёс крах імперыі.

3. Вузлавыя спляценні гісторыі Беларусі і сумежных з ёю краін, якія аўтар трактуе як міфалагемы і гістарычныя стэрэатыпы, па-рознаму інтэрпрэтуюцца беларускай, украінскай і расійскай нацыянальнымі гістарыяграфіямі. Тое, што для вучоных у Кіеве і Львове азначае спадчыну Кіеўскай Русі і Казацкага гетманата, а для даследчыкаў Масквы і Санкт-Пецярбурга звязана з міфамі аб Трэцім Рыме, царах і вызваленчых бітвах супраць татарскага гнёту, Напалеона і Гітлера, для гісторыкаў у Мінску і Гродна ўвасабляюць Полацкае княства і ВКЛ (Беларуска-Літоўскае вялікае княства) (с. 23.)

Падобна таму, як украінскія і расійскія гісторыкі вылучаюць узаемныя гістарычныя прэтэнзіі, беларуская гістарыяграфія, як у перад- і раннесавецкія часы, пачынае дыстанцыравацца ад гістарычнай Расіі. Аўтар гаворыць аб відавочнай розніцы паміж беларускай і расійскай гістарыяграфіяй нацыянальна-патрыятычнага напрамку, адзначаючы, што іх гістарычныя канцэпцыі выключаюць адна адну. Беларускі нацыяналізм, прыхільнікі якога хочуць бачыць у нацыяналізме канструктыўную сілу, не мае нічога агульнага з панславісцкай ідэалогіяй новага рускага нацыянальнага кансерватызму. У адрозненне ад рускіх інтэлектуалаў беларускія «нацыяналісты» сярод гісторыкаў глядзяць на Захад ці падкрэсліваюць «беларускую місію» для еўраазіяцкай прасторы. Погляд на будучае дзвюх дзяржаў яшчэ больш вылучае гэта гістарычна абгрунтаванае адрозненне: патрыёты ў Беларусі і Расіі не маюць нічога агульнага, што б іх звязвала (с. 483).

4. У Беларусі амаль у той жа ступені, як і ў іншых перыферыйных нацыях-дзяржавах Усходняй Еўропы, нацыянальная гісторыя канструявалася і дэканструявалася. Прыклад Беларусі паказвае, што народы, якія

засталіся ў сваёй сучаснай гісторыі ў стадыі перарванага ці незавершанага нацыянальнага генезісу, асабліва схільныя да фарміравання міфаў. Да такіх гістарычных міфаў належаць перш за ўсё міфы аб паходжанні беларусаў, стварэнні дзяржавы, Радзіме, залатым веку (часах ВКЛ), генацыдзе беларускага народа і насцярожаныя адносіны да іншаземцаў.

Схільнасць беларускай гістарыяграфіі да міфалагізацыі абгрунтоўваецца тым, што «малыя народы» часта класіфікуюцца сумежнымі дзяржаўнымі гістарыяграфіямі як «негістарычныя». З-за адсутнасці нацыянальнай эліты гістарычны шлях развіцця беларускага народа доўгі час быў «нябачны» і заставаўся «неапісаным». Адсутнічалі беларускія гістарычныя хронікі, нацыянальны пантэон выдатных дзеячаў гісторыі Беларусі быў незапоўнены. Гэта вяло да міфалагізацыі мінулага з боку нацыянальнай гістарыяграфіі і да яго абмежавання гісторыяй руска-беларускіх адносін з боку савецкіх гісторыкаў (с. 479–480).

5. З боку беларускай гістарыяграфіі існуе дваістая інтэрпрэтацыя мінулага беларускага народа. Гэта – вынік супярэчнасці паміж нацыянальнай і імперскай гістарычнымі карцінамі. Таму Беларусь магла ці аглядацца на традыцыі сваёй тысячагадовай дзяржаўнасці, ці аказвацца правінцыяй у густым цені польскай, рускай і савецкай імперскай гісторыі. Гэта дваістая культура гістарычнай свядомасці замінае разуменню рэальнай гісторыі беларускіх тэрыторый. Нацыянальная гісторыя, з аднаго боку, царская і савецкая імперская гісторыя, з другога боку, былі палітычна матываванымі канструкцыямі, якія нярэдка прымусова аспрэчвалі права адзін аднаго на існаванне. Розныя гістарычныя культуры, якія імкнуліся да нацыянальнай ці антынацыянальнай інтэграцыі, неслі адпаведна выразныя прызнакі выключэння (с. 480).

6. Праз усю кнігу праходзіць тэзіс аб супрацьлегласці нацыянальнай і імперскай гістарыяграфіі гісторыі Беларусі. Ва ўсе перыяды даследавання беларускія гісторыкі знаходзіліся ў палітычным полі прыцягнення, уплыву і кантролю. У той час як нацыянальная гістарыяграфія прафілявалася як пераважна гістарыяграфія пратэсту і дыстанцыравання ад улады і імперыі, савецкія гісторыкі павінны былі адпавядаць ціску падпарадкавання, які аказвала партыя, пануючая ідэалогія і іх уласная паслухмянасць, якая абганяла дыктат улады. Сталінізм праз рытуал крытыкі і індывідуальны тэрор істотна змяніў гістарычную навуку і гістарыяграфію часоў ранняга СССР і Беларусі. Аднак нацыянальная гістарычная карціна працягвала існаваць у пачатку 1930-х гг. да перыяду фізічнага прымянення сілы і забароны для гісторыкаў працаваць ва ўніверсітэце і акадэмічных інстытутах. Беспартыйныя беларускія гісторыкі былі выключэннем з правіла.

Нацыянальны прыклад інтэрпрэтацыі гісторыі Беларусі заставаўся на рубяжы эпох (XIX–XX і XX–XXI стст.) у цені «заходнерускай», «вялікарускай», «савецка-патрыятычнай» ці «русафіла-панславісцкай» гістарычных канцэпцый. У фазе палітычнага аслаблення ўлады і ідэалагічнай моцы цэнтра (пасля 1905 г., у 1920-я гг., падчас агоніі савецкай імперыі) нацыянальная гістарыяграфія магла развіваць самастойныя гістарычныя ўяўленні і спрабавала ўвасабляць іх як нацыянальна зразумелы гістарычны працэс. У гэтыя перыяды асабліва выдатна выяўлялася роля гістарыяграфіі як нацыятворчай сілы.

7. Спецыфікай гістарычнай навукі савецкіх рэспублік і новых постсавецкіх дзяржаў была і застаецца яе метадалагічная слабасць. Прычынамі структурнай слабасці і прафесійнай адсталасці беларускай гістарычнай навукі з'яўляліся, паводле аўтара, адсутнасць акадэмічных традыцый, рэпрэсіі і вайна. Толькі ў 1950–70-я гг. сярод мінскіх і гродзенскіх гісторыкаў можна было назіраць прафесійны рост, асабліва ў галіне сацыяльнай і аграрнай гісторыі. Увогуле ж гістарычная навука Беларусі заставалася на правінцыяльным узроўні і мела ранг гістарычнага рэгіянальнага краязнаўства. Вельмі рэдка тэарытычныя дэбаты ў савецкай гістарыяграфіі абвяшчаліся цэнтрам, а праходзілі яны пры масавым удзеле ЦК КПСС і галаўных маскоўскіх інстытутаў.

Пасля краху цэнтралізаванай сістэмы савецкай навукі ў новых дзяржавах не з'явілася інавацыйных методык, якія б сведчылі аб змене савецкай гістарычнай карціны на нацыянальную. Замена адной дзеючай канцэпцыі іншай не вяла да нейкага шматмернага гістарычнага аналізу. Міжнародны даследчы ландшафт успрымаецца гісторыкамі вельмі слаба. Тлумачэнне гісторыі заходняй школай даследчыкаў па-ранейшаму ігнаруецца. Толькі ў другой палове 1990-х гг. з боку маладога пакалення мінскіх гісторыкаў сталі зыходзіць імпульсы да паступальнага авалодання метадычным інструментарыем і заходнімі вынікамі даследаванняў (с. 481–482).

8. Для інстытуцыянальнай гісторыі беларускай гістарычнай навукі ў савецкую эру важнае значэнне мела тое, што два яе галоўныя цэнтры – Інстытут гісторыі Акадэміі навук і гістарычны факультэт БДУ – развіваліся ў рэчышчы палітычных працэсаў свайго часу ці нават абганялі іх. Маецца на ўвазе тое, што яны былі больш канфармісцкімі, чым гэта ад іх патрабавала ўлада. Нямала вучоных добраахвотна падтрымлівалі нефармальныя кантакты з мінскімі партыйнымі ўстановамі. З іншага боку, адносна невялікая колькасць партыйных сярод беларускіх гісторыкаў сведчыла аб іх пэўнай гатоўнасці да дысідэнцтва.

Адзіная савецкая гістарычная канцэпцыя ўсталявалася ў Беларусі толькі ў канцы 1950-х гг., калі была надрукавана першая агульная праца па гісторыі БССР, напісаная з марксісцка-ленінскіх пазіцый. Пе-

раважная большасць маладых аўтараў новай хвалі (пасля адлігі), якія потым сталі акадэмічнымі настаўнікамі позняга савецкага і постсавецкага пакаленняў вучоных, клапаціліся аб тым, каб Беларусь заставалася ў гравітацыйным полі рускай імперскай гісторыі і каб аб заходнім уплыве на палітычнае ці культурнае развіццё Беларусі не было ніякай гаворкі. Калі санкцыянаваная партыяй гістарычная канцэпцыя стабілізавалася ў пачатку 1960-х гг., да сярэдзіны 1980-х гг. былі выдадзены шматлікія адна- ці шматтомныя публікацыі гістарычных прац і падручнікаў па беларускай гісторыі.

Беларуская гістарыяграфія сфарміравала да сярэдзіны 1980-х гг. функцыянальна працаздольную інстытуцыянальную інфраструктуру. Колькасць гісторыкаў, абароненых дысертацый і публікацый пастаянна ўзрастала. Але прастора дзейнняў для гісторыкаў у даследаванні нацыянальнай гістарычнай тэматыкі ўсё больш звужалася і імкнулася да пошуку сенсацый і незвычайных падзей. Гістарыяграфія БССР, як і ўсяго СССР, знаходзілася ў «вытворчым летаргічным сне», з якога можна было выйсці толькі праз палітычны імпульс (с. 388).

9. Парадыгма нацыянальнага фактару была ў пачатку 1990-х гг. не толькі важным кампанентам фарміравання постсавецкай ідэнтычнасці, але і канцэптуальным базісам новай гістарычнай навукі ў былых савецкіх рэспубліках. Сярод інтэлектуалаў «малых» ці «негістарычных» народаў сфарміравалася ва ўмовах намінальнай незалежнасці новае разуменне гісторыі, якое зафіксавалася ў навуковых працах гісторыкаў, мастацкіх творах пісьменнікаў і праграмных заявах новых палітычных партый. Для адных гісторыкаў постімперская гістарычная навука стала надзеяй і захавальнікам нацыянальнай ідэі, іншыя разглядалі гэтых гісторыкаў як сабатажнікаў ідэі «адзінага савецкага народа».

Беларускі прыклад паказвае, што змена пануючай гістарычнай канцэпцыі ў савецкіх рэспубліках вызначалася больш зменай пакаленняў, чым непасрэдна зменай палітычнай сістэмы. Разам з тым аўтар зазначае, што спрэчка гісторыкаў у 1990-я гг. ніяк не звязана, як у 1920-я і пачатку 1930-х гг., з канфліктам пакаленняў, і гэта прадвызначыла захаванне падзелу сярод старога пакалення гісторыкаў (с. 421). Беларускія гісторыкі пры пераходзе ад царскай да савецкай сістэмы панавання менш эйфарычна мянялі ідэалогію, чым яны гэта рабілі пасля краху савецкай імперыі, калі толькі меншасць засталася ў гарсэце савецкага разумення гісторыі, а большасць з энтузіязмам звярнулася да нацыянальнай гісторыі (с. 483–484).

10. Адначасовасць існавання нацыянальнага і інтэгральнага (ці імперскага) варыянтаў беларускай гістарыяграфіі працягваецца. Палітычныя інтарэсы ўлады таксама надалей будуць вызначаць тую ці

іншую гістарычную карціну і клапаціцца аб тым, каб гістарычная навука заставалася функцыяй палітычнага фактару. У постсавецкім кантэксце вылучаецца беларускі асобны шлях, таму што тут нацыянальная гістарыяграфія адвергнута кіруючай палітычнай элітай і прэзідэнцкі рэжым А. Лукашэнкі стаіць на гістарычным і маральным каноне каштоўнасцей позняга савецкага часу. Як у пачатку, так і ў канцы XX ст. беларуская гістарычная карціна знаходзіцца пад падзеленым небам. Гістарыяграфія застаецца арэнай барацьбы даследчых інтарэсаў і палітычных патрабаванняў.

Кніга заканчваецца аптымістычным спадзяваннем на тое, што «ўсё больш гісторыкаў у Мінску, Гродне ці Гомелі будуць выстаўляць на рацыянальную праверку канкурэнтаздольныя канцэпцыі мінулага і прадстаўляць гісторыю Беларусі такой, якой яна з'яўляецца на самой справе: гісторыяй этнічна, культурна і рэлігійна абмежаванай гістарычнай прасторы, якая ўвасабляе на падставе яе тэрытарыяльнай прыналежнасці да Кіеўскай Русі, Вялікага Княства Літоўскага, польскай дваранскай рэспублікі, царскай імперыі ці Савецкага Саюза ўсходне- і цэнтральнаеўрапейскія традыцыі мінулых стагоддзяў ва ўсёй іх шматбаковасці, з усімі іх пераломамі і перыпетыямі. Палітычная і культурная будучыня маладой Рэспублікі Беларусь захоўваецца не ў малой ступені ў авалодванні гэтай багатай гісторыяй» (с. 484).

Чым прыкметна кніга Р. Лінднэра? Перш за ўсё ахопам перыяду даследавання і навізной узнятых праблем. Гэта першая ў сусветнай гістарычнай навуцы і беларусазнаўстве кніга аб станаўленні і развіцці беларускай гістарычнай навукі і яе ўзаемаадносінах з палітычнай уладай на працягу больш чым стогадовага адрэзку часу. Аўтар паставіў і вырашыў праблемы, якія не маглі нават разглядаць беларускія гісторыкі ў савецкі час і да якіх яны толькі пачынаюць падыходзіць зараз. Гэта перш за ўсё пытанне аб адносінах паміж гісторыкамі і ўладай, дакладней, аб залежнасці ці незалежнасці гісторыка ад улады. Запознены ці перарваны працэс фарміравання беларускай нацыі і панаванне ўлады над гісторыкамі – гэта дзве галоўныя прычыны, што абумовілі адсутнасць ці вельмі слабую прысутнасць нацыянальнага разумення гісторыі сярод беларускай навукова-гуманітарнай супольнасці да пачатку 1990-х гг.

Аўтар аперыруе добра знаёмымі для беларускіх даследчыкаў тэмамі, з'явамі і імёнамі. Праўда, і тут ён кранае сюжэты, якія па сённяшні дзень саромеюцца ці не жадаюць па розных прычынах асвятляць айчынныя навукоўцы. Гаворка ідзе пра нацыянальны склад гістарычных кадраў БДУ і Інстытута гісторыі Беларускай акадэміі навук у даваенныя і пасляваенныя гады. Прыведзеныя лічбы сведчаць пра вялікую долю яўрэйскіх і рускіх (па нацыянальнасці) прадстаўнікоў у асяроддзі гістарычнай супольнасці (с. 308–315).

Даследчы дыскурс працы выходзіць за межы таго, з чым звычайна прывыклі мець справу айчынныя навукоўцы. Аўтар уводзіць праблематыку ў еўрапейскі і міжнародны даследчы кантэкст, выкарыстоўвае распрацаваную метадалогію вывучэння гістарыяграфіі краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, параўноўвае гістарыяграфічныя працэсы гэтага рэгіёна з тымі, што адбываліся ў заходнееўрапейскіх краінах, у першую чаргу Германіі. Заслуга Р. Ліндкэра бачыцца ў тым, што ён зрабіў вопыт развіцця беларускай гістарычнай навукі XX ст. здабыткам сусветнай гістарыяграфіі. Параўнальна-гістарычны метад дазволіў вылучыць як спецыфічныя, так і агульныя рысы беларускай гістарычнай школы ў царскія, савецкія і постсавецкія часы.

Для беларускіх гісторыкаў і іншых спецыялістаў у галіне гуманітарных і сацыяльных навук кніга нямецкага даследчыка мае не толькі адукацыйны, пазнавальны, але і вялікі маральна-выхаваўчы сэнс. Аўтар, падкрэсліваючы пастаянны ціск улады на гісторыкаў, ставіць пытанне аб тым, ці магла іх пазіцыя быць больш скіраванай на нацыянальнае разуменне гістарычнага працэсу. Адказ на гэтае пытанне можна неаднаразова сустрэць на старонках кнігі, дзе гаворка ідзе пра моцны канфармізм гісторыкаў, гістарычных вучэбных і даследчых устаноў, іх «абганяючую патрабаванні ўлады паслухмянасць».

У 2003 г. кніга Р. Ліндкэра выйшла ў перакладзе на беларускую мову ў кніжнай серыі «Беларускага гістарычнага агляду», што сведчыла аб яе важнасці для беларускага чытача і было станоўчай рэакцыяй на нашу рэцэнзію. Падчас прэзентацыі кнігі ў Мінску аўтар уручыў яе свайму рэцэнзенту, што падрэслівала агульнасць нашых навуковых пазіцый. У прадмове да беларускамоўнага выдання Р. Ліндкэр зазначыў, што за чатыры гады, якія прайшлі пасля публікацыі працы ў Германіі, ён не адчувае патрэбы нешта мяняць у яе тэксце, паколькі тэндэнцыі развіцця гістарычнай палітыкі ў Беларусі засталіся нязменнымі. У наступныя гады Р. Ліндкэр паспяхова займаўся даследаваннем усходнееўрапейскай тэматыкі, атрымаўшы званне прафесара Цюбінгенскага ўніверсітэта. Ён таксама з'яўляўся членам праўлення Нямецкага таварыства па вывучэнні Усходняй Еўропы, знешнепалітычным саветнікам урада ФРГ і бундэстага, выканаўчым дырэктарам Усходняга камітэта нямецкай эканомікі, старшынёй Нямецка-беларускага таварыства і Мінскага форуму. Зараз займае кіруючыя пасады ў шэрагу буйных нямецкіх кампаній.

Першыя два дзесяцігоддзі XXI ст. пацвердзілі асноўныя вынікі даследавання нямецкага аўтара пра гістарычную палітыку ў Беларусі ў мінулым стагоддзі, пра што гаворыцца ў раздзеле 2.4. Разам з тым адбыліся пэўныя змены ў гэтай палітыцы як і ўвогуле ва ўзаемаадносінах паміж беларускімі гісторыкамі і дзяржаўнымі інстытутамі ўлады. З аднаго боку, ішоў працэс прыстасавання вядучага навуковага цэнтра вывучэння айчыннай

гісторыі — Інстытута гісторыі НАН Беларусі — да рэалізацыі задач дзяржаўнай палітыкі, што было працягам ранейшай савецкай партыйнай практыкі. З іншага боку, ствараліся незалежныя даследчыя цэнтры, нефармальныя групы гісторыкаў па інтарэсах, якія імкнуліся да большай ці меншай ступені самастойнасці ў правядзенні сваіх даследаванняў. Кола вучоных у сценах акадэмічнага інстытута гісторыі і дзяржаўных універсітэтаў таксама не было аднастайным. Яго значная (верагодна, большая) частка арыентавалася ці прытрымлівалася нацыянальнага разумення гістарычнага працэсу, хоць нацыянальна-дзяржаўная канцэпцыя гісторыі Беларусі засталася феноменам 1990-х гг. Замест яе Інстытут гісторыі НАН Беларусі стварыў новую тэарэтыка-метадалагічную канструкцыю — канцэпцыю гісторыі беларускай дзяржаўнасці, на аснове якой у 2018—2020 гг. сумесна з вузаўскімі вучонымі апублікаваў пяцітомную фундаментальную працу. Паводле логікі разважанняў Р. Лінднэра, гэтая канцэпцыя ўяўляе сабой сінтэз нацыянальна-дзяржаўнай канцэпцыі 1990-х гг. і часткова імперскіх, расійска-панславісцкіх і неасавецкіх тэарэтычных схем. Гэта пацвярджаецца пастановачным артыкулам кіраўнікоў Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў, Інстытута гісторыі НАН Беларусі і Упраўлення дзяржаўнага сакратара Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь аб гістарычнай палітыцы, апублікаваным у часопісе «Беларуская думка» (2019)[236].

Пераклад кнігі замежнага аўтара пра ўзаемадачыненні ўлады і гісторыкаў у Беларусі павысіў яе навуковую і палітычную актуальнасць у беларускім гістарычным супольніцтве і, несумненна, будзе садзейнічаць лепшаму разуменню складаных і цярністых шляхоў развіцця беларускай нацыі, фарміравання гістарычнай навукі Беларусі, гістарычнай культуры і гістарычнай свядомасці беларускага народа, паводзін яго палітычнай і інтэлектуальнай эліты ў пераломныя перыяды навейшай гісторыі.

## 2.2. Аб памылках і метадычных недахопах вучэбнага дапаможніка па гісторыі Беларусі

У 1998 г. выйшаў з друку вучэбны дапаможнік для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў па гісторыі Беларусі ў дзвюх частках, які ствараўся на працягу сямі гадоў калектывам з 29 чалавек: 6 прафесараў, 9 дэцэнтаў і 14 гісторыкаў без вучоных званняў і ступеняў пад кіраўніцтвам прафесараў Я. К. Новіка і Г. С. Марцуля. Выданне атрымала грыф Мініс-

[236] К вопросу об исторической политике / А. Коваленя [и др.] // Беларус. думка. 2019. № 8. С. 3—11.

тэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і стала першым у краіне вучэбным дапаможнікам па гісторыі Беларусі для сістэмы вышэйшай адукацыі. Выхад кнігі, абмеркаванай і рэкамендаванай да друку дзяржаўнай камісіяй па падрыхтоўцы новых падручнікаў у гуманітарна-грамадазнаўчай сферы, разглядаўся ў шэрагу падзей, якія азначалі «пераадоленне дэідэалагізацыі сярэдняй і вышэйшай школы» (А. Р. Лукашэнка). Сярод іх на першым месцы стаяла перавыданне падручнікаў па гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі для сярэдняй школы, што ў тэрміновым парадку адбылося ў 1995–1998 гг. Ролю падручніка для гістарычных факультэтаў універсітэтаў выконвалі «Нарысы гісторыі Беларусі», падрыхтаваныя Інстытутам гісторыі НАН Беларусі. Паколькі яны сталі лічыцца не адпавядаючымі новым ідэалагічным патрабаванням, было вырашана тэрмінова замяніць выданне новым падручнікам па айчыннай гісторыі для студэнтаў. У прадмове кіраўнік аўтарскага калектыву Я. Новік напісаў, што ён і яго калегі адмовіліся ад празмернай ідэалагізацыі і палітызацыі ў гістарычнай навуцы, імкнучыся не падфарбоўваць гісторыю, не даваць яе толькі ў негатыўным і ачэрненым выглядзе, як гэта нярэдка бывала раней[237]. На прэзентацыі выдання ён заявіў, што новая кніга «развенчвае міфы» і «адвяргае пісаніну некаторых гісторыкаў»[238], пад якімі, напэўна, меліся на ўвазе акадэмічныя аўтары першага пакалення школьных падручнікаў і «Нарысаў гісторыі Беларусі».

Прафесійная супольнасць беларускіх гісторыкаў адгукнулася на вучэбны дапаможнік рэзка адмоўнымі рэцэнзіямі. Першыя з'явіліся ў «Беларускім гістарычным аглядзе» ў выпуску 1998 г. Заснавальнік і рэдактар часопіса, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі Г. Сагановіч, разгледзеў першую частку выдання (ад старажытнасці да трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай) і прыйшоў да высновы, што кніга напісана з пазіцый старой расійскай, у некаторых частках манархічна-клерыкальнай, і савецкай гістарыяграфіі і ўяўляе сабой блытанае і блага напісанае перавыданне гісторыі «Паўночна-Заходняга краю», надрукаванае ў незалежнай Беларусі пад вокладкай гісторыі Беларусі. Паводле рэцэнзента, аўтары, адышоўшы ад прынцыпаў навуковасці і нацыянальнай самапавагі, не пазбеглі «падтасовак, самапрыніжэння, антыбеларускасці і лёкайскіх рэверансаў у бок Расіі...». Да гэтай абагуленай маральна-ідэалагічнай ацэнкі Г. Сагановіч дадаў адпаведную характарыстыку вучэбна-метадычным якасцям дапаможніка, у тым ліку

[237] Гісторыя Беларусі : у 2 ч. Мінск, 1998. Ч. 1 : Ад старажытных часоў па люты 1917 г. / пад рэд. праф. Я. К. Новіка і Г. С. Марцуля. С. 5.

[238] *Скурко А.* Паклёп як метад гістарычнай навукі // Навіны. 1998. 21 кастр.

«страшэннаму коснамоўю, якому не далі рады нават рэдактары» [239]. Намеснік дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі прафесар М. Біч (аўтар школьнага падручніка па гісторыі Беларусі для 8-га класа) падрабязна прарэцэнзаваў астатнія раздзелы першай часткі (з канца XVIII ст. па 1917 г.) і зрабіў заключэнне, што праца не адпавядае ні навуковым, ні метадычным адносінам патрабаванням да вучэбнага дапаможніка[240].

Паколькі публікацыя пад рэдакцыяй Я. К. Новіка і Г. С. Марцуля прэтэндавала на статус ідэалагічнай антытэзы працам акадэмічнага Інстытута гісторыі, яго супрацоўнікі адгукнуліся разгорнутай крытычнай рэцэнзіяй «Няспраўджаныя амбіцыі і абяцанні» ў штогодніку Інстытута гісторыі (1999). Яна была напісана чатырма спецыялістамі па адпаведных перыядах айчыннай гісторыі, што разглядаліся ў працы, дактарамі гістарычных навук: Г. Галенчанкам (Сярэднявечча), М. Бічом (новая гісторыя), І. Ігнаценкам (навейшая гісторыя, перыяд 1917–1945 гг.), У. Снапкоўскім (навейшая гісторыя, перыяд 1945–1997 гг.). Наша агульная думка заключалася ў тым, што аўтары падрыхтавалі зусім непісьменную, з масай факталагічных памылак, не адпавядаючую вучэбна-метадычным патрабаванням, з няправільнымі і шкоднымі ідэйна-метадалагічнымі падыходамі і ацэнкамі працу, якая не мела падстаў прэтэндаваць на статус вучэбнага дапаможніка па гісторыі Беларусі для студэнтаў ВНУ Рэспублікі Беларусь[241].

Прадстаўлены ніжэй тэкст – гэта апошняя частка калектыўнай рэцэнзіі, напісаная аўтарам. У ёй разглядаюцца раздзелы IX і X другой часткі вучэбнага дапаможніка, якія ахопліваюць перыяд 1946–1997 гг. (аўтары – прафесары Я. К. Новік, Г. С. Марцуль, дацэнты В. У. Лютава, У. Я. Парфянкоў, выкладчык Л. Ю. Жданко). Раздзел IX «Сацыяльна-эканамічнае, палітычнае і культурнае развіццё. Беларусь на міжнароднай арэне (1946–1985)», які складаецца з трох глаў, разглядае гаспадарчае, грамадска-палітычнае і духоўнае жыццё БССР, акцэнтуючы ўвагу на сацыяльна-эканамічных працэсах. У главе 1 асвятляюцца пасляваеннае аднаўленне народнай гаспадаркі і яе развіццё ў 1950-я – першай палове 1980-х гг. Прыводзіцца шмат лічбаў і канкрэтных выкладак, якія

---

[239] *Сагановіч Г.* Вяртанне ў «Северо-западный край?» // Беларус. гіст. агляд. 1998. Т. 5. Сш. 2 (9). С. 457–488, с. 487 ; *Яго ж.* Вайна з беларускай гісторыяй // Arche-Пачатак. 2001. № 3. С. 64.

[240] *Біч М.* Гістарыяграфічныя «навацыі» ў навучальнай літаратуры // Беларус. гіст. агляд. 1998. Т. 5. Сш. 2 (9). С. 489–522, с. 521.

[241] Няспраўджаныя амбіцыі і абяцанні: Да выхаду вучэбнага дапаможніка для студэнтаў ВНУ па гісторыі Беларусі ад старажытных часоў да нашых дзён / М. Біч [і інш.] // Штогоднік Інстытута гісторыі НАН Беларусі. 1999 / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск, 1999. С. 140–173, с. 163.

не нясуць істотнай сэнсавай нагрузкі. З другога боку, адчуваецца недахоп абагульненняў і якасных ацэнак, параўнанняў з сацыяльна-эканамічным развіццём іншых саюзных рэспублік. На с. 282 даецца працяглы пералік лічбаў трактароў, грузавых аўтамабіляў, камбайнаў, малацілак, веялак, коней, галоў буйной рагатай жывёлы, свіней, птушак, збожжа, насення канюшыны, цімафееўкі, пасяўнога насення лёну, бульбы, якія былі вылучаны Беларусі саюзным урадам у 1944—1945 гг. Канстатуецца ператварэнне рэспублікі з аграрна-індустрыяльнай у індустрыяльную краіну ў 1960-я гг., як і паступовае зніжэнне тэмпаў сацыяльна-эканамічнага развіцця СССР і саюзных рэспублік у 1970—80-я гг. Аб дамінаванні «эканамічнага матэрыялізму» сведчаць і высновы ў канцы раздзелу. З 13 пунктаў толькі два (9 і 12) не датычацца сацыяльна-эканамічных працэсаў. Нават у высновах аўтары не змаглі пазбегнуць назваў найбольш буйных прамысловых прадпрыемстваў і лічбаў аб здабычы і спажыванні нафты.

У раздзеле слаба раскрыта палітычнае і духоўнае жыццё рэспублікі, фактычна апушчана пытанне аб сутнасці палітычнай сістэмы ў СССР і БССР, механізмах яе функцыянавання і выніках, хоць тагачасны палітычны рэжым характарызуецца як «таталітарны» (с. 317). Абыдзена ўвагай дзейнасць КПБ, якой прысвечана літаральна некалькі радкоў, нягледзячы на тое, што аўтары называюць яе «кіруючай сілай беларускага грамадства» (с. 323). У раздзеле не згадваецца ніводнага з'езда КПБ і яго рашэнняў.

У параграфах аб развіцці навукі і культуры зноў пераважаюць лічбы, імёны, факты, табліцы (параграф 2 главы 2 змяшчае чатыры табліцы). Няма параўнанняў з іншымі саюзнымі рэспублікамі і замежнымі краінамі, хоць вядома, што ЮНЕСКА даволі высока ацэньвала дасягненні рэспублікі ў галіне адукацыі, навукі і культуры. Даючы агульную пазітыўнаю ацэнку сістэмы адукацыі, аўтары таксама канстатуюць, што «адукацыя ў рэспубліцы паступова губляла нацыянальныя рысы» (с. 329). Гэта тлумачыцца аб'ектыўнымі і суб'ектыўнымі прычынамі, у тым ліку пазіцыяй ЦК КПБ, партыйных і савецкіх органаў, якія «не зрабілі нічога істотнага, каб змяніць сітуацыю» (с. 329). Нарастанне працэсаў русіфікацыі і дэнацыяналізацыі беларускага этнасу ў пасляваенныя дзесяцігоддзі, што з'яўляецца агульнапрызнаным фактам у сучаснай гістарычнай навуцы Беларусі (характэрна, што аўтары дапаможніка пазбягаюць гэтых тэрмінаў), кантрастуе з высновамі кнігі аб «рознабаковым духоўным жыцці беларускага народа» (с. 341) і асабліва аб «агульнацывілізаваных дасягненнях беларускага народа» ў галіне адукацыі (с. 367). Такія сцвярджэнні на фоне знікнення беларускай мовы, чаму садзейнічала тагачасная сістэма адукацыі, гучаць крывадушна.

У главе 3 (У. Я Парфянкоў) разглядаецца дзейнасць БССР на міжнароднай арэне. Выкарыстаны тагачасныя даследаванні беларускіх вучоных па гэтай праблематыцы, але іх новыя падыходы, вынікі і абагульненні фактычна праігнараваны. Асвятляецца выхад рэспублікі на міжнародную арэну ў сярэдзіне 1940-х гг., наступная знешнепалітычная дзейнасць у ААН і яе спецыялізаваных установах, гандлёва-эканамічныя, культурныя, грамадскія сувязі з замежнымі краінамі. Аўтар не пагаджаецца з думкай сучасных даследчыкаў аб тым, што «Беларусь не праводзіла ніякай самастойнай знешняй палітыкі» (с. 342), напэўна, наіўна лічачы, што яна такую палітыку праводзіла, і робіць выснову аб павышэнні ролі Беларусі ў міжнародным супольніцтве (с. 367), якая не адпавядае міжнародным рэаліям і прынцыпам існавання савецкай унітарнай дзяржавы 1940–80-х гг.

ку стандартов историописания ключевых проблем белорусской истории. Речь идет о том, чтобы представить историческому сообществу определенный образец того, как нужно описывать и интерпретировать острые вопросы истории белорусской государственности, что соответствовало бы целям и задачам исторической политики государства. В них, как можно заметить, значительное внимание уделено проблемам международных отношений и внешней политики белорусских государств, начиная от ВКЛ и заканчивая БССР. Это обусловлено, как справедливо отмечают авторы статьи, геополитическим положением белорусских земель на перекрестке Европы, культурно-цивилизационном разломе между Востоком и Западом, что оказало противоречивое (положительное и отрицательное) влияние на судьбы белорусского народа, формирование и развитие нации и государственности[341].

Чтобы избежать искажений и неправильного толкования исторических событий, необходимо, согласно авторам статьи, руководствоваться концепцией истории белорусской государственности, которая в принципе продолжает национально-государственную концепцию истории Беларуси 1990-х гг. с определенными модификациями в сторону российскоцентричности и ресоветизации. Одним из приемов «исторического переформатирования» называется «тенденциозное выискивание в истории Беларуси антироссийской, антизападной, антипольской, антилитовской, антиукраинской и иных составляющих для использования в деструктивных политических целях»[342]. Описание данного приема, особенно в части, касающейся антизападных трактовок, можно расценивать как важный шаг в правильном направлении, стремление сбалансировать восточный и западный векторы в исторической политике.

Информационно-психологическое воздействие на население Беларуси с двух сторон требует эффективного противодействия ему с применением разнообразных приемов, методов и средств государственной исторической политики. Для прозападного контента информационных ресурсов характерны русофобия, антисоветизм и антикоммунизм, идея «национальной» истории, написанной после распада СССР. Основными идеологическими маркерами пророссийского медийного пространства являются идеи «русского мира», антизападность, реваншизм после развала СССР[343]. Историческая политика Беларуси конца 2010-х гг.,

---

[341] К вопросу об исторической политике. С. 5.
[342] Там жа. С. 9.
[343] Там жа. С. 9–10.

по нашему мнению, учла промахи и ошибки первых лет президентского правления с резкой ломкой в области среднего и высшего образования и сменой историографических парадигм. Она должна проводиться без явной спешки и рецидивов возврата к догматизму и ордодоксальности. Важно, чтобы деятельность государственных органов в области исторической политики не перерастала в борьбу с научным инакомыслием и разнообразием экспертных школ и концепций.

**О белорусско-польской группе историков по трудным вопросам**[344]. Важную роль в сближении позиций общественности и историков Беларуси и Польши призвана играть белорусско-польская группа историков по трудным вопросам взаимных отношений. Начало ее деятельности относится к 2010 г., когда посольство Польши в Минске и лично посол Л. Шарепка выступили с инициативой проведения совместных исследований по истории польско-белорусских (белорусско-польских) отношений ХХ в. Предложение было обращено к белорусским историкам-полонистам, работающим в ведущих университетах и научных учреждениях страны, а также за рубежом. В 2011–2014 гг. состоялся ряд встреч, конференций и поездок ученых двух стран, в которых принимал участие и автор. В результате активного сотрудничества был реализован научный проект «Польшча – Беларусь. Агульная гістарычная спадчына. Даведнік па архіўных матэрыялах 1918–1939 гг.» в двух томах. Этот справочник включал описание фондов государственных архивов Беларуси, в которых сохранилось наибольшее количество материалов, посвященных общему историческому наследию Польши и Беларуси в межвоенный период[345].

Нами после консультаций с членами белорусской группы историков (А. Великим, Г. Лазько, А. Литвиным) был разработан перечень тем для будущих совместных проектов с польскими историками. Это являлось фактически нашим ответом на польские предложения об исследованиях в первую очередь праблем Катыни, сталинских репресий и деятельности Армии Краёвой в Беларуси. Список из 10 тем был направлен

---

[344] *Снапкоўскі У. Е.* Аб дзейнасці беларуска-польскай групы гісторыкаў па складаных пытаннях беларуска-польскіх адносін (2010–2015 гг.) // Белорусско-российские отношения на современном этапе: состояние и перспективы развития : материалы круглых столов / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: В. Г. Шадурский (пред.) [и др.]. Минск, 2018. С. 157–164.

[345] Polska – Białoruś. Wspólne dziedzictwo historyczne. Przewodnik po materiałach archiwalnych 1918–1939 = Польшча – Беларусь. Супольная гістарычная спадчына. Даведнік па архіўных матэрыялах 1918–1939 гг. Том 1–2. Warszawa, 2013–2014.

в феврале 2015 г. декану факультета международных отношений БГУ В. Г. Шадурскому и польскому посольству в Минске. Они касались истории белорусско-польских отношений XX в. и были сформированы следующим образом: «Адраджэнне беларускай і польскай дзяржаўнасці ў кантэксце нацыя-будаўніцтва ва Усходняй Еўропе (1917–1919 гг.); Беларусь, савецка-польская вайна і Рыжскі мір; Праблемы бежанства, рэпатрыяцыі ваеннапалонных і абмену палітвязнямі ў беларуска-польскіх адносінах (1920 г. – пачатак 1930-х гг.); Беларуска-польскія палітычныя, эканамічныя і культурныя адносіны ў міжваенны перыяд (1921–1939 гг.); Беларусы ў Польшчы, палякі ў БССР у міжваенны перыяд: параўнальна-гістарычны аналіз; Беларусь у кантэксце вызначэння савецка-польскай мяжы (1941–1945 гг.); Удзел палякаў у антыфашысцкай барацьбе на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны; Рэпатрыяцыя беларускага і польскага насельніцтва ў 1944–1950-я гг.; Беларусы ў ПНР, палякі ў БССР у 1944–1991 гг.: параўнальна-гістарычны аналіз; Беларуска-польскія палітычныя, эканамічныя і культурныя адносіны ў перыяд "рэальнага сацыялізму" (1944–1989 гг.)»[346].

В записке отмечалось, что белорусская сторона, руководствуясь соответствующими установками и подходами официальной исторической политики, считает нецелесообразным разработку совместно с польскими историками тематики, связанной с: 1) катынским преступлением сталинского режима (в том числе с так называемым белорусским катынским списком); 2) воссоединением Западной Беларуси с БССР, которое рассматривается в Польше в русле военной интервенции СССР против польского государства и народа; 3) деятельностью Армии Краёвой на территории Западной Беларуси в годы Второй мировой войны. По этой тематике белорусские историки имеют значительный научный задел в виде книг, публикаций документов и статей. Также научно-исторические и общественно-политические позиции части белорусских исследователей – членов группы близки к тем, которые занимают их польские коллеги. Однако установки официальной исторической науки Республики Беларусь, историографические подходы, традиции и оценки, сформулированные в школьных и университетских учебниках по истории, общественные настроения, в том числе ветеранских организаций, пока не позволяют проводить по этим проблемам открытые

[346] *Снапковский В. Е.* Перечень тем, предлагаемых Польской стороне для совместных исследовательских проектов белорусских и польских историков : запіска дэкану ФМА БДУ В. Г. Шадурскаму ад 03.02.2015 (2 маш. стар.) // Архіў аўтара.

научные и общественные дискуссии между белорусскими и польскими историками и представителями общественности двух стран, а также научные исследования с последующей публикацией материалов. Эта проблематика могла бы стать предметом внимательного изучения белорусско-польской группы историков позднее[347].

На этом инициатива автора, связанная с информированием, оценками и предложениями относительно деятельности группы белорусских историков и ее сотрудничества з польскими коллегами, была завершена. Несмотря на то что предожения не были приняты, они могут быть реализованы с соответствующими коррективами в будущем. Те, которые были отклонены, возможно, еще сыграют свою роль. Деятельности группы посвящена соответствующая публикация[348]. Как отмечает руководитель белорусской части двухсторонней комиссии профессор В. Шадурский, в 2014 г. по инициативе Варшавы была создана белорусско-польская историческая комиссия, которая стремилась найти взаимопреемлемый формат совместной деятельности и определить темы двухсторонней дискуссии. Первые контакты историков показали, что исторический диалог будет представлять собой продолжительный процесс со взлетами и падениями[349]. Однако проделанная в первой половине 2010-х гг. работа показывает, что деятельность историков стала важной частью историко-культурного диалога между Беларусью и Польшей, который оказывает заметное влияние на оживление и нормализацию всего комплекса двухсторонних межгосударственных отношений.

**Заключение.** В 2010-е гг. историческая политика президента А. Лукашенко в целом двигалась в направлении укрепления независимости белорусского государства. Об этом говорят «мягкая белорусизация», лояльное отношение властей к празднованию 100-летия БНР, уголовное преследование лиц, выступавших в интернете с антибелорусскими взглядами, удаление из структур, близких к Администрации Президента, рьяных приверженцев «западнорусизма», принятие новой Военной доктрины и Концепции информационной безопасности, издание пятитомной «Истории белорусской государственности», создание Белорусского института стратегических исследований и другие важные ме-

---

[347] *Снапковский В. Е.* Перечень тем, предлагаемых Польской стороне ...

[348] *Снапкоўскі У. Е.* Аб дзейнасці беларуска-польскай групы гісторыкаў ...

[349] *Шадурский В. Г.* От культуры памяти к культуре исторического диалога (на примере деятельности белорусско-польской исторической комиссии) // Беларусь между Востоком и Западом ... С. 78–79.

роприятия. Однако решающее значение в этой сфере «мягкой силы» (исторической политики) будет иметь программа действий по реализации Договора о создании Союзного государства, направленная на усиление интеграции Беларуси и России при безусловном сохранении суверенитета двух государств, что критически важно для Беларуси как значительно меньшей по размерам страны, ставшей на путь сближения с сильно превосходящим ее по важнейшим показателям государством (великой державой).

Согласимся с мнением авторов упомянутой статьи об исторической политике, согласно которому историческая тематика в настоящее время приобретает исключительное значение в сфере информационно-психологического воздействия на белорусское общество извне. Однако в Беларуси, в отличие от зарубежных стран, значение исторической политики как инструмента стратегии выстраивания и формирования национальной идентичности до недавнего времени недооценивалось. В современных условиях в обществе имеется очевидный запрос на более отчетливое понимание истории белорусской государственности как одной из основ развития современной национальной идеи и государства в целом[350]. И этот запрос реализуется системой мероприятий в области исторической науки, образования, деятельности СМИ, культуры памяти, проводимых Институтом истории НАН Беларуси, университетами, издательствами, музеями, средствами массовой инфомации и коммуникации, другими государственными и общественными организациями страны.

Историческая политика президента А. Лукашенко имеет закономерные черты развития и особенности, отличные от предыдущих этапов перестройки и парламентской республики. Это историческая политика государства, ставшего на путь самостоятельного развития, со всеми ее проявлениями, хотя и довольно специфическими, отличными от процессов становления соседних европейских государств: официальной историографией, которая, однако, не слилась с национальным видением истории, системой исторического образования, институциональной, кадровой, издательской, мемориальной политикой, выводом вопросов исторической политики на международную арену.

Историческая политика периода президентской республики делится на два этапа, рубежом которых выступает условно 2003 год (год начала реализации проекта формирования государственной идеалогии). С этого времени наблюдается определенная тенденция к консолидации

[350] К вопросу об исторической политике. С. 10.

историков и общественных сил вокруг этого проекта, несмотря на продолжающееся разделение историков на провластных и «национально-свядомых», реабилитации некоторых национальных исторических концепций, относящихся преимущественно к истории древнебелорусских княжеств и ВКЛ, а также XIX в., осторожному отходу от российско-советских канонов интерпретации некоторых исторических тем (за исключением твердых позиций по тематике Великой Отечественной войны) и увеличению материалов национального содержания в историческом дискурсе. Понимание необходимости противостоять путинской концепции «русского мира», в отношении которой русскоязычная Беларусь является очень уязвимой, вероятно, будет двигать белорусского президента в сторону укрепления национальной идентичности белорусов.

Глава
3

# ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ЗНЕШНЕПАЛІТЫЧНАЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

## 3.1. Знешнепалітычныя аспекты гісторыі беларускай дзяржаўнасці[351]

Аўтары артыкула (загадчык аддзела гісторыі замежных сувязей БССР Г. Г. Сяргеева і старшы навуковы супрацоўнік У. Е. Снапкоўскі) зрабілі, па сутнасці, першы агляд знешнепалітычнай гісторыі Беларусі, пачынаючы ад дзяржаўна-палітычных утварэнняў старажытных часоў і заканчваючы абвяшчэннем незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Артыкул напісаны па просьбе рэдакцыі часопіса «Весці Акадэміі навук Беларусі», якая пажадала прадставіць навуковай грамадскасці актуальную карціну гістарычных ведаў аб асноўных этапах развіцця беларускай дзяржаўнасці, асабліва яе міжнародных аспектаў. Публікацыя з'явілася ў 1992 г. і аказалася запатрабаванай з боку гісторыкаў, правазнаўцаў, палітолагаў, спецыялістаў-міжнароднікаў, студэнтаў і навукоўцаў, якія праяўлялі інтарэс да новых падыходаў і канцэпцый у галіне гісторыі знешняй палітыкі Беларусі. Галоўная ўвага ў тэксце надаецца падзеям XX ст.: абвяшчэнню і дыпламатычнай дзейнасці БНР, унутраным і знешнім прычынам стварэння БССР

[351] Друкуецца паводле артыкула: *Сяргеева Г. Г.*, *Снапкоўскі У. Е.* Знешнепалітычныя аспекты суверэнітэту Беларусі: гістарычны агляд // Вес. Акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. 1992. № 2. С. 35–52.

і яе знешнепалітычнай актыўнасці, абмежаванню знешнепалітычных паўнамоцтваў рэспублікі пасля ўваходжання ў склад СССР, вяртанню гэтых паўнамоцтваў у 1944 г., пашырэнню міжнароднай дзейнасці і замежных сувязей у пасляваенныя дзесяцігоддзі, дыпламатыі часоў перабудовы і новага палітычнага мыслення. Артыкул напісаны на аснове новых для таго часу матэрыялаў (круглых сталоў па актуальных праблемах і «белых плямах» гісторыі, дакументальных зборнікаў беларускай эміграцыі) і новага прачытання прац У. І. Леніна, І. В. Сталіна і кіраўнікоў Кампартыі Беларусі.

Беларуская дзяржаўнасць мае глыбокія гістарычныя карані. Яны ідуць ад першых палітычных аб'яднанняў усходніх славян на тэрыторыі Беларусі (крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў), асобных тэрыторый Беларусі, якія ўваходзілі ў склад Кіеўскай Русі, ад Полацкага і Турава-Пінскага княстваў: моцных раннефеадальных усходнеславянскіх дзяржаўна-палітычных утварэнняў. Новы этап развіцця беларускай дзяржаўнасці прыпадае на эпоху развітага Сярэднявякоўя, калі беларускія землі ў XIV–XVI стст. з'яўляліся ядром федэратыўнай поліэтнічнай дзяржавы Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Вызначальнымі фактарамі яго стварэння сталі як знешнепалітычныя абставіны (пагроза нападаў крыжакоў і мангола-татарскіх ордаў), так і ўнутраныя аб'яднальныя тэндэнцыі на беларускіх і літоўскіх землях.

Аб'яднанне ў 1569 г. Польскага каралеўства і Вялікага Княства Літоўскага ў федэратыўную дзяржаву (Рэч Паспалітую) прывяло да паступовай страты беларускай дзяржаўнасці. Ажыццяўленне палітыкі паланізацыі і акаталічвання вяло да выцяснення з ужытку старабеларускай мовы, захопу дзяржаўных і адміністрацыйных пасад палякамі, паланізаванымі і акаталічанымі літоўскімі і беларускімі феадаламі. У XVI–XVIII стст. тэрыторыя Беларусі стала арэнай палітычнай барацьбы і войнаў паміж Маскоўскай дзяржавай і Рэччу Паспалітай, якія прынеслі беларускаму народу вялікія чалавечыя і матэрыяльныя страты. У канцы XVIII ст. беларускія землі ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай апынуліся ў складзе Расійскай імперыі, дзе беларусы не маглі атрымаць магчымасці для свабоднага нацыянальнага развіцця і стварэння ўласнай дзяржавы. У 1839 г. была ліквідавана ўніяцкая царква, да якой належалі 75 % беларусаў. У 1840 г. царскі ўрад забараніў ужыванне назвы «Беларусь», і беларускія губерні пачалі называцца «Паўночна-Заходнім краем». Паланізацыя, якая працягвалася з боку польскай шляхты, дапоўнілася ўзмоцненай русіфікацыяй, асабліва пасля паўстання 1863 г.

Рэвалюцыя 1905–1907 гг. значна паскорыла выспяванне аб'ектыўных і суб'ектыўных перадумоў для адраджэння беларускай дзяржаўнасці.

Першая сусветная вайна абвастрыла крызіс царызму, імперскай палітыкі правячых класаў у адносінах да шматлікіх нацый і народнасцей Расійскай імперыі. Лютаўская рэвалюцыя 1917 г., распад вялікіх шматнацыянальных імперый (Расійскай, Аўстра-Венгерскай і Асманскай) і фарміраванне на іх руінах новых дзяржаў садзейнічалі таму, што беларускі нацыянальны рух, як і нацыянальна-вызваленчая барацьба іншых народаў Расійскай дзяржавы, паставілі на парадак дня пытанне аб самавызначэнні нацый і стварэнні ўласнай дзяржаўнасці. Пры гэтым для беларускага народа па-ранейшаму важным аспектам самавызначэння быў знешнепалітычны.

Першымі намерамі на гэтым шляху былі спробы адраджэння беларускай дзяржаўнасці ў межах былога Вялікага Княства Літоўскага. У 1916 г. літоўскія і беларускія дзеячы выступілі з ідэяй стварэння канфедэрацыі ВКЛ у межах былога ВКЛ або яго часткі. Але ўрад кайзераўскай Германіі, якая ў той час акупавала Літву і значную частку Беларусі, адхіліў гэтую ініцыятыву, зрабіўшы стаўку на літоўскую буржуазію. Калі развеяліся ілюзіі аб магчымасці стварэння ВКЛ як канфедэрацыі, вядомы дзеяч беларускага нацыянальнага руху В. Ластоўскі заснаваў арганізацыю «Сувязь незалежнасці Беларусі» для барацьбы за незалежнасць Беларускай рэспублікі.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі актывізаваліся намаганні ліберальна-дэмакратычнай плыні беларускага вызваленчага руху да самавызначэння Беларусі. У сакавіку 1917 г. у Мінску адбыўся з'езд беларускіх арганізацый, на якім быў створаны Беларускі нацыянальны камітэт. У жніўні 1917 г. на першай сесіі Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый ліберальна-буржуазныя, клерыкальныя і дробнабуржуазныя палітычныя партыі аб'ядналіся ў Беларускую раду, якая выступіла за «нацыянальнае самавызначэнне»[352]. Важным крокам на гэтым шляху стала скліканне дазволенага бальшавіцкімі ўладамі Усебеларускага з'езда 5–18 снежня 1917 г., на якім прагучалі прапановы аб аўтаноміі Беларусі ў складзе Расіі. Дэлегаты выказалі занепакоенасць брэсцкімі перагаворамі з немцамі, што вяліся без уліку інтарэсаў беларускага народа, а таксама недавер кіраўніцтву Заходняй вобласці, бо ў яго выканаўчы камітэт уваходзілі ўсяго 70 прадстаўнікоў мясцовага насельніцтва і 100 вайскоўцаў. Бальшавікі не змаглі аб'яднаць рэвалюцыйную частку з'езда, таму ён быў разагнаны, а частка ўдзельнікаў арыштавана. Пры гэтым было прынята абразлівае ў адносінах да свядомай беларускай інтэлігенцыі рашэнне аб

[352] На скрыжаванні думак: Вучоныя аб «белых плямах» гісторыі Беларусі / склад. Я. І. Бараноўскі. Мінск, 1990. С. 49.

выгнанні актывістаў нацыянальна-дэмакратычнага руху з тэрыторыі Заходняй вобласці.

Ці была БНР дзяржавай? Ва ўмовах наступлення нямецкіх войск і адыходу бальшавіцкіх часцей Выканаўчы камітэт Рады Усебеларускага з'езда выдаў 21 лютага 1918 г. Першую Устаўную грамату да народаў Беларусі, у якой абвясціў сябе часовай уладай. Другой Устаўной граматай (9 сакавіка) абвяшчалася Беларуская Народная Рэспубліка, у межах якой аб'яўляліся свабода слова, друку, сходаў, сумлення, забастовак, недатыкальнасць асобы і жылля, права на аўтаномію, раўнапраўе моў усіх нацыянальнасцей Беларусі. Адмянялася права прыватнай уласнасці на зямлю, якая бясплатна перадавалася тым, хто яе апрацоўвае. Лясы, воды і нетры зямлі аб'яўляліся ўласнасцю БНР[353]. 25 сакавіка 1918 г. Рада БНР выдала Трэцюю Устаўную грамату, якая абвясціла БНР незалежнай дзяржавай.

Ва ўмовах нямецкай акупацыі БНР заявіла аб аддзяленні ад Расіі і спыненні дэкрэтаў савецкай улады[354]. У пастанове Рады БНР ад 12 ліпеня 1918 г. падкрэслівалася: «Усе дэкрэты ўрада Леніна, а таксама былых Народных камісараў Заходняй вобласці і фронту прызнаць для Беларусі несапраўднымі». Да ўсталявання законаў БНР усім установам і ўрадавым арганізацыям загадвалася карыстацца законамі былога Часовага ўрада Расійскай рэспублікі.

Рада БНР звярнулася да іншых краін з просьбай прызнаць яе дзяржаўнасць. Так, у двух зваротах да Германіі гаварылася, што анархія, якая апанавала ўсход (мелася на ўвазе бальшавіцкая рэвалюцыя. – *У. С.*), можа распаўсюдзіцца на тэрыторыю Беларусі, а потым і далей на захад. Рада БНР з улікам «маральнай адказнасці Германіі за далейшы лёс Беларусі» падкрэслівала, што «прызнанне Германіяй незалежнасці Беларусі надзвычай своечасовае і неабходнае як у інтарэсах Беларусі, так і ў інтарэсах самой Германіі». У сувязі з гэтым Рада прасіла германскі ўрад падтрымаць беларускую дзяржаўнасць і аказаць БНР дапамогу для ваеннай самаабароны[355]. Германія адказала, што перашкодай да прызнання незалежнасці Беларусі з'яўляецца Брэсцкі мірны дагавор з РСФСР, згодна з якім Германія абавязвалася не падтрымліваць новых дзяржаўных утварэнняў на тэрыторыі былой Расіі. Нямецкія акупацыйныя ўлады ў Беларусі афіцыйна не прызналі БНР, не аказвалі

---

[353] За дзяржаўную незалежнасць Беларусі. Дакументы і матэрыялы / пад рэд. І. Касяка. Лондан, 1960. С. 22–23.

[354] По воле народа: Из истории образования Белорусской ССР и создания Коммунистической партии Белоруссии / [сост.: М. Ф. Шумейко и др.]. Минск, 1988. С. 71–73.

[355] За дзяржаўную незалежнасць Беларусі ... С. 32.

садзейнічання ў яе дзейнасці і, нягледзячы на яе просьбы, не давалі ёй ніякіх уладных паўнамоцтваў, аднак яны лаяльна аднесліся да факта абвяшчэння незалежнасці БНР.

БНР не прызналі і галоўныя дзяржавы Антанты – Вялікабрытанія, Францыя і ЗША, аднак шэраг еўрапейскіх краін, у тым ліку Эстонія, Латвія, Грузія, Арменія, Фінляндыя, Літва, Украіна, Польшча, падтрымлівалі з урадам БНР больш ці менш цесныя палітычныя і эканамічныя адносіны. Адной з прычын непрызнання беларускай дзяржаўнасці краінамі Антанты была аднабокая арыентацыя БНР на Германію. Пасля Лістападаўскай рэвалюцыі 1918 г. у Германіі, анулявання Савецкай Расіяй Брэсцкага міру і адыходу немцаў з тэрыторыі Беларусі ўрад БНР эмігрыраваў за мяжу.

Такім чынам, першая ў XX ст. спроба ўтварэння беларускай нацыянальнай дзяржавы і адраджэння пасля стогадовага небыцця беларускай дзяржаўнасці аказалася няўдалай. На думку вядомага беларускага гісторыка і правазнаўцы В. А. Круталевіча, былі дзве альтэрнатывы стварэнню БНР. З аднаго боку, беларускія эсэры разлічвалі на тое, што Вялікабрытанія, Францыя і ЗША будуць зацікаўлены ў стварэнні беларускай дзяржавы «заходняга ўзору» як звяна ў «санітарным кардоне» буржуазнай Еўропы вакол Савецкай Расіі.

З другога боку, групоўкі паланафільскай арыентацыі (А. Луцкевіча, Я. Лёсіка, Р. Скірмунта, В. Гадлеўскага і інш.), звязаныя з польскімі памешчыкамі і каталіцкім духавенствам, лічылі, што трэба любым спосабам атрымаць дзяржаўнасць у саюзе з Польшчай[356]. Гэтая ідэя знайшла падмацаванне з польскага боку, калі ў час савецка-польскай вайны Ю. Пілсудскі заявіў, што ён прыхільнік федэрацыі Польшчы, Беларусі, Літвы і Украіны як раўнапраўных дзяржаўных адзінак, але далей гэтага абяцання справа не пайшла.

Уздым нацыянальнай самасвядомасці ў гады перабудовы выклікаў значны інтарэс беларускай грамадскасці і вучоных да месца і ролі БНР у навейшай гісторыі Беларусі. Стала відавочнай адсутнасць ці абмежаванасць ведаў пра дзейнасць БНР, яе ўнутраную і знешнюю палітыку, далейшы лёс. Вакол БНР разгарнулася ідэйна-палітычная і навуковая палеміка. Большасць гісторыкаў называлі БНР толькі «ідэяй», а не дзяржавай. Гэтую думку ў час дыскусій выказалі гісторыкі М. Сташкевіч, М. Кузняцоў, А. Хацкевіч, А. Залескі. У заключэнні АН БССР, Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ і Міністэрства юстыцыі БССР (сакавік 1990 г.) быў зроблены вывад аб тым, што БНР ніколі не з’яўлялася дзяржаўным утварэннем[357].

---

[356] На скрыжаванні думак ... С. 51–52.
[357] Совет. Белоруссия. 1990. 23 сак.

Прадстаўнікі Беларускага народнага фронту і некаторыя гісторыкі лічылі БНР дзяржаўным утварэннем, а абвешчаную Трэцяй Устаўной граматай Рады БНР незалежнасць Беларусі называлі першым дэклараваннем суверэнітэту беларускага народа. Яны падкрэслівалі, што БНР нельга лічыць толькі «ідэяй», якая нібыта мела вузка абмежаваны, буржуазны і дробнабуржуазны характар.

На нашу думку, БНР была першай спробай адраджэння беларускай дзяржаўнасці, зробленай у неспрыяльных унутраных і знешніх умовах. З-за кароткага тэрміну свайго існавання на акупаванай тэрыторыі БНР не змагла набыць неад'емных і важнейшых элементаў суверэнітэту: кантролю над уласнай этнічнай тэрыторыяй, функцыянавання сістэмы дзяржаўнай улады, правамоцнасці яе законаў. Яе знешняя палітыка арыентавалася на Германію. Тым не менш, як адзначае В. Круталевіч: «У асобе Рады БНР была створана палітычная структура, свайго роду цэнтр, які прэтэндаваў быць прадстаўніком інтарэсаў беларускага народа... Ён выступіў у ролі абаронцы інтарэсаў нацыі, яе правоў на самастойную дзяржаўнасць. Называючы сябе дзяржаўным органам, Рада БНР і Народны сакратарыят звярталіся непасрэдна да ўрадаў замежных дзяржаў з заявамі, мемарандумамі і г. д.»[358].

Факт абвяшчэння беларускай дзяржаўнасці мае вялікае гістарычнае значэнне як выяўленне права на самавызначэнне беларускага народа. Маючы на ўвазе яго залежнасць ад геапалітычных фактараў, абвяшчэнне БНР нацыянальнымі партыямі трэба разглядадь, як адзначыў гісторык Л. Лойка, «перш за ўсё як акт самаабароны, як спробу мірным шляхам захаваць беларускі народ ад каланіяльнага прыгнёту нямецкіх мілітарыстаў і манаполій, як зварот да сусветнай грамадскасці з заявай аб імкненні беларускай нацыі да самавызначэння»[359], які прадухіліў прэтэнзіі суседзяў да беларускіх тэрыторый як «нічыйных». Заслуга БНР заключаецца і ў тым, што фактам свайго абвяшчэння яна паказала кіраўнікам Савецкай Расіі і бальшавікам Беларусі, што беларускі народ падрыхтаваны да таго, каб мець уласную дзяржаву.

Разгледзім пытанне, як Ленін і партыя бальшавікоў ставіліся да нацыянальнага самавызначэння Беларусі. Вядома, што напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі (1 кастрычніка 1917 г.) Ленін у працы «Ці ўтрымаюць бальшавікі дзяржаўную ўладу» прадугледжваў «неадкладнае аднаўленне поўнай свабоды для Фінляндыі, Украіны, Беларусі, для мусульман і г. д.»[360] пасля прыходу пралетарыяту да ўлады. Аднак пасля

[358] *Круталевіч В.* 25 сакавіка 1918 г. у гісторыі самавызначэння Беларусі // Полацак. 1991. № 5. С. 29.

[359] Звязда. 1990. 13 кастр.

[360] *Ленін У. І.* Выбраныя творы : у 10 т. Мінск, 1986—1991. Т. 7. 1990. С. 430.

Кастрычніцкай рэвалюцыі аж да снежня 1918 г. ЦК РКП(б) не ставіў пытання аб беларускай дзяржаўнасці. У партыі была группа дзеячаў, якая недаацэньвала ці нават зусім ігнаравала нацыянальнае пытанне. Ім, ахопленым ідэяй сусветнай рэвалюцыі, было не да самавызначэння беларускага ці іншых народаў былой Расійскай імперыі. Нават калі ўжо на захадзе краіны ўзніклі пяць савецкіх рэспублік: Беларусь, Украіна, Літва, Латвія і Эстонія, М. І. Бухарын заявіў на VIII з'ездзе партыі (сакавік 1919 г.), што не разумее гэтую «гульню ў самавызначэнне». Кіраўнікі Заходняй вобласці, і перш за ўсё А. Ф. Мяснікоў (армянін), В. Г. Кнорын (латыш), М. В. Фрунзе (малдаванін), не лічылі беларусаў за нацыю і бачылі ў іх толькі этнаграфічную галіну рускага народа.

Вось як аб гэтым пісаў пазней В. Г. Кнорын: «Мы лічылі, што беларусы не з'яўляюцца нацыяй і што тыя этнаграфічныя асаблівасці, якія іх аддзяляюць ад астатніх рускіх, павінны быць зжыты. Нашай задачай з'яўляецца не стварэнне новых нацый, а знішчэнне старых нацыянальных рагатак»[361]. Пры гэтым ён зыходзіў з таго, што пасля перамогі савецкай улады палажэнне аб самавызначэнні народаў стала рэакцыйным, накіраваным супраць дыктатуры пралетарыяту і павінна быць адкінута.

Такая пазіцыя кіраўнікоў Заходняй вобласці ўплывала на палітыку цэнтральных органаў Савецкай Расіі. Напрыклад, пасля вызвалення Беларусі ад нямецкіх акупантаў восенню 1918 г. «абласнікі» на чале з А. Ф. Мясніковым актыўна выступалі супраць перайменавання Заходняй вобласці і за яе захаванне як адміністрацыйнай адзінкі ў складзе РСФСР. Яны лічылі, што этнічнай, культурнай блізкасці з рускім народам дастаткова, каб задаволіць жаданне беларусаў застацца ў складзе РСФСР. Другую пазіцыю займалі кіраўнікі беларускіх секцый РКП(б) і Белнацкама, якія на III з'ездзе Саветаў Заходняй вобласці (верасень 1918 г.) прапанавалі пераўтварыць Заходнюю вобласць у Беларуска-Літоўскую камуну ці аўтаномную рэспубліку ў складзе РСФСР.

Пазіцыя дзяржаўнага і партыйнага кіраўніцтва Савецкай Расіі на карысць самавызначэння Беларусі змянілася толькі ў снежні 1918 г., калі ЦК партыі прыняў рашэнне абвясціць Беларускую савецкую рэспубліку пасля вызвалення беларускай зямлі ад нямецкай акупацыі. Нельга было адмаўляць права на самавызначэнне беларускага народа ў той час, калі ў Прыбалтыцы ствараліся тры нацыянальныя рэспублікі і калі ўжо існавала Украінская Савецкая Рэспубліка.

Аднак Ленін і іншыя кіраўнікі РКП(б) пры абвяшчэнні беларускай савецкай дзяржавы перш за ўсё ўлічвалі міжнародныя фактары,

[361] *Кнорин В. Г.* Избранные статьи и речи. Минск, 1990. С. 12.

звязаныя з планамі сусветнай рэвалюцыі. Утварэннем Беларускай савецкай рэспублікі ЦК партыі спадзяваўся ўздзейнічаць на рэвалюцыйныя падзеі на Захадзе, асабліва ў Польшчы і Германіі. Браліся пад увагу і геапалітычныя інтарэсы Савецкай Расіі. Улічваючы антысавецкую палітыку Польшчы, кіраўніцтва РКП(б) хацела, напэўна, стварыць буферную дзяржаву паміж РСФСР і Польшчай, і гэтая роля адводзілася Беларусі. Такім чынам, абвяшчэнне беларускай савецкай дзяржаўнасці 1 студзеня 1919 г. з'явілася вынікам як палітыкі партыі бальшавікоў на чале з Леніным, так і дзейнасці беларускага нацыянальна-адраджэнцкага руху, які адлюстроўваў інтарэсы рабочых, сялян, народнай інтэлігенцыі. І ў гэтым плане БНР выступае папярэднікам БССР.

БССР выступіла на міжнароднай арэне ў якасці суб'екта міжнароднага права. Асноўнымі актамі, якія ахаплівалі працэс канстытуявання новай дзяржавы, былі Маніфест аб абвяшчэнні БССР ад 1 студзеня 1919 г., прызнанне РСФСР незалежнасці БССР і рашэнні І Усебеларускага з'езда саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў ад 2–3 лютага 1919 г. З'езд прыняў першую Канстытуцыю БССР і звярнуўся да ўсіх народаў і ўрадаў з прапановай аб прызнанні самастойнасці рэспублікі і ўстанаўленні дыпламатычных адносін з ёю. Аднак першая Канстытуцыя ніяк не вызначыла знешнепалітычных мэтаў, задач і прынцыпаў беларускай дзяржавы. Важнае значэнне для прызнання БССР суверэнным удзельнікам міжнародных адносін меў факт прызнання яе незалежнасці з боку РСФСР. 31 студзеня 1919 г. Прэзідыум ВЦВК прыняў пастанову «Аб прызнанні незалежнасці Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі», у якой падкрэсліў, што «факт прыналежнасці Беларусі, як і іншых, што знаходзіліся ў тым жа стане, краін, да старой царскай імперыі не накладвае на яе ніякіх абавязацельстваў»[362].

Аднак з моманту свайго стварэння БССР апынулася ў цяжкіх умовах унутранай разрухі, грамадзянскай вайны і пагрозы іншаземнай інтэрвенцыі. Гэта абумовіла яе першыя крокі, накіраваныя на аб'яднанне сіл з РСФСР і іншымі савецкімі рэспублікамі. 16 студаеня 1919 г. на аснове рашэння ЦК РКП(б) аб далучэнні да РСФСР трох губерняў (Магілёўскай, Віцебскай і Смаленскай) і аб'яднанні БССР (у складзе Мінскай і часткі Гродзенскай губерняў) з Літвой, утварэнні Літоўска-Беларускай рэспублікі І Усебеларускі з'езд саветаў выказаўся за «неадкладнае зліццё з Літоўскай Савецкай Рэспублікай, разглядаючы гэта як першы крок да аб'яднання на федэратыўных пачатках усіх савецкіх рэспублік[363].

[362] Сборник указов РСФСР. 1919. № 3. С. 31.

[363] КП(б)Б у рэзалюцыях. Мінск, 1934. Ч. 1 : (1919–1932) / пад рэд. А. І. Зюзькова. С. 135.

У гэтым рашэнні, прынятым па рэкамендацыі з Масквы і зацверджаным вышэйшымі дзяржаўнымі і партыйнымі органамі рэспублікі, зноў праявіўся пэўны нацыянальны нігілізм тагачаснага беларускага кіраўніцтва і шырокіх мас рабочых, сялян і чырвонаармейцаў. Згода аддаць РСФСР тры беларускія губерні і зліцца з Літвой у адзінай дзяржаве была абумоўлена, натуральна, не нацыянальнымі пачуццямі, а меркаваннямі палітычнага моманту, неабходнасцю ўзброенай абароны савецкай улады. У бальшавіцкага кіраўніцтва існавала ідэя, як піша акадэмік АН БССР І. М. Ігнаценка, «выкарыстаць перамогу рэвалюцыі ў Германіі для таго, каб праштурхнуць сацыялістычную рэвалюцыю на Захад. І ў гэтым плане ЛітБел, якая ішла далей, мела больш рацыі, чым адна рэспубліка»[364].

Створаны 27 лютага 1919 г. урад Літоўска-Беларускай ССР ва ўмовах узмацнення агрэсіі з боку Польшчы літаральна на другі дзень свайго існавання выступіў з Дэкларацыяй аб знешняй палітыцы, у якой прапанаваў польскаму ўраду вырашыць усе спрэчныя пытанні шляхам перагавораў і пагаджальнай працэдуры[365]. Аднак Польшча, адхіліўшы гэтыя прапановы, пачала вайну і да восені 1919 г. уся тэрыторыя ЛітБел была акупавана. Гэтая акалічнасць, як і стварэнне Літоўскай Рэспублікі, вызначыла канец існавання ЛітБел.

У час савецка-польскай вайны БССР, суверэнітэт якой не прызнаваў польскі ўрад, абапіралася на ўсталяваны ваенны і дыпламатычны саюз з РСФСР і іншымі савецкімі рэспублікамі. У прынятай пасля вызвалення Мінска 31 ліпеня 1920 г. Дэкларацыі аб абвяшчэнні незалежнасці ССРБ, у якой зацвярджаліся асноўныя прынцыпы ўнутранай і знешняй палітыкі, сфармуляваныя ў Маніфесце аб утварэнні БССР, адзначалася: «Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусь, знаходзячыся ва ўзаемаадносінах з Савецкай Расіяй як роўная з роўнай, перадае на ўвесь час рэвалюцыйных войнаў усе свае ўзброеныя сілы ў распараджэнне адзінага камандавання ўзброеных сіл усіх Савецкіх рэспублік, а таксама заяўляе, што ўсе дыпламатычныя выступленні ССРБ будуць узгадняцца з выступленнямі РСФСР і будуць мець на ўвазе агульныя інтарэсы ўсіх Савецкіх рэспублік, пабудаваныя на прынцыпах дыктатуры пралетарыяту»[366].

---

[364] На скрыжаванні думак ... С. 45.

[365] Документы внешней политики СССР : в 24 т. М., 1957–2000. Т. 2 : (1 января 1919 г. – 30 июня 1920 г.) / редкол.: Г. К. Деев [и др.]. 1958. С. 85.

[366] Документы внешней политики СССР. Т. 3 (1 июля 1920 г. – 18 марта 1921 г.) / редкол.: Г. А. Белов [и др.]. М., 1959. С. 74.

Аднак і ў перыяд савецка-польскай вайны нацыянальныя інтарэсы беларусаў не былі ўлічаны, калі ўзнікла магчымасць распаўсюджання ідэй сусветнай рэвалюцыі на Захад. Восенню 1920 г., калі значная частка тэрыторыі рэспублікі была зноў акупавана польскімі войскамі, Ваенна-рэвалюцыйны камітэт БССР у якасці вышэйшага часовага органа ўлады выдаў РСФСР «самы шырокі мандат на вядзенне мірных перагавораў з Польшчай па пытанні галоўным чынам вызначэння межаў Беларусі».

Дагавор аб перамір'і і прэлімінарных умовах міру з Польшчай, падпісаны ў кастрычніку 1920 г. аб'яднанай расійска-ўкраінскай дэлегацыяй, зафіксаваў прызнанне Польшчай незалежнасці Украіны і Беларусі. Гэта быў першы акт юрыдычнага прызнання БССР з боку замежнай дзяржавы. Аднак куплены ён быў дарагой цаной, бо дагавор прадугледжваў пераход пад уладу Польшчы значнай часткі тэрыторыі рэспублікі (каля 108 тыс. кв. км) з насельніцтвам больш за 4 млн чалавек. Рыжскі мірны дагавор, заключаны паміж РСФСР (і па ўпаўнаважанні ўрада БССР) і УССР, з аднаго боку, і Польшчай – з другога 18 сакавіка 1921 г., разарваў Беларусь на дзве часткі і замацаваў пераход Заходняй Беларусі да Польшчы.

Такім чынам, у выніку Брэсцкага міру з Германіяй 1918 г. і Рыжскага міру з Польшчай 1921 г., заключаных Савецкай Расіяй пад прымусам знешніх абставін, – значная частка тэрыторыі і насельніцтва Беларусі перайшла пад юрысдыкцыю іншых дзяржаў. У абодвух выпадках пры падпісанні гэтых важнейшых для вырашэння лёсу беларускага народа дакументаў адсутнічалі яго праўдзейныя прадстаўнікі. І калі гэта можна было зразумець пры заключэнні Брэсцкага міру (тады яшчэ не існавала беларускай дзяржаўнасці – ні БНР, ні БССР), калі немцам аддавалі беларускую зямлю, якую называлі Заходняй вобласцю, то ў выпадку з Рыжскім мірам, падпісаным «і па ўпаўнаважанні БССР», кіраўніцтва рэспублікі фактычна давала карт-бланш дэлегацыі РСФСР на вырашэнне лёсу беларускага народа.

Нацыянальны нігілізм, ігнараванне гісторыка-этнаграфічных межаў рассялення беларусаў і іх нацыянальнага гонару з боку кіраўнікоў толькі што народжанай БССР, як і Савецкай Расіі праявіліся і ў тым, што тры губерні, што ўваходзілі ў склад БССР, былі перададзены РСФСР перад уваходжаннем рэспублікі ў склад ЛітБел. Пасля другога абвяшчэння незалежнасці БССР у 1920 г. яе тэрыторыя складалася толькі з шасці паветаў. І. М. Ігнаценка адзначае, што ў 1920 г. «Беларусь знаходзілася ў такіх умовах, калі рэальнай падставы існавання суверэннай рэспублікі не было»[367].

[367] На скрыжаванні думак ... С. 45.

У складаных умовах 1919—1922 гг. БССР праводзіла даволі актыўную знешнюю палітыку, цесна каардынуючы яе з РСФСР, хоць ужо ў гэты перыяд беларускі ўрад пайшоў на значна большае абмежаванне свайго суверэнітэту на карысць урада РСФСР, чым Украіна. Сумесна з РСФСР і УССР Беларуская ССР падпісала шэраг пагадненняў з замежнымі краінамі. У 1922 г. пасля падпісання пагаднення ў Рапала паміж РСФСР і Германіяй апошняя прызнала БССР дэ-юрэ. Беларусь устанавіла дыпламатычныя адносіны з Польшчай і Германіяй. Гэта было значнае дасягненне беларускай дыпламатыі, якое сведчыла аб прызнанні БССР замежнымі краінамі ў якасці суб'екта міжнароднага права. Адносіны дэ-факта ў гэты час рэспубліка падтрымлівала з Літвой, Латвіяй, Эстоніяй, Аўстрыяй, Чэхаславакіяй, Турцыяй, Італіяй і Вялікабрытаніяй.

Уступленне БССР у склад Саюза ССР вызначыла новы этап у гісторыі беларускай дзяржаўнасці, істотна змяніла месца і ролю знешнепалітычных функцый БССР, як і іншых саюзных рэспублік. Знешнепалітычныя паўнамоцтвы былі перададзены цэнтральным органам Саюза. У 1923 г. былі ліквідаваны рэспубліканскія народныя камісарыяты па знешніх справах (у тым ліку і ў БССР), створана адзінае знешнепалітычнае ведамства – Народны камісарыят замежных спраў СССР. БССР, як і іншыя рэспублікі, магла ўдзельнічаць у міжнароднай дзейнасці СССР праз сваіх прадстаўнікоў на агульнасаюзных з'ездах саветаў, у вярхоўных і цэнтральных органах улады; праз пастаяннае прадстаўніцтва ўрада БССР пры СНК краіны; праз заснаваныя пры СНК БССР упраўленні ўпаўнаважаных агульнасаюзных народных камісарыятаў па замежных справах і знешнім гандлі.

Прававой асновай выяўлення спецыфічных асаблівасцей і патрэб рэспублікі, абароны яе знешнепалітычных інтарэсаў павінны былі стаць артыкулы Канстытуцыі БССР (ухваленай сесіяй ЦВК БССР у 1925 г. і зацверджанай Усебеларускім з'ездам Саветаў у 1927 г.), змешчаныя ў спецыяльнай главе «Узаемаадносіны з Саюзам ССР». Яны размяжоўвалі функцыі рэспублікі і федэрацыі, у тым ліку ў галіне знешніх зносін. Так, Канстытуцыя замацавала палажэнне, паводле якога рэспубліка перадавала вышэйшым саюзным органам «частку сваіх суверэнных правоў, дакладна вызначаных Канстытуцыяй Саюза», а да кампетэнцыі БССР адносіліся «заканадаўчая ініцыятыва, удзел у распрацоўцы пытанняў, а ў належных выпадках і выкананне... па пытаннях знешняга гандлю і замежных»[368]. Канстытуцыя вызначыла задачу пастаяннага прадстаўніцтва СНК БССР: «...правядзенне ў цэнтральных органах улады Саюза заканадаўчых дапушчэнняў урада БССР, удзел ад імя БССР

[368] Конституция (Основной закон) БССР. Минск, 1925. С. 8, 10, 15.

у заканадаўчай дзейнасці цэнтральных органаў улады Саюза ССР і абарона ў іх асобых запатрабаванняў БССР».

Другім каналам абароны нацыянальных інтарэсаў пасля ўваходу рэспублікі ў Саюз стала заканадаўства аб грамадзянстве і правах іншаземцаў, а таксама па рэгуляванні рэжыму дзяржаўных граніц з замежнымі краінамі. Палажэнне аб Народным камісарыяце замежных спраў СССР, зацверджанае ў 1923 г. і дапоўненае ў 1926 г., дазваляла ўрадам рэспублік назначыць спецыяльных сакратароў і дарадцаў у замежныя агульнасаюзныя дыпламатычныя прадстаўніцтвы ў тых краінах, якія мелі для іх асаблівы інтарэс. Так, некалькі гадоў прадстаўнік БССР быў саветнікам пасольства Саюза ССР у Польшчы, выконваў яго даручэнні і інфармаваў урад БССР аб сваёй дзейнасці.

Аднак асноўная знешнепалітычная дзейнасць ажыццяўлялася праз адпаведныя саюзныя органы, і практычны ўплыў рэспублікі на гэтыя працэсы быў даволі абмежаваны. Можа, таму VI, VIII, IX Усебеларускія з'езды саветаў, закранаючы пытанні адносін з замежнымі дзяржавамі ў другой палове 1920-х гг., практычна не абмяркоўвалі іх, а ў асноўным ухвалялі знешнепалітычныя акцыі краіны, заяўлялі аб сваіх міралюбівых імкненнях. І толькі пастанова сесіі ЦБК БССР (лістапад 1924 г.) абавязала яго Прэзідыум і СНК БССР дамагацца праз саюзны камісарыят правядзення польскім урадам мерапрыемстваў па недапушчэнні варожых Савецкай Беларусі акцый з польскай тэрыторыі[369].

Беларусізацыя, развіццё нацыянальнай культуры, ажыццяўленне новай эканамічнай палітыкі абумовілі даволі значны для таго часу ўзровень гандлёвых і культурных сувязей рэспублікі, стварэнне адпаведных органаў. З улікам новых умоў гаспадарання ў маі 1926 г. пачаў функцыянаваць Народны камісарыят знешняга і ўнутранага гандлю. У Германіі, Польшчы, Вялікабрытаніі, Латвіі дзейнічалі гандлёвыя прадстаўніцтвы Белзнешгандлю і Народнага камісарыята гандлю БССР, а таксама прадстаўніцтвы, канторы, бюро лесаэкспартных трэстаў Беларусі.

Аднак ужо канец 1920 – пачатак 1930-х гг. характарызаваліся сур'ёзным умацаваннем камандна-адміністрацыйнай сістэмы кіравання ўсімі справамі грамадства і дзяржавы, звышцэнтралізацыяй улады ў саюзных органах і ведамствах. Адносіны паміж рэспублікамі і федэрацыяй набывалі ўсё больш характар падначаленасці, залежнасці ад саюзных партыйных і дзяржаўных органаў. Немагчымасць самастойна вырашаць пытанні сацыяльна-палітычнага, эканамічнага і культурнага развіцця, дыктат цэнтра вызначылі дэкларатыўнасць суверэнітэту БССР у галіне

[369] Стэнаграфічны запіс трэцяй сесіі Цэнтральнага выканаўчага камітэта БССР VI склікання. Мінск, 1924. С. 110–115.

як унутранага, так і знешнепалітычнага жыцця. Складвалася па сутнасці ўнітарная дзяржава, касцяком якой стала камандна-адміністрацыйная сістэма кіравання грамадскім жыццём, эканомікай, культурай, знешняй палітыкай.

Гэта выключала магчымасць рэальнага нацыянальна-дзяржаўнага суверэнітэту, што пацвердзілі і асноўныя палажэнні Канстытуцыі СССР 1936 г. і Канстытуцыі БССР 1937 г. Яны не ўключалі ў сябе, як гэта было раней, палажэнні Саюзнага дагавора аб стварэнні СССР. Не толькі адсутнічала глава «Аб суверэнных правах саюзных рэспублік і аб саюзным грамадзянстве», але нават сам дагавор не ўпамінаўся. Да кампетэнцыі Саюза было аднесена вызначэнне асноў заканадаўства, г. зн. прынцыпы адносін з рэспублікамі ва ўсіх сферах унутранага і знешняга жыцця вырашаліся цэнтрам, які не лічыў патрэбным прыслухоўвацца да меркаванняў нацыянальна-дзяржаўных утварэнняў. Канстытуцыя прадугледжвала, што Саюз прадстаўляе краіну ў міжнародных зносінах, падпісвае, ратыфікуе ці дэнансуе дагаворы з іншымі дзяржавамі. Ні саюзная, ні рэспубліканская канстытуцыі, іншыя дзяржаўныя акты не размяжоўвалі знешнепалітычную кампетэнцыю федэрацыі і яе членаў. У гэтых умовах зацвердзілася практыка, калі ніводная знешнепалітычная ці знешнеэканамічная акцыя не магла ажыццяўляцца без рашэння адпаведных саюзных органаў партыйнай і дзяржаўнай улады.

Неабмежаванасць улады саюзных органаў замацоўвалася палажэннямі Канстытуцыі 1936 г., якія надавалі Вярхоўнаму Савету СССР права самастойнага пашырэння ці звужэння сваёй кампетэнцыі і кампетэнцыі іншых органаў Саюза ў якасці паправак да Канстытуцыі, а таксама права Саюза прымаць меры на забеспячэнні «адпаведнасці канстытуцый саюзных рэспублік Канстытуцыі СССР». Канстытуцыя 1936 г. замацавала памылковае разуменне вышэйшым дзяржаўным і партыйным кіраўніцтвам краіны ленінскага палажэння аб пераходным характары савецкай федэрацыі, якая яшчэ ў рамках сацыялізму павінна перарасці ў «сацыялістычны ўнітарызм»[370].

У гэтых абставінах натуральнае жаданне народаў развіваць нацыянальную культуру, мову, зберагаць сваю гістарычную спадчыну, традыцыі, праяўленне імі пачуццяў нацыянальнай годнасці, самасвядомасці ўспрымаліся цэнтрам як нацыяналістычныя, проціпастаўляліся інтэрнацыянальным інтарэсам, якія разумеліся як нешта безнацыянальнае. Барацьба ў Беларусі з «нацдэмамі», масавыя рэпрэсіі 1930-х гг., якія сур'ёзна закранулі ўсе пласты грамадства, асабліва нацыянальную інтэлігенцыю, наложылі негатыўны адбітак на замежныя сувязі, звузілі

[370] *Сталин И. В.* Соч. Т. 4. С. 73.

іх памеры, сферы ажыццяўлення. Зарубежныя кантакты ва ўмовах палітыкі ізаляцыі савецкага народа ад знешняга свету, пагранічнага з «варожым лагерам» становішча рэспублікі, раздзеленасці беларускага народа і знаходжанне значнай яго часткі ў складзе Польшчы сталі дадатковымі крыніцамі падазронасці і недаверу.

Адным з многіх прыкладаў гэтага можа служыць вельмі тэндэнцыйнае меркаванне аб Беларускай акадэмічнай канферэнцыі 1926 г. па пытаннях развіцця беларускай мовы, якая сабрала вядомых вучоных Масквы, Ленінграда, Кіева, Рыгі, Вільнюса, Варшавы, Прагі і атрымала шырокі водгук у славянскім свеце. Беларускі літаратар Р. Выдра зусім па-бальшавіцку кваліфікаваў у пачатку 1930-х гг. гэтую падзею: «У 1926 г. у Мінску адбылося доўгачаканае “аб’яднанне” ўсіх беларусаўнацдэмаў БССР і фашыстаў-беларусаў суседніх краін пад прыкрыццём “Беларускай акадэмічней канферэнцыі”. Значэнне гэтай канферэнцыі, між іншым, заключаецца ў тым, што на ёй было завуалявана, падпольна ўстаноўлена палітычнае і арганізацыйнае супрацоўніцтва беларускіх нацдэмаў БССР з беларускімі фашыстамі з Польшчы, Заходняй Беларусі і іншых краін»[371].

Да насельніцтва Савецкай Беларусі даходзілі водгукі трагедыі Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ) – састаўной часткі Камуністычнай партыі Польшчы (КПП), якая неабгрунтавана абвінавачвалася ў тым, што яе кіраўніцтва нібыта служыла пілсудскай ваеннай арганізацыі і палітычнай паліцыі. Летам 1937 г. было выклікана ў Маскву і арыштавана практычна ўсё кіраўніцтва Кампартыі Польшчы. Прадстаўнікі Выканкама Камінтэрна распаўсюдзілі сярод членаў КПП, КПЗБ і КПЗУ дакумент, у якім сцвярджалася, што Камінтэрн пасля выкрыцця шырока разгалінаванай правакатарскай сеткі вырашыў распусціць КПП, а той, хто не падпарадкуецца гэтаму, будзе лічыцца правакатарам.

З другой паловы 1930-х гг. міжнародныя сувязі БССР ва ўмовах распаўсюджвання фашызму і ўзмацнення пагрозы вайны, нарастання ў краіне атмасферы ўсеагульнай падазронасці і страху, рэпрэсій, адарванасці савецкага народа ад знешняга свету апынуліся ў заняпадзе. Спыніла сваю дзейнасць Беларускае таварыства культурнай сувязі з замяжкой, створанае ў 1926 г. Навуковыя кантакты звяліся ў асноўным да кнігаабмену. Гандлёва-эканамічныя сувязі практычна абарваліся. Падтрымка міжнародных антыфашысцкіх мерапрыемстваў, акты салідарнасці з класавай барацьбой замежнага пралетарыяту і ўдзел у дзейнасці

[371] *Выдра Р.* Беларускі нацдэмакратызм у краязнаўчым руху БССР // Навука на службе нацдэмаўскай контррэвалюцыі. Мінск, 1932. С. 71.

Міжнароднай арганізацыі дапамогі барацьбітам рэвалюцыі — вось галоўныя напрамкі сувязі з замежнай грамадскасцю.

Міжнародныя сувязі рэспублікі перажывалі значны рост і пашырэнне ў 1920-я гг., што было выклікана сацыяльна-эканамічнымі, культурнымі, нацыянальнымі працэсамі таго часу, і спад у 1930-я гг. Пасля ўваходу рэспублікі ў склад Саюза кіраўніцтва рэспублікі ніяк не ўдзельнічала ў падрыхтоўцы і заключэнні важных міжнародных пагадненняў, падпісаных савецкім урадам, якія непасрэдна закраналі нацыянальна-дзяржаўныя інтарэсы БССР. У прыватнасці, савецка-германскія дамоўленасці 1939—1940-х гг., у тым ліку сакрэтны пратакол аб размежаванні сфер уплыву ў Польшчы (які датычыўся Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны), з'яўляліся сакрэтам і для беларускага кіраўніцтва, а не толькі для народа. А сам па сабе гістарычна справядлівы і апраўданы акт уз'яднання беларускага і ўкраінскага народаў быў ажыццёўлены 17 верасня 1939 г. непрыгоднымі сродкамі: на аснове змовы Сталіна і Гітлера, шляхам узброенага ўварвання Чырвонай Арміі на тэрыторыю польскай дзяржавы, якая стагнала ад нямецка-фашысцкага нашэсця. Дарэчы, у абарончай вайне палякаў разам з Войскам Польскім прымалі ўдзел у якасці яго байцоў тысячы беларусаў і палякаў з тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Без узгаднення з беларускім народам і вышэйшымі органамі яго дзяржаўнай улады, без іх згоды, без уліку этнічных межаў сталінска- молатаўская дыпламатыя ў 1939—1940-х гг. перадала Літве Віленскі край (за выключэннем паласы ад Гродна да Маладзечна), а таксама Свянцянскі і частку пяці іншых раёнаў Баранавіцкай і Віленскай абласцей БССР. Такую страту панёс беларускі народ за падпісанне Дагавора ад 10 кастрычніка 1939 г. паміж СССР і Літвой (згодна з якім на яе тэрыторыі размяшчаліся чырвонаармейскія гарнізоны) і далучэнне Літвы 3 жніўня 1940 г. да Саюза ССР. Свае імперскія памкненні сталінскае кіраўніцтва задавальняла за кошт тэрытарыяльных уступак, а таксама іншых інтарэсаў беларускага народа, зневажаючы яго суверэнныя правы і годнасць.

Новая ступень арганізацыі і ажыццяўлення знешнепалітычных сувязей рэспублікі звязана з прыняццем Вярхоўным Саветам СССР у лютым 1944 г. Закона «Аб прадастаўленні саюзным рэспублікам паўнамоцтваў у галіне знешніх зносін і аб пераўтварэнні ў сувязі з гэтым Народнага камісарыята замежных спраў з агульнасаюзнага ў саюзна-рэспубліканскі Народны камісарыят». На сесіі Вярхоўнага Савета рэспублікі (сакавік 1944 г.) адпаведныя змены былі замацаваны ў Канстытуцыі БССР. Артыкул 16а зафіксаваў, што «Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка мае права ўступаць у непасрэдныя зносіны з замежнымі

дзяржавамі, заключаць з імі пагадненні і абменьвацца дыпламатычнымі і консульскімі прадстаўнікамі»[372].

Пашырэнне знешнепалітычнай кампетэнцыі рэспублік стварала больш спрыяльныя ўмовы для вырашэння імі сваіх спецыфічных гаспадарчых, культурных і іншых задач у галіне міжнародных адносін і садзейнічала пашырэнню замежных сувязей усяго Саюза. Аднак гэта была толькі адна з прычын прыняцця закона, бо рэалізаваць дадзеныя паўнамоцтвы ва ўмовах сталінскага таталітарызму (а ў значнай ступені і ў наступны час) аказалася надзвычай цяжкай справай: уся знешнепалітычная дзейнасць была сканцэнтравана ў саюзных органах, адсутнічала размежаванне функцый паміж рэспублікамі і федэрацыяй, не мелася адпаведных прававых актаў, якія абаранялі б нацыянальныя інтарэсы.

Вырашальнай акалічнасцю прыняцця закона ў 1944 г. быў перш за ўсё палітычны разлік савецкага партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва, які вынікаў з развіцця міжнароднай абстаноўкі. Вядома, што на маскоўскай канферэнцыі міністраў замежных спраў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі (кастрычнік 1943 г.), Тэгеранскай канферэнцыі кіраўнікоў трох саюзных дзяржаў (лістапад – снежань 1943 г.) абмяркоўваліся пытанні пасляваеннага ўладкавання свету і бяспекі народаў, у тым ліку і стварэння міжнароднай арганізацыі для падтрымання міру.

Закон аб прадастаўленні саюзным рэспублікам паўнамоцтваў у галіне знешніх зносін стаў юрыдычнай асновай пастаноўкі пытання аб іх членстве ў гэтай арганізацыі. Такая прапанова была выказана СССР на папярэдніх перагаворах аб стварэнні ААН, якія праходзілі восенню 1944 г. у Думбартон-Оксе. Аднак яна не атрымала падтрымкі заходніх дзяржаў, паколькі кваліфікавалася імі як памкненне да «множнага членства» з мэтай забеспячэння сабе пэўных пераваг у гэтай арганізацыі. Безумоўна, СССР меў намер такім чынам павялічыць свой уплыў на яе дзейнасць.

На Крымскай канферэнцыі (люты 1945 г.) пасля вострых дыскусій па шэрагу складаных і важных міжнародных праблем была дасягнута прынцыповая дамоўленасць аб прадстаўніцтве дзвюх з шаснаццаці рэспублік – Беларусі і Украіны. На ўстаноўчай канферэнцыі (Сан-Францыска, 1945 г.), абгрунтоўваючы права быць членамі-заснавальнікамі ААН, прадстаўнік СССР адзначаў суверэнны характар саюзных рэспублік, якія, згодна з саюзнай і рэспубліканскімі канстытуцыямі, маюць права на самавызначэнне і выхад са складу федэрацыі, падкрэсліваў іх уклад у разгром гітлераўскай Германіі. Савецкую прапанову падтрымалі прадстаўнікі

---

[372] Конституция (Основной Закон) Белорусской Советской Социалистической Республики. Минск, 1947. С. 8.

ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі, Кітая, Чэхаславакіі, Аўстрыі, Бразіліі, Ірана. Прынятае канферэнцыяй рашэнне запрасіць БССР і УССР быць першапачатковымі членамі ААН стала вырашальнай акалічнасцю выхаду гэтых рэспублік на міжнародную арэну ў якасці суб'ектаў міжнароднага права.

Вядома, што савецкая дыпламатыя, намагаючыся запрашэння рэспублік да членства ў міжнароднай арганізацыі, спасылалася на памеры тэрыторыі і насельніцтва гэтых, па выразу Сталіна, «дзвюх асноўных савецкіх рэспублік», іх гераічным укладам і велізарнымі ахвярамі ў барацьбе з фашызмам. Так было на самой справе, але справядлівымі з'яўляліся і довады заходняй дыпламатыі, Рузвельта і Чэрчыля, якія адносілі да галоўных прычын такой пастаноўкі пытання намаганні СССР мець два дадатковыя галасы ў Генеральнай Асамблеі ААН, а таксама спробу Сталіна задаволіць такім чынам нацыянальны гонар беларусаў і ўкраінцаў, сярод якіх (асабліва ва Украіне) за гады вайны вызначыўся апазіцыйны савецкай уладзе рух. Актам уключэння БССР і УССР у склад ААН Сталін і яго акружэнне хацелі паказаць сябе ў вачах сусветнай грамадскасці прыхільнікамі суверэннасці савецкіх народаў, умацаваць міжнародныя пазіцыі дзяржавы, затушаваць яе таталітарную і ўнітарную сутнасць.

Гэта пацвярджае і характар знешнепалітычнай дзейнасці тых рэспублік, якія не сталі членамі ААН, іх нязначная ўключанасць (асабліва да XX з'езда КПСС, 1956 г.) у міжнародныя адносіны краіны, да таго ж выключна праз саюзныя органы знешніх зносін. Сфера знешнепалітычнай дзейнасці БССР і УССР была значна шырэйшай, пазіцыя іх прадстаўнікоў гучала ў ААН і іншых міжнародных арганізацыях, пашыралася практыка заключэння двух- і шматбаковых дагавораў. Аднак было б вялікім спрашчэннем гаварыць аб суверэнітэце рэспублікі ў знешніх справах, аб самастойнасці яе дзеянняў і пазіцыі на міжнароднай арэне.

Адзін з крытэрыяў суверэнітэту, самастойнасці ў міжнародных справах – права на ўстанаўленне дыпламатычных зносін, абмен пасольствамі і консульствамі з замежнымі дзяржавамі. Як жа рэалізоўвалася гэтае права, якое рэспублікі атрымалі па законе 1944 г. (замацаванае затым і канстытуцыямі СССР і БССР 1977 і 1978 гг.)? На сваіх першых прэс-канферэнцыях (май 1945 г., Сан-Францыска) наркамы замежных спраў БССР і УССР К. В. Кісялёў і Д. З. Мануільскі гаварылі аб хуткім устанаўленні дыпламатычных адносін рэспублік з замежнымі дзяржавамі[373]. Хутчэй за ўсё яны шчыра верылі ў такую магчымасць. Але саюзнае

[373] Правда. 1945. 24, 25 мая.

кіраўніцтва не збіралася даваць рэспублікам такі важны інструмент знешняй палітыкі, як абмен пасольствамі, нават з пагранічнымі дзяржавамі, дзе рэспублікі, як правіла, мелі свае спецыфічныя інтарэсы.

Вялікабрытанія ў 1947 і 1949 гг. звярталася да савецкага ўрада з прапановай аб устанаўленні дыпламатычных адносін з Украінай, але так і не атрымала афіцыйнага адказу. У пачатку 1950-х гг. Кангрэс ЗША абмяркоўваў пытанне аб устанаўленні дыпламатычных адносін з Украінай і Беларуссю, аднак Дзяржаўны дэпартамент палічыў гэта бесперспектыўнай справай[374]. Потым, наколькі вядома, іншых спроб не было. Своеасаблівай кампенсацыяй сталі консульствы ГДР (1972), Польшчы (1972), Балгарыі (1990) у БССР, шэрагу еўрапейскіх краін – членаў СЭУ, ЗША і Канады ва Украіне.

Практычна ўсе пытанні адносін рэспублік з замежнымі дзяржавамі, міжнароднымі арганізацыямі вырашаліся ў Маскве. Там не толькі ўзгадняліся іх акцыі ў дадзенай сферы, але і абмяркоўваліся бягучыя, аператыўныя пытанні. Гэта становішча вынікала з палажэння Канстытуцыі СССР аб аднясенні да кампетэнцыі Саюза ўстанаўлення агульнага парадку ва ўзаемаадносінах рэспублік з замежнымі дзяржавамі, адсутнасці прававых актаў аб размежаванні функцый саюзных і рэспубліканскіх органаў (што вяло да дыктату цэнтра), пасіўнасці і слабасці рэспубліканскіх знешнепалітычных ведамстваў, адхілення ад міжнародных пытанняў Вярхоўных Саветаў і Саветаў Міністраў рэспублік, занадта шырокім тлумачэннем цэнтральнымі органамі функцый Саюза ў міжнародных адносінах.

Такое становішча захоўвалася аж да сярэдзіны 1980-х гг. Праўда, пасля ХХ з’езда КПСС умовы для знешнепалітычнай дзейнасці рэспублікі, якія, аднак, не змянялі ў істотнасці яе месца і ролю ў міжнародных зносінах краіны, сталі больш спрыяльнымі. Спробы пэўнай дэцэнтралізацыі дзяржаўнага апарату, большая самастойнасць саюзных рэспублік знайшлі адлюстраванне ў іх міжнароднай дзейнасці. Гэта былі першыя крокі да прарыву «жалезнай заслоны», ізаляванасці народаў краіны ад знешняга свету.

З сярэдзіны 1950-х гг. атрымалі развіццё сувязі прыгранічных, а ў далейшым – і ўнутраных абласцей, краёў, гарадоў, раёнаў на аснове дагавораў аб супрацоўніцтве з аналагічнымі адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі краін – членаў СЭУ. З сярэдзіны 1960-х гг. зацвердзілася практыка заключэння дагавораў і пагадненняў аб узаемадзеянні паміж

---

[374] *Bilinsky J.* The second Soviet Republic: The Ukraine after World War II. New Jersy, 1964. P. 268.

ВНУ, навукова-даследчымі інстытутамі, установамі культуры, прадпрыемствамі, г. зн. вытворчымі калектывамі рэспублік і краін – членаў СЭУ.

Пераход ад ажыццяўлення сувязей пераважна цэнтральнымі органамі да ўключэння ў гэтыя працэсы працоўных калектываў стымуляваў больш грунтоўны, чым раней, абмен вопытам арганізацыі грамадскага жыцця, развіцця вытворчасці, культуры, пашырэння зносін новых пластоў насельніцтва. Геаграфічнае становішча Беларускай ССР, блізкасць да еўрапейскіх краін, зручныя транспартныя зносіны з імі, а ў пэўнай ступені і культурная супольнасць славянскіх народаў садзейнічалі значнаму аб'ёму сувязей з Польшчай, Балгарыяй, Чэхаславакіяй, ГДР у грамадска-палітычнай, эканамічнай і культурнай сферах. Па лініі мясцовых органаў улады новы імпульс атрымалі сувязі параднёных гарадоў Савецкага Саюза, у тым ліку і БССР, і капіталістычных дзяржаў. Першымі былі Мінск і Натынгем, якія сталі пабрацімамі ў 1957 г., а ў 1990 г. ужо 12 гарадоў Беларусі вялі з 17 гарадамі адзінаццаці краін абмен вопытам па вядзенні гарадской гаспадаркі, ахове навакольнага асяроддзя, арганізацыі аховы здароўя, адпачынку насельніцтва.

Аднак спробы пашырыць правы саюзных рэспублік (пераважна ў галіне гаспадарчай дзейнасці) у сярэдзіне 1950-х і 1960-х, другой палове 1970-х гг. былі абмежаванымі, непаслядоўнымі, супярэчылі інтарэсам каманднa-адміністрацыйнай сістэмы і практычна не ўплывалі на міжнародныя зносіны рэспублік, не вывелі іх сувязі на якасна новы ўзровень. У гэтыя дзесяцігоддзі пашырыліся грамадска-палітычныя, эканамічныя і культурныя сувязі БССР з замежнымі дзяржавамі, адбылася пэўная эвалюцыя іх аб'ёму, зместу і форм. Але якасна новага стану яны не набылі, а іх узровень, практычныя вынікі не адпавядалі эканамічнаму, навукова-тэхнічнаму і культурнаму патэнцыялу, запатрабаванням сацыяльна-эканамічнага і духоўнага развіцця народа. Як фармальна суверэнная, а фактычна неад'емная частка ўнітарнай дзяржавы рэспубліка слаба ўплывала на развіццё міжнародных сувязей, асабліва ў галіне эканомікі і культуры. Аднак, у параўнанні з іншымі рэспублікамі, пазіцыі БССР і УССР у знешнепалітычнай сферы былі менш абмежаванымі ў сувязі з іх членствам у міжнародных арганізацыях сістэмы ААН, наяўнасцю пры іх уласных прадстаўніцтваў.

Манаполія цэнтральных партыйных і дзяржаўных органаў у міжнародных адносінах, вырашэнне на гэтым узроўні літаральна ўсіх пытанняў паралізавала ініцыятыву і актыўнасць рэспубліканскіх органаў, перашкаджала выкарыстоўваць вялікія магчымасці саюзных рэспублік для падмацавання агульнасаюзнай знешнепалітычнай лініі канкрэтнымі справамі – знешнімі сувязямі рэспублік. Дарэчы, і яны займалі пасіўную

пазіцыю, не ставілі пытанняў аб прадастаўленні большай нсзалежнасці ў арганізацыі і ажыццяўленні замежных сувязей, не супраціўляліся парушэнням суадносін нацыянальнага і інтэрнацыянальнага ў міжнародных аспектах жыцця краіны.

Адсутнасць рэальнага дзяржаўнага суверэнітэту, дыктат саюзных органаў і ведамстваў у галіне знешніх зносін, іх практычная манаполія абумовілі немагчымасць адлюстравання спецыфікі сацыяльна-эканамічнага, духоўнага развіцця народаў, іх гістарычных традыцый і нацыянальных асаблівасцей. Цэнтральныя органы і ведамствы краіны часам нават нясмелыя і цалкам абгрунтаваныя заявы аб парушэнні інтарэсаў рэспублік, у тым ліку ў арганізацыі і ажыццяўленні замежных сувязей, успрымалі як падрыў адзінства краіны. Пры гэтым адзінства разумелася як аднастайнасць, аднолькавасць, якая не патрабуе ўліку нацыянальных адрозненняў, спецыфікі.

Тэарэтычнай асновай ігнаравання самабытнасці, асаблівасцей і вынікаючых з гэтага інтарэсаў рэспублік і іншых нацыянальна-тэрытарыяльных утварэнняў стаў некрытычна ўспрыняты тэзіс класікаў марксізму аб зблiжэнні і зліцці нацый у блізкай перспектыве. Зафіксаваны ў партыйных і дзяржаўных пастановах, з 1960-х гг. ён стаў ажыццяўляцца ў якасці афіцыйнай палітыкі, што паскорыла працэсы дэнацыяналізацыі, уніфікацыі грамадскага жыцця народаў, прывяло да недаацэнкі развіцця нацыянальнай культуры, мовы, захавання звычаяў, традыцый, гістарычнай спадчыны.

На Беларусі, дзе працэсы дэнацыяналізацыі не знаходзілі процідзеяння, а нават падтрымліваліся і заахвочваліся яе кіраўніцтвам, нацыянальны нігілізм стаў істотным фактарам грамадска-палітычнага жыцця. Вышэйшыя органы партыйнай і дзяржаўнай улады, дэманструючы «звышінтэрнацыяналізм», не карэкціравалі сацыяльна-эканамічную і культурную, нацыянальна-дзяржаўную палітыку з улікам запатрабаванняў і карэнных інтарэсаў беларускага народа, у тым ліку і ў міжнародных адносінах.

Абсалютызацыя інтэрнацыянальнага фактару прывяла беларускі народ да мяжы, за якой пачынаецца страта нацыянальнай свядомасці, што значна абмежавала магчымасці міжнародных сувязей рэспублікі. БССР – член сусветнага супольніцтва, многіх міжнародных міжурадавых арганізацый, – маючы значны вытворча-тэхнічны, навуковы і культурны патэнцыял, не магла самастойна, не ўзгадняючы кожны крок з цэнтрам, развіваць эканамічныя, культурныя і іншыя замежныя сувязі ў адпаведнасці са сваімі магчымасцямі і патрэбамі.

Дыктат цэнтра, які пазбавіў рэспублікі ініцыятывы і эканамічнай зацікаўленасці, вынікаў з адсутнасці прававога механізма рэгулявання

адносін паміж федэрацыяй і яе суб'ектамі, у тым ліку ў галіне замежных адносін. Агульныя палажэнні і прынцыпы, зафіксаваныя ў саюзнай і рэспубліканскай канстытуцыях, не былі падмацаваны прававымі актамі аб размежаванні паўнамоцтваў, у тым ліку не былі распрацаваны юрыдычныя аспекты ўдзелу саюзных рэспублік у міжнародных адносінах у якасці суб'ектаў міжнароднага права. Вядома, што Канстытуцыя СССР 1977 г. аднесла да кампетэнцыі Саюза прадстаўніцтва ў міжнародных адносінах, а Канстытуцыя БССР замацавала прадстаўніцтва рэспублікі ў міжнародных адносінах.

Пасля прыняцця Закона ад 1 лютага 1944 г. размеркаванне кампетэнцый у сферы міжнародных адносін паміж рэспублікамі і Саюзам не зведала значных змен. У Канстытуцыі СССР 1977 г. і прынятых затым канстытуцыях саюзных рэспублік артыкул аб праве апошніх мець зносіны з замежнымі дзяржавамі, заключаць з імі дагаворы і абменьвацца дыпламатычнымі і консульскімі прадстаўнікамі быў дапоўнены правам удзельнічаць у дзейнасці міжнародных арганізацый. БССР мела гэта права пасля падпісання Статута ААН, і канстытуцыйныя змены практычна не ўмацавалі юрыдычную базу яе міжнародных зносін, тым больш што вызначэнне асноў міжнароднай дзейнасці было даручана цэнтру. Артыкул 28 Канстытуцыі БССР 1978 г. зацвердзіў, што рэспубліка «ў знешнепалітычнай дзейнасці кіруецца мэтамі, задачамі і прынцыпамі знешняй палітыкі СССР, вызначанымі Канстытуцыяй СССР». Прававыя асновы нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва СССР у галіне міжнароднай дзейнасці, закладзеныя ў часы культу асобы, законсерваваліся, акасцянелі ў гады застою, не былі дапоўнены неабходнымі юрыдычнымі, палітыка-дыпламатычнымі і арганізацыйна-практычнымі мерапрыемствамі.

Перабудова, працэсы дэмакратызацыі ўсіх сфер жыццядзейнасці грамадства, адмова ад пераважна адміністрацыйных і часткова пераход да эканамічных метадаў кіравання адкрылі новыя магчымасці ажыццяўлення рэспублікамі міжнароднай дзейнасці. Палітычныя і эканамічныя рэформы, пашырэнне праў рэспублік у сацыяльна-эканамічнай, культурнай сферах вызначылі новы ўзровень іх самастойнасці ў міжнародных справах. Аднак аж да 1990 г. размова ішла менавіта аб пашырэнні праў рэспублік за кошт некаторага змякчэння звышцэнтралізацыі ў дзейнасці саюзных органаў і ведамстваў, а не аб радыкальным пераразмеркаванні паўнамоцтваў паміж федэрацыяй і рэспублікамі, і тым больш не аб іх самастойнай міжнароднай дзейнасці.

Рост нацыянальнай свядомасці народаў, павышэнне ролі нацыянальнага фактару ў грамадска-палітычным жыцці краіны абумовілі

меры саюзнага кіраўніцтва па пашырэнні самастойнасці нацыянальна-дзяржаўных утварэнняў, у тым ліку і ў сферы міжнародных адносін. Першыя значныя крокі ў гэтым напрамку былі зроблены ў галіне знешнеэканамічных сувязей. Прадпрыемствы, аб'яднанні, установы атрымалі права самастойна весці знешнегандлёвыя аперацыі, г. зн. незалежна ад саюзнага цэнтра выходзіць на сусветны рынак, ствараць сумесныя з іншаземнымі партнёрамі прадпрыемствы, знешнегандлёвыя гаспадарчаразліковыя аб'яднанні. У сярэдзіне 1991 г. экспартную дзейнасць на тэрыторыі рэспублікі вялі ўжо каля двух дзясяткаў знешнегандлёвых фірм і аб'яднанняў, на сусветны рынак выйшла больш за 1500 самастойных удзельнікаў, зарэгістравана 155 сумесных прадпрыемстваў [375]. Новыя формы гаспадарання эканамічных адносін з замежнымі краінамі абумовілі стварэнне Дзяржаўнага камітэта БССР па знешнеэканамічных сувязях.

Па іншых напрамках міжнароднай дзейнасці рэспублікі змены былі менш значныя і запозненыя па часе, хоць і тут назіраўся рух наперад. Новы знешнепалітычны курс краіны, задачы перабудовы ўнутранай і знешняй палітыкі вызначылі новыя падыходы да ўдзелу рэспублік у фарміраванні і рэалізацыі знешняй палітыкі СССР. Крокам у гэтым напрамку стала нарада міністраў замежных спраў рэспублік (1987), пашырэнне паўнамоцтваў рэспубліканскіх міністэрстваў замежных спраў, якім даручалася каардынацыя ўсіх знешніх сувязей – палітычных, эканамічных і гуманітарных. У структуры Міністэрства замежных спраў СССР быў створаны аддзел па саюзных рэспубліках (1989), які павінен быў прыцягнуць іх навуковы, інтэлектуальны патэнцыял да вырашэння знешнепалітычных праблем, улічваць іх асаблівыя інтарэсы.

Хоць і марудна, запознена, пад націскам грамадскіх рухаў у рэспубліках, перш за ўсё прыбалтыйскіх, кіруючыя органы Саюза прынялі шэраг законаў, якія павінны былі забяспечыць больш устойлівыя ўмовы нацыянальнага развіцця, абароны інтарэсаў шматлікіх народаў краіны. Гэта законы аб асновах эканамічных адносін Саюза ССР, саюзных і аўтаномных рэспублік; аб агульных асновах мясцовага самакіравання; аб мовах народаў СССР; аб узмацненні адказнасці за замах на нацыянальнае раўнапраўе; аб размеркаванні паўнамоцтваў паміж Саюзам ССР і суб'ектамі федэрацыі; аб парадку вырашэння пытанняў, звязаных з выхадам саюзнай рэспублікі з СССР. Аднак жыццёвая практыка паказала іх недастатковасць, непаслядоўнасць, няздольнасць кардынальна змяніць становішча рэспублік, неразуменне цэнтрам новых рэалій і яго спробу захаваць свае ранейшыя пазіцыі.

[375] Звязда. 1991. 11 чэрв. ; 7 дней. 1991. 16–22 верас.

Запазненне ў радыкальным абнаўленні савецкай федэрацыі, заключэнні новага саюзнага дагавора, які замацаваў бы новую якасць нацыянальна-дзяржаўных адносін, абумовілі недавер да цэнтра, стымулявалі прыняцце некаторымі рэспублікамі рашэнняў аб стварэнні сваіх дзяржаў па-за межамі Саюза. Вынікам дэмакратызацыі грамадскага жыцця, імклівага росту нацыянальнай свядомасці народаў, іх волі да самавызначэння, усведамлення неабходнасці перагляду канцэпцыі суверэнітэту нацыянальна-дзяржаўных утварэнняў сталі прынятыя ў 1990 г. шэрагам рэспублік дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце.

Асэнсаванне неабходнасці рэальнага, а не дэклараванага суверэнітэту заканадаўчымі і кіруючымі органамі БССР праходзіла складана, марудна, супярэчліва. Адным з праяўленняў гэтага ў сферы міжнародных адносін стаў запознены зварот да сусветнай грамадскасці і ўрадаў аб дапамозе для змяншэння вынікаў Чарнобыльскай катастрофы. Толькі праз чатыры гады ўрад Беларускай ССР, члена-заснавальніка ААН, якая па Канстытуцыі мела права на зносіны з замежнымі краінамі, самастойна (ці ўсё ж атрымаўшы дазвол зверху?) прыняў адпаведныя захады.

Кіраўніцтва рэспублікі, галіновыя органы кіравання і ў час перабудовы не праяўлялі дастатковага процідзеяння дыктату саюзных міністэрстваў і ведамстваў, у тым ліку пры вырашэнні пытанняў знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай дзейнасці. Найбольш яскравай праявай запазнення ў асэнсаванні неабходнасці эканамічнай, палітычнай самастойнасці, незалежнасці ў міжнародных справах было адхіленне сесіяй Вярхоўнага Савета БССР (май 1990 г.) прапановы дэпутатаў дэмакратычнага блока аб уключэнні ў парадак дня абмеркавання Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце. Аб несамастойнасці пазіцыі большасці дэпутатаў, чаканні імі ўказанняў з цэнтра сведчыць іх зварот да гэтага пытання ў ходзе сесіі (хоць за гэтыя чатыры тыдні грамадска-палітычная сітуацыя ў рэспубліцы істотна не змянілася). Толькі пасля тэлеграмы Прэзідэнта СССР аб вылучэнні прадстаўнікоў для ўдзелу ў пасяджэнні Савета Федэрацыі (у сувязі з пачаткам работы па падрыхтоўцы саюзнага дагавора аб нацыянальна-дзяржаўным уладкаванні) пытанне аб дзяржаўным суверэнітэце было пастаўлена на абмеркаванне.

З улікам працэсаў самавызначэння народаў Прыбалтыкі, РСФСР, УССР, паскарэння працэсаў нацыянальнага адраджэння, пад уздзеяннем парламенцкай апазіцыі і грамадскасці Вярхоўны Савет БССР 27 ліпеня 1990 г. прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце. Яна засведчыла права на свабоду і незалежнасць беларускага народа, заявіла перад усім светам аб суверэннасці Беларусі, упершыню вызначыла яе

знешнепалітычны курс, які вынікае з нацыянальных патрэб і грунтуецца на міжнародна-прававых актах.

Кіруючыся яе палажэннямі, рэспубліка выступіла з шэрагам буйнамаштабных ініцыятыў, якія радыкальна мянялі погляд на многія аспекты яе міжнароднай дзейнасці. Яна прапанавала на 45-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН (1990) стварыць бяз'ядзерны пояс на тэрыторыі Беларусі, Украіны, рэспублік Прыбалтыкі, да якога маглі б далучыцца дзяржавы Цэнтральнай Еўропы. Шматлікія акцыі беларускай дыпламатыі садзейнічалі больш глыбокаму разуменню сусветнай грамадскасцю планетарнага маштабу Чарнобыльскай катастрофы, кансалідацыі сіл і сродкаў для змякчэння яе вынікаў. З улікам чарнобыльскай бяды Беларусь паставіла ў ААН пытанне аб пераводзе яе з краіны-донара ў краіну-атрымальніка міжнароднай дапамогі.

Пачаўся працэс станаўлення новых двухбаковых адносін (як раўнапраўных партнёраў, без пасрэдніцтва цэнтра) з суверэннымі рэспублікамі былога Саюза і замежнымі дзяржавамі (перш за ўсё з еўрапейскімі). Былі падпісаны і ратыфікаваны дагаворы Беларусі з Расіяй, Украінай, Казахстанам; заключаны міжурадавыя пагадненні са Славеніяй і Паўднёвай Карэяй, гандлёвыя – з Балгарыяй, ЧэхаСлавакіяй, КНДР; завяршалася падрыхтоўка пагадненняў аб узаемным гандлі з Венгрыяй, Польшчай, Сербіяй, Германіяй[376]. Адным са знешнепалітычных прыярытэтаў рэспублікі вылучаны адносіны з Польшчай (з улікам гістарычнай звязанасці лёсаў народаў-суседзяў). Беларусь, размешчаная на скрыжаванні еўрапейскіх шляхоў, заявіла аб намеры ўдзельнічаць у рэалізацыі ідэі агульнаеўрапейскага дома, канкрэтным супрацоўніцтве з усімі краінамі свету.

Працэсы дэмакратызацыі абумовілі ўзнікненне новых грамадскіх рухаў, партый, арганізацый, якія адлюстравалі новыя патрэбы сацыяльна-эканамічнага і духоўнага жыцця, развіцця міжнародных зносін, народнай дыпламатыі. Вялікую цікавасць да грамадскіх фарміраванняў, дзейнасць якіх накіравана на нацыянальнае адраджэнне, фізічнае і духоўнае выжыванне пасля Чарнобыля, праявілі неўрадавыя арганізацыі многіх замежных краін, беларускай дыяспары, якія аддаюць менавіта ім перавагу пры арганізацыі ўзаемадзеяння і дапамогі. Набылі сталы характар замежныя сувязі Беларускага народнага фронту. Былі зроблены першыя крокі па аднаўленні і ўмацаванні кантактаў з беларускім замежжам, якое раней было пазбаўлена маральнай, матэрыяльнай падтрымкі радзімы. Устаноўчая канферэнцыя Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына» (верасень 1990 г.) прыняла Статут, Дэкларацыю і зварот да беларусаў свету. Пачалі фарміравацца сувязі грамадскіх і царкоўных

[376] Нар. газ. 1991. 27 ліп.

структур рэспублікі з замежнымі арганізацыямі розных канфесій, якія раней жорстка абмяжоўваліся.

Новым штуршком на шляху суверэнізацыі Беларусі стала няўдалая спроба дзяржаўнага перавароту ў жніўні 1991 г. Нечарговая сесія Вярхоўнага Савета БССР надала канстытуцыйны статус Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце, абвясціла аб палітычнай і эканамічнай незалежнасці Беларусі. Беларускі народ прыступіў да стварэння свабоднай і самастойнай дзяржавы. «Жыццёвыя інтарэсы нацыі – вось краевугольны камень нашага курсу ў міжнародных справах», – адзначыў на 46-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН (1991) міністр замежных спраў П. К. Краўчанка, даводзячы да міжнароднага супольніцтва знешнепалітычныя прынцыпы і прыярытэты Беларусі[377].

Такім чынам, на рубяжы 1980–90-х гг. трэці раз у XX ст. беларуская дзяржава выйшла на міжнародную арэну. Дзве першыя спробы ўключэння Беларусі ў сусветнае супольніцтва – у 1918–1922 гг. і пасля 1944 г. – аказаліся недастаткова выніковымі. Цяпер жа Беларусь атрымала шанец зацвердзіцца ў міжнародных адносінах у якасці суверэннай і незалежнай дзяржавы.

Праз 30 гадоў пасля прыняцця Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР можна сцвярджаць, што Рэспубліка Беларусь рэалізавала гэты гістарычны шанец і працягвае паступовы рух у напрамку захавання і ўмацавання незалежнасці. Трэці выхад Беларусі на міжнародную арэну аказаўся выніковым і трывалым, хоць на шляху самастойнага развіцця давялося прайсці праз шмат цяжкіх выпрабаванняў і пераадолець розныя перашкоды. Пры гэтым беларускі народ выявіў непахісную волю да стварэння сучаснай еўрапейскай дзяржавы.

## 3.2. Аб ключавых пытаннях знешнепалітычнай гісторыі Беларусі[378]

Пры выкладанні вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі» вельмі важна вызначыцца з канцэптуальна-метадалагічнымі падыходамі і тэрмінамі да асэнсавання гэтага новага напрамку ў беларускай гістарыяграфіі. Першае пытанне, якое адразу ўзнікае,

[377] Нар. газ. 1991. 1 кастр.

[378] Друкуецца паводле даклада: *Снапкоўскі У. Е.* Аб некаторых ключавых пытаннях знешнепалітычнай гісторыі Беларусі // Беларусь в меняющемся мире: история и современность : материалы междунар. науч.-практ. конф., Минск, 22 февр. 2019 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: М. Э. Чесновский (пред.) [и др.]. Минск, 2019. С. 21–29.

заключаецца ў тым, якія паняцці блізкія ці нават падобныя да назвы гэтага прадмета. Такім паняццем выступае вызначэнне «знешнепалітычная гісторыя Беларусі» (ЗГБ), якое выкарыстоўваецца намі як аналаг тэрміну «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі». З паняццем «знешнепалітычная гісторыя Беларусі» цесна звязана роднаснае яму паняцце «дыпламатычная гісторыя Беларусі», аднак апошняе мае вузейшае значэнне, паколькі дыпламатыя з'яўляецца часткай знешняй палітыкі дзяржавы. Акрамя таго, не для ўсіх перыядаў беларускай дзяржаўнасці была ўласціва знешняя палітыка тых ці іншых дзяржаўных утварэнняў, асабліва ў часы знаходжання беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі. Наконт гэтага перыяду ўвогуле паўстае пытанне аб існаванні беларускай дзяржаўнасці, нават у нерэалізаванай, патэнцыяльнай форме. Падобнае сцвярджэнне абгрунтоўваецца аўтарамі другога тома «Гісторыі беларускай дзяржаўнасці», аб чым скажам ніжэй.

Даследаванне і выкладанне ЗГБ будуецца на наступных канцэпцыях і прынцыпах.

1. Нацыянальная канцэпцыя гісторыі Беларусі. Заканамерна, што вывучэнне знешнепалітычнай гісторыі пэўнай дзяржавы будуецца на яе нацыянальнай гістарычнай канцэпцыі, паколькі гэта вонкавая, знешняя гісторыя з'яўляецца часткай агульнай гісторыі народа і дзяржавы. Нацыянальная ці нацыянальна-дзяржаўная канцэпцыя гісторыі Беларусі – гэта адносна маладая і новая сістэма навуковых поглядаў на гістарычнае мінулае беларускага народа. Яе асновы былі сфармуляваны ў 1910–20-х гг. класікамі нацыянальнай гістарыяграфіі – В. Ластоўскім, У. Ігнатоўскім, М. Доўнар-Запольскім, У. Пічэтай. Як цэласная сістэма навукова ўпарадкаваных поглядаў нацыянальная канцэпцыя гісторыі Беларусі была распрацавана ў пачатку 1990-х гг. у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі. Сваё практычнае ўвасабленне яна знайшла ў «Нарысах гісторыі Беларусі» – першым акадэмічным падручніку для ВНУ па гісторыі Беларусі (1994–1995), двух першых тамах «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» (1993–1994), шасцітомнай «Гісторыі Беларусі» (2000–2011) – першай шматтомнай нацыянальнай гісторыі беларускага народа[379].

Падчас працы ў Інстытуце гісторыі, у тым ліку загадчыкам аддзела нацыянальных і міжнародных адносін, аўтар меў непасрэднае дачыненне да фармулявання знешнепалітычных аспектаў канцэпцыі, а потым да яе ўкаранення ў сістэму навуковых даследаванняў і адукацыйна-выха-

[379] Гл.: *Касцюк М. П.* Нацыянальна-дзяржаўная канцэпцыя гісторыі Беларусі як шлях да ісціны // Шлях да ісціны... С. 42–96.

ваўчы працэс БДУ і вышэйшай школы Беларусі ў цэлым. Гэта знайшло адлюстраванне ў навучальных дапаможніках «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі» (у 2 ч., 2003–2004 гг. на беларускай мове і 2013 г. на рускай мове), падрыхтаванай супрацоўнікамі кафедры міжнародных адносін БДУ «Гісторыі міжнародных адносін» (ч. 2 і 3, у главах «Беларусь у міжнародных адносінах» (1918–1945 і 1945–1990 гг.), манаграфіях па беларуска-расійскіх і беларуска-польскіх адносінах. Гэтыя і іншыя працы напісаны на аснове нацыянальнай канцэпцыі гісторыі Беларусі, якая была асэнсавана і выкарыстана намі з пункту гледжання міжнародных адносін і знешнепалітычнай дзейнасці беларускіх дзяржаў і дзяржаўных утварэнняў.

2. Канцэпцыя гісторыі беларускай дзяржаўнасці. З другой паловы 1990-х гг. у гістарычнай палітыцы і гістарыяграфіі Рэспублікі Беларусь набіраюць моц і пачынаюць дамінаваць неасавецкія, часам расійскацэнтрычныя трактоўкі гісторыі Беларусі, асабліва перыяду XX ст. Нацыянальная канцэпцыя гісторыі Беларусі адыходзіць на задні план, пра яе проста не згадваюць ці наўмысна забываюць[380]. Такі стан захоўваўся недзе 10–15 гадоў, пасля чаго наступіла рэактывацыя гэтай канцэпцыі, але ў спрошчаным, мадыфікаваным, кампрамісным і абноўленым варыянце, што знайшло адлюстраванне ў пяцітомнай працы Інстытута гісторыі НАН Беларусі «История белорусской государственности». Два першыя тамы апублікаваны ў канцы 2018 – пачатку 2019 г. і ахопліваюць часы ад узнікнення беларускай дзяржаўнасці ў IX ст. да канца існавання Расійскай імперыі (1917). Ва ўводзінах да ўсяго выдання кіраўнікамі аўтарскага калектыву (А. Каваленям, В. Даніловічам і М. Смяховічам) сфармулявана канцэпцыя гісторыі беларускай дзяржаўнасці і дадзена вызначэнне паняццю дзяржаўнасці: «...это внутренняя потенциальная способность этнонационального сообщества и его элиты, обеспечивающая право и возможность длительного самостоятельного существования и развития». Дзяржава ж з'яўляецца канкрэтна-гістарычным увасабленнем патэнцыі дзяржаўнасці і яе дзяржаваўтваральных фактараў[381].

Зыходзячы з распрацаванай канцэпцыі, аўтары разглядаюць беларускую дзяржаўнасць у выглядзе гістарычных і нацыянальных форм. Да гістарычных форм беларускай дзяржаўнасці належаць: Кіеўская Русь, Полацкая зямля і Тураўскае княства, Вялікае Княства Літоўскае,

---

[380] *Снапковский В. Е.* Историческая политика в Республике Беларусь ... S. 162–163, 172–174 ; гл. раздз. 2.4.

[381] История белорусской государственности. Т. 1. С. 6.

Рэч Паспалітая, Расійская імперыя. Спецыфікай гістарычных форм дзяржаўнасці было тое, што яны з'яўляліся поліэтнічнымі ўтварэннямі і належалі не толькі беларускаму, але і іншым этнасам, і ў іх межах складвалася дзяржаўнасць беларускага народа. Нацыянальная дзяржаўнасць – вышэйшая кропка развіцця кожнага этнасу, паколькі толькі ва ўмовах дзяржаўнай незалежнасці магчыма найбольш поўная рэалізацыя ўсіх магчымасцей і патэнцый нацыі. Нацыянальныя формы беларускай дзяржаўнасці ўзніклі, існавалі і працягваюць сваё развіццё ў XXI ст. у форме Беларускай Народнай Рэспублікі, Беларускай ССР (у розных відах) і Рэспубліцы Беларусь[382].

Паводле аўтараў выдання, новая трактоўка паняцця «дзяржаўнасць» – значнае навуковае дасягненне айчыннай гістарычнай навукі, што мае важнае значэнне для далейшай распрацоўкі ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці. Гэта трактоўка была ўпершыню абгрунтавана ў калектыўнай працы «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.» (2011). Асноўнай мэтай згаданай пяцітомнай працы па гісторыі беларускай дзяржаўнасці з'яўляецца раскрыццё працэсу зараджэння і развіцця беларускай дзяржаўнасці, вылучэнне і характарыстыка яе асноўных этапаў, даследаванне гістарычнай пераемнасці традыцый дзяржаўнасці ад яе вытокаў да сённяшніх дзён, устанаўленне заканамернасцей у рэалізацыі ідэі беларускай дзяржаўнасці як у гістарычных, так і нацыянальных формах. Сярод цэнтральных задач, якія паставіў перад сабой аўтарскі калектыў, вылучаюцца вывучэнне працэсу фарміравання беларускага этнасу, вызначэнне яго месца ў дзяржаўных утварэннях, у склад якіх уваходзілі беларускія землі да стварэння ўласнай нацыянальнай дзяржаўнасці, выяўленне як негатыўнага, так і пазітыўнага ўплыву гэтых дзяржаўна-палітычных утварэнняў на развіццё беларускай дзяржаўнасці[383].

3. Перыядызацыя гісторыі беларускай дзяржаўнасці і знешнепалітычнай дзейнасці беларускіх дзяржаў і дзяржаўных утварэнняў. Падзел гісторыі Беларусі па прынцыпе дзяржаўных форм існавання беларускага народа ўпершыню быў уведзены ў гістарыяграфію У. Ігнатоўскім у працы «Кароткі нарыс гісторыі Беларусі». У. Ігнатоўскі паклаў у аснову сваёй перыядызацыі прынцып дзяржаўнасці (дзяржаўнай прыналежнасці беларускіх зямель), г. зн. па сутнасці знешнепалітычны прынцып, які

[382] История белорусской государственности : в 5 т. / А. А. Коваленя [и др.]. Минск, 2018–. Т. 1 : Белорусская государственность: от истоков до конца XVIII в. / отв. ред. тома : О. Н. Левко, В. Ф. Голубев. 2018. С. 6.

[383] Там жа. С. 9–10.

адлюстроўваў гістарычную зменлівасць знаходжання тэрыторыі Беларусі, яе міжнароднага становішча сярод іншых дзяржаў і народаў Усходняй Еўропы[384].

У перыядызацыі ЗГБ вылучана пяць перыядаў: знешнепалітычная дзейнасць старажытнабеларускіх дзяржаў-княстваў (IX–XIII стст.); знешняя палітыка і дыпламатыя ВКЛ (XIII – канец XVIII ст.); Беларусь у складзе Расійскай імперыі, ці бездзяржаўны перыяд у гісторыі Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.); адраджэнне і развіццё беларускай дзяржаўнасці і яе знешнепалітычнай актыўнасці ў форме БНР і БССР (1918–1991 гг.); станаўленне знешняй палітыкі незалежнай Рэспублікі Беларусь (з 1991 г. па сённяшні дзень)[385]. Паводле гэтай перыядызацыі ўсе формы беларускай дзяржаўнасці названы гістарычнымі, уключаючы сучасныя (БНР, БССР і Рэспубліку Беларусь), паколькі іх звязвае прынцып гістарызму і зменлівасці сутнасных характарыстык.

Адзначым і пэўную розніцу паміж перыядызацыяй ЗГБ і перыядызацыяй гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Яна вынікае з таго, што сфера міжнародных адносін і знешняй палітыкі дзяржаў адрозніваецца ад больш шырокай галіны грамадска-палітычных адносін, якой з'яўляецца дзяржаўнасць. У знешнепалітычнай сферы, аднак, больш выразна і адкрыта праяўляецца наяўнасць ці адсутнасць дзяржаўнасці, як і наяўнасць ці адсутнасць дзяржаўнага ці нацыянальнага суверэнітэту. У сувязі з гэтым перыяд пад назвай «Беларусь у складзе Расійскай імперыі ці бездзяржаўны перыяд у гісторыі Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.)» ахарактарызаваны ў нашых вучэбных дапаможніках як час, калі Беларусь не мела сваёй дзяржаўнасці, якую яна згубіла пасля падзелаў Рэчы Паспалітай. Аўтары акадэмічнага выдання маюць іншы пункт гледжання, які выкладзены ў другім томе. Разам з тым трэба адзначыць, што гэтае выданне падзяляе нашу перыядызацыю знешнепалітычнай дзейнасці Беларусі ў XX ст., якую мы пазначаем як «адраджэнне і развіццё беларускай дзяржаўнасці і яе знешнепалітычнай актыўнасці ў форме БНР і БССР (1918–1991 гг.)». Тое, што пачатак нацыянальнай дзяржаўнасці вядзецца ад БНР, з'яўляецца новым словам у афіцыйнай беларускай гістарычнай навуцы і палітыцы, аб чым раней у дзяржаўных навуковых установах і чуць не жадалі.

---

[384] *Ігнатоўскі У. М.* Пазнач. твор. С. 28–30.

[385] *Снапкоўскі У. Е.* Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі. Ч. 1. С. 8–9 ; *Яго ж.* История внешней политики Беларуси. С. 8–10 ; *Яго ж.* Перыядызацыя гісторыі знешняй палітыкі Беларусі // Беларусь в соврем. мире : тез. докл. I Респ. науч. конф. (Минск, 22–23 окт. 2002 г.). Минск, 2003. С. 59–62.

Увядзенне аўтарскім калектывам Інстытута гісторыі НАН Беларусі паняцця «нацыянальная форма беларускай дзяржаўнасці», якое адносіцца да XX–XXI стст., узбагачае сучасную гістарыяграфію і дае ў рукі гісторыкаў прыдатны метадалагічны інструментарый для разумення і тлумачэння складаных, пакручастых шляхоў узнікнення і развіцця беларускай дзяржаўнасці ва ўсім багацці і разнастайнасці яе форм і зместу. Разам з тым некаторыя сцвярджэнні, трактоўкі і падыходы аўтараў «Истории белорусской государственности» выклікаюць пытанні ці падаюцца супярэчлівымі.

1. Кіеўская Русь, Полацкае і Тураўскае княствы аднесены да першых гістарычных форм беларускай дзяржаўнасці[386], у выніку чаго адбылося спалучэнне дзвюх канцэпцый: з аднаго боку, расійска-савецкай, якая лічыла, што ў перыяд ранняга феадалізму існавала толькі адзіная Старажытнаруская дзяржава (Кіеўская Русь)[387], і з другога – сучаснай беларускай канцэпцыі, паводле якой на тэрыторыі Беларусі існавала раннедзяржаўнае ўтварэнне (Полацкая зямля), раўназначнае ў палітычных адносінах Наўгародскай і Кіеўскай землям[388]. Да таго ж спалучэнне Кіеўскай Русі з беларускімі княствамі азначае аб'яднанне цэлага і часткі, што не зусім лагічна. Але ўсё ж такі дамінуючай канцэпцыяй у асвятленні перадумоў зараджэння беларускай дзяржаўнасці і яе першых гістарычных форм у гэтай працы, як і ва ўсёй беларускай гістарыяграфіі, стала канцэпцыя існавання раннедзяржаўнага ўтварэння – Полацкая зямля, гістарычным вытокам якой было племяннное княжанне крывічоў-палачан. Такі падыход шырока абгрунтаваны ў працах В. М. Ляўко[389].

2. Другой гістарычнай формай беларускай дзяржаўнасці з'яўлялася ВКЛ. У сучаснай беларускай і замежнай літаратуры яно разглядаецца як мацнейшая ўсходнееўрапейская дзяржава, якая існавала пяць з паловай стагоддзяў і праводзіла актыўную знешнюю палітыку. Пытанні пачынаюцца ў спадкаемцаў ВКЛ і датычацца яны гістарычнай спадчыны гэтай поліэтнічнай і поліканфесіянальнай дзяржавы. Так гіс-

---

[386] История белорусской государственности. Т. 1. С. 6, 158, 211–229.

[387] Сярод сучасных беларускіх гісторыкаў гэтую канцэпцыю адстойвае Э. М. Загарульскі. Гл.: *Загарульскі Э. М.* Заходняя Русь. IX–XIII стст. Мінск, 1998.

[388] *Штыхаў Г. В.* Старажытныя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі. Мінск, 1999 ; История белорусской государственности. Т. 1. С. 35–36.

[389] История белорусской государственности. Т. 1. С. 36–37 ; *Левко О. М.* Средневековые территориально-административные центры северо-восточной Беларуси: Формирование и развитие. Минск, 2004.

тарычна атрымалася, што беларусы як нашчадкі літвінаў (этнасу, які дамінаваў у княстве) у выніку змены назвы (з літвінаў на беларусаў) як бы пазбавіліся сваіх гістарычных праў на ВКЛ. Акрамя таго, беларускі горад Навагрудак страціў статус сталіцы ВКЛ, а беларусы згубілі старажытнабеларускую мову – афіцыйную мову справаводства, сваю эліту, што пацягнулася ў польскую шляхту, праваслаўны варыянт хрысціянства як дамінуючай рэлігіі, этнічную і міжнародную ідэнтычнасць у выніку векавой канфрантацыі паміж ВКЛ і Рускай дзяржавай, а пазней паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй[390].

Расійская (дарэвалюцыйная, савецкая і сучасная), польская, пазней літоўская і заходнееўрапейская гістарыяграфіі разглядаюць ВКЛ як пераважна польска-літоўскую, літоўска-рускую ці ўласна літоўскую дзяржаву. Бацькі-заснавальнікі беларускай гістарычнай школы (В. Ластоўскі, У. Ігнатоўскі, У. Пічэта, М. Доўнар-Запольскі) вярнулі ВКЛ яго гістарычна правільную, сутнастную этнічную характарыстыку – «беларуска-літоўская дзяржава», якая, праўда, не прынялася ў пазнейшай савецкай гістарыяграфіі, дзе дамінавалі не навуковыя, а палітызаваныя падыходы. Да гэтай характарыстыкі беларускія гісторыкі вярнуліся ў 1990-я гг., і яе спачатку прынялі літоўскія гісторыкі, пагадзіўшыся з кампраміснай для іх формулай – «літоўска-беларуская дзяржава». Аднак недзе з канца 1990-х гг. у Вільнюсе (Вільні) гісторыкі Літоўскай Рэспублікі адмовіліся ад гэтага кампраміснага пагаднення.

Сучасная беларуская гістарыяграфія разглядае беларускія і ў меншай ступені іншыя ўсходнеславянскія землі як тэрытарыяльную, дэмаграфічную, гаспадарчую, ваенную, фінансавую, духоўную аснову ВКЛ. Тут закладваліся падмуркі самых вялікіх магнацкіх і царкоўных латыфундый, існавалі буйныя гарады, развіваліся гандаль і культура. На тэрыторыю Беларусі прыйшоўся асноўны цяжар доўгай і драматычнай для ўсіх бакоў цяжбы і барацьбы ВКЛ з Вялікім Княствам Маскоўскім у XV–XVI стст. за гегемонію ва Усходняй Еўропе. Продкі сучасных беларусаў разам з літоўцамі і іншымі народамі (палякамі, украінцамі, рускімі) стварылі новую шматэтнічную дзяржаву на балтаславянскіх абшарах. Гэтая дзяржава адыгрывала адметную ролю ў палітычным і цывілізацыйным развіцці Усходняй Еўропы не толькі сваімі памерамі і грамадска-палітычным ладам. Яна была першым збіральнікам

[390] Гл. падрабязней: *Радзік Р.* Вакол ідэнтычнасці беларусаў. Мінск, 2017. Раздз. 5 : Ідэнтычнасці беларусаў: ад рускасці да савецкасці і беларускасці ; раздз. 6 : Беларусы: паміж нацыянальнай самабытнасцю і рускай агульнасцю. С. 171–210.

раздробленых зямель Заходняй Русі, моцна стымулявала развіццё цэнтраімклівых працэсаў сярод «буферных» прамежкавых княстваў (Цвярскога, Чарнігаўскага, Смаленскага і інш.), а таксама на землях Паўночна-Усходняй Русі[391]. Гэтыя пытанні міжнародных адносін на тэрыторыі былой Кіеўскай Русі знаходзяць сваё адлюстраванне ў курсе «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі» ў адпаведных раздзелах, прысвечаных узнікненню і наступнай тэрытарыяльна-палітычнай экспансіі ВКЛ на абшарах Усходняй Еўропы.

3. Ключавой падзеяй у гісторыі Беларусі, Літвы і Польшчы была Люблінская ўнія 1569 г. Аб'яднанне ВКЛ і Польшчы ў федэратыўную дзяржаву Рэч Паспалітую застаецца прадметам гістарыяграфічных спрэчак і дыскусій. У беларускай гістарыяграфіі, як пачатку XX ст., так і савецкіх часоў, Люблінская ўнія трактавалася пераважна як адмоўная падзея, якая прывяла да заняпаду ВКЛ, паланізацыі і акаталічвання шляхты. У сучаснай гістарыяграфіі стварэнне Рэчы Паспалітай ацэньваецца больш збалансавана з улікам яе значных гістарычных дасягненняў. Яны асабліва добра бачны з пазіцый знешняй палітыкі і міжнароднага становішча ВКЛ, паколькі заключэнне Люблінскай уніі дазволіла аб'яднаным сілам Княства і Кароны перамагчы ў Лівонскай вайне[392]. Пазнейшай платай за перамогу стала дээтнізацыя літвінскай шляхты і грамадства. Аднак альтэрнатыва была яшчэ горшай – ужо ў XVI ст. ВКЛ магло быць далучана да Рускай дзяржавы Івана Жахлівага.

4. Сур'ёзныя пытанні ўзнікаюць да аўтараў другога тома «Истории белорусской государственности» ў сувязі з іх тэндэнцыяй разглядаць існаванне (працяг) беларускай дзяржаўнасці ў перыяд Расійскай імперыі. Гэта новае слова ў беларускай гістарыяграфіі, якога нават не было ў савецкія часы, калі пачатак беларускай дзяржаўнасці выводзілі з узнікнення БССР. Паводле логікі аўтараў прадмовы да гэтага тома, беларусаў і ўкраінцаў у Расіі залічалі да адзінага рускага «суперэтнасу», дзяржаваўтваральнага народа ўсёй імперыі. З гэтага вынікала, што расійская дзяржава была іх уласнай дзяржавай, для якой былі ўласцівыя агульнасць этнічных каранёў, гісторыі, моўная блізкасць і адзіная вера (праваслаўе). Паводле ўяўленняў расійскіх улад, духоўная і этнічная еднасць трох усходнеславянскіх народаў (рускага, украінскага

[391] *Галенчанка Г.*, *Касцюк М.* Уводзіны // Гісторыя Беларусі. Т. 2 : Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага / Ю. Бохан [і інш.] ; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. 2008. С. 5–6.

[392] *Радаман А. А.* Образование Речи Посполитой. Государственно-политическая система ВКЛ // История белорусской государственности. Т. 1. С. 364–369.

і беларускага) прадугледжвала і дзяржаўнае адзінства[393]. Знаходжанне ў Расійскай імперыі азначала, што беларусы і ўкраінцы павінны былі адмовіцца ад усялякіх надзей, мар і планаў аб уласнай нацыянальнай дзяржаўнасці. Як вядома, гэтага не адбылося. У XIX – пачатку XX ст. у складзе Расійскай імперыі сфарміраваліся беларуская і ўкраінская нацыі, пачаўся беларускі і ўкраінскі нацыянальны рух за нацыянальную аўтаномію, якую гэтым народам не жадалі прадастаўляць кіруючыя колы ў Санкт-Пецярбургу. Гэтыя працэсы адносна беларусаў адлюстраваны ў томе неяк невыразна і непераканаўча.

Аўтары тома не даюць адказу на пытанне, які дзяржаўна-прававы статус мелі беларускія землі ў складзе Расійскай імперыі, нягледзячы на адпаведную назву Главы 2. Пэўныя падыходы да тлумачэння гэтага статусу змяшчаюцца ў прадмове, дзе адзначаецца, што ўраду Расіі не ўдалося дасягнуць уніфікацыі як усёй тэрыторыі былога ВКЛ, так і беларускіх зямель у адпаведнасці з агульнаімперскім заканадаўствам. Прычынамі такога становішча былі, па-першае, нацыянальны склад беларускіх губерняў, які па шэрагу важных пазіцый адрозніваўся ад уласна расійскіх; па-другое, сацыяльна-эканамічныя і палітычныя супярэчнасці як унутры правячага класа былой Рэчы Паспалітай, так і паміж палітычнымі элітамі Расіі і былой польска-літвінскай дзяржавы; па-трэцяе, значэнне знешніх, геапалітычных фактараў знаходжання беларускіх зямель у складзе Расіі; па-чацвёртае, фарміраванне беларускай нацыі і ўзнікненне нацыянальнага руху, накіраванага на рэалізацыю ідэі стварэння ўласнай дзяржаўнасці[394].

Наша разуменне расійскага перыяду ў гісторыі Беларусі ці «расійскага панавання ў Беларусі» (паводле Доўнар-Запольскага) заключаецца ў тым, што гэта быў час бездзяржаўнага існавання беларускага народа, перапынку яго дзяржаўнай гістарычнай традыцыі, які супаў з працэсамі мадэрнізацыі, развіцця капіталізму, фарміравання нацыі і пачаткам барацьбы супраць самадзяржаўя, за аўтаномію і незалежнасць[395]. На такіх і нават больш радыкальных пазіцыях грунтуюцца сучасныя гістарычныя канцэпцыі Польшчы, Балтыйскіх дзяржаў, Украіны. З пункту гледжання геапалітыкі і міжнародных адносін беларускія тэрыторыі выконвалі

[393] Предисловие (авторы не указаны) // История белорусской государственности. Т. 2 : Белорусская государственность в период Российской империи (конец XVIII – начало XX в.) / Н. В. Смехович [и др.] ; отв. ред. тома: Н. В. Смехович, А. В. Унучек, Е. Н. Филатова. 2019. С. 3.

[394] Там жа. С. 3–4.

[395] *Снапкоўскі У. Е.* Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі. Ч. 2. С. 7–8 ; *Яго ж.* История внешней политики Беларуси. С. 223–225.

ролю заходняга фарпоста еўраазіяцкай імперыі падчас напалеонаўскіх войн і Першай сусветнай вайны. Беларускага пытання як еўрапейскай міжнароднай праблемы барацьбы беларусаў за свае нацыянальныя правы ў XIX – пачатку XX ст. не існавала, у адрозненне ад польскага ці ўкраінскага[396].

5. У 2010-я гг. беларуская гістарыяграфія і гістарычная палітыка зрабілі значны крок наперад у разуменні і тлумачэнні дзяржаўна-ўтваральных працэсаў у Беларусі ў першыя дзесяцігоддзі XX ст. Гэта выявілася, як адзначалася, у творчым вынаходніцтве тэрміна «нацыянальная дзяржаўнасць» і ўключэнні ў яго БНР, якая такім чынам вярнулася на сваё законнае і пачэснае месца ў гісторыі Беларусі XX ст. як першая спроба адраджэння дзяржаўнасці ці першы крок да незалежнасці. Шырокае святкаванне ў Беларусі і за яе межамі ў асяродках дыяспары 100-гадовага юбілею БНР у 2018 г. адлюстравала папулярнасць і прыцягальнасць незалежніцкіх ідэалаў 25 Сакавіка ў грамадстве.

Гэта гістарычная дата выклікала хвалю інтарэсу ў шырокіх грамадскіх колах да БНР як першай формы нацыянальнай дзяржаўнасці Беларусі ў XX ст. Самыя важныя пытанні датычыліся дзяржаўна-палітычнага і міжнародна-прававога статусу новаабвешчанай рэспублікі, яе суб'ектнасці і самастойнасці як дзяржаўнага ўтварэння. Пераасэнсаванне ролі і месца БНР у навейшай гісторыі Беларусі пачалося ў гады перабудовы, калі стала паступова выспяваць нацыянальная канцэпцыя айчыннай гісторыі. Аднак толькі пасля абвяшчэння незалежнасці гісторыкі змаглі больш смела і рашуча павесці наступ на жалезабетонныя пазіцыі артадаксальных прыхільнікаў «марксісцка-ленінскага разумення» гістарычнага працэсу, якія бачылі ў БНР «марыянетку» нямецкіх акупацыйных улад[397]. Новыя падыходы і ацэнкі сутнасных характарыстык БНР, яе ўнутранай і знешняй палітыкі з'явіліся ў «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» (т. 2), «Нарысах гісторыі Беларусі» (ч. 2), школьных падручніках, навуковых і гісторыка-публіцыстычных артыкулах. Яны адрозніваліся імкненнем аўтараў неперадузята ацаніць гэты феномен у гісторыі беларускай дзяржаўнасці, адысці ад выключна адмоўных характарыстык «бацькоў-заснавальнікаў» БНР і іх палітыкі. Публікацыя

---

[396] *Snapkouski U.* Białoruś i kwestia białoruska w stosunkach międzynarodowych XIX–XX w. // Racja stanu: Studia i materiały. Połrocznik nr 1 (1) 2007. Instytut Studiów Międzynarodowych Uniwersytetu Wrocławskiego. Wrocław, 2007. S. 29–40.

[397] *Каменская Н. В.* Ля вытокаў здрады. Мінск, 1963 ; *Ковкель И.*, *Сташкевич Н.* Почему не состоялась БНР? Из истории политического банкротства националистической контрреволюции в Белоруссии (1917–1925 гг.) Минск, 1980 ; *Круталевич В. А.* История Беларуси ... і інш.

ў канцы 1990-х гг. «Архіваў Беларускай Народнай Рэспублікі» і першага тома зборніка дакументаў «Знешняя палітыка Беларусі» дала ў рукі гісторыкаў вялікі масіў матэрыялаў аб дзяржава-ўтваральных працэсах на тэрыторыі Беларусі, ролі ўнутраных і знешніх фактараў у самавызначэнні беларускага народа. На аснове гэтых, а таксама архіўных і іншых крыніц і літаратуры з'явіліся першыя навуковыя працы па знешнепалітычнай дзейнасці БНР (Л. Кавалёва, Т. Паўлава, А. Ціхаміраў)[398]. У нашым падручніку па знешнепалітычнай гісторыі Беларусі (ч. 2) дыпламатыі БНР прысвечана асобная глава[399].

У «Нарысах гісторыі Беларусі» і шасцітомнай «Гісторыі Беларусі» абвяшчэнне БНР разглядалася як дасягненне стратэгічнай мэты беларускага нацыянальна руху, які імкнуўся стварыць буржуазна-дэмакратычную рэспубліку[400]. Аднак, як пісаў аўтар раздзелаў пра БНР акадэмік І. Ігнаценка: «Імкненне беларускай буржуазіі здзейсніць нацыянальнае самавызначэнне на буржуазна-дэмакратычнай аснове поспеху не мела»[401]. Сярод прычын паражэння БНР ён называе адсутнасць моцнай падтрымкі Беларускай сацыялістычнай грамады і ўрада БНР народнымі масамі і памылковую арыентацыю на нямецкіх і польскіх інтэрвентаў[402]. Такія ацэнкі з боку вядомага гісторыка сведчылі аб значным кроку наперад у разуменні феномена БНР беларускай гістарыяграфіяй, нягледзячы на капрамісныя фармулёўкі пра «буржуазна-дэмакратычную аснову» БНР і яе памылкі ў выбары знешнепалітычных саюзнікаў.

Яшчэ далей пайшоў акадэмік М. Касцюк, разглядаючы абвяшчэнне БНР як «самаадданы і мужны грамадзянскі акт з боку тых нацыянальных дзеячаў, якія шчыра верылі ў патэнцыяльныя магчымасці беларускага народа»[403]. Ён ацэньвае іх дзейнасць як парыў рамантыкаў, што імкнуліся ў жорсткіх унутры- і знешнепалітычных умовах здзейсніць сваю мару і тым самым не адстаць ад іншых народаў, выкарыстаўшы ўзніклыя,

---

[398] *Паўлава Т. Я.* Вытокі дыпламатыі БНР // Белорус. журн. междунар. права и междунар. отношений. 1999. № 3. С. 51–54 ; *Яе ж.* Знешнепалітычная дзейнасць і дыпламатыя БНР у 1918 г. // Беларус. гіст. часоп. 2000. № 1. С. 24–28 ; *Яе ж.* К вопросу о границах БНР // Белорус. журн. междунар. права и междунар. отношений. 1999. № 1. С. 77–83 ; *Ціхаміраў А. В.* Беларусь у сістэме міжнародных адносін ...

[399] *Снапкоўскі У. Е.* Дыпламатыя Беларускай Народнай Рэспублікі (1918–1925 гг.) // Гісторыя знешняй палітыкі. Ч. 2. Гл. 15. С. 81–105.

[400] Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / М. П. Касцюк (і інш.). Мінск, 1994–1995. Ч. 2. 1995. С. 57–58, 63–64.

[401] Гісторыя Беларусі. Т. 5. С. 104.

[402] Там жа. С. 105.

[403] *Касцюк М. П.* Шлях да ісціны ... С. 138.

хоць і вельмі неспрыяльныя, абставіны. М. Касцюк, як і шмат іншых гісторыкаў, падзяляў і адстойваў думку аб тым, што БНР і БССР – звёны аднаго працэсу станаўлення нацыянальнай дзяржаўнасці. Таму абвяшчэнне БНР не маглі ігнараваць беларускія і расійскія бальшавікі, прапанаваўшы ёй вымушаную альтэрнатыву – беларускую дзяржаўнасць на савецкай аснове[404].

У калектыўных працах Інстытута гісторыі НАН Беларусі «Беларуская Народная Рэспубліка – крок да незалежнасці» і трэцім томе «Гісторыі беларускай дзяржаўнасці» (выйшлі ў 2018–2019 гг.) адлюстравана сучаснае бачанне стварэння і дзейнасці БНР, яе сутнасці як першай формы нацыянальнай беларускай дзяржаўнасці, якую не ўдалося рэалізаваць у значнай ці поўнай ступені[405]. Аўтары паказалі, што беларускія нацыянальныя дзеячы (эліта) не толькі змаглі выпрацаваць ідэю беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці, але і шмат зрабілі па яе ўвасабленні ў жыццё, імкнучыся праводзіць унутраную і знешнюю палітыку БНР у адпаведнасці з нацыянальнымі інтарэсамі беларускага народа. У «Гісторыі беларускай дзяржаўнасці» БНР ахарактарызавана як «гістарычны выбар нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння», які, аднак, не пашэнціла давесці да стану незалежнай дзяржавы[406].

6. Другой формай нацыянальнай дзяржаўнасці была Беларуская ССР. Ёй у параўнанні са сваім сацыяльна-класавым антаганістам (БНР) выпаў больш шчаслівы лёс, і беларуская савецкая рэспубліка праіснавала 72 гады, даўшы пачатак новай незалежнай дзяржаве – Рэспубліцы Беларусь. Гісторыя БССР і яе знешнепалітычнай дзейнасці яшчэ як след не напісана, але ж у афіцыйнай гістарыяграфіі і гістарычнай палітыцы прэзідэнцкага перыяду часы БССР падаюцца ў светла-ружовых колерах. 100-годдзе БССР дае добрую падставу, каб ацаніць дзяржаўна-прававы і міжнародна-палітычны статус рэспублікі, ступень яе самастойнасці ў складзе СССР і на міжнароднай арэне.

Кіраўніцтва МЗС Рэспублікі Беларусь, праводзячы курс на ўмацаванне гісторыка-дзяржаўнай традыцыі ў сваёй дзейнасці, шукала падзею ці дату, з якой можна было б весці пачатак сучаснай дыпламатычнай службы Беларусі. Яно звярнулася з адпаведнай просьбай да

---

[404] *Касцюк М. П.* Шлях да ісціны ... С. 138.

[405] Беларуская Народная Рэспубліка – крок да незалежнасці: да 100-годдзя абвяшчэння : гіст. нарыс / А. А. Каваленя [і інш.]. Мінск, 2018 ; История белорусской государственности. Т. 3 : Белорусская государственность: от идеи к национальному государству (1917–1939 гг.) / А. А. Коваленя [и др.] ; отв. ред. тома: В. Г. Мазец, Н. В. Смехович, С. А. Третьяк. Минск, 2019.

[406] История белорусской государственности. Т. 3. С. 4, 612.

спецыялістаў, у тым ліку з факультэта міжнародных адносін БДУ. Свае думкі і прапановы на гэты конт выказаў і аўтар у запісцы на імя дэкана ФМА праф. В. Г. Шадурскага ў лютым 2016 г. Эксперты і дыпламатычныя супрацоўнікі МЗС паўсталі перад дылемай, з якой формы нацыянальнай дзяржаўнасці (БНР ці БССР) пачынаць адлік дыпламатычнай службы Беларусі, пра што вялася гаворка і на круглым стале ў беларускім МЗС, прысвечаным 100-гадоваму юбілею гэтага важнага дзяржаўнага інстытута (студзень 2019 г.). Супрацоўнікі МЗС, аддаючы належнае гістарычнай спадчыне БНР, адзначалі, што першыя дыпламатычныя пасады з'явіліся ва ўрадзе БНР (Народным сакратарыяце), дзе была пасада народнага сакратара па замежных справах, якую займаў старшыня ўрада Язэп Варонка[407]. Аднак пэўнай дыпламатычнай структуры ва ўрадавых установах БНР створана не было. Такі орган з'явіўся ў складзе ўрада ССРБ (Камісарыят па замежных справах), а яго першае ўпамінанне ў друку (22 студзеня 1919 г.) было прапанавана лічыць датай, якую зараз адзначаюць як Дзень дыпламатычнага работніка[408]. Паводле слоў ветэрана беларускай дыпламатыі, надзвычайнага і паўнамоцнага пасла У. Шчаснага: «Гэта першая ў найноўшай гісторыі Беларусі рэальная дзяржаўная структура, якая займалася знешнепалітычнай дзейнасцю»[409].

У савецкія часы Беларускую ССР абазначалі як «суверэнную сацыялістычную дзяржаву» (Канстытуцыя БССР 1978 г.), раўнапраўны суб'ект міжнароднага права (працы савецкіх юрыстаў-міжнароднікаў)[410], дзяржаву «асобнага роду ці абмежаваны суб'ект міжнароднага права» (працы заходніх юрыстаў-міжнароднікаў)[411], залежную ад РСФСР савецкую рэспубліку ці залежную ад саюзнага цэнтра (Крамля) саюзную рэспубліку СССР (ацэнкі замежных, заходніх урадаў), «марыянетачную дзяржаву, створаную і навязаную Масквой» (ацэнкі ўрада БНР і беларускай палітычнай эміграцыі)[412]. У вельмі розных, часам дыяметральна супрацьлеглых навуковых і палітычных дэфініцыях і ацэнках

[407] *Шаплыка Т.* Круглы стол: Дзяржавай упаўнаважаныя // Беларус. думка. 2019. № 1. С. 19–20.

[408] Гэтая дата была прапанавана надзвычайным і паўнамоцным паслом, старшынёй асацыяцыі ветэранаў МЗС З. Л. Калантай. – Гл.: Там жа. С. 20.

[409] Там жа. С. 20.

[410] *Яновский М. В.* Международная правосубъектность советских социалистических союзных республик // Международная правосубъектность: некоторые вопросы теории. М., 1971. С. 54–81 ; таксама гл. згаданыя працы Ю. П. Броўкі.

[411] *Кремнев П. П.* Пазнач. твор. С. 165–170.

[412] Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў ... Т. 4. Дак. № 69. С. 167.

адной з савецкіх саюзных рэспублік палягала сутнасць палітычнага і ідэалагічнага падзелу свету, які наступіў пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Расіі.

Гэты падзел знік пасля заканчэння халоднай вайны, што дазволіла гісторыкам, прававедам і палітыкам наблізіцца да сутнасных, сістэмных характарыстык савецкага камунізму і Савецкага Саюза як унікальнай «унітарнай федэрацыі», якую складалі залежныя ад Цэнтра саюзныя рэспублікі. У першыя гады незалежнасці беларускія вучоныя схіляліся да таго, каб даволі крытычна ацэньваць гістарычную спадчыну БССР, што добра бачна ў артыкуле Л. Лойкі ў першым томе «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» (1993), дзе час існавання БССР разглядаецца як «важны, своеасаблівы і супярэчлівы перыяд у шматвяковай гісторыі беларускага народа». Прызнаючы яе гістарычныя дасягненні ў эканамічным, сацыяльным і культурным развіцці і кансалідацыі беларускай нацыі, аўтар палічыў неабходным зазначыць, што «савецкі перыяд у гісторыі Беларусі – гэта час упушчаных магчымасцей для паскоранага цывілізацыйнага прагрэсу і нацыянальнага адраджэння»[413]. Гістарычныя ацэнкі значна змяніліся ў бок гларыфікацыі БССР у афіцыйных і энцыклапедычных выданнях, пачынаючы з другой паловы 1990-х гг. Усё гэта дае падставы сцвярджаць, што сёння «феномен БССР» застаецца пераважна прадметам і ўласнасцю гістарычнай палітыкі[414], а не навуковай гістарыяграфіі.

МЗС ажыццявіла шэраг важных мерапрыемстваў, накіраваных на ўмацаванне дзяржаўнай легітымнасці беларускай дыпламатычнай традыцыі (увядзенне Дня дыпламатычнага работніка, зацвярджэнне геральдычных сімвалаў МЗС, урачыстае пасяджэнне з нагоды 100-годдзя стварэння НКЗС БССР[415].

Аднак нельга забываць пра абмежаваны суверэнітэт БССР у складзе савецкай «унітарнай» федэратыўнай дзяржавы, адсутнасць сапраўднай знешняй палітыкі і яе сурагат у форме «знешнепалітычнай дзейнасці» рэспублікі. «Беларускі атрад савецкай дыпламатыі» – вось рэальнае месца

---

[413] *Лойка Л.* Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка // Энцыкл. гісторыі Беларусі. Т. 1 : А – Беліца. 1993. С. 407.

[414] К вопросу об исторической политике. С. 9.

[415] Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь. 100-годдзе сучаснай беларускай дыпламатычнай службы [Электронны рэсурс]. URL: http://mfa.gov.by/be/ministry/100years/bel/ (дата звароту: 14.04.2019) ; О торжественном собрании по случаю 100-летия дипломатической службы Республики Беларусь [Электронны рэсурс]. URL: http://mfa.gov.by/print/press/news_mfa/fd2d03b446b494fa.html (дата звароту: 14.04.2019).

МЗС БССР у сістэме дыпламатычнай службы СССР[416]. Дыпламатычныя работнікі, асабліва тыя, хто працаваў у савецкія часы, адказваючы на пытанне аб ступені самастойнасці і залежнасці рэспубліканскага МЗС, схільны больш падкрэсліваць самастойнасць дзейнасці дыпламатычнай службы БССР[417].

БНР паклала пачатак аднаўленню беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці ў XX ст., і яе справа была працягнута наступным дзяржаўным утварэннем – Беларускай ССР, якая, у сваю чаргу, паклала пачатак новай незалежнай дзяржаве – Рэспубліцы Беларусь. Гэтая трэцяя форма беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці працягвае сваё далейшае існаванне ў XXI ст., рэалізуючы гістарычныя традыцыі і ідэалы сваіх папярэднікаў – БНР і БССР. Узятыя разам, тры формы беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці XX–XXI стст. уяўляюць сабой гістарычную парадыгму, якую можна выразіць гегелеўскай трыядай: тэза (БНР) – антытэза (БССР) – сінтэз (Рэспубліка Беларусь)[418]. Зразумела, што пакуль у гэтай трыядзе вельмі шмат савецкага, бэсэсэраўскага, але з часам роля тэзы (БНР) будзе ўзмацняцца, што адбываецца ўжо зараз. Сінтэз будзе больш прапарцыянальным, будзе ўбіраць у сябе больш спадчыны, ідэалаў і каштоўнасцей першай формы нацыянальнай беларускай дзяржаўнасці, тым самым адлюстроўваючы ўсё больш гістарычнай праўды.

Такім чынам, знешнепалітычная гісторыя Беларусі з'яўляецца важным кірункам гістарычных, міжнародных і паліталагічных даследаванняў у айчыннай гістарычнай і ў больш шырокім сэнсе – гуманітарнай і сацыяльнай (грамадазнаўчай) навуцы. ЗГБ – неад'емная частка нацыянальнай гісторыі Беларусі, гісторыі беларускай дзяржаўнасці, палітычнай і дзяржаўна-прававой гісторыі беларускага народа.

Гісторыя знешнепалітычнай дзейнасці БНР, БССР і Рэспублікі Беларусь даказвае, што яны дзейнічалі на карысць нацыянальным інтарэсам беларускага народа ў тагачасным разуменні гэтых інтарэсаў і патрэб, у тагачасных унутрыпалітычных і міжнародных абставінах, якімі іх уяўлялі і тлумачылі кіруючыя колы гэтых трох форм (відаў) беларускай дзяржаўнасці. У гэтым сэнсе прапанаваная намі трыяда гісторыі

---

[416] С такім сцвярджэннем выступіў аўтар на круглым стале, цытуючы сумесны артыкул з С. Вайтовічам 1984 г.: *Шаплыка Т.* Круглы стол ... С. 24.

[417] Там жа. С. 23–25.

[418] *Гарбацэвіч А.* Прафесар БДУ Снапкоўскі: БНР – гэта тэзіс, БССР – антытэзіс, а Рэспубліка Беларусь – гэта сінтэз [Электронны рэсурс] // Наша ніва. URL: https://nn.by/?c=ar&i=206311 (дата звароту: 14.07.2019).

беларускай дзяржаўнасці XX – пачатку XXI ст. (тэза – антытэза – сінтэз) паказвае дыялектычную супярэчлівасць БНР і БССР, на аснове якой узнікла і развіваецца маладая незалежная дзяржава Рэспубліка Беларусь.

## 3.3. Перыядызацыя гісторыі знешнепалітычнай дзейнасці БССР[419]

Беларуская ССР праіснавала 72 гады і зышла ў нябыт (з палітычнай карты свету, а дакладней з палітыка-адміністрацыйнай карты СССР) разам з распадам федэратыўнай дзяржавы – Савецкага Саюза, адной са стваральніц якой стала ў 1922 г. Аднак яна працягвае заставацца прыцягальным аб’ектам і прадметам даследавання гістарычнай навукі і гістарычнай палітыкі Рэспублікі Беларусь – новай незалежнай дзяржавы, якая з’яўляецца палітычнай і юрыдычнай спадчынніцай БССР. У гістарычнай палітыцы незалежнай Беларусі, асабліва перыяду прэзідэнцкага праўлення, гісторыя БССР разам з часамі Вялікай Айчыннай вайны займае ключавое, найважнейшае месца і служыць галоўным сродкам легітымізацыі існуючай сістэмы ўлады. У камемаратыўнай палітыцы гэта адлюстравалася ў факце абвяшчэння 3 ліпеня Днём незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

Стогадовы юбілей БССР гісторыкі сустрэлі без абагульняючай ці больш-менш сінтэтычнай працы па гісторыі беларускай савецкай дзяржавы. Напэўна, такая задача перад імі не ставілася. Магчыма, такую працу лічылі ўжо выкананай, маючы на ўвазе, напрыклад, калектыўную манаграфію Інстытута гісторыі НАН Беларусі «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст»., у дзвюх кнігах якой апісана гісторыя БССР, пры гэтым другая кніга пачынаецца з уз’яднання Заходняй Беларусі з БССР у 1939 г., а заканчваецца перыядам існавання Рэспублікі Беларусь[420]. Зразумела, што гісторыя БССР як дзяржаўнага ўтварэння адлюстравана ў многіх абагульняючых працах па гісторыі Беларусі, аднак гэта не здымае перад гісторыкамі (айчыннымі ці замежнымі) задачы напісання цэласнага, сістэматызаванага нары-

[419] Друкуецца паводле даклада на Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Гістарычныя лёсы беларускай савецкай дзяржаўнасці (да 100-годдзя абвяшчэння Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь)», арганізаванай Інстытутам гісторыі НАН Беларусі (Мінск, 6–7 снеж. 2018 г.).

[420] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ...

са ці даследавання, прысвечанага 72 гадам існавання беларускай савецкай рэспублікі.

З гэтай вялікай даследчыцкай задачай звязана і меншая, але таксама дастаткова важная і сур'ёзная. У беларускай гістарыяграфіі адсутнічае перыядызацыя гісторыі БССР. Замест яе маецца падзел навейшай гісторыі Беларусі на пэўныя, часам даволі ўмоўныя адрэзкі, якія пры гэтым не заўсёды вызначаны і абгрунтаваны храналагічна. Прыкладам можа выступаць пяты том шасцітомнай «Гісторыі Беларусі», дзе раздзел 2 «Беларуская ССР у абставінах выбару шляху развіцця» ахоплівае час ад Рыжскага міру да канца 1920-х гг., раздзел 3 «Савецкая Беларусь ва ўмовах таталітарнай сістэмы» – амаль усе 1930-я гг. (да восені 1939 г.), раздзел 4 «Беларусь у Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнах» (1939–1945 гг.)[421]. У шостым томе падзел на перыяды існавання БССР пададзены лепш, паколькі ён акрэслены дакладна. Раздзел 2 называецца «Беларуская ССР у час спроб рэфармавання савецкай сістэмы (другая палова 1950-х – 1970-й гг.)» (аднак у змесце дапушчана памылка: замест 1970-ты год дадзены 1970-я гг.), раздзел 4 «БССР у перыяд нарастання крызісу і заканчэння існавання савецкай сістэмы (1971–1991 гг.)»[422].

Як лічыць Г. Сагановіч, адным з цэнтральных пытанняў, якія ўзніклі перад беларускімі гісторыкамі ў сувязі з пераглядам старых метадалагічных падыходаў да гісторыі Беларусі, стала перыядызацыя, паколькі яны яшчэ ніколі не надавалі ёй належнага значэння[423]. Свой артыкул ён прысвяціў перыядызацыі гісторыі Беларусі часоў Сярэдневякоўя, аднак шэраг выказаных ім думак і палажэнняў мае абагульняючы, пастановачны характар і датычыцца шырокага разумення праблемы гістарычнай перыядызацыі. Пагодзімся з гэтым гісторыкам у тым, што вызначэнне перыядаў уяўляе сабой «самую верхнюю генералізацыю, у якой праяўляецца найвышэйшая форма сінтэзнага падыходу да гісторыі, таму як мага дакладнейшы падзел гістарычнага працэсу заўсёды быў важнай задачай класічнай гістарыяграфіі»[424].

Як вядома, перыядызацыя – гэта падзел гісторыі на часовыя адрэзкі (эпохі, перыяды, эры і г. д.), які ажыццяўляецца на аснове пэўных крытэрыяў. Паводле вызначэння У. Кошалева, «гістарычная перыяды-

---

[421] Гісторыя Беларусі. Т. 5.

[422] Гісторыя Беларусі. Т. 6.

[423] *Сагановіч Г.* У пошуках Сярэднявечча // Беларус. гіст. агляд. 1997. Т. 4. Сш. 1–2 (6–7). С. 3.

[424] Там жа. С. 4.

зацыя – гэта форма колькаснага і якаснага абазначэння гістарычнага развіцця». Найбольш распаўсюджаная тыпалагічная форма перыядызацыі – лінейная, што прадугледжвае падзел гісторыі на раўназначныя па маштабах і глыбіні ступені, кожная наступная з якіх вырастае з папярэдняй. Іерархічная форма выражаецца ў субардынацыі асобных з'яў і этапаў развіцця, якія ўяўляюць сабой часткі больш агульнага і складанага працэсу. Прынцыповую аснову любой перыядызацыі складаюць крытэрыі, выбар якіх вызначаецца не толькі навуковай кваліфікацыяй, але і светапоглядам даследчыка. Як вядома, ідэалізацыя і абсалютызацыя сацыяльна-эканамічных крытэрыяў абмежавалі і дыскрэдытавалі эўрыстычныя магчымасці марксісцкай фармацыйнай перыядызацыі[425].

Увогуле ж, усялякі падзел часу на перыяды адносны і ўмоўны і нават штучны, аднак такое дзяленне патрэбна для лепшага разумення мінулага і з'яўляецца выдатным інструментам у руках гісторыка, каб як мага лепш, паўней і выразней прадставіць колькасныя і якасныя адметнасці таго ці іншага гістарычнага адрэзку часу.

Першая спроба перыядызацыі гісторыі знешнепалітычнай дзейнасці (ПГЗД) БССР зроблена правазнаўцам-міжнароднікам Ю. Броўкам (1974), які вылучыў асноўныя этапы знешнепалітычнай дзейнасці БССР з 1919 да пачатку 1970-х гг. У аснову яго перыядызацыі пакладзены інстытуцыянальна-прававы крытэрый з выдзяленнем трох этапаў: 1919–1923 гг.; 1923–1944 гг. і 1944 – пачатак 1970-х гг.[426] Перыядызацыя зроблена вучоным у форме гісторыка-прававога нарыса з падрабязным апісаннем падзей.

Наступная спроба ПГЗД БССР ажыццёўлена аўтарам у навучальных дапаможніках па гісторыі знешняй палітыкі Беларусі: у 2004 г. на беларускай мове[427] і ў 2013 г. на рускай мове[428]. Намі прапануецца два крытэрыі перыядызацыі: 1) геапалітычны і міжнародна-палітычны (змены вакол БССР на міжнароднай арэне); 2) знешнепалітычнай актыўнасці (змены ў інстытуцыянальна-прававым і палітычным статусе рэспублікі).

Паводле першага крытэрыя ПГЗД БССР падзяляецца на два этапы: 1919–1945 гг. і 1945–1991 гг. Першы этап ахоплівае адрэзак часу ад заканчэння Першай сусветнай вайны да заканчэння Другой сусветнай

[425] *Кошалеў У.* Гістарычная перыядызацыя // Энцыкл. гісторыі Беларусі. Т. 3 : Гімназія – Кадэнцыя. 1996. С. 9–10.

[426] *Бровка Ю. П.* Белорусская ССР – суверенный участник ... С. 34–80.

[427] *Снапкоўскі У. Е.* Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі. Ч. 2. С. 8–14.

[428] *Снапковский В. Е.* История внешней политики Беларуси. С. 296–298, 353–354, 396–399.

вайны. Другі этап пачынаецца завяршэннем Другой сусветнай вайны і новым выхадам БССР на міжнародную арэну, а заканчваецца распадам СССР і абвяшчэннем незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Амаль цалкам 46-гадовы адрэзак часу супадае з гісторыяй халоднай вайны[429]. Гэты крытэрый уяўляецца нам больш абстрактным і менш карысным для разумення міжнароднай, знешнепалітычнай дзейнасці БССР, таму засяродзім увагу на другім, больш канкрэтным і змястоўным.

Паводле крытэрыя знешнепалітычнай актыўнасці рэспублікі знешнепалітычная дзейнасць БССР падзяляецца на чатыры этапы: 1) 1919–1923 гг.; 2) 1923–1938 гг.; 3) 1938–1944 гг.; 4) 1944–1991 гг. Ніжэй даецца іх кароткая характарыстыка.

*Першы этап* ахоплівае час ад з'яўлення БССР да ўтварэння СССР і абмежавання знешнепалітычных паўнамоцтваў рэспублікі ў ліпені 1923 г., калі Дэкларацыя і Саюзны дагавор уступілі ў сілу[430]. У гэты час, асабліва ў 1921–1923 гг., адбыўся выхад Беларускай савецкай дзяржавы на міжнародную арэну. Аднак ён быў даволі сціплым і праяўляўся пераважна ва ўзаемаадносінах БССР з іншымі савецкімі рэпублікамі і суседнімі дзяржавамі Усходняй Еўропы. Рэспубліка атрымала юрыдычнае прызнанне незалежнасці з боку РСФСР, а таксама Польшчы і Германіі. Адносіны дэ-факта падтрымліваліся з шэрагам еўрапейскіх краін. БССР прымала самы актыўны ўдзел у фарміраванні федэратыўных адносін з РСФСР і іншымі савецкімі рэспублікамі, складванні іх дыпламатычнага саюзу, стварэнні Саюза ССР. Створаная па волі і ў знешнепалітычных інтарэсах Савецкай Расіі, Савецкая Беларусь выступала ў рэгіянальнай палітыцы як праваднік знешнепалітычнай лініі Масквы. Дыпламатычная служба БССР фарміравалася таксама пад вырашальным уплывам РСФСР і ў кантэксце складвання федэратыўных адносін паміж дзвюма рэспублікамі. У рамках дыпламатычнага саюзу савецкіх рэспублік БССР дэлегавала свае знешнепалітычныя паўнамоцтвы РСФСР. Адначасова рэспубліка ажыццяўляла і пэўныя самастойныя акцыі ў адносінах з суседнімі дзяржавамі[431].

*Другі этап* ахоплівае адрэзак часу ад абмежавання знешнепалітычных паўнамоцтваў рэспублікі ў ліпені 1923 г. да ліквідацыі Упраўлення

---

[429] *Снапкоўскі У. Е.* Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі. Ч. 2. С. 8–11 ; *Яго ж.* История внешней политики Беларуси. С. 394–396.

[430] Знешняя палітыка Беларусі. Т. 2 : (1923–1927 гг.) / склад.: У. М. Міхнюк [і інш.]. 1999. Дак. № 18, 20, 28.

[431] Знешняя палітыка Беларусі. Т. 1 : (1917–1922 гг.) / склад. У. М. Міхнюк [і інш.]. 1997. Дак. № 131, 140, 161, 191, 192, 195.

ўпаўнаважанага (УУ) НКЗС СССР пры СНК БССР у 1938 г. У гэты 15-гадовы перыяд БССР, як і іншыя саюзныя рэспублікі, не ажыццяўляла знешнепалітычнай дзейнасці, не маючы на гэта ні канстытуцыйных паўнамоцтваў, ні адпаведных інструментаў у выглядзе знешнепалітычнага ведамства ці іншых органаў знешняй палітыкі. З уваходжаннем у склад СССР савецкія рэспублікі перадалі свае знешнепалітычныя паўнамоцтвы саюзным органам, у першую чаргу Наркамату замежных спраў СССР, што было замацавана ў Канстытуцыях СССР 1924 і 1936 гг. і Канстытуцыях БССР 1927 і 1937 гг. З 1923 г. знешнепалітычная дзейнасць БССР хутка затухла і фактычна спынілася. Створаны замест НКЗС БССР новы дзяржаўны інстытут, УУ НКЗС СССР пры СНК БССР, меў значна вузейшыя правы і функцыі і рэальна дзейнічаў толькі да пачатку 1930-х гг.[432], фармальна спыніўшы сваё існаванне ў 1938 г. У 1920-я гг. развіваліся замежныя эканамічныя і культурныя сувязі рэспублікі, але і яны значна аслабелі ў канцы дзесяцігоддзя. Суверэнітэт БССР набыў фармальны і дэкларатыўны характар. З усталяваннем ваенна-бюракратычнай мадэлі сацыялізму ў СССР, умацаваннем унітарызму ў развіцці савецкай федэрацыі і нарастаннем пагрозы вайны рэспубліка папала ў міжнародную ізаляцыю і самаізаляцыю.

*Трэці этап* ахоплівае час ад ліквідацыі УУ НКЗС СССР пры СНК БССР у 1938 г. да аднаўлення дзейнасці Наркамата замежных спраў БССР у сакавіку 1944 гг. Напярэдадні і ў пачатку Другой сусветнай вайны Беларусь стала аб'ектам геапалітычных камбінацый і вялікадзяржаўнай палітыкі, якую планавалі і ажыццяўлялі дзве самыя магутныя дзяржавы ўсходнееўрапейскага рэгіёна – Савецкі Саюз і нацысцкая Германія. У выніку іх узгодненай палітыкі, накіраванай на пераразмеркаванне сфер уплыву ў рэгіёне, была падзелена Польшча і Заходняя Беларусь уз'ядналася з БССР. Другім вынікам сакрэтных савецка-германскіх дамоўленасцей і савецка-літоўскіх перагавораў стала перадача Літве Вільні, Віленскага краю і іншых тэрыторый са значнай часткай беларускага насельніцтва. Як вядома, у выніку стратэгічных памылак сталінскага кіраўніцтва Беларусь стала адной з першых ахвяр гітлераўскага нападу на СССР, а пасля летняга «бліцкрыгу» 1941 г. на працягу трох гадоў знаходзілася пад нямецка-фашысцкай акупацыяй. Азначаны перыяд характарызуецца аб'ектнай, несамастойнай роллю БССР у міжнародных адносінах, аб чым сведчыла перш за ўсё адсутнасць беларускай дыпламатычнай службы нават у форме УУ НКЗС СССР пры

[432] Знешняя палітыка Беларусі. Т. 2. Дак. № 31, 33, 38, 213, 222.

СНК БССР, і адначасова актыўнай роллю Беларусі ў ваеннай палітыцы (на франтах і ў тыле савецка-германскай вайны)[433].

*Чацвёрты этап* ахоплівае час ад аднаўлення дзейнасці НКЗС БССР у сакавіку 1944 гг. да абвяшчэння незалежнасці Рэспублікі Беларусь 25 жніўня 1991 г. Гэты 47-гадовы адрэзак часу адметны тым, што ажыўленне і ўздым знешнепалітычнай дзейнасці БССР прыпадалі на пачатак гэтага этапа (1944 г. – канец 1940-х гг.) і на яго заканчэнне (другая палова 1980-х – пачатак 1990-х гг.). Чацвёрты этап ПГЗД БССР у сілу яго адноснай працяглaсці можна разбіць на карацейшыя адрэзкі часу (падэтапы), прымяніўшы такім чынам іерархічную перыядызацыю, у аснову якой мы пакладзём крытэрый знаходжання ва ўладзе таго ці іншага савецкага кіраўніка, што было істотным чыннікам для характарыстыкі знешняй палітыкі і дыпламатычнай дзейнасці СССР, якія, як вядома, вызначалі абмежаваную знешнепалітычную дзейнасць саюзных рэспублік. Перыядызацыя гэтага этапа ПГЗД БССР зроблена аўтарам у асобным артыкуле[434].

*Першы падэтап ахоплівае 1944–1953 гг.* Гэта апошняе сталінскае дзесяцігоддзе савецкай знешняй палітыкі, звязанае з разгортваннем актыўнай знешнепалітычнай дзейнасці БССР і яе наступным затуханнем (у пачатку 1950-х гг.). У сярэдзіне 1940-х гг. адбыўся другі выхад БССР на міжнародную арэну, аб чым сведчылі такія падзеі, як аднаўленне дзейнасці рэспубліканскага НКЗС, падпісанне беларускім урадам двухбаковага пагаднення аб абмене насельніцтвам з Польшчай, удзел беларускай дэлегацыі ва Установчай канферэнцыі Аб’яднаных Нацый у Сан-Францыска і падпісанне ёю Статута ААН, пачатак дзейнасці БССР у ААН, удзел беларускай дэлегацыі ў Парыжскай мірнай канферэнцыі і падпісанне мірных дагавораў з былымі саюзнікамі Германіі, уступленне БССР у некаторыя спецыялізаваныя ўстановы ААН, атрыманне Беларуссю дапамогі з боку ЮНРРА. Аднак пачатак і абвастрэнне халоднай вайны не дазволіў Беларускай ССР нарошчваць і пашыраць сваю дыпламатычную актыўнасць. У канфрантацыі з Захадам савецкаму кіраўніцтву не патрэбна была дыпламатыя саюзных рэспублік.

*Другі падэтап уключае 1953–1964 гг.* Гэта хрушчоўскі перыяд знешнепалітычнай дзейнасці СССР–БССР (адліга і рэформы). Ён адметны пашырэннем і актывізацыяй знешнепалітычнай дзейнасці і замежных сувязей рэспублікі, яе ўступленнем у шэраг спецыялізаваных устаноў

---

[433] *Снапкоўскі У. Е.* Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі. Ч. 2. С. 147–148.

[434] *Снапкоўскі У. Е.* Беларуская ССР на міжнароднай арэне (1945–1990 гг.) // Белорус. журн. междунар. права и междунар. отношений. 1999. № 2. С. 62–67.

ААН (ЮНЕСКА, МАП, таксама МАГАТЭ), стварэннем пастаянных прадстаўніцтваў БССР пры ААН і іншых міжнародных арганізацыях, новымі формамі замежных сувязей (прыгранічнае супрацоўніцтва, мясцовыя дружалюбныя сувязі, стварэнне грамадскіх арганізацый, перш за ўсё Беларускага таварыства дружбы і культурных сувязей з замежжам, развіццё гандлёвых, культурных і турысцкіх сувязей), фарміраваннем партыйна-дзяржаўнай сістэмы кіраўніцтва знешнепалітычнай дзейнасцю БССР.

*Трэці падэтап уключае 1964–1985 гг.* Гэта эпоха Л. Брэжнева і яго наступнікаў, якая характарызуецца далейшым экстэнсіўным ростам савецкай эканомікі і грамадства і яго пераходам у застой, колькаснымі зменамі ў знешнепалітычнай актыўнасці БССР без істотных якасных перамен. Тагачасная сістэма міжнароднай актыўнасці БССР (знешнепалітычная дзейнасць і замежныя сувязі) дасягнула апагею, што праяўлялася ў павелічэнні колькасці падпісаных міжнародных дагавораў і пагадненняў (выключна шматбаковага характару), пашырэнні ўдзелу БССР у органах сістэмы ААН і актыўнасці пры абмеркаванні розных пытанняў парадку дня, узрастанні знешнеэканамічных і культурных адносін з замежнымі краінамі, перш за ўсё з сацыялістычнымі. Аднак размеркаванне знешнепалітычнай кампетэнцыі паміж рэспублікамі і саюзным цэнтрам не зведала якіх-небудзь значных змен пасля 1944 г., што было адлюстравана ў Канстытуцыі СССР 1977 г. і Канстытуцыі БССР 1978 г. У цэлым ролю і месца дыпламатычнай службы БССР у агульнасаюзнай сістэме знешнепалітычнай дзейнасці можна вызначыць тэрмінам, што ўвялі аўтарытэтныя маскоўскія вучоныя, рэдактары выдання, прысвечанага 60-годдзю ўтварэння СССР (1984), – «составной отряд советской дипломатической службы»[435].

*Чацвёрты падэтап ахоплівае 1985–1991 гг.* Гэта час гарбачоўскай перабудовы, які ўключаў нацыянальнае адраджэнне ў саюзных рэспубліках, новае палітычнае мысленне ў савецкай знешняй палітыцы, ажыўленне знешнепалітычнай актыўнасці БССР, як і іншых саюзных рэспублік, канец халоднай вайны, распад сацыялістычнага блока і СССР. Новыя моманты ў дзейнасці і рыторыцы беларускіх дыпламатаў праяўляліся ва ўзмацненні канструктыўных падыходаў да абмеркавання праблем сусветнай палітыкі, супрацоўніцтве з дэлегацыямі заходніх дзяржаў, адыходзе ад прапагандысцкіх штампаў і навешванні ярлыкоў на апанентаў,

---

[435] *Войтович С. Д., Снапковский В. Е.* Участие Белорусской ССР во внешнеполитической деятельности СССР // СССР в борьбе за мир и безопасность народов: исторический опыт. М., 1984. С. 227.

пашырэнні самастойнасці ў вылучэнні і адстойванні ўласных ініцыятыў. Якасныя перамены адбываліся ў актывізацыі замежных сувязей з Польшчай і іншымі дзяржавамі, развіцці знешнегандлёвых, культурных і гуманітарных кантактаў, пастаноўцы праблемы Чарнобыля на форуме нацый, развіцці дыпламатычных і міжпарламенцкіх сувязей з замежнымі дзяржавамі, новых адносінах метраполіі да беларускай дыяспары і іншых новых момантах, якія асабліва былі бачны ў 1990–1991 гг. Рэспубліка ішла да незалежнасці, а Міністэрства замежных спраў набывала ўсё больш рыс і прыкмет самастойнай дыпламатычнай службы.

У заключэнне падкрэслім, што ўсялякая перыядызацыя мае адносны і штучны характар. Яе можна прыраўняць да «ідэальнага тыпу» – тэрміна, які ўжываў нямецкі сацыёлаг М. Вэбер, каб абазначыць ім зручны даследчы інструмент для пазнання гістарычнага працэсу і сучаснага свету. Прапанаваная перыядызацыя гісторыі знешнепалітычнай дзейнасці БССР можа разглядацца падобным інструментам для лепшага, больш поўнага і ўсебаковага разумення гістарычных этапаў узнікнення, развіцця і знікнення беларускай савецкай дзяржаўнасці (менавіта яе знешніх, міжнародных аспектаў).

## 3.4. Аб падрыхтоўцы да выдання падручніка па гісторыі знешняй палітыкі Беларусі[436]

Пад збіральнай назвай «Падручнік па гісторыі знешняй палітыкі Беларусі» разумеюцца два выданні навучальнага дапаможніка для студэнтаў факультэта міжнародных адносін БДУ: 1) У. Е. Снапкоўскі. Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі : у 2 ч. (Мінск : БДУ, 2003–2004) і 2) В. Е. Снапковский. История внешней политики Беларуси (Минск : БГУ, 2013). Яны адрозніваюцца не толькі мовай напісання (беларускай і рускай), але і памерам, зместам, вучэбна-метадычнымі прыёмамі, падыходамі і ацэнкамі (хаця яны значна не змяніліся, і я імкнуўся па магчымасці іх не мяняць), нарэшце часам публікацыі (розніца складае 10 год).

[436] Друкуецца паводле выдання: *Снапкоўскі У. Е.* Аб маім вопыце падрыхтоўкі і выдання падручніка па гісторыі знешняй палітыкі Беларусі // Исследование международных отношений в Республике Беларусь: состояние и перспективы : материалы Респ. науч.-практ. конф., посвящ. 25-летию кафедры междунар. отношений БГУ (Минск, 6 окт. 2017 г.) / редкол.: М. Э. Чесновский (предисл.) [и др.]. Минск, 2018. С. 26–33.

Вучэбны курс «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі» пачаў выкладацца на Аддзяленні міжнародных адносін БДУ з верасня 1993 г., калі аўтар быў прыняты на пасаду прафесара кафедры міжнародных адносін. Гэта была новая вучэбная і навуковая дысцыпліна ў навучальным працэсе вышэйшай школы і ў гістарычнай навуцы Беларусі. Ніхто дагэтуль падобны прадмет нідзе не чытаў – ні ў Беларусі, ні за мяжой. Прафесары кафедры А. А. Разанаў, У. Е. Снапкоўскі, А. А. Чалядзінскі, А. В. Шарапа і дацэнт Л. В. Лойка абмяркоўвалі пытанне, як лепш назваць новы прадмет. Прапаноўваліся розныя варыянты – ад «Гісторыі геапалітыкі і дыпламатыі Беларусі» да «Гісторыі знешнепалітычнай дзейнасці і міжнародных сувязей Беларусі», аднак у рэшце рэшт пагадзіліся з назвай «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі», якую прапанаваў сам выкладчык, зыходзячы з таго, што беларуская дзяржаўнасць існавала стагоддзямі, а Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае праводзіла актыўную і разнастайную знешнюю палітыку.

Адукацыйная, навуковая, грамадска-палітычная запатрабаванасць навучальнага курса па знешнепалітычнай гісторыі Беларусі была выклікана найважнейшай палітычнай падзеяй у гісторыі Беларусі XX ст.: абвяшчэннем незалежнасці Беларусі. Як вядома, кафедра міжнародных адносін стваралася для падрыхтоўкі дыпламатаў для Міністэрства замежных спраў новай незалежнай дзяржавы. А беларускі дыпламат, як і ўвогуле дыпламаваны спецыяліст у галіне міжнародных адносін, павінен быў ведаць гісторыю знешнепалітычнай дзейнасці і дыпламатыі беларускіх дзяржаў. Таму гэта дысцыпліна станавілася адной з асноўных вучэбных прадметаў нашай кафедры. На яе выкладанне адводзіўся ўвесь навучальны год (70 гадзін аўдыторных заняткаў) з залікам і экзаменам.

Галоўныя цяжкасці падрыхтоўкі лекцый і выкладання матэрыялу былі звязаны з першымі тэмамі курса, прысвечанымі перыяду Сярэдневякоўя: старажытнабеларускім княствам і Вялікаму Княству Літоўскаму. Літаратуры, асабліва беларускай, па знешнепалітычнай дзейнасці гэтых першых дзвюх гістарычных форм беларускай дзяржаўнасці фактычна не было. Каб у гэтым пераканацца, дастаткова паглядзець праграму курса «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі» і планы семінарскіх заняткаў, упершыню выдадзеных у БДУ ў 1996 г[437]. З публікацый,

[437] Праграма курса «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі» для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці Г.10.01.00 – «Міжнародныя адносіны» / аўт.-склад.: праф. У. Е. Снапкоўскі. Мінск, 1996. 21 с.; Планы семінарскіх заняткаў па курсе «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі» для студэнтаў факультэта міжнародных адносін / аўт.-склад.: праф. У. Е. Снапкоўскі. Мінск, 1996. 20 с.

найбольш блізкіх да тэматыкі міжнародных адносін, у іх згадваліся працы беларускіх даследчыкаў М. Доўнар-Запольскага, М. Ермаловіча, У. Насевіча, У. Пічэты, Я. Юхо, расійскіх гісторыкаў Л. Аляксеева, І. Грэкава, В. Пашуты і інш.

Мне як даследчыку міжнародных адносін і знешнепалітычнай гісторыі Беларусі пасляваеннага часу (ХХ ст.) давялося ісці ў глыб вякоў, да пачаткаў беларускай дзяржаўнасці, авалодваць новымі, невядомымі ці малавядомымі дагэтуль пластамі гістарычнага матэрыялу, спасцігаць спецыфічную тэрміналогію і метадалогію даследавання сярэдневяковага перыяду. Аднак гэта былі не толькі асабістыя цяжкасці. Сотні беларускіх гісторыкаў і прадстаўнікоў іншых гуманітарных навук, натхнёныя запісам у Канстытуцыі аб глыбокіх гістарычных традыцыях беларускай дзяржаўнасці і вымушаныя так ці інакш прыстасоўвацца да новых патрабаванняў часу, рынуліся ў сівую даўніну, каб даведацца пра пачаткі нашай гісторыі і яе наступныя этапы. Праз чвэрць стагоддзя пасля стварэння кафедры міжнародных адносін БДУ можна ўжо казаць пра беларускую школу даследчыкаў знешняй палітыкі ВКЛ, куды ўваходзяць супрацоўнікі гэтай кафедры, кафедры дыпламатычнай і консульскай службы факультэта міжнародных адносін (кандыдаты гістарычных навук, дацэнты А. Дземідовіч, В. Лазоркіна, С. Лашкевіч), прадстаўнікі гістарычнага факультэта БДУ і іншых навучальных і навуковых установ Беларусі.

Праз 5–6 гадоў пасля пачатку выкладання прадмету заканамерна паўстала пытанне аб выданні падручніка (вучэбнага дапаможніка). Трэба было даць студэнтам, выкладчыкам, дыпламатам, спецыялістам у галіне міжнародных адносін, шырокаму колу чытачоў, усім, хто цікавіўся гісторыяй знешняй палітыкі і дыпламатыі Беларусі, сістэматызаваны навуковы агляд знешнепалітычнай гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Да таго ж у канцы 1990-х гг. значна пашырылася кола крыніц і літаратуры па нашым прадмеце. Пачала выдавацца «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі», выйшлі з друку «Нарысы гісторыі Беларусі», якія выконвалі ролю першага ўніверсітэцкага падручніка па айчыннай гісторыі, прайшлі абарону першыя кандыдацкія дысертацыі, з'явіліся першыя манаграфічныя даследаванні па знешняй палітыцы ВКЛ і БССР. Штуршком для напісання дапаможніка сталі замежныя стажыроўкі ў Вялікабрытаніі і ЗША. Трохмесячнае знаходжанне спачатку ў Хале (Хумберсайдскі ўніверсітэт, 1996 г.), потым у Нью-Ёрку (Калумбійскі ўніверсітэт, 1998 г.) у рамках праграм акадэмічных абменаў значна ўзбагаціла веды і вопыт даследчыцкай і выкладчыцкай працы, прыдало ўпэўненасці ў сваіх сілах. Знаёмства з англамоўнай літаратурай, гістарычнымі

даследаваннямі беларускай эміграцыі яшчэ раз пераканала ў тым, што за мяжой, як і на Радзіме, няма сінтэзаваных, абагульняючых работ па гісторыі знешняй палітыкі Беларусі ці нават па асобных яе перыядах. Канкрэтна пытанне аб падрыхтоўцы дапаможніка паўстала недзе ў 2000–2001 гг., і яно было паспяхова вырашана праз некалькі год. У 2003–2004 гг. навучальны дапаможнік быў апублікаваны з дзвюх частак у выдавецтве БДУ тыражом 600 экз. і паступіў у шырокае карыстанне студэнтамі факультэта міжнародных адносін, як і іншых падраздзяленняў БДУ.

Пры напісанні кнігі аўтару давялося вырашыць шэраг навукова-метадалагічных і вучэбна-метадычных задач. Быў вызначаны аб'ект вучэбнага курса «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі» як навуковай дысцыпліны. Гэта даследаванне гісторыі міжнародных адносін у рэгіёне Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, да якога геаграфічна, геапалітычна і цывілізацыйна належыць Беларусь; знешняй палітыкі дзяржаў як гэтага рэгіёна, так і іншых еўрапейскіх і нееўрапейскіх уплывовых актораў міжнароднай палітыкі і дыпламатыі. Устаноўлена таксама, што прадметам навуковай дысцыпліны «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі» з'яўляецца даследаванне знешнепалітычнай дзейнасці беларускіх дзяржаў і дзяржавападобных утварэнняў у розныя гістарычныя перыяды, а таксама знешнепалітычных праектаў беларускага нацыянальнага руху ў XIX–XX стст.

Трэба было распрацаваць перыядызацыю знешнепалітычнай гісторыі Беларусі ад пачаткаў дзяржаўнасці да сённяшніх дзён. За аснову была ўзята перыядызацыя гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Першыя гістарычныя формы беларускіх дзяржаў (старажытныя княствы і Вялікае Княства Літоўскае), у прынцыпе, цяжкасцей не выклікалі, хоць тады не ўсе беларускія гісторыкі прызнавалі, напрыклад, Полацкае княства дзяржавай. У 500-гадовай гісторыі ВКЛ вылучаліся два вялікія адрэзкі: да Люблінскай уніі і пасля яе.

Знешняя палітыка Рэчы Паспалітай разглядалася ў двух зрэзах: на федэратыўным і вялікакняжацкім. У адносінах паміж цэнтрам і перыферыяй праяўляліся асобныя дзяржаўныя інтарэсы ВКЛ, яго самастойныя дзеянні на міжнароднай арэне, якія ў Польскім каралеўстве, а потым і ў польскай гістарыяграфіі характарызаваліся як «літоўскі сепаратызм». Для беларускай гістарыяграфіі гэта была новая праблема, і яна разглядалася праз прызму барацьбы Вялікага Княства за сваю самастойнасць з унітарнымі тэндэнцыямі Польшчы ў складзе польска-літвінскай федэрацыі (саюзнай дзяржавы).

Падзеламі Рэчы Паспалітай заканчваецца першая частка дапаможніка. Пасля падзелаў пачаўся новы перыяд у гісторыі Беларусі і яе знешнепалітычнай дзейнасці (у дадзеным выпадку трэба казаць якраз пра няўдзел у міжнародных адносінах), паколькі тэрыторыя Беларусі апынулася ў складзе іншай дзяржавы – Расійскай імперыі. Беларускі народ страціў сваю дзяржаўнасць, не мог праводзіць знешняй палітыкі іператварыўся ў аб'ект знешняй і ваеннай палітыкі іншых дзяржаў. Гэтая роля аб'екта праяўлялася ў часы напалеонаўскіх войнаў, дыпламатычнай актыўнасці заходніх дзяржаў падчас нацыянальных паўстанняў у Польшчы, Літве і Беларусі, гады Першай сусветнай вайны. Працяглы перыяд знаходжання беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі адлюстраваны ў другой частцы дапаможніка ў трох главах, дзе раскрываецца роля беларускага фактару ва ўнутранай і знешняй палітыцы расійскага ўрада.

Наступны перыяд у гісторыі знешняй палітыкі Беларусі ахоплівае 1918–1991 гг.: ад абвяшчэння незалежнасці БНР да распаду СССР і спынення існавання БССР. Пасля распаду Расійскай імперыі беларуская дзяржаўнасць адрадзілася ў дзвюх формах: Беларускай Народнай Рэспубліцы і Беларускай ССР. У адрозненне ад афіцыйнай канцэпцыі гісторыі беларускай дзяржаўнасці, якая звязвае адраджэнне (узнікненне) дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі ў XX ст. выключна з абвяшчэннем БССР, у кнізе пачатак новага перыяду ў знешнепалітычнай гісторыі Беларусі звязваецца з абвяшчэннем незалежнасці БНР 25 сакавіка 1918 г. Знешнепалітычнай дзейнасці, дакладней дыпламатыі БНР, прысвечана глава, дзе адзначаецца гістарычнае значэнне БНР як першай спробы стварэння беларускай дзяржаўнасці ў XX ст., якая, аднак, па сутнасці аказалася няўдалай, паколькі яна не змагла аформіцца як незалежная дзяржава. Дзяржаваўтваральны працэс, пачаты Першым Усебеларускім з'ездам і стварэннем дзяржаўна-палітычных структур БНР, працягнуўся абвяшчэннем і наступнай дзейнасцю БССР. Беларуская савецкая дзяржава ў адрозненне аб БНР аказалася больш трывалым палітычным утварэннем, што праіснавала 72 гады. У падручніку знешнепалітычная дзейнасць БССР падраздзяляецца на некалькі этапаў і разглядаецца ў некалькіх главах.

Навучальны курс храналагічна завяршаецца 1991 годам, канцом існавання СССР і БССР і абвяшчэннем незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Аднак заключнай главой кнігі з'яўляецца раздзел аб знешняй палітыцы Рэспублікі Беларусь, дзе даецца агульная характарыстыка асноў і напрамкаў знешнепалітычнай актыўнасці новай незалежнай дзяржавы. Гэта зроблена з мэтай паказу ўсяго гістарычнага шляху бе-

ларускай дзяржаўнасці ад пачаткаў да класічнай формы сучаснай дзяржавы, якую набывае Беларусь пасля атрымання незалежнасці ў 1991 г.

Яшчэ адной важнай навукова-метадалагічнай і вучэбна-метадычнай задачай пры падрыхтоўцы падручніка было выяўленне і раскрыццё сфер праяўлення (рэалізацыі) знешняй палітыкі і дыпламатыі беларускіх дзяржаў і дзяржавападобных утварэнняў. Ва Уводзінах да першай часткі дапаможніка вылучаны шэсць састаўных элементаў, ці навуковых кірункаў (сфер), якія складаюць прадмет дысцыпліны. Яны мелі сваю спецыфіку для кожнай гістарычнай формы беларускай дзяржаўнасці, асабліва падчас знаходжання беларускіх дзяржаў у складзе федэратыўных дзяржаўных утварэнняў (ВКЛ – у Рэчы Паспалітай, БССР – у СССР), а таксама тэрыторыі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі. Дзейнасць Беларусі на міжнароднай арэне знаходзіла сваё выражэнне як у актыўнай форме суб'екта міжнародных адносін, так і ў пасіўнай форме аб'екта знешняй і ваеннай палітыкі іншых дзяржаў. Спецыфіка гістарычнага развіцця Беларусі ў перыяд Сярэдневякоўя і новага часу заключалася ў тым, што яе тэрыторыя ўваходзіла ў склад дзяржаў, дзе дамінавалі іншыя этнасы (у Рэчы Паспалітай гэта былі палякі, у Расійскай імперыі – рускія, у склад якіх уключалі беларусаў і ўкраінцаў). У поліэтнічнай дзяржаве, якой з'яўлялася ВКЛ, продкі беларусаў таксама не адыгрывалі ролю дамінуючага этнасу.

Этнанацыянальныя, канфесіянальныя, моўныя, культурна-цывілізацыйныя, геапалітычныя фактары ў рознай ступені ўздзейнічалі на тое, што на працягу вялікіх адрэзкаў часу Беларусь, нават маючы ўласную дзяржаўнасць, выступала больш як аб'ект знешняй палітыкі іншых дзяржаў. У часы Рэчы Паспалітай гэта праявілася пасля цяжкай вайны з Расіяй 1654–1667 гг., калі моцна аслабленае Вялікае княства згубіла самастойнасць як у складзе федэрацыі, так і на міжнароднай арэне. Аб'ектам знешняй палітыкі іншых дзяржаў (напалеонаўскай Францыі, кайзераўскай Германіі), як і ўнутранай і знешняй палітыкі расійскага ўрада, былі беларускія землі ў Расійскай імперыі.

Разам з тым расійскі перыяд у гісторыі Беларусі супаў з фарміраваннем беларускай нацыі і нацыянальнага руху, развіццём капіталізму і працэсамі мадэрнізацыі, што стварала асновы для аднаўлення, дакладней, для нараджэння сучаснай беларускай дзяржаўнасці. І гэта былі пазітыўныя моманты расійскага перыяду гісторыі беларускай дзяржаўнасці/недзяржаўнасці. Расійскую дзяржаву часоў імперыі нельга лічыць зусім чужой для беларусаў, хоць яе палітыка, асабліва пасля паўстання 1863–1864 гг., была накіравана на асіміляцыю і русіфікацыю беларускага этнасу.

Дыялектыка знешнепалітычных суб’ектна-аб’ектных адносін выразна праявілася ў гісторыі беларускай дзяржаўнасці XX ст., якая адрадзілася (дакладней, сфарміравалася нанова) у форме дзяржавападобнага ўтварэння (БНР) і паўсуверэннай дзяржавы (БССР). І гэта адзін з ключавых, асноватворных тэзісаў падручніка, які праходзіць праз главы, прысвечаныя знешнепалітычнай ці дыпламатычнай актыўнасці гэтых двух удзельнікаў міжнародных адносін. Паколькі ні БНР, ні БССР у выніку неспрыяльнага збегу ўнутраных і знешніх фактараў не пераўтварыліся ў паўнавартасныя (суверэнныя і незалежныя) дзяржавы, яны не праводзілі і не маглі праводзіць сапраўднай знешняй палітыкі ў класічным разуменні гэтага паняцця. Знешнепалітычная актыўнасць БНР праяўлялася пераважна ў дыпламатычнай сферы і ахоплівала кароткі гістарычны адрэзак (1918–1925 гг.). Знешнепалітычная дзейнасць БССР падзяляецца на некалькі этапаў у даваенныя і пасляваенныя часы. Гістарычная роля Беларускай ССР заключаецца ў тым, што, праіснаваўшы больш за 70 гадоў, яна стала аўтэнтычнай тэрытарыяльнай, палітычнай, міжнародна-прававой, эканамічнай і этнічнай базай для незалежнай Рэспублікі Беларусь.

Выхад кнігі сустрэў прыхільны водгук у навуковай грамадскасці. Першая частка беларускамоўнага падручніка атрымала станоўчую рэцэнзію ў «Беларускіх гістарычных сшытках» (Беласток, аўтар А. Краўцэвіч)[438], а пазней усё выданне было адзначана прэміяй імя першага рэктара БДУ акадэміка У. Пічэты ў 2008 г. за падрыхтоўку цыкла вучэбных і навуковых работ па гісторыі знешняй палітыкі Беларусі. У 2013 г. у серыі «Класічнае ўніверсітэцкае выданне» быў апублікаваны рускамоўны і актуалізаваны варыянт, які таксама карыстаецца попытам сярод студэнтаў, асабліва замежных.

Выданне падручніка для студэнтаў па гісторыі знешняй палітыкі Беларусі, няхай сабе ў сціплай форме навучальнага дапаможніка ў 2003–2004 і 2013 гг., – гэта вынік калектыўнай працы супрацоўнікаў кафедры міжнародных адносін, шэраг з якіх выкладаюць гэты прадмет па розных спецыяльнасцях факультэта міжнародных адносін БДУ ці выкладалі раней у іншых навучальных установах. У ім прадстаўлена канцэпцыя знешнепалітычнай гісторыі Беларусі ад пачаткаў дзяржаўнасці да канца XX ст., якая базіруецца на навуковых падыходах і метадалагічных парадыгмах, уласцівых для беларускай нацыянальнай школы даследчыкаў міжнародных адносін. Гэта школа, у цэнтры якой стаіць кафедра

[438] Białoruskie Zeszyty Historyczne. 2005. № 23. S. 231–235 ; *Смалярчык А.* Беларус. гіст. агляд. 2017. Т. 24. Сш. 1–2 (46–47). С. 277–286.

міжнародных адносін БДУ, сфарміравалася на працягу мінулага чвэрцьстагоддзя, а зараз выходзіць на шырокую дарогу разгортвання знешнепалітычных даследаванняў.

## 3.5. Особенности современного геополитического положения Беларуси[439]

**Территория Беларуси во времени и пространстве.** После провозглашения независимости Беларусь вышла на международную арену в двух качествах: как новое независимое государство со своими геополитическими интересами и как европейская страна, имеющая глубокие исторические традиции государственности[440]. Конституционный тезис о исторических традициях белорусской государственности наполнен богатым внешнеполитическим содержанием. Многовековой опыт истории белорусской дипломатии показывает определенную последовательность и логику внешнеполитических усилий в определении характера отношений белорусских государств (многонациональных государств, в состав которых входили белорусские земли) с соседними государствами и народами, окружающим миром в целом.

Уже на первом этапе истории белорусской государственности (существование древнебелорусских земель-княжеств в IX–XIII вв.) определились основные контуры геополитических целей и внешнеполитических интересов Беларуси. Во-первых, это отношения с восточнославянским миром, с государствами-княжествами Киевской Руси (восточный вектор). Во-вторых, это отношения с государствами и народами Западной

[439] Друкуецца паводле даклада на Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларусь у сучасных геапалітычных працэсах» (30 сак. 2017 г., Мінск, Цэнтр гісторыі геапалітыкі ДНУ «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» і Прадстаўніцтва па Беларусі Фонду імя Конрада Адэнаўэра).

[440] Дадзеная фармулёўка, прапанаваная аўтарам, апрабавана ў праекце Канцэпцыі знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, падрыхтаваным у лістападзе 2001 г. часовым навуковым калектывам, створаным пры Цэнтры міжнародных даследаванняў БДУ, і прынятым затым Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь. Гэтае палажэнне пазней было ўключана ў энцыклапедычныя выданні: *Снапкоўскі У. Е.* Фарміраванне асноў знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь // Беларус. энцыкл. : у 18 т. Мінск, 1996–2004. Т. 18 : в 2 кн. Кн. 2 : Рэспубліка Беларусь / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. Мінск, 2004. С. 711–713 ; *Яго ж.* Внешняя политика // Республика Беларусь. Т. 1. 2005. С. 413–415.

и Северной Европы (Польшей, Немецким орденом, народами Балтии) (западный вектор). Тогда же сформировалась и геополитическая традиция белорусской государственности. Ее суть и основная ценность – балансирование между Востоком и Западом, недопущение чрезмерного крена ни в одну из сторон. Это вытекало из геополитического положения белорусских земель, расположенных в географическом центре Европы, на стыке двух цивилизаций – восточноевропейской, православной, и западноевропейской, католической. Необходимость геополитического и цивилизационного баланса определялась и внутренней структурой белорусско-литовского общества (после возникновения ВКЛ), для которой были характерны полиэтничность и поликонфессиональность[441].

В течение ХХ в. территория Беларуси трижды становилась объектом геополитической активности больших («великих держав»), средних и малых государств. При этом белорусское государство (в данном случае Белорусская ССР) играло не только пассивную роль объекта, но и было субъектом этой геополитической деятельности, что наиболее выразительно проявилось в процессе распада СССР. Первый пик припадает на период Первой мировой войны и первые годы после ее окончания, завершившись Рижским мирным договором 1921 г. и созданием СССР в 1922 г. Второй пик охватывает период Второй мировой войны. Рубеж 1980–90 гг. – это третий, самый высокий и значительный по своим результатам пик геополитической активности вокруг Беларуси в истории ХХ в. Бывшие союзные республики, по всем критериям международного права формально считавшиеся государствами, таковыми не являлись в составе «советской унитарной федерации», которую многие небезосновательно называли многонациональной империей. Распад СССР открыл им путь на международную арену[442].

В данном тексте автор характеризует особенности геополитического положения Республики Беларусь, опираясь на собственные

[441] *Грыцкевіч А. П.* Гісторыя геапалітыкі Беларусі // Спадчына. 1994. № 1. С. 85–93 ; Гісторыя Беларусі. Т. 1 : Старажытная Беларусь: ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. 2000 ; *Снапкоўскі У. Е.* Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі. Ч. 1. С. 13–30.

[442] *Снапковский В. Е.* Эволюция геополитического положения Беларуси в ХХ в. // История внешней политики Беларуси. С. 394–396 ; *Яго ж.* Інтэграцыйныя і дэзынтэграцыйныя працэсы ў гісторыі Беларусі // Беларусь в современном мире : материалы XV Междунар. науч. конф., посвящ. 95-летию образования Белорус. гос. ун-та, Минск, 27 окт. 2016 г. Минск, 2016. С. 57–59.

исследования этой проблематики, работы зарубежных, прежде всего польских, ученых и высказывания президента Республики Беларусь А. Г. Лукашенко на тему о геополитическом месте Беларуси и ее стратегическом (цивилизационном) выборе.

Республика Беларусь по своему географическому положению находится в центре Европы, а также занимает срединную часть Евразийского континента в целом. По европейским меркам Беларусь можно рассматривать как среднюю по размерам территории и населения страну, сопоставимую с Австрией, Бельгией, Венгрией, Грецией, Португалией и другими подобными европейскими государствами[443]. Эта мысль, которая сейчас широко разделяется белорусскими[444] и зарубежными исследователями[445], а также официальной внешнеполитической доктриной Беларуси, не сразу пробила себе дорогу. После получения независимости в 1991 г. в среде белорусских политиков и узком кругу исследователей, занимавшихся международными отношениями, были сильны настроения, трактовавшие новоиспеченное государство (бывшую БССР) с позиций российскоцентризма и провинциального мышления. Царившие тогда среди представителей бывшей республиканской партийно-хозяйственной номенклатуры взгляды отражало высказывание «Мы без России пропадем», что предполагало и уничижительную роль Беларуси как сателлита и зависимого от Москвы «маленького» государства на международной арене. В журнальных публикациях начала 1990-х гг. автор проводил мысль о том, что, во-первых, Беларусь имеет внешнепо-

---

[443] Białoruś w stosunkach międzynarodowych / pod red. I. Topolskiego. Lublin, 2009 ; Geopolityczne mejsce Białorusi w Europie i w świecie / red. V. Bulhakau. Warszawa, 2006 ; *Garnett S. W.*, *Legvold R.* Belarus at the crossroads. Washington, 2002. Перевод на русский: Белоруссия на перепутье: в поисках международной идентичности / ред.: Ш. Гарнетт, Р. Легволд. М., 1998.

[444] Из белорусских авторов по этой теме можно выделить публикации: *Казак Е.* Геополитический потенциал Республики Беларусь в современных условиях // Белорус. журн. междунар. права и междунар. отношений. 2004. № 4. С. 3–38 ; *Пимошенко И. И.* Особенности современного геополитического положения Республики Беларусь // Белорус. журн. междунар. права и междунар. отношений. 2002. № 4. С. 66 ; *Фрольцов В. В.* Поиск геополитической идентичности. Республика Беларусь и геоэкономике вызовы мирового и регионального развития // Геополитика : учеб.-метод. пособие. С. 82–99 ; *Лазаревич А. А.*, *Левяш И. Я.* Беларусь: культурно-цивилизационный выбор. Минск, 2014.

[445] *Iwańczuk K.* Pozicja geopolityczna Bialorusi // Białoruś w stosunkach międzynarodowych. S. 129–135.

литические традиции и не только с советских времен, во-вторых, она на политической карте Европы может рассматриваться как среднее, а не малое государство[446].

**Геополитическая позиция Беларуси.** Обратимся к характеристике геополитического положения (геополитической позиции) Беларуси, которая предопределена территорией и пространственным положением государства. Она имеет важное значение, и хотя государства могут достигнуть значительной независимости от географического пространства, эта независимость не может быть полной. В отношении Беларуси геополитическая позиция государства имеет весьма существенное значение. Польский политолог К. Иваньчук определяет геополитическую позицию Беларуси, анализируя три ее составные элемента: территорию, непосредственное окружение (соседи, границы и состояние отношений с соседями), пространственное положение[447].

Он разделяет уже общепринятую среди исследователей позицию о том, что Беларусь по европейским меркам является средним государством. Отмечая фактически полное отсутствие у Беларуси минеральных ресурсов, за исключением калийной соли, К. Иваньчук обращает внимание на парадокс, связанный со значительной долей нефти и нефтепродуктов в белорусском экспорте[448]. В начале XXI в. эта доля составляла около 40 % стоимости всего экспорта. В 2010-е гг. она заметно уменьшилась в связи с сокращением поставок нефти из России.

Республика Беларусь граничит с пятью государствами и в настоящее время не имеет с ними пограничных споров, хотя в начале 1990-х гг. имелись определенные претензии Минска к границам с Польшей и Литвой[449]. Их удалось быстро решить путем заключения политического договора с Польшей в 1992 г. и договора о государственной границе с Литвой в 1995 г. Сегодня отношения Беларуси с соседними государствами и их интенсивность находятся на различном уровне. С Российской Федерацией Беларусь формально состоит в союзном государстве, которое можно определить как конфедерацию, однако сам этот союзный проект переживает кризис,

---

[446] *Снапкоўскі У.* Геапалітыка // Энцыкл. гісторыі Беларусі. Т. 2 : Беліцк – Гімн. 1994. С. 500–501 ; *Яго ж.* Геапалітычнае становішча Беларусі: учора і сёння // Беларуская мінуўшчына. 1994. № 3. С. 36–37 ; *Яго ж.* З Захадам ці Усходам // Маладосць. 1993. № 1. С. 249–252 ; Знешнепалітычныя аспекты суверэнітэту Беларусі ... (гл. раздз. 3.1).

[447] *Iwańczuk K.* Op. cit. S. 129.

[448] Ibid. S. 130.

[449] Гл. раздз. 2.3.

будучи поглощенным Евроазиатским экономическим союзом. Беларусь занимает особое место во внешней политике России, что обусловлено важным геополитическим, геостратегическим и транзитным положением Беларуси для интересов Российской Федерации. Россия всегда поддерживала политический режим президента А. Лукашенко, выполняя роль его защитника, протектора и адвоката на международной арене[450]. Доля России во внешней торговле Беларуси в начале XXI в. колебалась от 45 до 60 %. В 2016 г. на Россию приходилось около 40 % белорусского экспорта и более половины объема импорта[451]. Наибольшая зависимость проявляется в обеспечении Беларуси российскими энергоносителями (нефтью и газом). После отказа президента А. Лукашенко принять предложение президента России В. Путина о вхождении Беларуси в состав РФ, последовавшей за этим серии энергетических и торговых войн между двумя странами и позднее, в связи с российско-украинским конфликтом и стремлением Минска придерживаться в нем нейтральной позиции, белорусско-российские отношения охладели и приобрели более прагматический характер, что особенно заметно в торгово-экономической и военно-стратегической областях[452].

13 лет оставался нерешенным вопрос о ратификации Беларусью договора с Украиной о государственной границе от 1997 г., что осложняло двусторонние отношения, как и негативная реакция белорусских властей на «оранжевую революцию» 2004–2005 гг. После ратификации белорусским парламентом договора в 2010 г. и обмена ратификационными грамотами, отложенного по инициативе Минска на три года, погранич-

---

[450] *Снапкоўскі У. Е.* Будучыня беларускай дзяржавы ў прагнозна-аналітычным дакладзе Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных адносін // Беларусь в современном мире = Беларусь у сучасным свеце : материалы XVII Междунар. науч. конф., посвящ. 97-летию образования Белорус. гос. ун-та, Минск, 26 окт. 2018 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: В. Г. Шадурский (пред.) [и др.]. Минск, 2018. С. 58–60.

[451] Внешняя торговля Беларуси (2016 г.) [Электронны рэсурс] // Министерство иностранных дел Республики Беларусь. URL: http://mfa.gov.by/export/ (дата звароту: 14.04.2017) ; *Есин Р. О.* Экспорт как инструмент внешней политики Республики Беларусь // Актуальные проблемы международных отношений и глобального развития. Минск, 2016. Вып. 4. С. 67–77.

[452] *Снапкоўскі У. Е.* Аб новых момантах знешняй палітыкі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі // Беларусь в современном мире : материалы VIII междунар. науч. конф., посвящ. 88-летию образования Белорус. гос. ун-та, Минск, 30 окт. 2009 г. / редкол.: В. Г. Шадурский [и др.]. Минск, 2009. С. 54–56 ; *Яго ж.* Беларуска-расійскія адносіны.

ная проблема была снята. Поддержка официальным Минском нового украинского руководства, пришедшего к власти после «революции достоинства» 2014 г., и конструктивная позиция Беларуси во время российско-украинского конфликта способствовали улучшению отношений с Украиной. Однако обе страны придерживаются различной геополитической ориентации: в то время как позиция Киева является проевропейской и прозападной, Минск остается приверженным ориентации на Россию, хотя и пытается уменьшить свою зависимость от нее, стремясь проводить многовекторную политику.

Отношения Беларуси с тремя западными соседними государствами (Польшей, Литвой и Латвией), которые являются членами НАТО и ЕС, несмотря на происходящие с 2014 г. изменения к лучшему, пока не достигли такого уровня, чтобы называть их полностью добрососедскими и дружественными. Эти три государства придерживаются общей политики Запада в отношении Беларуси (политика «селективного воздействия» и «критического диалога») и стремятся в силу возможности развивать отношения с официальным Минском на основе экономического прагматизма. Вместе с тем отношения с Варшавой дополнительно обременены проблемой польского национального меньшинства в Беларуси[453], а отношения с Вильнюсом – строительством Островецкой АЭС вблизи границы с Литвой.

Геополитическая позиция Беларуси с точки зрения пространственного положения характеризуется следующими элементами: 1) Беларусь является фронтовым государством, граничащим, с одной стороны, с государствами – членами НАТО, с другой – с Россией; 2) Беларусь также граничит с государствами – членами Европейского союза; 3) Беларусь в соответствии с геополитическими концепциями России является частью так называемого ближнего зарубежья или постсоветского пространства, которое представляет собой важнейшую сферу безопасности РФ; 4) Беларусь лежит на важных транзитных путях между Россией и Европой, прежде всего через ее территорию проходят транспортные трубопроводы нефти и газа[454].

**А. Лукашенко о месте страны на политической карте.** С оценками и характеристиками геополитического положения Беларуси, высказанными К. Иваньчуком, как и другими зарубежными авторами, во многом перекликаются высказывания белорусских официальных лиц.

[453] *Снапкоўскі У. Е.* Беларуска-польскія адносіны на шляху да пацяплення // Многовекторность во внешней политике Республики Беларусь ... С. 68–78.

[454] *Iwańczuk K.* Op. cit. S. 133.

Характеристике особенностей геополитического положения Беларуси и другим связанным с этой темой вопросам было уделено значительное место в программном докладе «Внешняя политика Республики Беларусь в новом мире», с которым А. Лукашенко выступил 22 июля 2004 г. на совещании с руководителями заграничных учреждений Республики Беларусь[455]. Доклад представлял собой концептуальное изложение основ внешней политики белорусского государства. В частности, докладчиком была поставлена задача оценить «наш государственный внешнеполитический ресурс» и «правильно представить себе место нашей страны на континенте и в мире».

В докладе выделены четыре характерные черты современного геополитического положения Беларуси: 1. Беларусь по населению и территории – не малая, а средняя по европейским меркам страна. 2. Это страна с развитой экономикой, основанной не на добыче и продаже полезных ископаемых, а на переработке сырья и производстве готовой продукции. В республике создана экономика открытого типа, где около 60 % валового внутреннего продукта экспортируется. 3. «Беларусь расположена на чувствительнейшем геополитическом перекрестке. Объективно – это благословение для государства и народа: мы находимся на средоточии торговых и транзитных путей». 4. Беларусь – страна с внушительным военным потенциалом. В мировом списке военных потенциалов она входит в число пятидесяти первых государств[456].

В докладе сформулирована главная стратегическая задача страны – понизить уязвимость экономики и непосредственно вытекающие из этого внешнеполитические риски. Отмечено, что достичь целей ликвидации энергетической и сырьевой зависимости, как и зависимости от одного рынка сбыта, немедленно и полностью невозможно. Перед правительством поставлена задача обеспечить в ближайшей перспективе диверсификацию источников энергии на 25 %, а также достичь более разносторонней географии сбыта товаров и услуг. Имелось в виду

---

[455] *Лукашенко А. Г.* Внешняя политика Республики Беларусь в новом мире: Выступление Президента Республики Беларусь А. Г. Лукашенко на совещании с руководителями загранучреждений Республики Беларусь 22 июля 2004 г. [Электронны рэсурс] // Официальный интернет-портал Президента Республики Беларусь. URL: http://www.president.gov.by/press18726.html#doc. (дата звароту: 15.12.2010) ; Знешняя палітыка Беларусі. Т. 9 : (2001–2005 гг.) / склад.: У. Е. Снапкоўскі, А. В. Ціхаміраў, А. В. Шарапа. 2013. С. 417–440.

[456] Знешняя палітыка Беларусі. Т. 9. С. 419.

уйти от «уязвимости одного рынка» (российского, хотя в докладе он так и не назван)[457].

Спустя более 15 лет приходится констатировать, что уменьшить зависимость от поставок энергоносителей и российского рынка не удалось. Поэтому перед правительством поставлена задача достигнуть более или менее равномерного распределения торговых потоков между тремя главными партнерами Беларуси (треть – ЕАЭС, треть – ЕС, треть – остальной мир, или «дальняя дуга»). Как отмечалось в Обзоре итогов внешней политики Республики Беларусь и деятельности Министерства иностранных дел в 2016 г., на внешнеэкономическом направлении основные усилия были направлены на расширение взаимовыгодных связей с традиционными партнерами и освоение новых рынков, диверсификацию белорусского экспорта как одного из условий обеспечения экономической безопасности государства. Целевым ориентиром является выход в перспективе на более сбалансированное распределение белорусского экспорта по трем основным направлениям: ЕАЭС – ЕС – «дальняя дуга» – в целях снижения уязвимости национальной экономики от стрессовых ситуаций[458].

А. Лукашенко рассматривает транзитное положение как стратегический ресурс государства, а Беларусь – как ключевую транзитную страну для Европейского союза, подчеркивая для него три преимущества использования белорусской территории. 1) «Транзит через Республику Беларусь (в Россию и дальше на Восток. – *В. С.*) в два раза короче, чем через любое другое государство. Транспортная инфраструктура у нас наиболее развита. Порядка у нас побольше. И наконец, Беларусь – не криминальная страна, здесь Европейский союз и Россия к нам не имеют претензий, и интересы их полностью соблюдаются»[459].

Беларусь – это страна между двумя гигантами (Европейским союзом и Россией), но она не «буферное государство» и не вассал той или иной страны. Главным компонентом отношений Беларуси с Европейским союзом является торгово-экономические связи. Роль Евросоюза и Европы в целом в ее внешней торговле постоянно растет. Если в 1990-е гг. его доля в экспорте Беларуси составляла 8–10 %, то в 2004 г.

---

[457] Знешняя палітыка Беларусі. Т. 9. С. 421–422.

[458] Обзор итогов внешней политики Республики Беларусь и деятельности Министерства иностранных дел в 2016 году [Электронны рэсурс] // Министерство иностранных дел Республики Беларусь. URL: http://mfa.gov.by/publication/reports/ea444d5cceb4798d.html (дата звароту: 14.04.2017).

[459] Дадатак 1. Паз. 25. Т. 9. С. 429.

доля Европы в нашем экспорте – уже около 40 %, что сопоставимо с долей России[460].

В программном докладе содержится и раздел о стратегическом выборе Беларуси. Отвечая на вопрос, хочет ли Беларусь стать членом Европейского союза и что она выбирает – Восток или Запад, А. Лукашенко сказал, что выбор, который нам обычно пытаются навязать как судьбоносный – Восток или Запад, – это не выбор, а ложная дилемма. «Мы выбираем Беларусь, которая в силу экономики, в силу истории, в силу географии, в силу культуры и менталитета будет и на Востоке, и на Западе» [461]. Это можно и следует понимать как стремление Беларуси проводить сбалансированную внешнюю политику и выправить, по словам президента, тот «дичайший крен на Восток», допущенный им же в период «интеграционной горячки» в отношениях с Россией в 1996–1999 гг.

Высказанные в программном докладе идеи, оценки, предложения, как и задачи, поставленные перед правительством, министерствами иностранных дел, экономики и другими ведомствами, аккумулировали теоретические и практические наработки и достижения представителей различных общественных наук Беларуси (экономистов, политологов, международников, историков и др.), а также дипломатических работников и аналитиков из правительственных кругов. Это касалось в первую очередь научных положений о Беларуси как среднем европейском государстве, необходимости равноценного развития двух векторов белорусской внешней политики (восточного и западного) и активизации белорусской дипломатии на латиноамериканском направлении, плюсах и минусах открытой экономики Беларуси, уменьшении экономической зависимости от России и укреплении энергетической безопасности страны, проведении «агрессивной» внешнеторговой политики белорусскими предприятиями, Беларуси как доноре международной безопасности, в целом характеристики геополитического и международного положения Республики Беларусь.

Тематика геополитического положения и цивилизационного выбора Беларуси получила свое развитие в докладе А. Лукашенко на IV Всебелорусском собрании 6 декабря 2010 г., в котором, в частности, отмечалось: «Статус “перекрестка”, которым геополитически наделена Беларусь, мы понимаем как связующее звено, артерию между Западом

---

[460] Дадатак 1. Паз. 25. Т. 9. С. 426–427.

[461] *Лукашенко А. Г.* Внешняя политика Республики Беларусь в новом мире ; Дадатак 1. Паз. 25. Т. 9. С. 431.

и Востоком. Но не как барьер, буфер или санитарный кордон и ни в коем случае не проходной двор»[462]. Коснувшись вопроса о том, какой выбор был бы предпочтительней для Беларуси: Европейский союз или Россия, докладчик повторил мысль, которая впервые была сформулирована в вышеупомянутом докладе перед белорусскими дипломатами 22 июля 2004 г. В этом докладе идея «стратегического выбора» Беларуси была развита в концепцию ее «равной приближенности» к Востоку и Западу. Она была сформулирована следующим образом: «Мы не намерены “выбирать” между Евросоюзом и Россией. Это было бы неумно и неправильно. Мы не “идем” ни на Восток, ни на Запад. У нас собственное место в Европе, данное нашему народу Господом Богом, свои геополитическая идентичность и национальные интересы, важнейший из которых – обеспечение сбалансированного взаимодействия со всеми, формирование пояса добрососедства по всему периметру наших границ»[463].

Стратегия «равной приближенности» к Востоку и Западу дает шанс максимально эффективно использовать выгодное географическое положение, транзитный и промышленный потенциал страны[464].

В реальности, однако, правильная по своей сути стратегия «равной приближенности» остается трудно осуществимой из-за ненормальных отношений Беларуси с Западом. Поэтому она пока больше напоминает теоретическую конструкцию и хорошее пожелание на будущее, чем реально выполнимую стратегическую установку, реализация которой серьезно затруднена сложной геополитической ситуацией, в которой остается Беларусь[465].

В октябре 2011 г. А. Лукашенко опубликовал в газете «Известия» статью «О судьбах нашей интеграции», которая была откликом на статью тогдашнего премьер-министра России В. Путина об интеграции на постсоветском пространстве, где излагалась его предвыборная внешнеполитическая

---

[462] Доклад Президента Республики Беларусь Александра Лукашенко на четвертом Всебелорусском собрании [Электронны рэсурс] // Официальный интернет-портал Президента Республики Беларусь. URL: http://www.president.gov.by/press101732.print.html (дата звароту: 15.12.2018).

[463] Там жа.

[464] Там жа.

[465] *Снапкоўскі У. Е.* Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнка аб стратэгічным (цывілізацыйным) выбары Беларусі // Беларусь в современном мире : материалы XVI Междунар. науч. конф., посвящ. 96-летию образования Белорус. гос. ун-та, Минск, 25 окт. 2017 г. = Беларусь у сучасным свеце : матэрыялы XVI Міжнар. навук. канф., прысвеч. 96-годдзю заснавання Беларус. дзярж. ун-та, Мінск, 25 кастр. 2017 г. / редкол.: В. Г. Шадурский (пред.) [и др.]. Минск, 2017. С. 64–66.

программа. В своей статье белорусский руководитель выдвинул идею «интеграции интеграций», направленную на сближение двух интеграционных группировок на пространстве Евразии – Европейского союза и Евразийского союза – и создание в результате их взаимодействия общего экономического пространства от Лиссабона до Владивостока[466]. Можно сказать, что идея «интеграции интеграций» была развитием стратегической установки о «равной приближенности» Беларуси к Востоку и Западу. Однако и эта интересная и плодотворная мысль, получившая благоприятный отклик в Брюсселе, не дождалась своего часа. В настоящее время она далека от реализации в связи с осложнением международной ситуации в Восточной Европе из-за российско-украинского конфликта и кризисными явлениями в развитии ЕС (выход Великобритании из этого интеграционного объединения)[467].

**Оценки зарубежных исследователей.** Вопросы и проблемы, поднятые в докладе белорусского президента, в одних случаях были созвучны, в других отличались или существенно расходились с мнениями и оценками зарубежных исследователей, изучающих тематику геополитики и геостратегии Беларуси. К. Иваньчук, подчеркивая важное геополитическое, геостратегическое и транзитное положение Беларуси в европейском измерении, приходит к заключению, что она представляет «потенциальный предмет игры» между Россией и ЕС. Также и США заинтересованы пространством СНГ и этим государством[468].

Польская исследовательница К. Мажента проанализировала внутренние и внешние факторы, характеризующие экономическую позицию Беларуси (динамику ВНП, внешнюю торговлю, заграничные инвестиции, внешний долг), а также индекс человеческого развития и пришла к заключению, что «для Беларуси характерна низкая экономическая позиция»[469]. Она объясняет это прежде всего политическими причинами и существующим в стране политическим режимом, который «блокирует имеющиеся шансы развития». Говоря о перспективах экономической позиции Беларуси, К. Мажента предлагает два возможных сценария: 1) основанный на тезисе о прочности союза

---

[466] *Лукашенко А. Г.* О судьбах нашей интеграции // Известия. 2011. 19 окт.

[467] *Байчоров А. М.* Создание Евразийского экономического союза и проблема «интеграции интеграций» // Актуальные проблемы международных отношений и глобального развития : сб. науч. ст. / сост. Е. А. Достанко ; редкол.: А. М. Байчоров (гл. ред.) [и др.]. Минск, 2014. Вып. 2. С. 12.

[468] *Iwańczuk K.* Op. cit. S. 135.

[469] *Marzenda K.* Pozycja ekonomiczna Białorusi // Białoruś w stosunkach międzynarodowych. S. 156.

с Россией; 2) основанный на тезисе о медленном открытии (включении) Беларуси в сотрудничество с ЕС. В случае реализации первого сценария можно ожидать сползания Беларуси к роли «протектората» России, избавленного возможности влияния на экономическую ситуацию, как и существенных стимулов для модернизации и развития. Второй сценарий связан с реализацией европейской политики соседства, направленной на укрепление экономических связей с государствами, расположенными между ЕС и Россией. Это может усилить позицию Беларуси на переговорах с Россией, но не решит проблему энергетической зависимости. Поэтому сотрудничество с ЕС в условиях, когда Беларусь почти полностью зависит от российских поставок, не представляет для нее привлекательной альтернативы[470].

С оценками белорусского президента о значительном военном потенциале страны созвучны выводы польского автора И. Топольского относительно военной позиции Беларуси. На основе своей методики анализа военного потенциала различных государств он сопоставляет военную позицию Беларуси с аналогичной позицией США, России и других государств. С учетом ядерных сил, которыми Беларусь располагала в начале 1990-х гг., ее военная позиция была «очень низкой» в отношении США, России и Франции. Без учета ядерного потенциала военная позиция Беларуси была «очень низкой» в отношении США и России, «низкой» в отношении ФРГ, Франции и Украины. По мнению Топольского, международная военная позиция Беларуси сопоставима с Польшей с учетом количественных и качественных показателей, но без учета технического состояния военного снаряжения, количества персонала и технической зависимости от России. В сравнении с Чехией она «высокая», а Литвой и Латвией – «очень высокая». Решающую роль в военной позиции Беларуси играют сухопутные силы, развитая сеть полувоенных формирований (имеются в виду силовые структуры, в том числе внутренние войска) и ударный потенциал военно-воздушных сил[471]. Вывод, к которому приходит И. Топольский, заключается в том, что с учетом величины государства, включая его экономический потенциал и демографический фактор, «военная позиция Беларуси высокая. Особенно следует подчеркнуть хорошо развитую сеть полувоенных формирований, имеющих для власти большее значение, чем армия»[472].

---

[470] *Marzenda K.* Pozycja ekonomiczna Białorusi // Białoruś w stosunkach międzynarodowych. S. 156–157.

[471] Ibid. S. 174.

[472] Ibid. S. 175.

На основе проведенного краткого обзора современного геополитического положения Беларуси можно прийти к следующим выводам и заключениям.

1. На геополитической и цивилизационной карте Евразии Беларусь – это часть Востока, восточноевропейской, православной цивилизации, центром которой является Россия. Это подтверждается членством Беларуси в интеграционных группировках, где доминирующую роль играет Россия (ОДКБ и ЕАЭС), а также тем, что Россия и постсоветское пространство остаются приоритетом номер один в белорусской внешней политике и геостратегии.

2. Беларусь – это прифронтовое государство, лежащее на границе военно-политических блоков, интеграционных объединений и цивилизаций в Евразии. Как часть коллективного Востока это выдвинутый на Запад плацдарм или форпост в противостоянии Востока Западу. Эту мысль и эту роль Беларуси для России неоднократно высказывал белорусский президент. Конечно, есть и большие плюсы такого прифронтового положения Беларуси (возможности игры и балансирования между центрами силы, использование социального и технологического опыта двух цивилизаций, особенно западной, транзитное положение). Важно увеличить преимущества и уменьшить недостатки такого положения на стыке культур, цивилизаций и блоков.

3. Примерно с 2000 г. президент Беларуси пытается уменьшить зависимость от России, что нашло отражение как в концепциях и доктринальных установках, так и в реализуемых внешнеполитических стратегиях и курсах (многовекторная внешняя политика, возрождение концепции нейтралитета, равноприближенность к Востоку и Западу, интеграция интеграций). Вероятно, в политической сфере эту зависимость удалось уменьшить, правда, больше символически, о чем говорит «выгорание» проекта союзного государства и ставка В. Путина на создание Евразийского союза, в экономической же и военной сферах она не уменьшилась.

Среди внешнеполитических императивов белорусской государственности, выстраданных трудной историей отношений с соседними государствами и народами, следует назвать недопущение значительной, тем более чрезмерной, зависимости (политической, военной, экономической, культурной) от любой соседней или отдаленной страны под любым предлогом (историческая, этническая или конфессиональная близость, выгодность пользования экономическими и природными ресурсами и др.)[473]. Этот тезис, разделяемый многими белорусскими и зарубежными исследователями геополитики и международных отно-

[473] *Снапковский В. Е.* История внешней политики Беларуси. С. 430.

шений, несомненно, имеет своим адресатом великую восточную соседку, поскольку ни сейчас, ни в ближайшей перспективе любой другой страны, от которой Беларусь могла быть так сильно зависима, на политической карте Европы и мира не просматривается.

Несмотря на то что Республика Беларусь остается в стратегической сфере влияния Российской Федерации и как минимум в среднесрочной перспективе не сможет выйти из нее, императивом внешней, да и внутренней политики белорусского руководства является сохранение независимых, насколько это возможно, основ существования своего государства, ослабление культурно-цивилизационной зависимости от российского ядра восточнославянской цивилизации и укрепление связей, коммуникаций, отношений с западной цивилизацией, частью которой белорусские территории и государства были в прошлом и которая в форме НАТО и ЕС присутствует на северных и западных границах Беларуси и к которой сейчас разворачивается ее южная соседка – Украина.

# Глава 4

# БЕЛАРУСЬ У МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІНАХ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XX ст.: АБ ЗНЕШНЕПАЛІТЫЧНАЙ СУБ'ЕКТНАСЦІ БНР І БССР

## 4.1. Беларусь як суб'ект і аб'ект міжнароднай палітыкі (1918–1921 гг.)[474]

Як вядома, галоўнымі ўдзельнікамі (суб'ектамі) міжнародных адносін з'яўляюцца суверэнныя дзяржавы, якія ўжо доўгі час (з 1648 г.) займаюць вядучае месца ў вестфальскай сістэме міжнародных адносін. Другую групу складаюць недзяржаўныя ўдзельнікі міжнародных адносін, да якіх адносяцца міжнародныя арганізацыі, палітычныя, грамадскія і царкоўныя рухі і арганізацыі, прафесіянальныя саюзы, транснацыянальныя карпарацыі, асобы.

Паводле юрыдычнай тэрміналогіі асноўныя (першасныя) суб'екты міжнароднага права – дзяржавы, народы і нацыі, у тым ліку тыя, хто вядзе барацьбу за незалежнасць і стварэнне ўласнай нацыянальнай дзяржавы. Вытворнымі (другаснымі) суб'ектамі міжнароднага права з'яўляюцца міжнародныя арганізацыі, паколькі аб'ём іх праў

---

[474] Друкуецца паводле выдання: *Снапкоўскі У. Е.* Фарміраванне беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах геапалітычных зрухаў XX ст. : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 29–30 лістап. 2018 г. / рэдкал.: А. Д. Кароль (старш.) [і інш.]. Мінск, 2018. С. 245–250.

і паўнамоцтваў вызначаецца дзяржавамі-заснавальнікамі (стваральнікамі). Асобнымі элементамі міжнароднай правасуб'ектнасці могуць валодаць і дзяржавападобныя ўтварэнні накшталт вольных гарадоў Данцыга і Трыеста[475].

Зыходзячы з вышэйазначаных вызначэнняў удзельнікаў міжнародных адносін, якімі карыстаюцца гістарычная і палітычная навукі, і суб'ектаў міжнароднага права, якімі карыстаецца міжнароднаправавая навука, паспрабуем коратка апісаць ролю і месца Беларусі (беларускіх дзяржаў і дзяржавападобных утварэнняў) у міжнароднай палітыцы ў 1918–1921 гг., г. зн. ад стварэння (абвяшчэння) Беларускай Народнай Рэспублікі як дзяржавападобнага ўтварэння да заключэння Рыжскага мірнага дагавора, адным з удзельнікаў якога была Беларуская ССР.

У гэты перыяд беларуская дзяржаўнасць існавала ў дзвюх формах – БНР (зародкавая, нерэалізаваная форма дзяржаўнасці) і БССР (рэалізаваная форма дзяржаўнасці асобнага, сацыялістычнага тыпу), – якія адрозніваліся паміж сабой многімі істотнымі характарыстыкамі ў галіне дзяржаўнага будаўніцтва, унутранай і знешняй палітыкі, ідэалагічнай накіраванасці, ступенню і формамі залежнасці ад іншых дзяржаў. Аб'ядноўвала іх тое, што гэтыя дзве формы беларускай дзяржаўнасці XX ст. не пераўтварыліся ў паўнавартасныя (суверэнныя і незалежныя) еўрапейскія дзяржавы. Аднак у параўнанні з дзяржаўна-палітычнымі структурамі БНР (Радай і ўрадам), якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі не больш чым два гады (з лютага 1918 да лета 1920 г.), БССР праіснавала значна большы адрэзак часу (72 гады) і стала аўтэнтычнай прававой, палітычнай, тэрытарыяльнай, эканамічнай і этнічнай базай для незалежнай Рэспублікі Беларусь[476].

Ад гэтай думкі зусім недалёка і сцвярджэнне беларускіх гісторыкаў Іларыёна Ігнаценкі і Сяргея Хоміча аб тым, што адсутнасць палітычнага адзінства нацыі і складаная знешнепалітычная сітуацыя абумовілі два магчымыя напрамкі самавызначэння Беларусі – БНР і БССР. Гэтыя дзве формы беларускай дзяржаўнасці пэўны час існавалі паралельна, атаясамліваючы сабой дзве альтэрнатывы, выбар паміж якімі павінен быў зрабіць беларускі народ. З двух варыянтаў гістарычнага развіцця лёсам і часам быў выбраны другі, савецкі, напрамак. На думку гэтых аўтараў, «Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка стала своеасаблівай

---

[475] *Додонов В. Н.*, *Панов В. П.*, *Румянцев О. Г.* Субъекты международного права // Международное право : слов.-справ. / под общ. ред. В. Н. Трофимова. М., 1998. С. 307.

[476] *Снапкоўскі У. Е.* Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі. Ч. 2. С. 8.

формай беларускай дзяржаўнасці, у якой правы рэспубліканскіх органаў улады з самага пачатку моцна ўрэзаны на карысць цэнтра»[477]. Такім чынам, Савецкая Беларусь нарадзілася з моцна ўрэзаным суверэнітэтам, што асабліва праяўлялася ў яе абмежаванай здольнасці да самастойнай знешнепалітычнай дзейнасці.

У выніку звяржэння дынастыі Раманавых, Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г. на абсягах шматнацыянальнай Расійскай імперыі актывізаваўся нацыянальна-вызваленчы рух. У гэтым кантэксце паскорылася эвалюцыя беларускага руху ад агульнай ідэі свабоднай Беларусі да яе канкрэтызацыі ў кірунку незалежнага дзяржаўнага самавызначэння. Як вядома, разгон Усебеларускага з’езда супаў з пачаткам мірных перагавораў у Брэст-Літоўску паміж дзяржавамі Чацвярнога саюза і Савецкай Расіяй. Выканкам Усебеларускага з’езда накіраваў у Брэст-Літоўск дэлегацыю ў складзе А. Цвікевіча, С. Рак-Міхайлоўскага, І. Серады для абароны праў і інтарэсаў Беларусі пры падпісанні мірнага дагавора. Членаў гэтай дэлегацыі можна лічыць першымі дыпламатычнымі прадстаўнікамі Беларускай Народнай Рэспублікі.

19 студзеня 1918 г. Выканкам Рады Усебеларускага з’езда апублікаваў Дэкларацыю Беларускай мірнай дэлегацыі, дзе выкладаліся асноўныя прынцыпы і кірункі знешнепалітычнай дзейнасці будучай БНР. Некаторыя пункты дакумента, якія датычыліся міжнароднай дыпламатыі і эканамічнай палітыкі, былі практычна ідэнтычныя амерыканскай знешнепалітычнай дактрыне, выкладзенай 8 студзеня 1918 г. у «Чатырнаццаці пунктах» прэзідэнта В. Вільсана. У першым пункце Дэкларацыі гаварылася, што ўся Беларусь у сваіх этнаграфічных межах з’яўляецца адзінай і непадзельнай і ўваходзіць як раўнапраўная аўтаномная частка ў Расійскую Федэратыўную Дэмакратычную Рэспубліку. Нацыянальным меншасцям, што пражывалі на тэрыторыі Беларусі, прадастаўляецца нацыянальна-персанальная аўтаномія. У мэтах захавання цэласнасці дзяржавы меркавалася хутчэйшае ўз’яднанне акупаваных частак Беларусі, якія павінны былі быць вызвалены ад акупацыйных войскаў. Для аказання дапамогі Беларусі ў аднаўленні яе эканомікі ваюючым дзяржавам прапанавалася стварыць міжнародны фонд, за кошт якога на радзіму павінны былі быць вернуты бежанцы і кампенсаваны страты насельніцтву. Пасля вяртання беларускіх бежанцаў на радзіму меркавалася правесці свабоднае галасаванне ўсяго дарослага насельніцтва Беларусі па пытанні дзяржаўнай

---

[477] *Ігнаценка І.*, *Хоміч С.* Утварэнне БССР // Гісторыя Беларусі. Т. 5. С. 112.

прыналежнасці. Знешнепалітычная праграма Выканкама Усебеларускага з'езда ўключала пункт аб амністыі ўсім дзяржаўным злачынствам, звязаным з вайной[478].

Паўнамоцтвы беларускіх прадстаўнікоў не былі прызнаны дэлегацыямі, якія вялі перагаворы ў Брэст-Літоўску. Аднак яны атрымалі статус саветнікаў дэлегацыі Украінскай Народнай Рэспублікі, якая была афіцыйна дапушчана на перагаворы. Беларуская дэлегацыя сустрэлася з членамі германскай дэлегацыі і перадала ім мемарандум, у якім гаварылася аб стварэнні беларускай дзяржавы (БНР) у яе этнаграфічных і гістарычных межах. У дакуменце змяшчаўся пратэст супраць умоў мірнага дагавора, паводле якога частка беларускіх тэрыторый адыходзіла да Германіі, а таксама супраць таго, што дагавор не прадугледжваў выплату кампенсацыі беларускаму насельніцтву за страты, якія яно панесла ў ходзе вайны. Аднак немцы адмовіліся ўносіць нейкія змены ў падрыхтаваны тэкст дагавора, а прадстаўнік савецкай дэлегацыі Л. Карахан адмовіўся ад сустрэчы з беларускімі дэлегатамі[479].

У знешнепалітычнай сферы галоўнай мэтай Рады і ўрада БНР было прызнанне незалежнасці, устанаўленне дыпламатычных адносін з суседнімі дзяржавамі, вырашэнне пытання аб граніцах БНР. Першачарговымі задачамі новаабвешчанай дзяржавы на міжнароднай арэне з'яўляліся вяртанне бежанцаў, атрыманне грашовых займаў і пазык, развіццё гандлёва-эканамічных адносін, перш за ўсё з суседнімі краінамі. У радыётэлеграме ад 18 красавіка 1918 г. кіраўнік дэлегацыі БНР па знешніх перагаворах А. Цвікевіч паведамляў урадам еўрапейскіх дзяржаў аб абвяшчэнні незалежнасці БНР, прынцыпах яе дзяржаўнага будаўніцтва, тэрыторыі і дзяржаўных граніцах. Падкрэслівалася, што БНР не можа прызнаць Брэсцкі мірны дагавор, паколькі ён парушае тэрытарыяльную цэласнасць Беларусі, выказвалася жаданне ўрада пачаць перагаворы аб дружалюбных адносінах і дзяржаўных граніцах з суседнімі і іншымі еўрапейскімі дзяржавамі[480].

Над вырашэннем пытання аб міжнародна-прававым прызнанні граніц БНР працавалі Стратэгічная камісія пры Радзе БНР і Камісія па міжнародных справах пры Народным сакратарыяце[481]. У Дэкларацыі

---

478 Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі / уклад., падрыхт. тэксту, уступ. арт., камент., пер., паказ. С. Шупы. Вільна ; Нью-Ёрк ; Менск ; Прага, 1998. Т. 1 : у 2 кн. Кн. 1. С. 40–42.

479 *Тихомиров А. В.* Брестский мир 1918 года и Беларусь // Белорус. журн. междунар. права и междунар. отношений. 1999. № 2. С. 49.

480 Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. С. 102–103.

481 *Павлова Т. Я.* К вопросу о границах БНР. С. 78.

ўрада БНР ад 21 мая 1918 г. гаварылася, што граніцы Беларусі патрэбна праводзіць па нацыянальным прынцыпе, улічваючы таксама гістарычныя, геаграфічныя і эканамічныя моманты. Вырашаць складаныя пытанні, звязаныя з устанаўленнем дзяржаўных граніц са сваімі суседзямі, урад БНР збіраўся шляхам узаемнай згоды і перагавораў з Літвой і Украінай. З Польшчай лініяй размежавання павінна была стаць былая граніца Польскага каралеўства з Гродзенскай губерняй, што ў той момант, на думку дзеячаў БНР, не стварала праблем[482]. Адным з найбольш складаных пытанняў бачылася праблема вызначэння «наиболее правильных и справедливых отношений с Великороссией».

Як вядома, усе суседнія дзяржавы прэтэндавалі на пэўныя часткі, а «чырвоная» і «белая» Расіі – на ўсю тэрыторыю абвешчанай БНР. Непрызнанне імі незалежнасці новага дзяржаўнага ўтварэння давала дадатковыя козыры для тэрытарыяльных прэтэнзій, і наадварот. З іншага боку, карта акадэміка Я. Карскага, пакладзеная ў аснову вызначэння граніц БНР, уключала ў яе склад пагранічныя тэрыторыі суседніх дзяржаў, з чым яны, зразумела, не маглі пагадзіцца. Усё гэта разам складала вялікі масіў гаручага матэрыялу ў адносінах БНР з суседнімі краінамі і дзяржавамі Антанты[483]. Асабліва вострая канфрантацыя па тэрытарыяльна-палітычных пытаннях, якія непасрэдна закраналі лёс Беларусі як этнічна цэласнай дзяржавы, адбылася паміж палітычнымі структурамі БНР і польскімі ўрадавымі коламі ў 1920–1921 гг.: напярэдадні, падчас і пасля савецка-польскіх мірных перагавораў[484].

Барацьба ўрада БНР і беларускіх нацыянальных арганізацый за непадзельнасць Беларусі ў яе этнаграфічных і гістарычных граніцах не прынесла жаданых палітычных вынікаў, і тэрыторыя краіны стала прадметам неаднаразовых падзелаў, самы глыбокі з якіх адбыўся пасля Рыжскага мірнага дагавора. Аднак нельга лічыць гэтую барацьбу зусім марнай. Перад суседзямі, еўрапейскімі дзяржавамі і ЗША, міжнароднай супольнасцю (Парыжская мірная канферэнцыя, Ліга Нацый) актыўнымі намаганнямі дыпламатыі БНР абгрунтоўвалася і сцвярджалася права беларускага народа на ўласную дзяржаўнасць у міжнародна прызнаных граніцах. БНР, як і шэрагу іншых дзяржаўных утварэнняў на тэрыторыі былой Расійскай імперыі, у тым ліку больш моцнай і ўплывовай УНР, не выпала гістарычнага шансу рэалізаваць у тагачасных умовах гэтае

---

[482] *Міхалюк Д.* Беларуская Народная Рэспубліка ў 1918–1920 гг.: Ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці. Смаленск, 2015. С. 272–273.

[483] *Павлова Т. Я.* К вопросу о границах БНР. С. 78.

[484] *Снапкоўскі У. Е.* Шлях скрозь стагоддзе ... С. 20, 28–32.

права[485]. Аднак дыпламатычная актыўнасць Рады і ўрада БНР у справе адстойвання этнічных граніц новаабвешчанай дзяржавы паўплывала на пазіцыі бальшавікоў і палякаў падчас мірных перагавораў у Мінску і Рызе, а таксама на пазіцыі кіраўнікоў ССРБ–БССР, якія, як вядома, прынялі за граніцы абвешчанай 1 студзеня 1919 г. ССРБ тую ж самую карту Карскага і, з пэўнымі мадыфікацыямі, карту М. Доўнар-Запольскага[486].

БНР нарадзілася ва ўмовах нямецкай акупацыі, дзейнічала пры польскай акупацыі і была вымушана пакінуць тэрыторыю Беларусі, калі яе займалі бальшавікі. Пад уціскам неспрыяльных знешнепалітычных абставін, адсутнасці міжнароднай падтрымкі, супярэчнасцей сярод кіруючых колаў БНР не змагла аформіцца як незалежная дзяржава, і даволі хутка яе органы (Рада і ўрад) павінны былі эмігрыраваць з тэрыторыі Беларусі. Разам з тым абвяшчэнне БНР і дзейнасць (як унутры краіны, так і за яе межамі) маюць вялікае гістарычнае значэнне. З прыняццем Трэцяй Устаўной граматы да народаў Беларусі 25 сакавіка 1918 г. беларуская нацыянальная ідэя ўвасобілася ў акт абвяшчэння новай незалежнай дзяржавы.

Дыпламатыя БНР была накіравана на міжнароднае прызнанне, забеспячэнне спрыяльных умоў для існавання рэспублікі, захаванне тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі, вырашэнне шэрагу першачарговых задач знешняй палітыкі. Да дасягненняў дыпламатыі БНР трэба залічыць інстытуцыяналізацыю міжнародных кантактаў і стварэнне сеткі замежных прадстаўніцтваў (місій і консульстваў), ажыццяўленне двухбаковай і шматбаковай дыпламатыі, знешняй культурнай палітыкі і прапаганды, пастаноўку беларускага пытання на міжнароднай арэне. У той жа час сябрам Рады і ўрада БНР не хапала вопыту, ведаў і навыкаў кіраўнічай і дыпламатычнай працы. Не было сваіх прафесійных дыпламатаў ці ўвогуле спецыялістаў ў галіне міжнародных адносін. Востра стаяла праблема фінансавага забеспячэння дыпламатычных мерапрыемстваў. Сярод кіруючых колаў існавалі супярэчнасці па пытаннях знешнепалітычных саюзаў і арыентацый[487].

Яшчэ адным цяжкім і, як аказалася, невырашальным пытаннем для палітыкаў БНР была праблема міжнароднага прызнання. Вызначальную ролю ў гэтым адыгрывалі дзяржавы Антанты. Рада і ўрад БНР

[485] *Міхалюк Д.* Беларуская Народная Рэспубліка ... С. 207–233.

[486] *Павлова Т. Я.* К вопросу о границах БНР. С. 83.

[487] *Снапкоўскі У. Е.* Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі. Ч. 2. С. 102–103 ; *Ціхаміраў А. В.* Беларусь у сістэме міжнародных адносін ... С. 434–440.

неаднаразова звярталіся да замежных дзяржаў, асабліва такіх уплывовых, як Вялікабрытанія, Францыя, ЗША, з просьбай аб прызнанні. У прыватнасці, пазіцыя брытанскага ўрада па гэтым пытанні была негатыўнай, чаго, у прынцыпе, трэба было чакаць, улічваючы яго адносіны да БНР, да якой Лондан ставіўся вельмі падазрона і недаверліва, аб чым упершыню напісаў англійскі гісторык Д. Дыгнлі[488]. Гэта пытанне разгледзім ніжэй на прыкладзе адносін Лондана да прызнання БНР з боку Фінляндыі[489].

У апошнія гады беларускія і замежныя гісторыкі зрабілі значны крок наперад у даследаванні і асэнсаванні феномену БНР і яе ролі ў гісторыі беларускай дзяржаўнасці. У манаграфіі польскай даследчыцы Дароты Міхалюк разглядаюцца спробы здабыцця беларусамі ўласнай дзяржаўнасці пасля Першай сусветнай вайны, прасочваецца развіццё беларускай дзяржаўніцкай ідэі, утварэнне сярод нацыянальных сіл розных палітычных стратэгій і саюзаў. Аўтар, прааналізаваўшы дзейнасць чатырох урадаў БНР у 1918–1920 гг., канстатуе: «Беларуская Народная Рэспубліка не адбылася як незалежная дзяржава, а беларускія землі паводле артыкулаў Рыжскай дамовы былі падзеленыя паміж Польшчай і Савецкай Расіяй»[490]. Яна таксама ўпершыню даследавала пытанне аб міжнародным прызнанні БНР і прыйшла да высновы, што адзінай дзяржавай, якая прызнала БНР дэ-факта, была Фінляндыя. Маўклівае ці ўскоснае прызнанне БНР ажыццявілі Украінская Народная Рэспубліка, Германія, Чэхаславакія, Латвія, Эстонія. Аднак БНР не прызналі дзяржавы пераможнай кааліцыі – Антанты, якія вызначалі новы расклад сіл у Еўропе: Вялікабрытанія, Францыя і ЗША[491].

Беларускі гісторык Андрэй Чарнякевіч у кнізе «БНР. Триумф побежденных» адзначае, што БНР хоць і прайграла барацьбу за ўладу і існаванне, аднак заклала асновы беларускай дзяржаўнасці ў XX ст. і стала першым дзяржаўным утварэннем у навейшай гісторыі, дзякуючы якому беларусы заявілі аб сваім праве на незалежнасць і самавызначэнне[492]. Гэты аўтар таксама лічыць, што БНР не сфарміравалася да канца як рэальная дзяржава з усімі класічнымі атрыбутамі дзяржаўнасці.

---

[488] *Dingley J.* Lastouski as a Politician // J. of Byelorussian Studies. 1984. Vol. V. № 3–4. P. 21–27.

[489] Гл. раздз. 4.3.

[490] *Міхалюк Д.* Беларуская Народная Рэспубліка ... С. 7.

[491] Там жа. С. 441–443.

[492] *Чернякевич А. М.* БНР. Триумф побежденных. Минск, 2018. Ацэнкі дадзены з анатацыі і вокладкі кнігі.

А. Чарнякевіч прызнае пэўныя вынікі беларускіх дзеячаў у галіне дыпламатыі, якіх, аднак, было недастаткова для прызнання Беларусі (БНР) як суб'екта міжнароднага права[493].

Да 100-годдзя абвяшчэння незалежнасці БНР Інстытут гісторыі НАН Беларусі выпусціў працу «Беларуская Народная Рэспубліка – крок да незалежнасці», у якой значна наблізіўся да сучаснага разумення гістарычнага значэння абвяшчэння і дзейнасці БНР, пераадолеўшы шэраг стэрэатыпаў і догмаў, што існавалі раней як у сценах гэтай вядучай навуковай установы, так і ў гістарычнай навуцы ўвогуле. Аўтары прыйшлі да слушнай высновы: «Упершыню за ўсю гісторыю беларускага народа былі зроблены канкрэтныя крокі па стварэнні незалежнай дзяржавы... І хоць БНР як дзяржава не адбылася, але з яе абвяшчэннем пытанне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці ўвайшло ў парадак дня еўрапейскай геапалітыкі»[494].

Услед за гэтым пастулатам перакідваецца мосцік да стварэння Беларускай ССР, і такім чынам гэтыя два ўтварэнні разглядаюцца як звёны аднаго дзяржава-утваральнага працэсу на тэрыторыі Беларусі. Разам з тым было відавочна, што БССР стваралася як дзяржава-антаганіст БНР. Гэта адлюстравана ў Маніфесце Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі ад 1 студзеня 1919 г., дзе па-за законам абвяшчалася «прадаўнічая буржуйная Белорусская Рада з яе так прызыванымі "народнымі міністрамі"»[495], якой бальшавікі не маглі даравяць арыентацыі на Германію і краіны Антанты.

Нягледзячы на тое што БССР была створана праз восем месяцаў пасля абвяшчэння незалежнасці БНР, знешнепалітычныя фактары яе ўтварэння і міжнароднае асяроддзе, у якім яна нараджалася, ужо былі іншымі. У з'яўленні Беларускай савецкай рэспублікі была зацікаўлена патэнцыяльна самая моцная дзяржава ўсходнееўрапейскага рэгіёна – Савецкая Расія, якая стварыла БССР (ССРБ) як дзяржаву-буфер, каб палітычна аддзяліць сябе ад небяспекі з Захаду. Буферная канцэпцыя ленінскага ўрада была агучана ў Мінску 22 студзеня 1919 г. членам ЦК РКП(б) А. Ёфэ, які адзначыў немэтазгоднасць хуткага ўключэння Беларускай рэспублікі ў склад Савецкай Расіі на правах федэрацыі, бо гэта «ліквідуе ўсю выгаду існавання буфераў-рэспублік», і прапанаваў

---

[493] *Чернякевич А. М.* БНР. Триумф побежденных ... С. 293–294.

[494] Беларуская Народная Рэспубліка – крок да незалежнасці ... С. 134.

[495] 1 января 1919 года. Временное рабоче-крестьянское советское правительство Белоруссии : док. и материалы / сост.: В. Д. Селеменев (рук.) [и др.] ; науч. ред. М. Ф. Шумейко. Минск, 2005. С. 15.

метад працяглых перагавораў аб федэрацыі[496]. Так узнікла ідэя стварэння Літоўска-Беларускай ССР (Літбел).

Знешнепалітычныя меркаванні мелі вырашальнае значэнне ў планах ленінскага ўрада па стварэнні Беларускай савецкай дзяржавы. Палітыка Савецкай Расіі ў беларускім пытанні з'яўлялася самым важным знешнепалітычным фактарам, які прадвызначаў дзяржава-ўтваральныя працэсы на тэрыторыі Беларусі. Такі падыход набірае ўсё большую моц у працах беларускіх і замежных гісторыкаў, прысвечаных стварэнню БССР. У прыватнасці, цытаваныя вышэй І. Ігнаценка і С. Хоміч небеспадстаўна сцвярджаюць, што велізарны ўплыў на вынікі працэсу аднаўлення нацыянальнай дзяржаўнасці ў форме БССР аказалі знешнепалітычны фактар і інтарэсы бальшавіцкай рэвалюцыі ў Расіі[497]. Іншага пункту гледжання прытрымліваецца аўтарытэтны спецыяліст У. Ладысеў, які лічыць стварэнне беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове ці беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці вынікам узаемадзеяння аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў, лагічнага развіцця нацыянальнага руху ў Паўночна-Заходнім краі Расійскай імперыі і ажыццяўлення палітыкі бальшавікоў у нацыянальным пытанні[498]. Ён акцэнтуе ўвагу на ўнутраных (аб'ектыўных і суб'ектыўных) фактарах развіцця беларускага нацыянальнага руху, які ўвасобіўся ў абвяшчэнні БССР.

Першыя знешнепалітычныя выступленні і прапановы БССР і Літбел знайшлі пэўнае адлюстраванне ў рашэннях Першага Усебеларускага з'езда Саветаў (Мінск, 2–3 лютага 1919 г.). У Дэкларацыі аб устанаўленні цеснай федэратыўнай сувязі паміж Савецкай Беларуссю і РСФСР падкрэслівалася неабходнасць устанавіць цесныя эканамічныя і палітычныя сувязі са сваім «старшым братам» – РСФСР. З'езд заклікаў «усе брацкія незалежныя сацыялістычныя рэспублікі» наладзіць па прыкладзе ССРБ федэратыўныя сувязі з Савецкай Расіяй[499]. Наколькі нам вядома, гэта першы дзяржаўны дакумент, у якім адносіны паміж дзвюма савецкімі рэспублікамі (ССРБ і РСФСР) трактаваліся паводле ўзору сямейных адносін (адносіны паміж старшым і малодшым братамі).

Сярод першых дыпламатычных ініцыятыў Літоўска-Беларускай ССР былі прапановы па мірным урэгуляванні адносін з Польшчай. 16 лютага 1919 г. Часовы рабоча-сялянскі ўрад Літоўскай ССР і ЦВК ССРБ

[496] Знешняя палітыка Беларусі. Т. 1. С. 94–95.

[497] *Ігнаценка І., Хоміч С.* Утварэнне БССР. С. 112.

[498] *Ладысеў У. Ф.* Пазіцыя кіраўніцтва Савецкай Расіі ў беларускім пытанні. Утварэнне ССРБ // Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе / М. П. Касцюк [і інш.] ; рэдкал.: А. А.Каваленя [і інш.]. Мінск, 2008. С. 165.

[499] Знешняя палітыка Беларусі. Т. 1. С. 104–105.

накіравалі ноту польскаму ўраду з прапановай стварыць змешаную камісію для мірнага ўрэгулявання спрэчных тэрытарыяльных пытанняў і ўсталявання дзяржаўнай мяжы паміж толькі што абвешчанай Літбел і Польшчай[500]. 28 лютага 1919 г. ЦВК Літбел выдаў Дэкларацыю аб знешняй палітыцы, у якой зноў выказвалася гатоўнасць «вырашаць усе спрэчныя пытанні палюбоўна і міралюбіва». У Дэкларацыі змяшчаўся паўторны (першы быў у Маніфесце аб стварэнні ССРБ) заклік (запрашэнне) «да ўсіх народаў і іх урадаў» прызнаць Сацыялістычную Савецкую Рэспубліку Літвы і Беларусі і ўступіць з ёю ў зносіны[501]. Але ўсе гэтыя прапановы засталіся без адказу. Польшча і краіны Антанты не прызнавалі Літбел і адмаўляліся ўступаць з ёй у перагаворы.

У гады барацьбы з замежнай інтэрвенцыяй адносіны паміж РСФСР і іншымі савецкімі рэспублікамі рэгуляваліся законамі і патрэбамі ваеннага часу, рэвалюцыйнай мэтазгоднасці, сфармуляванымі ў Крамлі «інтарэсамі» сусветнай пралетарскай рэвалюцыі. Пасля аднаўлення савецкай улады на тэрыторыі Беларусі 31 ліпеня 1920 г. была прынята Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці ССРБ. Канстатуючы раўнапраўны характар узаемаадносін паміж ССРБ і РСФСР, яна заяўляла аб перадачы Беларускай рэспублікай на ўвесь час рэвалюцыйных войнаў сваіх узброеных сіл у распараджэнне адзінага камандавання ўсіх савецкіх рэспублік, якое ажыццяўлялася РСФСР. Выказвалася гатоўнасць таксама ўзгадняць дыпламатычныя выступленні рэспублікі з дзеяннямі РСФСР[502]. На самой справе, як паказалі наступныя падзеі, ССРБ фактычна добраахвотна падпарадкавала сваю знешнепалітычную дзейнасць інтарэсам Савецкай Расіі.

Найбольш выразна дыпламатычная залежнасць Мінска ад Масквы праявілася падчас савецка-польскіх мірных перагавораў 1920 г. У жніўні – верасні ВРК БССР прыняў некалькі пастаноў аб выдачы РСФСР мандата на вядзенне перагавораў з Польшчай[503]. Самая вядомая з іх – пастанова ад 10 верасня 1920 г., якая прадугледжвала выдаць РСФСР «самы шырокі мандат на вядзенне мірных перагавораў з Польшчай па пытанні, галоўным чынам, вызначэння межаў Беларусі»[504]. Гэта азначала, што беларускі савецкі ўрад даваў згоду на падзел Беларусі, што і было потым зафіксавана ў Рыжскім мірным дагаворы, падпісаным РСФСР і УССР, з аднаго боку, і Польшчай, з другога. У прэамбуле дага-

[500] Знешняя палітыка Беларусі. Т. 1. С. 110–111.
[501] Там жа. С. 116–117.
[502] Там жа. С. 184–186.
[503] *Снапкоўскі У. Е.* Шлях скрозь стагоддзе ... С. 23–25.
[504] Знешняя палітыка Беларусі. Т. 1. С. 195.

вора адзначалася, што ўрад РСФСР падпісвае дагавор «за сябе і па ўпаўнаважанню Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі»[505].

Такім чынам, ні БНР, ні БССР не змаглі ў першыя гады свайго існавання дасягнуць значных поспехаў на міжнароднай арэне і зацвердзіцца як актыўныя і суверэнныя ўдзельнікі міжнародных адносін. Аднак паміж гэтымі дзвюма формамі беларускай дзяржаўнасці была істотная розніца ў знешнепалітычнай актыўнасці. БНР з-за адсутнасці кантролю над тэрыторыяй і ўласнага дзяржаўнага апарату, у тым ліку знешнепалітычнага ведамства, не атрымала міжнароднага прызнання (за выключэннем некалькіх дзяржаў, прызнаўшых яе ўскосна ці маўкліва) і не валодала статусам суб'екта міжнароднага права. БССР, хоць і была моцна залежнай ад іншай дзяржавы – РСФСР, валодала неабходнымі атрыбутамі дзяржаўнасці, кантралявала ўласную тэрыторыю, мела дзяржаўны апарат, у тым ліку Наркамат замежных спраў, атрымала абмежаванае міжнароднае прызнанне, у тым ліку дэ-юрэ з боку Польшчы і Германіі. Усё гэта давала і дае падставы лічыць БССР суб'ектам міжнароднага права[506]. Аднак яе знешнепалітычная актыўнасць была невысокай і кантралявалася Масквой.

## 4.2. Аб пачатках дзейнасці Камісарыята замежных спраў ССРБ (студзень – люты 1919 г.)[507]

У працэсе стварэння Беларускай савецкай рэспублікі, якая ў першапачатковым выглядзе атрымала назву «Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусь» (хоць с моманту яе абвяшчэння ўжываліся і іншыя назвы), выявіліся вострыя рознагалоссі паміж дзвюма палітычнымі групамі, што дзейнічалі, як ім уяўлялася, выключна ў інтарэсах беларускага працоўнага люду. Першую групу (беларускіх нацыянал-камуністаў) складалі дзеячы беларускіх секцый РКП(б) і Белнацкама (БНК) і яе ўзначальваў Зміцер Жылуновіч, які пазней стаў старшынёй першага ўрада ССРБ. Другую (камуністаў-інтэрнацыяналістаў) складалі

[505] Знешняя палітыка Беларусі. Т. 1. С. 254–255.

[506] *Бровка Ю. П.* Международная правосубъектность БССР. С. 79 і інш. ; *Кремнев П. П.* Пазнач. твор. С. 9–12.

[507] Друкуецца паводле выдання: *Снапкоўскі У.* Аб дзейнасці Камісарыята замежных спраў ССРБ (студзень – люты 1919 года) // Беларус. думка. 2019. № 4. С. 58–65.

дзеячы Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП(б) і Аблвыканкамзаха на чале з Аляксандрам Мясніковым, які змяніў З. Жылуновіча на пасадзе старшыні ўрада[508]. Абедзве групы прытрымліваліся розных ці нават супрацьлеглых пазіцый наконт неабходнасці стварэння беларускай дзяржавы і перспектыў яе існавання. Вызначальную ролю ў стварэнні новай савецкай рэспублікі адыграла кіраўніцтва РСФСР, а кіраваў працэсам канстытуявання БССР наркам па справах нацыянальнасцей Іосіф Сталін. Вышэйсказанае мае непасрэднае дачыненне да стварэння, кіруючага складу і дзейнасці знешнепалітычнага ведамства Беларускай савецкай рэспублікі.

На аснове вядомых нам дакументаў НАРБ і іншых беларускіх архіваў, як і апублікаваных матэрыялаў, прасочым, па-першае, працэс выбару кандыдатур на пасаду члена ўрада ССРБ па замежных справах і іх асабістыя лёсы, па-другое, пачатак дзейнасці Камісарыята замежных спраў (КЗС) у студзені – лютым 1919 г. Адзначым, што некаторыя з закранутых пытанняў знайшлі адлюстраванне ў працы беларускай даследчыцы Л. А. Кавалёвай[509].

**Аб кандыдатах на пасаду наркама па замежных справах.** Упершыню пытанне аб складзе Часовага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі паўстала на аб’яднаным пасяджэнні БНК 25 снежня 1918 г. у Маскве, калі абмяркоўвалі спіс кандыдатаў у склад гэтага ўрада. З 70 кандыдатур было абрана 15 «найбольш дастойных». На пасаду члена ўрада па замежных справах быў абраны Аляксандр Квачанюк, прадстаўнік Мінскай абласной секцыі РКП(б). Партфель члена ўрада па сацыяльным забеспячэнні і ахове здароўя атрымаў Усевалад Фальскі, загадчык прытулку бежанскага камітэта Усерасійскага земскага саюза Заходняга фронту. На пасаду будучага наркама па нацыянальных пытаннях быў абраны З. Жылуновіч, загадчык выдавецкага аддзела БНК; ён жа ў выніку тайнага галасавання быў абраны большасцю галасоў старшынёй «СНК Беларускай Сацыялістычнай Рабоча-Сялянскай Савецкай Рэспублікі»[510].

---

[508] *Селеменев В. Д.*, *Скалабан В. В.* Предисловие // 1 января 1919 года ... С. 4–5.

[509] *Кавалёва Л. А.* Утварэнне і дзейнасць наркамата замежных спраў БССР у 1919–1920 гг. // Вес. Акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. 1993. № 1. С. 43–49.

[510] Протокол объединенного заседания членов коллегии Белорусского Национального комиссариата, представителей Центрального бюро Белорусских коммунистических секций и Комитета Московской белорусской секции РКП(б) о государственном устройстве Белоруссии. 25 декабря 1918 г. // НАРБ. Ф. 60п. Воп. 3. Спр. 432. Л. 15–17.

Праз некалькі дзён сітуацыя з пасадай камісара замежных спраў змянілася. 28 снежня Сталін па даручэнні ЦК РКП(б) падпісаў запіску аб складзе ўрада Беларускай рэспублікі, дзе прапанаваў на гэтую пасаду старшыню ўрада Жылуновіча. У дакуменце ён ішоў 16-м па парадку, г. зн. у самым канцы, паколькі ўрад планаваўся з сямнаццаці асоб, пры гэтым шэраг партфеляў заставаўся вакантным. У запісцы было і прозвішча Ісака Рэйнгольда, якога хацелі паставіць на фінансы ці замежныя справы. Гэта дае падставы лічыць, што кандыдатура Жылуновіча з'явілася перад самай адпраўкай тэлеграмы і што ён павінен быў сумяшчаць пасады старшыні ўрада і камісара замежных спраў[511].

29 снежня ў тэлеграме Сталіна да Мяснікова і члена Паўночна-Заходняга абкама РСДРП(б) і Аблвыканкамзаха Майсея Калмановіча з'явіліся дзве папраўкі па персанальным складзе ўрада Беларускай савецкай рэспублікі: 1) Жылуновіч як старшыня ўрада не бярэ партфеля камісара замежных спраў; 2) пасада аддавалася па настаянні беларусаў-камуністаў Фальскаму, які і стаў першым наркамам замежных спраў ССРБ. На гэтай пасадзе ён пратрымаўся да пачатку лютага 1919 г. (да Першага Усебеларускага з'езда саветаў), дзе па адных звестках пры галасаванні не атрымаў ніводнага голасу, па другіх – зняў сваю кандыдатуру[512]. Да тэлеграмы прыкладаўся «спіс парадку подпісаў Маніфеста Часовага рабоча-сялянскага ўрада», у якім пералічваліся наступныя прозвішчы: старшыня – З. Жылуновіч, потым на першай пазіцыі ішоў камісар замежных спраў – У. Фальскі, далей камісары: нацыянальных спраў – Ф. Шантыр, асветы – А. Чарвякоў, ваенных спраў – А. Мяснікоў і г. д.[513] Першае месца ў гэтым спісе пасля старшыні ўрада сведчыла пра важнасць пасады кіраўніка знешнепалітычнага ведамства, якому, напэўна, меркавалі даць адказны і самастойны ўчастак працы. Звяртае на сябе ўвагу і тое, што першыя тры пазіцыі пасля Жылуновіча займалі прадстаўнікі беларускіх нацыянал-камуністаў, і толькі на чацвёртай ішоў кіраўнік камуністаў-інтэрнацыяналістаў Мяснікоў.

Вакол складу ўрада і парадку падпісання Маніфеста пачалася палітычная барацьба, аднак Сталін 1 студзеня 1919 г. накіраваў тэлеграму Жылуновічу і Мяснікову, дзе строга папярэдзіў, што лічыць недапушчальнай затрымку з публікацыяй спіса членаў урада: «Еще раз предлагаем срочно опубликовать со включением в состав товарища Фаль-

---

[511] Материалы к вопросу об образовании Белорусской Республики // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 21. Спр. 2535. Л. 18–19 ; 1 января 1919 года ... С. 106.

[512] 1 января 1919 года ... С. 149–150.

[513] НАРБ. Ф. 4п. Воп. 21. Спр. 2535. Л. 25 ; 1 января 1919 года ... С. 107–108.

ского»[514]. Як вядома, у апублікаваным 1 студзеня 1919 г. Маніфесце стаялі ўжо іншыя прозвішчы членаў («сябраў») «Часовага Работніча-Селянскага Савецкага Правіцельства Беларусі»: старшыня Змітро Жылуновіч, «сябры правіцельства: А. Мяснікоў, И. С. Иванов, Алесь Чэрвякоў, И. Рейнгольд»[515].

Першае публічнае паведамленне аб пачатку дзейнасці камісарыята замежных спраў (КЗС) датуецца 22 студзеня 1919 г., калі ў газеце «Звезда» была змешчана кароткая нататка аб тым, што «комиссариат по внешним делам открыл свою деятельность» і ён размяшчаецца ў Мінску на вул. Койданаўская, 21 (сёння – вул. Рэвалюцыйная, 15). Тады ў КЗС працавала 12 супрацоўнікаў[516]. Як вядома, гэтая дата стала кропкай адліку пачатку дзейнасці беларускай дыпламатычнай службы.

**У. С. Фальскі – першы наркам замежных спраў БССР.** На чале камісарыята стаў Усевалад Сцяпанавіч Фальскі (1886–1937), ураджэнец вёскі Лошыца Мінскага павета Мінскай губерні. З біяграфічных даных вядома, што ён скончыў тры курсы Ляснога інстытута ў Пецярбургу. У 1906 г. далучыўся да беларускага руху. На працягу 1915–1918 гг. удзельнічаў у арганізацыі і быў старшынёй Першага таварыства беларускай драмы і камедыі, Мінскага таварыства працаўнікоў мастацтва, членам Мінскага аддзела Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны, намеснікам старшыні Беларускага нацыянальнага камітэта ў Мінску, прадстаўніком Вялікай Беларускай рады на Дэмакратычнай нарадзе 1917 г., адным з лідараў левай фракцыі на Усебеларускім з’ездзе. У 1918 г. удзельнічаў у стварэнні маскоўскай беларускай секцыі РКП(б). Пасля адстаўкі з пасады камісара замежных спраў двойчы арыштоўваўся савецкімі ўладамі, у тым ліку летам 1919 г. быў сярод расстрэльных закладнікаў, якіх чэкісты вывезлі ў Смаленск пры адступленні бальшавікоў з Беларусі. Пасля вызвалення са смаленскай катаржнай турмы вярнуўся ў Мінск, дзе ў 1919–1921 гг. працаваў у польскай службе эксплуатацыі лясоў, акцёрам у Таварыстве беларускай драмы і камедыі, перакладчыкам у Беларускай вайсковай камісіі, вучоным сакратаром

[514] Телеграмма народного комиссара по делам национальностей РСФСР И. Сталина (г. Москва) председателю Временного рабоче-крестьянского советского правительства Белоруссии Д. Жилуновичу (г. Смоленск) о срочном опубликовании Манифеста Белорусского советского правительства. 1 января 1919 г. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 12. Л. 12.

[515] Манифест Временного рабоче-крестьянского советского правительства Белоруссии. 1 января 1919 г. На белорусском языке // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 1. Л. 10 ; 1 января 1919 года ... С. 22.

[516] НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 43. Л. 115–116 ; 1 января 1919 года ... С. 148.

Акадэмічнага цэнтра Наркамата асветы БССР, быў сябрам Беларускай арганізацыі дапамогі ахвярам вайны. У 1921 г. зноў арыштаваны «за зносіны з польскімі шпіёнамі» і асуджаны да растрэлу, замененага на пяць гадоў зняволення, якія адбываў у смаленскай катаржнай турме. Пасля вызвалення па амністыі ў 1923 г. працаваў справаводам рабфака пры Смаленскім універсітэце. З 1925 г. жыў у Кіеве, працаваў дырэктарам драматычнага тэатра імя Марыі Занькавецкай, дырэктарам Кіеўскай вандроўнай перасовачнай оперы, безвынікова хадайнічаў перад урадам БССР, каб дазволілі вярнуцца дамоў[517]. Паводле інфармацыі беларускай даследчыцы З. Калантай, у 1937 г. быў зноў арыштаваны і расстраляны ў лук'янаўскай турме ў Кіеве. Рэабілітаваны ў 1996 г.[518]

Для сучаснікаў застаецца загадкай, чаму Фальскі апынуўся на пасадзе камісара замежных спраў першага беларускага савецкага ўрада. Чалавек з незаконченай вышэйшай адукацыяй па лясной справе, акцёр, тэатральны і грамадскі дзеяч, палітык левай арыентацыі, потым бальшавік, нацыянал-камуніст, які ў канцы 1918 г. апынуўся сярод кіруючых дзеячаў Белнацкама ў Маскве ў той вырашальны момант, калі ўтваралася ССРБ і фарміраваўся яе ўрад. Па дакументах бачна, як Сталін настойліва падтрымліваў кандыдатуру камісара замежных спраў, хоць яму не ўдалося «праціснуць» яе ў лік падпісантаў Маніфеста. Фальскі не быў за мяжой і не меў сувязей з замежнымі палітыкамі і дыпламатамі. Аднак ведаў, акрамя беларускай, рускую, украінскую, польскую і нямецкую мовы. Яму, несумненна, больш падыходзіла пасада члена ўрада па сацыяльным забеспячэнні і ахове здароўя, на якую яго абралі 25 снежня 1918 г. з улікам, напэўна, таго, што ён з'яўляўся актыўным дзеячам па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны. Лёс жа распарадзіўся інакш. Сваю ролю адыграла тое, што Фальскі з'яўляўся паплечнікам Жылуновіча, які набіраў у сваю каманду беларусаў-камуністаў[519]. Грузін Сталін, які яшчэ не паспеў стаць расійскім вялікадзяржаўнікам, вырашыў падтрымаць гэтую групу, каб супрацьпаставіць яе дзеячам Аблвыканкамзаха, што займалі адкрыта антыбеларускія пазіцыі.

Фальскі пасля месячнага знаходжання на пасадзе наркама замежных спраў стаў адной з першых ахвяр рэпрэсій савецкай улады, будучы двойчы асуджаным да расстрэлу, якога, аднак, яму пашэнціла па-

---

[517] *Селеменеў В.*, *Скалабан В.* Фальскі Усевалад Сцяпанавіч // Энцыкл. гісторыі Беларусі. Т. 6. Кн. 2. С. 25 ; *Селеменев В. Д.*, *Скалабан В. В.* Фальский Всеволод Степановіч // 1 января 1919 года ... С. 185–186.

[518] *Колонтай З.* Неизвестный Фальский. Его судьба и время // Беларус. думка. 2019. № 4. С. 72–81.

[519] Там жа. С. 73, 75.

збегчы. Верагодна, трэці раз яму гэтак не пашчасціла, і першы кіраўнік дыпламатычнай службы савецкай Беларусі скончыў жыццёвы шлях у засценках. Як вядома, лёс пераважнай большасці «бацькоў-заснавальнікаў» БССР аказаўся трагічным, і гэта тычылася як ахвяр, так і іх калезе па ўрадзе, што ўзначальвалі карныя органы, якія пазней самі сталі ахвярамі сталінскага молаха рэпрэсій.

Матэрыялаў аб пачатку працы КЗС ССРБ захавалася мала, а яго актыўнасць не паспела як след разгарнуцца ў выніку шэрагу прычын: пераўтварэнняў урада, што прывяло да фактычнай ліквідацыі камісарыята; ліквідацыі ССРБ і стварэння Літбел; наступу польскіх войскаў і заняцця імі Мінска. На пасяджэнні Цэнтральнага бюро Кампартыі (бальшавікоў) Беларусі (ЦБ КП(б)Б) 20 студзеня 1919 г. па прапанове А. Мяснікова была зацверджана новая структура ўрада і адбылося аб'яднанне шэрагу камісарыятаў, у выніку чаго камісарыят замежных спраў знік, паколькі яго ў новай схеме арганізацыі ўрада не было[520]. Аднак на справе ён працягваў сваю дзейнасць.

На пасяджэнні ўрада 27 студзеня ў прысутнасці Фальскага, які не прысутнічаў на шэрагу пасяджэнняў, былі разгледжаны некалькі пытанняў, звязаных з дзейнасцю КЗС. Па-першае, прынята пастанова аб стварэнні пры камісарыяце аддзела па зборы матэрыялаў аб бясчынствах і злоўжываннях нямецкіх акупацыйных улад на тэрыторыі Беларусі. Па-другое, разгледжана пытанне аб выдачы крэдытаў камісарыятам. Замест запланаванай сумы ў 200 тыс. руб. КЗС было адпушчана 100 тыс. руб. Для параўнання: камісарыяту на справах нацыянальнасцей выдзелена 150, камісарыяту па ахове здароўя – 200 тыс. руб. Па-трэцяе, урад даручыў КЗС хадайнічаць перад цэнтральнымі органамі ўлады РСФСР аб вяртанні Беларускай рэспубліцы ўсёй эвакуіраванай маёмасці. Па-чацвёртае, па дакладзе Фальскага была прынята пастанова аб тым, што парадак уліку замежных грамадзян прызыўнога ўзросту ажыццяўляецца паводле адпаведнага дэкрэта РСФСР[521].

У пачатку лютага Часовы рабоча-сялянскі ўрад Беларусі прыняў дэкрэт аб зборы матэрыялаў пра беззаконні і бясчынствы нямецкіх акупацыйных войскаў, паводле якога эканамічна-прававому аддзелу КЗС даручалася ажыццявіць збор і распрацоўку матэрыялаў і звестак

[520] Протокол № 9 заседания Центрального бюро КП(б)Б. 20 января 1919 г. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 8. Л. 18.

[521] Протокол № 6 заседания Временного рабоче-крестьянского советского правительства Белоруссии. 27 января 1919 г. // НАРБ. Ф. 809. Воп. 1. Спр. 6. Л. 13–15.

аб распараджэннях і дзеяннях акупантаў на тэрыторыі Беларусі, што парушалі «нормы пралетарскага права», і зрабіць падлік страт, што былі зроблены імі адносна дзяржавы, устаноў і прыватных асоб. У кожным губернскім горадзе Беларусі ўтвараліся пададдзелы эканамічна-прававога аддзела КЗС для збору і апрацоўкі матэрыялаў па кожнай губерні з наступным іх прадстаўленнем ва ўказаны аддзел. Створаная раней Камісія па зборы матэрыялаў пра бясчынствы нямецкіх акупацыйных войскаў ліквідавалася. Дэкрэт падпісалі старшыня ўрада З. Жылуновіч, член урада па замежных справах У. Фальскі, кіраўнік справамі ўрада Беларусі В. Кнорын[522].

**Буферная канцэпцыя Крамля.** У айчыннай гістарычнай навуцы апошніх дзесяцігоддзяў пераважнай большасцю вучоных прызнаецца вызначальны ўплыў знешняга фактару ў працэсе стварэння новай дзяржавы. Сціплы ўклад у гэту канцэпцыю ўнёс і аўтар[523]. Адзначым, што знешнепалітычныя меркаванні мелі вырашальнае значэнне ў планах ленінскага ўрада па стварэнні Беларускай савецкай дзяржавы[524]. У канцы 1918 г. у Крамлі атрымала дамінаванне думка аб неабходнасці стварэння на заходніх межах савецкай дзяржавы ланцуга буферных савецкіх рэспублік, каб пазбавіць капіталістычныя краіны прамога кантакту з бальшавіцкай Расіяй. Абвяшчэнне ССРБ 1 студзеня 1919 г. мела сваёй мэтай «замкнуть цепь советски-самоопределившихся образований». Такі аргумент быў сфармуляваны I з'ездам КП(б)Б у сувязі з рашэннем аб пераўтварэнні Заходняй камуны ў самастойную ССРБ[525].

Палітыка ленінскага ўрада ў беларускім пытанні не была паслядоўнай і хутка мянялася ў залежнасці ад міжнародных абставін. Пагроза польскага захопу Літвы і Беларусі прымусіла бальшавіцкае кіраўніцтва ўжо на стадыі юрыдычнага афармлення ССРБ пайсці на скасаванне Бе-

---

[522] Декрет Временного рабоче-крестьянского советского правительства Белоруссии о сборе материалов, касающихся беззаконий и бесчинств немецких оккупационных войск. Не позднее 6 февраля 1919 г. // Государственный архив Брестской области. Ф. 497. Воп. 2. Спр. 3. Л. 14–14 адв.

[523] *Снапкоўскі У. Е.* Знешнепалітычная дзейнасць Беларускай ССР (1919–1929 гг.). С. 28–29 ; *Яго ж.* Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі. Ч. 2. С. 106–109.

[524] *Ігнаценка І. М.* Беларусь напярэдадні і ў першыя гады савецкай улады // Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 2. С. 68–69 ; Борьба коммунистов-белорусов за создание национального государства на советской основе // Государственность Беларуси: Проблемы формирования в программах политических партий. Минск, 1999. С. 60, 64.

[525] Пратакол I з'езда Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі / падрыхт. да друку Ю. Майзель ; пад рэд. С. Агурскага і М. Леўкова. Менск, 1934. С. 15.

ларускай рэспублікі. 16 студзеня 1919 г. ЦК РКП(б) без папярэдняга абмеркавання пытання з урадам ССРБ і ЦБ КП(б)Б прыняў рашэнне аб вылучэнні з ССРБ Віцебскай, Смаленскай і Магілёўскай губерняў і перадачы іх у склад РСФСР. Гэтае рашэнне прадугледжвалася правесці праз мясцовыя саветы і Усебеларускі з'езд Саветаў[526], што і было зроблена пазней.

Рашэнне бальшавіцкага кіраўніцтва аб адыходзе да РСФСР паловы тэрыторыі ССРБ выклікала вострае незадавальненне ў беларускім партыйна-ўрадавым кіраўніцтве: як сярод групы Жылуновіча, так і групы Мяснікова. 16 студзеня Жылуновіч разам з членамі ўрада Фальскім і Шантырам прыехаў у Маскву і звярнуўся з просьбай да старшыні СНК У. Леніна аб сустрэчы, каб «поговорить с Вами о работе правительства»[527]. Аднак беларуская дэлегацыя не была прынята і вярнулася ў Мінск.

Праз некалькі дзён Жылуновіч і прадстаўнікі яго групы ў беларускім урадзе звярнуліся з лістом да прадстаўніка ЦК РКП(б) А. Ёфэ, дзе гаварылася, што пастанова ЦК РКП(б) аб аддзяленні ад Беларусі Віцебскай, Смаленскай і Магілёўскай губерняў карэнным чынам мяняе ўсю палітычную сітуацыю, парушае абвешчаныя сацыялістычнай рэвалюцыяй прынцыпы самавызначэння народаў і цяжка адаб'ецца на жыццёвых інтарэсах беларускага пралетарыяту і сялянства. Аўтары пісьма З. Жылуновіч, А. Квачанюк, З. Чарнушэвіч, Я. Дыла, Ф. Шантыр, У. Фальскі, А. Чарвякоў, І. Пузыроў прасілі ЦК перагледзець прынятае ім рашэнне[528]. Але гэтая просьба засталася без адказу.

22 студзеня 1919 г. пытанне аб тэрыторыі Беларускай Савецкай Рэспублікі і федэратыўных адносінах з РСФСР было абмеркавана на пасяджэнні ЦБ КП(б)Б з удзелам члена ЦК РКП(б) А. Ёфэ, які адмыслова быў накіраваны з Масквы для правядзення лініі Цэнтра і навязванні яе незадаволенымі кіраўнікамі Беларусі. А. Ёфэ выклаў вядомую «буферную» канцэпцыю ЦК РКП(б) адносна стварэння ССРБ і акрэсліў перспектывы ўзаемаадносін савецкіх рэспублік. Ён адзначыў немэтазгоднасць хуткага ўключэння Беларускай рэспублікі ў склад Савецкай Расіі на правах федэрацыі, бо гэта «ліквідуе ўсю выгаду існавання буфераў-

---

[526] Знешняя палітыка Беларусі. Т. 1. С. 91–92.

[527] Сообщение председателя Временного рабоче-крестьянского советского правительства Белоруссии Д. Жилуновича в Кремль председателю Совета народных комиссаров РСФСР В. Ленину о прибытии из Минска членов правительства для переговоров о его работе. Москва. 16 января 1919 г. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 120. Л. 27–27 адв.

[528] НАРБ. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 478. Л. 54–55 ; Знешняя палітыка Беларусі. Т. 1. С. 93–94. Дак. № 73.

рэспублік», і прапанаваў метад працяглых перагавораў аб федэрацыі. Прадстаўнік Цэнтра паведаміў удзельнікам нарады аб прапановах ЦК РКП(б) абмежаваць памеры ССРБ «геаграфічна неабходнымі граніцамі, г. зн. Мінскай і Гродзенскай губернямі», і параіў звярнуцца да РСФСР з прапановай аб федэрацыі[529]. Гэтыя прапановы былі пазней прынятыя Першым Усебеларускім з’ездам саветаў.

Складванне «міждзяржаўных» адносін паміж РСФСР і ССРБ адбывалася на аснове рэвалюцыйнай мэтазгоднасці і «сацыялістычнага права». Разам з тым ленінскі ўрад, зыходзячы з абвешчанага ім права нацый на самавызначэнне, імкнуўся афарміць адносіны з савецкімі рэспублікамі з улікам тагачасных норм міжнароднага права. У гэтым сэнсе прынцыповае значэнне для фарміравання патэнцыяльна раўнапраўных і добрасуседскіх адносін паміж ССРБ і РСФСР мела пастанова Прэзідыума Усерасійскага цэнтральнага выканаўчага камітэта (УЦВК) ад 31 студзеня 1919 г. «Аб прызнанні незалежнасці Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі»[530].

Пытанні міжнароднага прызнання і знешняй палітыкі ССРБ, вызначэння яе межаў, адносін з РСФСР і іншымі савецкімі рэспублікамі знайшлі пэўнае адлюстраванне ў рашэннях Першага Усебеларускага з’езда саветаў (Мінск, 2–3 лютага 1919 г.). У звароце з’езда «Да ўсіх народаў і іх урадаў» выказвалася ўпэўненасць, што «самастойная Сацыялістычная Савецкая Беларуская Рэспубліка будзе прызнана ўсімі народамі паасобна, як яна прызнана брацкай Расійскай Сацыялістычнай Федэратыўнай Савецкай Рэспублікай». З’езд звярнуўся да ўсіх народаў і ўрадаў з прапановай неадкладна ўступіць у непасрэдныя дыпламатычныя адносіны з ССРБ[531], але яна засталася без адказу. Як вядома, ніякіх канкрэтных захадаў у справе міжнароднага прызнання і ўстанаўлення дыпламатычных адносін з замежнымі дзяржавамі ўрад ССРБ і КЗС не прадпрымалі. З’езд вызначыў тэрыторыю ССРБ у складзе Мінскай і Гродзенскай губерняў і прыняў рашэнне аб утварэнні Літоўска-Беларускай ССР, у склад якой увайшлі тэрыторыі Віленскай, Мінскай, часткі Ковенскай і Гродзенскай губерняў[532].

**М. П. Пятроў – новы наркам.** 3 лютага ЦБ КП(б)Б прызначыла новы склад урада, зацвердзіўшы загадчыкам КЗС М. П. Пятрова, і прыняло рашэнне аб стварэнні прэзідыума ЦВК ССРБ у складзе трох чала-

---

[529] Знешняя палітыка Беларусі. Т. 1. С. 94–97.
[530] Там жа. С. 103.
[531] Там жа. С. 104.
[532] Там жа. С. 105–106.

век: Мяснікова – старшыні, кіраўнікоў камісарыятаў па ўнутраных і замежных правах (Сямёна Іванова і Пятрова)[533]. 5 лютага сесія ЦВК Беларусі зацвердзіла новы склад урада і Малога Прэзідыума ЦВК.

10 лютага на пасяджэнні ЦБ КП(б)Б пры разглядзе пытання аб новым складзе ўрада Літбел адбыўся востры абмен думкамі наконт лёсу КЗС і некаторых іншых камісарыятаў. Член ЦК Камуністычнай рабочай партыі Польшчы (КРПП) у Расіі Іосіф Далецкі сказаў, што пытанне аб складзе ўрада абмяркоўвалася ў ЦК КРПП, пры гэтым «признано желательным уничтожение комиссариата иностранных дел»[534]. Сам наркам Пятроў заявіў, што ўвогуле няма ніякай неабходнасці для Беларусі ў замежнай палітыцы; дастаткова мець, невялікі тэхнічны аппарат пад кіраўніцтвам аднаго з членаў Прэзідыума ЦВК. Яму запярэчыў Далецкі: сваю знешнюю палітыку неабходна мець і гэта будзе вельмі важная палітыка, таму яе прыйдзецца весці пад кіраўніцтвам савецкай Расіі ўсяму ўраду. Дыскусію падсумаваў камісар фінансаў Ісак Рэйнгольд, адзначыўшы, што пры Прэзідыуме ЦВК павінен існаваць асобны сакратарыят па замежных справах пад кіраўніцтвам аднаго з членаў Прэзідыума. Старшынёй урада павінна быць асоба з Цэнтра (РСФСР), якая б звязвала ўрад з ЦК РКП(б). У прынятай пастанове ЦБ КП(б)Б зыходзіла з таго, што ў аб'яднаным урадзе Літбел камісарыяты замежных спраў, нацыянальных спраў, гандлю і прамысловасці не патрэбны («не должны существовать»)[535].

Пры абмеркаванні наступнага пункту парадку дня аб паездцы дэлегацыі беларускага ўрада ў Вільню для вырашэння пытанняў аб складзе аб'яднанага ўрада Літбел камісар па ваенных справах Іосіф Уншліхт выказаўся супраць кандыдатуры М. Пятрова, паколькі той нетактоўна паводзіў сябе ў адносінах з Ёфэ. У адказ Пятроў зняў «па прынцыповых меркаваннях» сваю кандыдатуру ў члены дэлегацыі, якая скарацілася да двух чалавек – Мяснікова і Іванова. Таксама Пятроў заявіў аб тым, што складае з сябе паўнамоцтвы камісара па замежных справах. Яго заява была прынята, аднак Пятроў застаўся ў Прэзідыуме ЦВК[536].

Аб Пятрове мала што вядома ў літаратуры, яго біяграфічнага нарысу няма ў энцыклапедыях. На аснове архіўных дакументаў устаноўлена, што на пасяджэнні ЦБ КП(б)Б 19 студзеня 1919 г. член ЦВК Іван Алібегаў

---

[533] 1 января 1919 года ... С. 102.

[534] Протокол № 17 заседания Центрального бюро КП(б)Б. 10 февраля 1919 г. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 8. Л. 29.

[535] Там жа. Л. 29–29 адв.

[536] Там жа. Л. 30 ; Знешняя палітыка Беларусі. Т. 1. С. 6–7.

і Рэйнгольд ахарактарызавалі яго як цэннага работніка, які згодны застацца для працы ў Мінску, і прапанавалі запрасіць яго для заняцця адной з адказных пасад. Гэтая прапанова была прынята, і Алібегаву даручылі яе выкананне[537].

На пасяджэнні ЦБ КП(б)Б 22 студзеня, на якім адбыўся першы беларуска-расійскі канфлікт, пасля выступлення Ёфэ слова ўзяў Пятроў (які, дарэчы, не пералічаны сярод прысутных членаў ЦБ, што дае падставы не лічыць яго членам ЦБ; невядома таксама і тое, якую пасаду ён займаў у той момант). Пятроў смела заявіў, што прапановы ЦК РКП(б) аб скарачэнні тэрыторыі ССРБ і федэрацыі Беларусі, як і Літвы і Латвіі, з РСФСР не вытрымліваюць крытыкі з марксісцкага пункту гледжання, бо Ф. Энгельс разбіў прынцыпы самавызначэння малых нацыянальнасцей. Тым не менш у Літве, нягледзячы на адсутнасць умоў для развіцця нацыяналізму, ён усё ж такі развіўся. Пятроў мог бы сказаць тут і пра беларускі нацыяналізм, пра які неаднаразова згадваў Ёфэ ў сваіх лістах у Маскву, аднак, напэўна, палічыў за лепшае гэтага не рабіць. Пятроў закончыў выступ думкай, што калі ЦК настойвае на сваіх прапановах, ЦБ павінна іх прыняць і паставіць пытанне на з'ездзе саветаў, каб увайсці ў федэрацыю з Расіяй[538]. Як вядома, беларускае ЦБ на чале з Мясніковым, як і група Жылуновіча, заняло тады цвёрдую пазіцыю і адхіліла прапановы расійскага ЦК, аднак пазней было вымушана іх прыняць. Што датычыла Пятрова, то яго адкрытая палеміка з прадстаўніком ЦК РКП(б) Ёфэ прыйшлася шэрагу членаў ЦБ не па душы, і таму ваенкам Уншліхт на пасяджэнні ЦБ 10 лютага адхіліў кандыдатуру Пятрова для паездкі ў Вільню, паколькі яна «ввиду его личных трений с Иоффе вызывает лишнюю страстность»[539].

Галоўнай знешне- і ваенна-палітычнай праблемай Літоўска-Беларускай ССР было прадухіленне вайны з Польшчай. 16 лютага 1919 г. Часовы рабоча-сялянскі ўрад Літоўскай ССР і ЦВК ССРБ накіравалі ноту польскаму ўраду з прапановай стварыць змешаную камісію для мірнага ўрэгулявання спрэчных тэрытарыяльных пытанняў і ўсталявання дзяржаўнай мяжы паміж толькі што абвешчанай Літбел і Польшчай[540]. Нота была падпісана Мясніковым і старшынёй СНК Літбел, наркамам па за-

---

[537] Протокол № 8 заседания Центрального бюро КП(б)Б. 19 января 1919 г. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 8. Л. 14–15.

[538] Знешняя палітыка Беларусі. Т. 1. С. 94–95.

[539] Протокол № 17 заседания Центрального бюро КП(б)Б. 10 февраля 1919 г. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 8. Л. 30.

[540] Знешняя палітыка Беларусі. Т. 1. С. 110–111.

межных справах Вінцасам Міцкевічам-Капсукасам. 28 лютага 1919 г. ЦВК Літбел выдаў Дэкларацыю аб знешняй палітыцы, у якой зноў выказвалася «гатоўнасць вырашаць усе спрэчныя пытанні палюбоўна і міралюбіва». З абурэннем канстатавалася тое, што ўрад Польшчы не адказаў на прапанову аб стварэнні змешанай камісіі і працягвае наступленне. У Дэкларацыі змяшчаўся паўторны (першы быў у Маніфесце аб стварэнні ССРБ) заклік да ўсіх народаў і іх урадаў прызнаць Сацыялістычную Савецкую Рэспубліку Літвы і Беларусі і ўступіць з ёю ў зносіны[541]. Аднак усе гэтыя прапановы засталіся без адказу. Польшча і краіны Антанты не прызнавалі Літбел і адмаўляліся ўступаць з ёй у перагаворы. Як вынікае з тэлеграмы Ёфэ старшыні УЦВК Я. Свярдлову ад 28 лютага, гэтая дэкларацыя была адзінагалосна прынята ЦК КП(б) Беларусі і Літвы, і ён прасіў адправіць яе па радыё з Масквы, што паказвае, хто і як вырашаў знешнепалітычныя справы новага дзяржаўнага ўтварэння[542].

Такім чынам, у два першыя месяцы свайго існавання Беларуская савецкая рэспубліка перажыла драматычныя пераломы лёсу, звязаныя перш за ўсё са знешнімі, міжнароднымі фактарамі. Зацятая барацьба беларускіх камуністаў з абласнікамі, што не прызнавалі беларускай нацыі і не жадалі самастойнай беларускай дзяржаўнасці, адбывалася ва ўмовах геапалітычных эксперыментаў бальшавіцкага ўрада, які спачатку «распалавініў» ССРБ, а яе заходнюю частку злучыў з савецкай Літвой, утварыўшы Літбел, якая аказалася недаўгавечным утварэннем.

У не менш драматычных умовах нараджалася знешнепалітычнае ведамства савецкай Беларусі. З трэцяга заходу была падабрана адпаведная кандыдатура члена ўрада па замежных справах (Фальскі), які прабыў на гэтай пасадзе крыху больш за месяц, стаўшы потым адной з першых ахвяр новай улады. Яго пераемнік Пятроў, займаючы вялікадзяржаўныя пазіцыі, не лічыў патрэбным для невялікай рэспублікі мець уласную знешнюю палітыку і паўнавартасны камісарыят замежных спраў. Не бачачы перспектыў у незалежным існаванні беларускай дзяржавы, ён адмовіўся ад паўнамоцтваў камісара па замежных справах.

Гераічнае і трагічнае, выпадковае і заканамернае перапляліся ў лёсах беларускай дыпламатычнай службы, і гэта было характэрна і ў яе першыя месяцы існавання, і ў наступныя дзесяцігоддзі. Разам з тым ва ўсе

---

[541] Знешняя палітыка Беларусі. Т. 1. С. 116–117.

[542] *Снапкоўскі У. Е.* Дакументы пра місію паўнамоцнага прадстаўніка ЦК РКП(б) А. А. Іофе ў Беларусь і Літву // Існі на святло лабірынтамі даўніх падзей: Зборнік памяці Віталя Скалабана / уклад. А. Сідарэвіч, А. Фядута, М. Шумейка. Мінск, 2013. С. 313–319.

часы стогадовай гісторыі Наркамата, а потым Міністэрства замежных спраў БССР/Рэспублікі Беларусь вызначальнай рысай беларускай дыпламатыі і дыпламатычных кадраў было служэнне інтарэсам беларускай дзяржаўнасці.

## 4.3. Беларусь і БНР паводле дакументаў і матэрыялаў брытанскага Форын офіса 1918–1920 гг.[543]

**Стан даследаванняў англа-беларускіх адносін.** Пытанні, звязаныя з адносінамі замежных, асабліва вядучых заходніх, дзяржаў да абвяшчэння і наступнай палітычнай дзейнасці Беларускай Народнай Рэспублікі, слаба даследаваны ў беларускай і замежнай гістарыяграфіі. Гэта датычыцца і стаўлення Вялікабрытаніі да новаабвешчанай дзяржавы, для якой увогуле тэрыторыя Беларусі не была прыярытэтам і якую Лондан, паводле звестак дзеячаў БНР, уступіў Францыі ў адпаведнасці з падзелам сфер уплыву ва Усходняй Еўропе. Прыярытэтам для англійскага ўрада ў гэтым рэгіёне была Прыбалтыка, новыя Балтыйскія дзяржавы, якія былі прывабныя для Лондана з пункту гледжання гандлёвых і геапалітычных, ваенна-палітычных інтарэсаў. Тым не менш тэматыка англа-беларускіх палітычных адносін канца 1910-х – пачатку 1920-х гг., у цэнтры якой была палітыка і дыпламатыя БНР, атрымала пэўнае адлюстраванне ў гістарычных даследаваннях.

Піянерамі тут былі англійскія вучоныя з Лондана, цесна звязаныя з беларусазнаўствам і дзейнасцю беларускай дыяспары ў Вялікабрытаніі. Выкладчык Школы ўсходнееўрапейскіх і славянскіх даследаванняў Лонданскага ўніверсітэта Джэймс Дынглі апублікаваў у 1984 г. артыкул пра палітычную дзейнасць старшыні ўрада БНР Вацлава Ластоўскага, у якім, абапіраючыся на архіўныя матэрыялы Форын офіса, упершыню распавёў пра стаўленне брытанскай дыпламатыі да БНР і яе кіраўнікоў[544]. У 2001 г. актывіст Англа-Беларускага таварыства і вядомы беларусазнаўца Гай Пікарда выступіў з артыкулам пра дыпламатычную місію БНР у Лондане 1921–1922 гг.[545] На жаль, артыкул выйшаў без спасылак. У пачатку

---

[543] Друкуецца паводле даклада: *Снапкоўскі У. Е.* Свой пачэсны пасад між народамі: Станаўленне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці і дэмакратыі ў 1918 г. (Лондан, 24 сак. 2018 г.). Матэрыялы для артыкула сабраны ў выніку рэалізацыі праекта ЕС «МОСТ» № R-eyNV-21399 (Лондан, люты – сакавік 2018 г.).

[544] *Dingley J.* Op. cit. P. 14–27.

[545] *Picarda G.* Diplomatic mission of the Belarusian National Republic in London (1919–1922) // Belarusian Chronicle. 2001. Spring. № 15. P. 9–15.

2000-х гг. да гэтай тэмы звярнуліся беларускія і польскія вучоныя. Аляксандр Ціхаміраў у сваёй манаграфіі апісаў адносіны Вайскова-дыпламатычнай місіі БНР у Латвіі і Эстоніі з дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі Вялікабрытаніі і Францыі ў балтыйскіх дзяржавах у 1919–1920 гг., выкарыстоўваючы матэрыялы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і выданне «Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі»[546]. Дарота Міхалюк надрукавала артыкул пра беларускі рух і БНР у адлюстраванні дакументаў брытанскага Форын офіса, што знаходзіліся ў фондах Беларускай бібліятэкі і музея імя Францішка Скарыны ў Лондане[547]. Ксеракопіі гэтых дакументаў былі зроблены Гаем Пікардам з фонду Форын офіса ў Нацыянальным архіве Вялікабрытаніі (НАВ; Kew Gardens) у 1968–1969 гг.[548] Гомельскі гісторык Алена Дуброўка даследуе палітыку Вялікабрытаніі ва Усходняй Еўропе пасля заканчэння Першай сусветнай вайны, у тым ліку адносна Літвы і Беларусі, выкарыстоўваючы таксама даследаванні англійскіх вучоных і даступныя ў інтэрнэце матэрыялы НАВ[549]. На жаль, па аналізаванай намі тэматыцы маецца выпадак і недобрасумленнай публікацыі[550].

Аўтар у 2018 г. меў шчаслівую магчымасць даследчыцкай працы ў НАВ і Скарынаўскай бібліятэцы па гранце, прадастаўленым праектам Еўрапейскага саюза «МОСТ». Адной з тэм нашых пошукаў стала пытанне аб адносінах англійскага ўрада да БНР. Удалося знайсці некалькі вялікіх спраў Форын офіса, прысвечаных Расіі, дзе блокам былі вылучаны адносіны з «Беларускай», «Беларутэнскай», «Заходнерускай», «Мінскай рэспублікай» за 1918–1921 гг. Агульная колькасць старонак пра Беларусь налічвае больш за 500.

---

546 *Ціхаміраў А. В.* Беларусь у сістэме міжнародных адносін ... С. 209–219.

547 *Michaluk D.* Ruch biaroruski w swietlie dokumentow brytyjskiego Foreign Ofice z lat 1918–1919 ze zbiorow Bialoruskiej Biblioteki im. Frantiszka Skaryny w Londynie // Bialoruskie zeszyty historyczne. 2007. № 28. S. 35–53.

548 Беларуская бібліятэка і музей імя Францішка Скарыны ў Лондане. Падборка дакументаў пра БНР з фондаў Форын офіса.

549 *Дубровко Е. Н.* Английские проекты для «Белой Руси» в условиях польско-российского/советского территориального размежевания (конец 1918 – начало 1921 г.) // Беларусь і суседзі: Шляхі фарміравання дзяржаўнасці, міжнацыянальныя і міждзяржаўныя адносіны : зб. навук. арт. Гомель, 2017. Вып. 6. С. 95–100 ; *Яе ж.* Вялікабрытанія і «беларуская справа» падчас Парыжскай мірнай канферэнцыі 1919–1920 гадоў // Беларус. гіст. часоп. 2019. № 4. С. 3–9.

550 *Кобрин М. В.* Белорусский вопрос в документах британских дипломатов в 1918–1919 гг. // Вопр. истории. 2012. № 5. С. 146–150.

Падчас працы ў Лондане аўтар звярнуў увагу і на новае шматтомнае выданне «British Documents on Foreign Affairs. Part II. Ser. A: The Soviet Union», якое ахоплівае перыяд 1917–1939 гг.[551] У ім змешчаны некаторыя дакументы пра БНР і беларускі нацыяналізм, што захоўваюцца ў НАВ. Зараз можна сцвярджаць, што там, перш за ўсё ў фондзе Форын офіса (Foreign office), а таксама ў фондзе Кабінета міністраў (War Cabinet), ваеннага міністэрства (War Office) і іншых міністэрстваў, захоўваецца значная колькасць дакументаў і матэрыялаў, маючых дачыненне да Беларусі. Іх распрацоўка можа стаць асновай для напісання артыкулаў і нават дысертацыі пра англа-беларускія адносіны канца 1910-х – пачатку 1920-х гг.

Спынімся на некалькіх важных пытаннях, датычных адносін Форын офіса і брытанскага ўрада да стварэння і дзейнасці БНР і ўспрыняцця імі ваенна-палітычных і дыпламатычных крокаў урадавых структур БНР. Гэта пытанні, звязаныя з першымі кантактамі паміж англійскімі дыпламатамі і прадстаўнікамі БНР; рэакцыяй Форын офіса на звароты беларускіх і польскіх палітыкаў адносна бальшавіцкай пагрозы для Беларусі ў 1918 г.; успрыняццем палітычнымі і навуковымі коламі Вялікабрытаніі Беларусі і беларусаў; ацэнкамі Лондана дзяржаўнага і палітычнага статусу новаабвешчанай дзяржавы і праблемай міжнароднага прызнання БНР; адносінамі да стварэння беларускага войска і да палітычных і ваенных дзеячаў БНР.

Узрастаючы інтарэс брытанскага ўрада да Усходняй Еўропы ў завяршальны перыяд Першай сусветнай вайны і першыя гады пасляваеннага ўладкавання міжнародных адносін быў выкліканы слабеючай роллю Расіі сярод дзяржаў Антанты, станам хаосу і анархіі на тэрыторыі былой Расійскай імперыі, бальшавіцкай пагрозай для новапаўсталых краін Усходняй і Цэнтральнай Еўропы і планамі Германіі па стварэнні залежных ад яе «ўскраінных дзяржаў». У прынцыпе, такія ж інтарэсы ў рэгіёне праследвала і Францыя. Аднак Лондан і Парыж па-рознаму глядзелі на будучыню тэрыторый, якія раней былі заходняй ускраінай Расійскай імперыі. Францыя ўвогуле прытрымлівалася канцэпцыі цэласнасці Расійскай дзяржавы і непрыхільна ставілася да нацыянальных рухаў народаў заходніх правінцый. Вялікабрытанія ж зрабіла стаўку на падтрымку незалежніцкіх памкненняў літоўцаў, латышоў і эстонцаў. Пашырэнне ўплыву ва Усходняй Прыбалтыцы адпавядала геапалітычным і гандлёва-эканамічным

[551] British Documents on Foreign Affairs: Reports and Papers From the Foreign Office Confidential Print. Part II: From the First to the Second World War. Series A: The Soviet Union, 1917–1939 / ed. by D. Cameron Watt ; gen. ed., Kenneth Bourne and D. Cameron Watt. Frederick, Md., 1984. Vol. 1: Soviet Russia and Her Neighbors, Jan. 1917 – Dec. 1919, XXVI, 470 pp.

інтарэсам англічан[552]. Дзеянні англа-французскай кааліцыі ў дачыненні да Балтыйскіх дзяржаў былі абумоўлены таксама страхам перад магчымым пагадненнем Германіі з савецкай Расіяй (новым Брэсцкім мірам).

Для падтрымкі ўрадаў Балтыйскіх рэспублік і ўмацавання уласных пазіцый дзяржавы Антанты накіравалі на іх тэрыторыю вайсковыя і палітычныя місіі. У Рызе з пачатку 1919 г. дзейнічала Брытанская місія ў балтыйскіх правінцыях (пазней дзяржавах) на чале з Гербертам Грант-Ватсанам, якога пазней змяніў Эрнэст Вайлтан. Вайсковай місіяй Вялікабрытаніі кіраваў Джордж Кенан, а потым генерал Альфрэд Берт, эканамічнай місіяй – палкоўнік Стэфан Таленц. Тут таксама працавала міжсаюзніцкая місія па эвакуацыі нямецкіх войскаў з Балтыйскіх краін на чале з французскім генералам А. Нісэлем. Распад імперый і ўзнікненне шэрагу новых дзяржаў ва Усходняй Еўропе выклікалі структурную перабудову Паўночнага дэпартамента Форын офіса, у якім з'явіліся падраздзяленні па справах Расіі (раней было па справах Расійскай імперыі), Польшчы і балтыйскіх дзяржаў. Беларуская праблематыка знаходзілася ў кампетэнцыі гэтых трох падраздзяленняў, а таксама Дэпартамента палітычнай разведкі.

У 1918 г. Форын офіс яшчэ даволі слаба арыентаваўся ў беларускіх справах. Праблема была звязана з ідэнтыфікацыяй беларусаў і Беларусі. Спачатку іх адносілі да белых рускіх (White Russians) ці спаланізаваных русінаў (Polish Ruthenes). Замяшанне выклікаў пераклад назвы «Беларусь» на англійскую мову, якая звычайна перакладалася як Белая Русь/Расія (White Russia), Заходняя Русь/Расія (West Russia) – як Беларутэнія (Belaruthenia). Гэта стварала ўражанне блізкай сувязі Беларусі з Расіяй ці белагвардзейцамі[553]. Часцей за ўсё ў дыпламатычных дакументах англічане называлі нашу краіну White Russia ці часам Byelorussia, а Беларускую Народную Рэспубліку – White Russian National Republic ці Byelorussian National Republic[554].

**Першыя кантакты паміж Форын офісам і прадстаўнікамі БНР.** Першы афіцыйны кантакт паміж прадстаўнікамі Рады БНР і брытанскімі дыпламатамі адбыўся 2 лістапада 1918 г., калі Рыгор Каплан (сябра Рады БНР), Станіслаў Хжанстоўскі (першы бургамістр Мінска) і Сымон Розенбаўм (другі бургамістр Вільні і старшыня Яўрэйскага таварыства ў Вільні) наведалі прадстаўніцтва Вялікабрытаніі ў Даніі. Яны былі

[552] *Весялкоўскі Ю.* Беларусь у Першай сусьветнай вайне (гістарычны нарыс). Беласток ; Лёндан, 1996. С. 239–240 ; *Міхалюк Д.* Беларуская Народная Рэспубліка ... С. 404–405.

[553] *Michaluk D.* Op. cit. S. 36–37.

[554] Гл., напр.: TNA. Foreign Office Index in Inquire Room (1918–1921).

прыняты першым сакратаром брытанскага пасольства ў Капенгагене лордам Віктарам Кірмарнокам, якому перадалі падпісаны імі зварот Рады БНР на імя прэм'ер-міністра Д. Лойд-Джорджа (аналагічныя пасланні былі накіраваны прэзідэнтам ЗША і Францыі) з просьбай абараніць насельніцтва Белай Русі ад бальшавіцкай анархіі і аказаць ёй ваенную дапамогу пасля адыходу нямецкіх войскаў[555].

4 лістапада лорд Кірмарнок накіраваў у Форын офіс першую тэлеграму аб выніках сустрэчы, дзе паведамляў, што «тры дэлегаты Рады Белай Русі», выбранай яшчэ пры рэжыме Керанскага і прызнанай потым немцамі падчас іхняй акупацыі, якія дазволілі дэлегацыям БНР летам 1918 г. выязджаць за мяжу, былі прыняты ім у брытанскім прадстаўніцтве[556]. Падобныя дэлегацыі былі высланы ў Берн і Варшаву, а неафіцыйная дэлегацыя вяла перагаворы ў Кіеве[557]. Кірмарнок інфармаваў пра склад Рады БНР з 64 сяброў, якія прадстаўлялі розныя грамадскія класы ад 1300 абшчын, і цяжкасці з правядзеннем сесій Рады, на якіх маглі прысутнічаць толькі дэпутаты з акупіраванай Германіяй тэрыторыі Беларусі і Літвы. Закранаючы пытанне вываду нямецкіх войскаў, Кірмарнок падкрэсліваў, што Рада апасаецца не толькі інтэрвенцыі бальшавіцкіх войскаў, але і ўнутраных хваляванняў, паколькі шмат беларускіх сялян інфіцыраваны бальшавіцкімі ідэямі[558].

Прадстаўнікі Рады БНР таксама паведамілі, што ў выніку неафіцыйных перагавораў з нямецкімі акупацыйнымі ўладамі яны прыйшлі да высновы, што няма сэнсу прасіць немцаў аб узбраенні ці стварэнні ўласных узброеных аддзелаў, каб аказаць супраціў бальшавікам. Яны не звярталіся па дапамогу і, як было сказана, да «Скандынаўскага ўрада» (напэўна, меліся на ўвазе ўрады скандынаўскіх краін), паколькі спадзяваліся, што Антанта, якая прымусіць немцаў вярнуцца дадому, зробіць неабходныя крокі для захавання парадку ў Беларусі. Рада БНР не чакала дапамогі і з боку Украіны і Польшчы. Беларускія прадстаўнікі збіраліся вяртацца ў Мінск праз Берлін, але жадалі б зноў вярнуцца ў Данію для працягу дыскусій і маглі б тут падтрымліваць кантакты праз Сіяніцкае бюро. У канцы сустрэчы, напэўна, для патрэб брытанскай

---

[555] TNA. Foreign Office 371–3344. Telegram of lord Kirmarnock to Foreign Office 04.11.1918. P. 181–182 ; Telegram of lord Kirmarnock to Foreign Office 10.11.1918. P. 369.

[556] Інфармацыя аб прыёме брытанскім паслом беларускіх прадстаўнікоў стала вядома нямецкай вайсковай разведцы. *Paluszyński T.* Walka o niepodległość Lotwy. 1914–1921. Warszawa, 1999. S. 179.

[557] Гл.: Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. С. 292.

[558] TNA. Foreign Office 371–3344. Telegram of lord Kirmarnock to Foreign Office 04.11.1918. P. 185–186.

разведкі, яны ацанілі колькасць нямецкага гарнізона ў Мінску ў сем, а ў Вільні – у шэсць тыс. чал.[559]

Па выніках прапрацоўкі гэтай тэлеграмы ў Дэпартаменце палітычнай разведкі Форын офіса і Дэпартаменце ваеннай інфармацыі Вайсковага офіса з'явілася наступнае заключэнне: «Белая Русь» (White Russia) – гэта верагодна яшчэ адзін кандыдат, хто жадае далучыцца да шэрагу новых дзяржаў. Паколькі ясна, што мы не зможам у любым выпадку аказаць ім значнай дапамогі, я думаю, што для нас будзе лепш не даваць адказу на зварот у тэлеграме № 183236 да таго часу, пакуль нам не стане больш вядома пра гэтых людзей і пра іх паўнамоцтвы». У апошнім сказе гаварылася пра тое, што гэтыя людзі жадалі б выступаць і ад імя Літвы, якую самі літоўцы лічаць сваёй Радзімай[560].

10 лістапада лорд Кірмарнок накіраваў у Форын офіс другую тэлеграму аб выніках сустрэчы з прадстаўнікамі Рады БНР, у якой змяшчаліся даныя пра колькасць насельніцтва Беларусі (12 млн чал.), яе нацыянальны склад з перавагай беларусаў, увогуле добрыя адносіны паміж сялянамі-беларусамі і памешчыкамі-палякамі. Аднак і тут адзначалася, што некаторыя сяляне заражаныя бальшавізмам і гэта небяспека вымушае палякаў і яўрэяў да цеснага супрацоўніцтва[561].

Паводле слоў беларускіх прадстаўнікоў, было цяжка вызначыць жаданні насельніцтва па нацыянальным пытанні, аднак ясна, што жыхары Беларусі хацелі, каб іх краіна была незалежнай ужо зараз і, што малаверагодна, каб у Велікаросіі стабільны ўрад усталяваўся на доўгі час, па меншай меры на 25 гадоў ці больш. Большасць сяброў Рады БНР былі б рады бачыць Беларусь у складзе супольнасці дзяржаў (Лігі) разам з палякамі, літоўцамі і латышамі, куды б яна ўвайшла на раўнапраўных умовах. Аднак пры гэтым кожны народ жыў бы ізалявана, і таму беларусы не вельмі імкнуліся б да камунікацый з літоўцамі ці іншымі суседнімі дзяржавамі. Была выказана вялікая пагарда ў бок літоўскай Тарыбы, якая, на думку прадстаўнікоў Рады БНР, не можа прадстаўляць волю народа і з'яўляецца інструментам у руках нямецкіх ваенных колаў. Мясцовае насельніцтва цярпела ад нямецкіх улад, аднак страх перад бальшавіцкай пагрозай

---

[559] TNA. Foreign Office 371–3344. Telegram of lord Kirmarnock to Foreign Office 04.11.1918. P. 186–187. Аб першай тэлеграме Кірмарнока гл. таксама: *Michaluk D.* Op. cit. S. 37–38.

[560] TNA. Foreign Office 371–3344. Minutes [Military 5.11.1918] to the telegram of lord Kirmarnock to Foreign Office 4.11.1918. P. 185. Д. Міхалюк памылкова адносіць аўтарства гэтага заключэння да Кірмарнока, а яго пераклад на польскую мову мае некаторыя недакладнасці. *Michaluk D.* Op. cit. S. 37.

[561] TNA. Foreign Office 371–3344. Telegram of lord Kirmarnock to Foreign Office 10.11.1918. P. 369.

перасільваў усе іншыя апасенні. У Мінску, дзе немцы разглядалі сваю акупацыю як часовую, сітуацыя была лепшай, чым у Вільні, дзе нямецкі рэжым быў значна горшы. З Віленскай губерні немцы вывезлі такую колькасць прадуктаў, што значная частка насельніцтва была асуджана на пагібель. Вялікая колькасць людзей сядзела ў турмах. Увогуле харчовае забеспячэнне ў Беларусі значна палепшылася за 1918 год[562]. Гэтае сцвярджэнне прадстаўнікоў Рады БНР ставіць пад сумненне высновы многіх беларускіх гісторыкаў аб пагаршэнні эканамічных умоў жыцця насельніцтва пад нямецкай акупацыяй.

Заканчваючы тэлеграму, брытанскі дыпламат закрануў пытанне аб верагоднасці інфармацыі, што паведамілі «дэлегаты» невядомай яму раней «Рады Белай Русі», якая, як заўважалі ў Форын офісе, таксама прэтэндуе на статус новай дзяржавы. Кірмарнок пісаў, што яны прыехалі ў Данію праз Германію і вярнуцца тым самым шляхам, таму ўтоенасць, якую яны выявілі з-за страху рэпрэсій перад немцамі, павінна была апошнім паказаць, што пасланцы з Беларусі гаварылі дастаткова свабодна[563].

**Звароты да Вялікабрытаніі ў сувязі з бальшавіцкай пагрозай.** У гэты ж самы час 4 лістапада да брытанскага пасла ў Швейцарыі лорда Рычарда Актана звярнуўся з лістом прадстаўнік польскіх арганізацый Літвы, Белай Русі і Украіны Станіслаў Гутоўскі, які прасіў дапамогі англійскага ўрада ў сувязі, як ён сцвярджаў, з масавымі забойствамі палякаў «бальшавіцкімі ордамі з Велікаросіі» ў Лепельскім і іншых паўночных паветах Беларусі[564]. Форын офіс адказаў новаму паслу ў Берне Хорасу Румбальду 15 лістапада, што прапанова аб пасылцы саюзніцкіх войскаў у Беларусь праз Адэсу не можа быць узята пад увагу з-за ваенных разлікаў. Таксама невыканальнай была прапанова аб тым, каб узгадніць з Аўстрыяй пасылку польскіх войскаў з былой аўстрыйскай арміі ў Беларусь, паколькі Аўстрыйская імперыя распалася. У Лондане дадзеную прапанову разглядалі як спробу атрымання дапамогі саюзнікаў для захавання за Польшчай тэрыторый (рэгіёнаў), да якіх яна не мае ніякіх праў. Таму паслу раілі карэктна адказаць Гутоўскаму, што адпраўка брытанскіх войскаў у Беларусь немагчыма[565].

Амаль што разам з дэлегацыяй БНР, якая выязджала ў Капенгаген, была накіравана дэлегацыя ў Берн у складзе былога старшыні ўрада БНР

[562] TNA. Foreign Office 371–3344. Telegram of lord Kirmarnock to Foreign Office 10.11.1918. P. 369 revers.

[563] Ibid. P. 370.

[564] TNA. Foreign Office 371–3729. Telegram of lord Acton to Foreign Office 4.11.1918 and Letter of Gutowski to lord Acton 31.10.1918. No pagination in this reference.

[565] Ibid. Telegram of Foreign Office to Rumbold 15.11.1918.

Рамана Скірмунта і вядомага грамадскага дзеяча Альбрэхта Радзівіла, якая была прынята брытанскім паслом Хорасам Румбальдам. Яны таксама ўручылі яму падпісаны імі зварот да англійскага ўрада, дзе гаварылася аб бальшавіцкай небяспецы ў сувязі з вывадам нямецкіх войскаў з Беларусі і змяшчалася просьба, каб войскі Антанты неадкладна занялі іх месца, што дало б магчымасць забяспечыць спакой і парадак у краі і выкарыстаць мясцоваму насельніцтву права народаў на распараджэнне ўласным лёсам[566]. Тэлеграма Румбальда была азаглаўлена ў Форын офісе як «Пагроза бальшавізму ў Белай Русі», а кіраўнікі Расійскага дэпартамента папрасілі Румбальда праз Дэпартамент ваеннай інфармацыі перадаць Гутоўскаму, што саюзніцкія войскі не могуць быць пасланыя ў Беларусь[567].

У сувязі са зваротамі Гутоўскага, як і іншых грамадскіх і палітычных дзеячаў Беларусі і Польшчы, сваю думку ў даволі катэгарычнай форме выказаў эксперт Дэпартамента палітычнай разведкі Форын офіса Левіс Нам’ер. Ён пісаў, што паведамленні аб «ордах бальшавікоў з Велікаросіі» цалкам непраўдзівыя, хваляванні маюць лакальны і стыхійны характар. Скірмунт і Радзівіл, адказваючы на пытанне Румбальда, чаму мясцовае насельніцтва не ўзброена, прызнавалі, што ўсе баяздольныя элементы інфіцыраваны бальшавізмам. Ніводная са справаздач аб пазакрымінальным забойстве, верагодна, не адпавядае праўдзе. На яго думку, больш верагодна, што польскія сяляне далучыліся да беларускіх, каб забіваць польскіх буйных абшарнікаў. Нам’ер звяртаў увагу і на тое, што вялікая колькасць беларусаў у Лепельскім павеце – каталікі, якіх палякі лічаць палякамі, але па гэтай прычыне першыя не маюць добрых пачуццяў да другіх[568]. Заключэнне эксперта было завізіравана дэпартаментамі Расіі, палітычнай разведкі і ваеннай інфармацыі.

Нягледзячы на адмоўныя адказы з боку Лондана, дзеячы БНР працягвалі свае намаганні, каб прыцягнуць увагу дзяржаў Антанты і міжнароднай грамадскасці да магчымых непрыемных наступстваў эвакуацыі нямецкіх войскаў з Усходняга фронту. Раман Скірмунт, карыстаючыся сувязямі свайго брата Канстанціна, які быў польскім паслом у Італіі, звярнуўся ў лістападзе да Папы Рымскага з просьбай аб пасрэдніцтве Ватыкана паміж дзяржавамі Антанты і Германіяй. Мэта звароту заключалася ў тым, каб не дапусціць пасля вываду нямецкіх войскаў з

566 TNA. Foreign Office 371–3344. Telegram of Rumbold to Foreign Office 11.11.1918. P. 342–242a.

567 Ibid. P. 341.

568 TNA. Foreign Office 371–3729. Minutes of Namier. Subject: Appeal by Monsieur Gutowski on behalf of the Poles in White Russia. 08.11.1918.

тэрыторыі Польшчы, Літвы і Беларусі «поўнага знішчэння гэтых правінцый дзікімі бандамі бальшавікоў», як гэта ўжо адбылося ў двух паветах Беларусі ў кастрычніку[569]. Аб такім пасрэдніцтве, як і рэакцыі Папы, нам невядома, а тэлеграма памочніка ваеннага аташэ брытанскага пасольства ў Парыжы князя Джона дэ Саліса ў Форын офіс аб ініцыятыве Скірмунта не выклікала там інтарэсу[570].

19 лістапада Форын офіс атрымаў зварот Рады БНР да прэзідэнта ЗША Вудра Вільсана, ваюючых і цэнтральных дзяржаў ад 22 кастрычніка, перасланы Румбальдам з Берна. Апошні паведамляў, што зварот, падпісаны «Прэзідэнтам Савета Рэспублікі Белая Русь» (меўся на ўвазе старшыня Рады БНР Язэп Лёсік), змяшчае просьбу забяспечыць краіну ад разгрому, гарантаваць яе цэласнасць і суверэнную незалежнасць у сувязі з адыходам акупацыйнай арміі[571]. Дакумент быў азаглаўлены ў Форын офісе як «Страх анархіі ў Белай Русі», а заключэнне дэпартаментаў палітычнай разведкі і ваеннай інфармацыі характарызавала яго як зварот яшчэ аднаго прадстаўніка Беларусі, пасля чаго катэгарычна гучала фраза: «Мы ўжо сказалі, што адпраўка брытанскіх войскаў у Белую Русь немагчымая»[572].

Апошнюю кропку ў справе «масавых забойстваў палякаў у Белай Русі» паставіў дырэктар Дэпартамента ваеннай разведкі (інфармацыі) Вайсковага офіса генерал Уільям Твайтс у лісце намесніку міністра замежных спраў 9 лістапада. Трэці пункт яго кароткага мемарандума быў прысвечаны гэтаму пытанню, і яго змест заключаўся ў тым, што калі палякі ў Белай Русі апынуліся ў небяспецы, то гэта, напэўна, таму, што яны складаюць зямельную арыстакратыю краю. Ён раіў, каб яны хутчэй кідалі свае ўладанні і беглі ў Польшчу. Зноў паўтаралася думка аб немагчымасці інтэрвенцыі брытанскіх войскаў у Белую Русь[573]. Мемарандум, як бачна, напісаны пад уплывам заключэння Нам'ера, што адчуваецца і ў двух першых яго пунктах. У заключэннях супрацоўнікаў Форын офіса на гэты дакумент выказваліся дзве прапановы. У першай лорду Актану раілі перадаць згаданаму вышэй Гутоўскаму пазіцыю Дэпартамента ваеннай інфармацыі ў стрыманай манеры. У другой рэкамендавалі паведаміць новаму паслу Румбальду пазіцыю гэтага Дэ-

---

569 TNA. Foreign Office 371–3344. Count de Salis to Foreign Office 16.11.1918. P. 359.

570 Ibid. P. 358.

571 Ibid. Telegram of Rumbold to Foreign Office 19.11.1918. P. 378. Зварот Рады БНР (на французскай мове) P. 379–380. Гл.: Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. С. 283–284.

572 Ibid. Minutes. P. 377.

573 TNA. Foreign Office 371–3729. The Director of Military Intelligence (War Office) to the Under Secretary of State for Foreign Affairs 09.11.1918.

партамента, каб ён потым інфармаваў Гутоўскага аб немагчымасці брытанскай інтэрвенцыі[574].

Такім чынам, «адкрыццё» Беларусі і яе палітычнага прадстаўніцтва ў форме БНР адбылося брытанскім урадам у лістападзе 1918 г. і было звязана са зваротамі Рады БНР, беларускіх і польскіх грамадскіх і палітычных дзеячаў наконт пагрозы бальшавізму. Лондан адмовіўся пасылаць войскі ў Беларусь, тлумачачы гэта як ваеннымі разлікамі, так і перабольшваннем бальшавіцкай пагрозы для палякаў, якія там пражывалі. БНР падазрона разглядалі як яшчэ аднаго кандыдата на статус новай незалежнай дзяржавы, якая патрабуе дапамогі, грошай і прызнання. Атрыманая Форын офісам інфармацыя пра Беларусь хоць і не заўсёды была дакладнай, напрыклад адносна ўзаемаадносін БНР з нямецкімі акупацыйнымі ўладамі і яе прызнання, аднак не давала падстаў сур'ёзна ставіцца да Рады БНР і яе палітычных памкненняў. Адначасова англійская дыпламатыя і разведка негатыўна ўспрымалі спробы польскіх палітыкаў абараняць інтарэсы польскіх абшарнікаў у Беларусі, на якую Польшча не магла мець ніякіх праў. Гэту цвёрдую і, як аказалася, прынцыповую пазіцыю адносна польскіх прэтэнзій на «крэсы ўсходнія» Вялікабрытанія праводзіла і далей.

**Белая Русь як тэра інкогніта.** Звароты Рады БНР і сустрэчы з яе дэлегацыямі ў еўрапейскіх сталіцах заканамерна паставілі перад брытанскай дыпламатыяй і разведкай пытанне аб тым, што гэта ўвогуле за краіна. Інтарэс да тэра інкогніта пад назвай «Белая Русь» прынамсі на ўзроўні агульнай, даведачнай інфармацыі быў выкліканы і падрыхтоўкай да пасляваеннай мірнай канферэнцыі, якая павінна была заняцца справамі тэрытарыяльна-палітычнага ўладкавання Усходняй Еўропы. Першым вядомым нам аналітычным дакументам пра Беларусь, падрыхтаваным брытанскім урадам, быў згаданы вышэй кароткі мемарандум дырэктара Дэпартамента ваеннай інфармацыі Вайсковага офіса, накіраваны намесніку міністра замежных спраў 9 лістапада. У двух яго першых пунктах давалася кароткая інфармацыя пра Беларусь, яе насельніцтва, тэрыторыю, межы і пра палітычнае прадстаўніцтва ў асобе Рады БНР.

У першым пункце адзначалася, што беларусы (White Russians) налічвалі каля 6 млн у 1914 г.; цесна звязаныя з велікарусамі і маюць слабую ці ўвогуле не маюць нацыянальнай свядомасці. Яны непісьменныя і адсталыя, пераважна праваслаўныя з пэўнай часткай рыма-каталікоў. Яны насяляюць Мінскую, Магілёўскую, Віцебскую, большую частку Смаленскай, паўночную частку Чарнігаўскай і ўсходнія часткі Гродзенскай і Віленскай губерняў, на якія таксама прэтэндуюць палякі і літоўцы.

[574] TNA. Foreign Office 371–3729. The Director of Military Intelligence (War Office) to the Under Secretary of State for Foreign Affairs 09.11.1918. Minutes.

У Белай Русі вельмі шмат яўрэяў, якія кантралююць гандаль; большасць землеўласнікаў складаюць палякі, за выключэннем Смаленскай губерні[575].

У другім пункце гаворка ішла пра палітычнае прадстаўніцтва краю. Беларуская Рада была выбрана летам 1917 г. (мелася на ўвазе Цэнтральная рада беларускіх арганізацый, створаная ў ліпені 1917 г., пазней пераўтвораная ў Вялікую Беларускую раду), але ў лістападзе бальшавікі ўсталявалі «Беларуска-расійскі савет», які меў вельмі мала прыхільнікаў (меўся на ўвазе Савет народных камісараў Заходняй вобласці і фронту). Падчас брэст-літоўскіх перагавораў немцы ажыццявілі жорсткую інтэрвенцыю і пасля поўнай акупацыі краіны «прызналі і аднавілі Раду». Недзе ў канцы сакавіка 1918 г. апошняя абвясціла незалежнасць Беларускай рэспублікі, якая беспаспяхова шукала прызнання ў Германіі. Краіна знаходзіцца цалкам пад нямецкім кантролем, але з пачаткам вываду нямецкіх войскаў з'явіліся частыя паведамленні аб забойствах бальшавікамі ў раёнах, якія пакідаюць немцы[576]. У трэцім пункце, як адзначалася, гаворка ішла пра небяспеку для палякаў у сувязі з вывадам нямецкіх войскаў.

Можна заўважыць, што ў другім пункце мемарандума ёсць супярэчнасці адносна прызнання Рады БНР Германіяй. Сцвярджэнне аб тым, што немцы прызналі і аднавілі Раду БНР, не адпавядае рэчаіснасці. Як вядома, яна дзейнічала паўлегальна пры бальшавіках і аднавіла сваю дзейнасць да прыходу немцаў у Мінск. Нямецкія акупацыйныя ўлады пры ўваходзе ў горад абышліся з урадам БНР як з урадам варожай дзяржавы: з будынка Народнага сакратарыята сарвалі беларускі нацыянальны сцяг і на яго месца ўсталявалі нямецкі, канфіскавалі касу, зрабіўшы немагчымай далейшую дзейнасць гэтага органа. Толькі перадыслакаваны ў Мінск у маі 1918 г. штаб 10-й арміі пашырыў правы Рады і ўрада БНР, перадаўшы ў іх кампетэнцыю мясцовыя справы, якія, аднак, можна было вырашаць толькі разам з акупацыйнымі ўладамі[577]. Пра тое, што Германія прызнала літоўскую палітычную ўладу ў Вільні і не прызнала беларускую ў Мінску, пісаў і Д. Дынглі[578]. Што датычылася беспаспяховых спроб БНР прызнання з боку нямецкага ўрада, то яны сапраўды ні да чаго не прывялі.

У красавіку 1919 г. кіраўнік брытанскай місіі ў балтыйскіх дзяржавах Г. Грант Ватсон падрыхтаваў даклад для Форын офіса «Аб памежных

---

[575] TNA. Foreign Office 371–3729. The Director of Military Intelligence (War Office) to the Under Secretary of State for Foreign Affairs 09.11.1918.

[576] Ibidem.

[577] *Туронак Ю.* Мадэрная гісторыя Беларусі. Вільня, 2006. С. 69–71, 524–527 ; Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. С. 268.

[578] *Dingley J.* Op. cit. P. 16.

прэтэнзіях і адносінах паміж Літвой і суседнімі нацыямі», атрыманы ў Лондане 13 мая[579]. У навуковы зварот гэты немалы па памерах дакумент (20 маш. стар.) увёў Д. Дынглі[580], а яго змест даволі падрабязна прааналізаваны Д. Міхалюк[581]. Звернем увагу на найбольш важныя моманты, звязаныя з Беларуссю і літоўска-беларускімі адносінамі, якія адлюстраваныя ў раздзеле «Літоўцы і беларусы, беларускія нацыянальныя мэты».

Характарызуючы літоўскія памежныя патрабаванні, Грант Ватсон падкрэслівае, што мэтай літоўскіх палітыкаў з'яўляецца стварэнне дзяржавы, якая будзе складацца з літоўцаў і шматлікіх, аднак не ўсіх, рутэнаў, ці беларусаў. У гэтай дзяржаве літоўцы павінны заставацца ў большасці. Калі ў яе склад увойдуць Гродзенская і беларускія паветы Віленскай губерні, агульная колькасць жыхароў будзе складаць каля трох мільёнаў літоўцаў і двух мільёнаў беларусаў. Аднак літоўцы не жадаюць уключаць у сваю дзяржаву ўсю Мінскую губерню, паколькі тады большасць у новай дзяржаве склалі б беларусы. Больш за тое, літоўцы заклапочаны тым, каб не падпасці пад славянскі ўплыў, які ўжо адчуваюць беларусы ў Мінскай губерні. Гэты ўплыў яшчэ больш моцны ў Магілёўскай, Віцебскай і заходніх паветах Смаленскай губерняў, беларускае насельніцтва якіх русіфікавана, таму літоўцы супраціўляліся б іх уключэнню ў сваю дзяржаву[582].

Прапанаваная літоўцамі ўсходняя мяжа Літвы праходзіла б праз паветы, насельніцтва якіх размаўляе па-літоўску, па-польску і па-беларуску і дзе розныя нацыянальнасці так перамешаны, што этнаграфічная мяжа не магла быць вызначана. Зыходзячы з гэтага, гаварылася ў дакладзе, літоўскія патрабаванні наконт мяжы маглі мець толькі часовы характар, паколькі будучыня беларусаў застаецца няяснай. Але несумненна, што паміж літоўцамі і беларусамі павінна быць узаемаразуменне, а мяжа можа быць канчаткова вызначана дружалюбным пагадненнем паміж двума народамі[583].

Грант Ватсон ацэньваў колькасць беларусаў у восем мільёнаў чалавек, уключаючы два мільёны каталікоў. Беларусы вельмі цесна звязаны з велікарусамі і ўкраінцамі, асабліва сялянскае насельніцтва Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў. Значна больш моцныя нацыянальныя прыкметы маюць Мінская і беларускія паветы (асабліва

[579] TNA. Foreign Office 371–3937. Reports on frontier claims and relations between Lithuania and frontier nations. 13.05.1919. P. 430–450.

[580] *Dingley J.* Op. cit. P. 17.

[581] *Michaluk D.* Op. cit. S. 41–47.

[582] TNA. Foreign Office 371–3937. P. 430–431.

[583] Ibid. P. 434.

Дзісненскі і Вілейскі) Віленскай губерняў. Сялянства ў Белай Русі больш непісьменнае і менш нацыянальна свядомае, чым у Літве. «Літоўцы разглядаюць беларусаў як вельмі аморфны народ без дакладных нацыянальных прыкмет і без дакладных нацыянальных меж», — гаварылася ў дакладзе[584]. Яны таксама ненавідзяць палякаў, якія хочуць іх паланізаваць, аднак літоўцы не маюць ніякага антаганізму да беларусаў, паколькі апошнія ніколі не спрабавалі перашкодзіць іх нацыянальнаму развіццю. Таму абедзве краіны жадаюць супрацоўнічаць у ажыццяўленні сваіх нацыянальных мэт, і тут аўтар даклада не бачыў цяжкасцей у будучых літоўска-беларускіх узаемаадносінах, з якімі яны вельмі хутка сутыкнуліся.

У дакладзе гаварылася пра дзве палітычныя групоўкі ў нацыянальным руху, якія па-рознаму прадстаўлялі стварэнне беларускай дзяржавы. Першая атаясамлівалася з Усебеларускім з'ездам і створанай на яго аснове Радай БНР, якая выступала за аб'яднанне ўсіх беларускіх зямель у складзе беларускай дзяржавы. Другая, прадстаўленая Гродзенскай управай, выбранай у снежні 1918 г., выступала за часовы саюз Гродзенскай губерні з Літвой, каб аддзяліць беларускія тэрыторыі ад бальшавікоў і палякаў; пазней прадугледжвалася вяртанне Гродзенскай губерні ў склад Беларускай рэспублікі. Палітычныя падзеі апісваліся да пачатку 1919 г., калі дэлегацыя БНР рыхтавалася да паездкі на Парыжскую мірную канферэнцыю[585]. Асобнымі раздзеламі ў дакладзе вылучаліся пытанні «Беларусы і Гродна», «Літоўцы і яўрэі», «Літва і Гродна»[586].

Даклад Грант Ватсона выклікаў інтарэс у супрацоўнікаў дэпартаментаў Форын офіса, якія займаліся расійскімі справамі, аб чым гавораць тры заключэнні. У адным з іх адзначалася, што ён вельмі цікавы, паколькі абмяркоўвае памежныя праблемы Латвіі, Літвы, Белай Русі, Польшчы і Германіі, з якімі яны будуць сутыкацца і ў будучыні[587]. З разгорнутым заключэннем выступіў Нам'ер, які ацаніў даклад як «найбольш цэннае апісанне цяперашняй палітычнай сітуацыі ў Літве і Белай Русі». Разам з тым ён раіў аўтару палепшыць яго ў адной частцы — адносінах беларусаў да Расіі, паколькі той падыходзіў да праблемы амаль выключна з сепаратысцкага пункту гледжання, пакідаючы беларусаў пад моцным расійскім уплывам. Аднак сур'ёзны аналіз матэрыялаў, якія змяшчаюцца ў дакладзе, паказвае, што ўсе беларусы жадаюць: 1) каб Белая Русь засталася адзінай і 2) каб яе значная частка засталася пад славянскім

[584] TNA. Foreign Office 371–3937. P. 440.
[585] Ibid. P. 440–444.
[586] Ibid. P. 443–450.
[587] Ibid. Minutes. P. 427.

уплывам, г. зн. што яны хочуць канчаткова застацца ў федэратыўнай Расіі. Брытанская палітыка адносна балтыйскіх правінцый прыдатная і да большай часткі Белай Русі. Аднак найбольш пякучай праблемай Нам'ер, які не адчуваў сімпатый да палякаў, лічыў прадухіленне іх празмерных прэтэнзій да новых краін, якія ніхто не жадаў апраўдваць[588].

Ацэньваючы даклад Грант Ватсона, трэба пагадзіцца з думкай Д. Міхалюк, што яго аўтар падае праблему вызначэння меж Літвы з суседнімі народамі з літоўскіх пазіцый[589]. Гэта, напэўна, можна растлумачыць тым, што пры напісанні даклада выкарыстоўваліся пераважна літоўскія матэрыялы. Беларускіх жа крыніц, літаратуры і дакументаў БНР, верагодна, не хапала. Вайскова-дыпламатычная місія БНР у Латвіі і Эстоніі яшчэ не пачала сваю дзейнасць, а кантакты яе шэфа Канстанціна Езавітава з Грант Ватсонам усталяваліся толькі ў канцы 1919 г. У дакладзе не гаворыцца пра пазіцыю БНР, хоць яе канцэпцыя меж Беларусі была сфармулявана ўжо ў пачатку 1919 г. Праўда, аналітычных распрацовак па памежных пытаннях і адносінах Беларусі з суседзямі дзеячы БНР не стварылі, і гэтыя пытанні падаваліся ў агульным плане ў мемарандумах да замежных дзяржаў і Парыжскай мірнай канферэнцыі. Карыстаючыся дэфіцытам інфармацыі пра Беларусь і амаль поўным няведаннем гэтай краіны сярод дзяржаў Антанты, якія тварылі новы міжнародны парадак у Еўропе, вобраз Беларусі і беларусаў у выгадным для сябе святле фармавалі і падавалі літоўцы, палякі і прыхільнікі манархічнай Расіі.

Трэцім інфармацыйна-даведачным дакументам Форын офіса, у якім важнае месца надавалася Беларусі, быў даведнік «Руская Польшча, Літва і Белая Русь», падрыхтаваны гістарычнай секцыяй брытанскага МЗС у красавіку 1919 г. і выдадзены ў 1920 г. асобнай брашурай пад нумарам 44 у серыі матэрыялаў да мірнай канферэнцыі[590]. Усяго выйшла 162 даведнікі, кожны з якіх звычайна змяшчаў інфармацыю аб фізічнай і палітычнай геаграфіі адпаведнага рэгіёна, дзяржаве ці краю: яе пазіцыі і межах, паверхні і воднай сістэме, клімаце, санітарных умовах, складзе насельніцтва, нацыянальнасці і мове, палітычнай гісторыі, сацыяльных і палітычных умовах, прамысловасці, унутраным і знешнім гандлі, транспарце і фінансах.

Польшчы і звязаным з ёй тэрыторыям былі прысвечаны чатыры кнігі (№ 43–46), змест якіх уважліва прааналізаваў Віктар Сукеніцкі і знайшоў там шэраг недакладнасцей, у тым ліку сцвярджэнне аб

[588] TNA. Foreign Office 371–3937. P. 429.

[589] *Michaluk D.* Op. cit. S. 42.

[590] Ю. Весялкоўскі памылкова датуе выпуск даведніка 1917 годам: *Весялкоўскі Ю.* Пазнач. тв. С. 240.

тым, што нібыта Гродзенская, Ковенская і Курляндская губерні былі часткай уласна Польшчы. Пасля публікацыі даведніка пра Украіну Украінская дыпламатычная місія ў Англіі паслала 20 ліпеня 1920 г. ліст у гістарычную секцыю Форын офіса, дзе гаварылася, што шматлікія сцвярджэнні ў даведніку не адпавядаюць фактам[591].

Змест кнігі «Руская Польшча, Літва і Белая Русь» з пункту гледжання беларускай тэматыкі каратка прааналізаваны А. Дуброўкай[592]. Белая Русь разглядаецца ў працы як край, геаграфічна і гістарычна звязаны з Літвой, але гэта не азначае, папярэджвалі аўтары ў прадмове на адваротным баку тытульнага ліста, што была неабходнасць уключыць інфармацыю пра яе ў раздзел пра эканамічныя ўмовы развіцця Літвы[593]. Аўтары даведніка невядомыя, аднак сярод іх, напэўна, быў Нам’ер, што адчуваецца ў жорсткай пазіцыі наконт польскіх тэрытарыяльных прэтэнзій на былыя землі Рэчы Паспалітай. Таксама тут праглядаецца ўплыў даклада Грант Ватсона ці матэрыялаў, якімі ён карыстаўся, паколькі яго даклад, як адзначалася, паступіў у Форын офіс у маі 1919 г.

Праца падзяляе тэрыторыю былога ВКЛ на этнічную Літву (Ковенская і паўночна-заходняя частка Віленскай губерняў) і Белую Русь (Гродзенская, Віцебская, Мінская, Магілёўская і паўднёва-ўсходняя частка Віленскай губерняў), якая характарызавалася як край са славянскім насельніцтвам[594]. Аднак у другім месцы пры апісанні становішча вакол усходняй мяжы Польшчы эксперты вылучалі губерні «беларускія» (Віцебская, Мінская, Магілёўская) і «літоўскія» (Гродзенская, Віленская і Ковенская)[595]. Гродзенская губерня з парушэннем этнаграфічнага прынцыпу на карысць геапалітычнага перадавалася літоўскай дзяржаве. Пры характарыстыцы насельніцтва беларусы адносіліся да рускай нацыі і зноў паўтаралася пра іх «адсталасць і беднасць»[596]. Гаварылася пра блізкасць беларускай, маларускай і рускай моў і падкрэслівалася, што кожны, хто ведае рускую ці маларускую мову, «лёгка зразумее любую форму беларускай»[597].

Белая Русь характарызавалася экспертамі гістарычнай секцыі Форын офіса як краіна ці, хутчэй, тэрыторыя, блізка звязаная ці нават

---

[591] *Sukiennicki W.* East Central Europe during World War I: from foreign domination to national independence : in 2 vol. New York, 1984. Vol. 2. P. 1186–1187.

[592] *Дубровко Е. Н.* Английские проекты для «Белой Руси». С. 95–96.

[593] TNA. Foreign Office 373/3/8. Vol. VIII: Poland and Finland. № 44: Russian Poland, Lithuania and White Russia. London, 1920. 144 p.

[594] Ibid. P. 40.

[595] Ibid. P. 12.

[596] Ibid. P. 19.

[597] Ibid. P. 24.

прывязаная да Расіі. Гэта пацвярджае наступны сказ: «Беларусы – народ, які па прыкметах нацыі, мовы і (ва ўсходніх губернях) рэлігіі больш шчыльна звязаны з іншымі галінамі рускай нацыі, чым з палякамі ці літоўцамі»[598]. Гэты пастулат не супярэчыў культурна-цывілізацыйнай рэчаіснасці ўсходнееўрапейскага рэгіёна пачатку XX ст., аддаючы Беларусь пад уплыў Расіі, хоць ў 1919 г. яшчэ не было ясна, які колер (чырвоны ці белы) возьме верх у Маскве. Адначасова гэты тэзіс абмяжоўваў польскія тэрытарыяльныя прэтэнзіі на беларускія землі як частку тэрыторыі гістарычнай Літвы, якія непазбежна цягнуліся да Расіі. Адсюль рабілася слушная выснова аб тым, што валоданне палякамі беларускімі землямі будзе пастаяннай пагрозай міру ў Польшчы і ўсёй Еўропе[599]. Трэба меркаваць, што калі змест гэтага даведніка стаў бы вядомы прадстаўнікам БНР, яны, напэўна, адрэагавалі б лістом, падобным да ўкраінскага.

У той час вядучыя брытанскія палітыкі і дыпламаты – прэм'ер-міністр Лойд Джорж, міністры замежных спраў Бальфур і Керзан, кіраўнік Паўночнага дэпартамента Форын офіса Джон Грэгары – эксперт Нам'ер, як і іншыя, выступалі супраць дамаганняў Польшчы на «ўсходнія крэсы», падкрэсліваючы небяспеку геапалітычных ціскоў для яе ў знаходжанні паміж Расіяй і Германіяй[600]. Член польскай дэлегацыі на Парыжскай мірнай канферэнцыі Тытус Філіповіч 13 красавіка 1919 г. пісаў прэм'ер-міністру Ігнацыю Падарэўскаму аб тым, што ў Форын офісе непрыхільна настроены да плана ўтварэння вялікай Польшчы і патрабуюць яе абмежавання этнаграфічнай тэрыторыяй. Пры тым англічане пацвердзілі сваю пазіцыю адносна Белай Русі: «Гэта тая ж самая White Russia – а значыць, Расія мае першае права як на сваю этнаграфічную тэрыторыю»[601].

На мірнай канферэнцыі Камісія па польскіх справах на чале з французскім дыпламатам Жулем Камбонам (Jules Cambon) прапанавала 22 красавіка 1919 г. праект польскай усходняй мяжы, які базіраваўся

[598] TNA. Foreign Office 373/3/8. Vol. VIII : Poland and Finland. № 44 : Russian Poland, Lithuania and White Russia. London, 1920. P. 60.

[599] Ibidem.

[600] Гл. падрабязней: *Piszczowski T.* Anglia a Polska 1914–1939 w świetlie dokumentów brytyjskich. Londyn, 1975 ; *Sukiennicki W.* Op. cit. Vol. 2. P. 877–925 ; *Весялкоўскі Ю.* Пазнач. твор. С. 159–161, 221 і інш.

[601] Archiwum polityczne Ignacego Paderewskiego. T. II : 1919–1921 / oprac. W. Stankiewicz, A. Piber. Warszawa, 1974. S. 93–94 ; на белар. мове: Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў ... Т. 1 : у 2 ч. Ч. 1 : 1 жніўня 1914 – 31 снежня 1919 г. / склад.: А. Ф. Вялікі [і інш.]. Дак. № 220: З рапарта Т. Філіповіча польскаму ўраду аб непрыхільным стаўленні Англіі да прызнання за Польшчай тэрыторый за Бугам. 2008. С. 270–271.

на этнаграфічным прынцыпе, выключаючы Гродна і Брэст са складу Польшчы[602]. У склад камісіі, дарэчы, уваходзіў кіраўнік Дэпартамента палітычнай разведкі Форын офіса Уільям Тырэл (William Tyrrell). 8 снежня 1919 г. гэтая прапанова была пацверджана Вярхоўным саветам Антанты, які прыняў рашэнне аб часовай усходняй мяжы польскай дзяржавы, пакідаючы канчатковае яе ўстанаўленне да стварэння стабільнага расійскага ўрада[603]. Лінія Камбона легла ў аснову лініі Керзана, якую 11 ліпеня 1920 г. міністр замежных спраў Вялікабрытаніі прапанаваў у якасці лініі перамір'я паміж польскімі і савецкімі войскамі: яна праходзіла па лініі Гродна – Ялаўка – Няміраў –Брэст-Літоўск – Дарагуск – Усцілуг, на ўсход ад Грубяшова, праз Крылоў і далей на захад ад Равы-Рускай, на ўсход ад Перамышля да Карпат[604]. Такім чынам французская і англійская дыпламатыя мелі непасрэднае дачыненне да вызначэння мяжы Польшчы з суседнімі дзяржавамі на ўсходзе (Літвой, Беларуссю і Украінай), якая з пэўнымі мадыфікацыямі дайшла да нашых дзён.

Агляд інфармацыйна-даведачных прац англійскіх дыпламатаў і гісторыкаў пра Беларусь завершым фундаментальным, шасцітомным выданнем аб Парыжскай мірнай канферэнцыі пад рэдакцыяй вядомага гісторыка і супрацоўніка Дэпартамента ваеннай інфармацыі Гаральда Тэмперлея. У шостым, апошнім, томе, апублікаваным у 1924 г., у главе «Аднаўленне Польшчы» змяшчаюцца цікавыя назіранні і ацэнкі па пытаннях польскай усходняй палітыкі, яе ўсходніх меж, адносін да польскіх тэрытарыяльных патрабаванняў з боку Вялікабрытаніі, Расіі, Літвы, Украіны і Беларусі.

Беларусам у працы прысвечаны два абзацы. У першым даецца агульная характарыстыка гэтаму народу: «Беларусы – нацыя, якая пражывае на тэрыторыі паміж Літвой на поўначы і прыпяцкімі балотамі на поўдні, колькасцю прыкладна ў 6 000 000. Гэтая тэрыторыя распасціраецца ад меж этнаграфічнай Польшчы да ўсходняй мяжы Польшчы ад 1772 года. Беларусы – найбольш адсталыя і неразвітыя з усіх славянскіх народаў. На захадзе – гэта каталікі, на ўсходзе – праваслаўныя. Менавіта

[602] Sprawy polskie na Konferencji Pokojowej w Paryżu w 1919 r. Dokumenty i materiały. T. 1. Warszawa, 1965. S. 157–163 ; на белар. мове: Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў ... Т. 1. Ч. 1. Дак. № 224: Справаздача № 2 Камісіі па польскіх справах Парыжскай мірнай канферэнцыі па пытанні ўсходняй мяжы Польшчы. С. 279–283.

[603] Документы и материалы по истории советско-польских отношений. Т. 2 : Ноябрь 1918 г. – апрель 1920 г. / подгот. С. Вроньский [и др.]. М., 1964. С. 431–432.

[604] Документы внешней политики СССР. Т. 3.

на гэтае каталіцкае насельніцтва заходніх раёнаў прэтэндуюць палякі, аргументуючы свае дамаганні падабенствам рэлігіі і, як сцвярджаецца, мовы»[605].

У другім абзацы гаворка ідзе аб прэтэнзіях палякаў на вузкую паласу тэрыторыі з польскамоўным насельніцтвам, якая ішла ад польскай этнаграфічнай мяжы да Вільні. Наяўнасць такой тэрыторыі цалкам абвяргаецца расійскім перапісам 1897 г., але ў некаторай ступені пацвярджаецца няпоўным перапісам, праведзеным у перыяд нямецкай акупацыі. На думку аўтараў (верагодна, супрацоўнікаў гістарычнай секцыі Форын офіса), нават калі такая вобласць існуе, выклікае сумненне пытанне, ці з'яўляецца яе геаграфічнае становішча зручным для таго, каб апраўдаць яе далучэнне да польскіх тэрыторый[606]. Адказ відавочны: сур'ёзных падстаў у Польшчы для далучэння гэтай паласы няма. Аўтары пісалі, што Вялікабрытанія стала адзінай дзяржавай, якая супрацьстаяла польскім дамаганням на суседнія тэрыторыі на ўсходзе. Калі б Польшча атрымала вялікую колькасць літоўцаў, беларусаў і ўкраінцаў, то гэта зменшыла б яе палітычную эфектыўнасць, ператварыла б дзяржаву ў другую Аўстрыйскую імперыю, а таксама стварыла б пагрозу новага, канчатковага падзелу Польшчы паміж Расіяй і Германіяй[607].

У заключэнне агляду адзначым некалькі тэзісаў, якімі ў Лондане характарызавалі тагачасную Белую Русь і беларусаў. 1. Гэта адсталы і непісьменны народ. 2. Беларусы маюць слабую нацыянальную свядомасць, што прадвызначае іх слабы нацыянальны рух. 3. Яны знаходзяцца пад дамінуючым уплывам Расіі і фактычна з'яўляюцца часткай рускай нацыі. 4. Белая Русь таксама цесна звязана з Літвой, і перадача Гродзенскай губерні ў яе склад адпавядала б літоўскім і, у прынцыпе, брытанскім інтарэсам. 5. Вялікабрытанія не падтрымлівае польскіх тэрытарыяльных дамаганняў на беларускія землі. 6. Перспектывы стварэння беларускай дзяржавы вельмі цьмяныя, а існуючая форма палітычнага прадстаўніцтва ў выглядзе абвешчанай БНР падаецца невыразнай і падазронай, паколькі яе Рада была залежная ад Германіі.

---

605 A History of the Peace Conference of Paris / ed. by H.W.V. Temperley. Vol. VI. London, 1924. P. 279 ; на белар. мове: Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў ... Т. 1. Ч. 2 : 3 студзеня 1920 – 18 сакавіка 1921 г. / склад.: А. Ф. Вялікі [і інш.]. Мінск, 2008. Дак. № 579: Англійскі гісторык Г. Тэмперлей аб Польшчы і яе ўсходніх суседзях у кантэксце абмеркавання гэтых пытанняў на Парыжскай мірнай канферэнцыі. С. 282.

606 A History of the Peace Conference of Paris. Vol. VI. P. 239–241.

607 Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў ... Т. 1. Ч. 2. С. 280–281.

Звярнем увагу, што прааналізаваныя вышэй працы, за выключэннем кнігі пад рэдакцыяй Тэмперлея, напісаны ў канцы 1918 – першай палове 1919 г., калі БНР яшчэ не паспела як след разгарнуць сваю дыпламатычную актыўнасць, таму ў Лондане пра яе ведалі вельмі слаба. У наступныя год-паўтара гэтая актыўнасць павысілася, а беларуска-брытанскія кантакты дзякуючы Вайскова-дыпламатычнай місіі БНР пры ўрадах Латвіі і Эстоніі набылі больш-менш рэгулярны характар.

З паданых вышэй тэзісаў спынімся на першым, «знакавым» сцвярджэнні пра беларусаў, што яны адсталы і непісьменны народ. Яно, як бачым, было некрытычна запазычана англійскімі дыпламатамі, разведчыкамі, гісторыкамі і публіцыстамі з тагачаснай навуковай літаратуры і публіцыстыкі, перш за ўсё расійскай і польскай. Свой уклад у стварэнне такога непрывабнага вобраза суайчыннікаў унеслі (канешне, не жадаючы таго) беларускія паэты і пісьменнікі, іншыя дзеячы нацыянальнага адраджэння і культуры. Міф ці паўміф аб непісьменным беларускім народзе, які знаходзіўся ў такім стане перад Кастрычніцкай рэвалюцыяй, актыўна выкарыстоўвала савецкая гістарыяграфія. Ён быў падважаны ў 1968 г. вядомым беларускім і расійскім гісторыкам Міколам Улашчыкам[608], а ў 1990-я гг. абвергнуты беларускімі даследчыкамі па гісторыі адукацыі і педагагічнай думкі[609]. Паводле даследаванняў Паўла Церашковіча, сярод народаў Заходняй Расіі, што імкнуліся да незалежнасці (беларусаў, украінцаў, літоўцаў, латышоў і эстонцаў), па ўзроўні пісьменнасці беларусы пераўзыходзілі толькі ўкраінцаў, аднак адставалі ад іх па ўзроўні развіцця палітычна актыўных сацыяльных груп, што сярод іншага праявілася ў адставанні палітычнай кансалідацыі беларускага нацыянальнага руху ад украінскага, літоўскага і латышскага[610].

**Брытанскі ўрад і прызнанне БНР.** Пасля абвяшчэння незалежнасці БНР перад яе кіруючымі органамі паўстала праблема міжнароднага прызнання. Вызначальную ролю ў гэтым адыгрывалі дзяржавы Антанты. Як вядома, Рада і ўрад БНР неаднаразова звярталіся да замежных

---

[608] *Улащик Н. Н.* Грамотность в дореволюционной Белоруссии // История СССР. 1968. № 1. С. 106–116.

[609] *Снапкоўская С. В.* Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. Мінск, 1998. С. 12, 17, 25–26 ; *Яе ж.* Развитие образования и педагогической мысли Беларуси: вторая половина XIX – начало XX в. М., 2011. С. 122–126 ; Гл. таксама: *Міхалюк Д.* Беларуская Народная Рэспубліка ... С. 36–38.

[610] *Терешкович П. В.* Этническая история Беларуси XIX – начала XX в.: В контексте Центрально-Восточной Европы. Минск, 2004. С. 195–198.

дзяржаў, асабліва такіх уплывовых, як Вялікабрытанія, з просьбай аб прызнанні. Пазіцыя брытанскага ўрада па гэтым пытанні была негатыўнай, чаго, у прынцыпе, трэба было чакаць, улічваючы яго адносіны да БНР. Цяпер разгледзім гэтае пытанне адмыслова на прыкладзе стаўлення Лондана да прызнання БНР з боку Фінляндыі.

Калі англійскаму паслу ў Гельсінгфорсе (сучасны – Хельсінкі) лорду А. Актону стала вядома пра тое, што Фінляндыя прызнала ўрад Белай Русі дэ-факта як урад дзяржавы, ён быў гэтым непрыемна ўражаны. 17 снежня 1919 г. Актон паведамляў у Лондан: «Гэта, канешне, урад Мінска, які зараз называе сябе Заходнерускай Рэспублікай. Калі ў мінулым годзе я прымаў у Берне дэлегацыю Часовага ўрада гэтай дзяржавы на чале з князем Радзівілам і Скірмунтам, ні ў кога з іх не было і следу рэспубліканскіх сімпатый»[611]. Брытанскі пасол прасіў міністра замежных спраў Д. Керзана растлумачыць, якая трансфармацыя адбылася з рэжымам у Мінску. Ён казаў пра прадстаўніка БНР у Балтыйскіх дзяржавах К. Душэўскага, які, верагодна, ужо быў прыняты фінскім урадам як прадстаўнік дэ-факта. Актон таксама выказваў разуменне таго, што мінскі ўрад у асноўным абапіраецца на «палонафільскіх рутэнаў»[612]. Тэкст гэтай тэлеграмы, як і іншых, звязаных з прызнаннем БНР і ўвогуле з Беларуссю, быў дасланы і ў Варшаву, паколькі за справай прызнання БНР вельмі раўніва сачыла Польшча.

Кароткі змест тэлеграмы быў сфармуляваны ў Паўночным дэпартаменце Форын офіса наступнымі сказамі: Расійскі ўрад у Мінску; Паўафіцыйная заява аб прызнанні Фінляндыяй [урада БНР]; Просьба інфармаваць аб зменах у мінскім рэжыме. Тэлеграма выклікала шэраг заўваг (minutes) брытанскіх дыпламатаў, якія казалі пра тое, што ў Лондане не атрымалі ніякай інфармацыі аб «Беларускай рэспубліцы», што гэта, несумненна, палякі ўсталявалі свой урад у Мінску на антырасійскім базісе і што шэраг яго сяброў выпадкова абскарджаны ў выніку польскіх эксцэсаў[613]. Тут меліся на ўвазе нядаўні раскол Рады БНР і арышт польскімі ўладамі некалькіх сяброў урада В. Ластоўскага.

31 снежня 1919 г. паверааны ў справах Польшчы ў Гельсінгфорсе Мікалай Самсон-Хімельштэрн паведамляў свайму МЗС у спецыяльным рапарце па пытанні прызнання беларускага ўрада, што «Фінляндыя прызнала дэ-факта беларускі ўрад з сядзібай у Мінску на чале з прэм'ерам Пралуцкім (меўся на ўвазе Ластоўскі. – *У. С.*) і міністрам замежных спраў

[611] TNA. FO 371/4044. Telegram of lord Acton to FO 17.12.1919. P. 157.
[612] Ibidem.
[613] Ibid. Minutes. P. 156 and revers.

Лучынскім (меўся на ўвазе Ладноў. – *У. С.*) у Парыжы». Калі польскі дыпламат звярнуўся з запытам да намесніка дзяржаўнага сакратара МЗС Фінляндыі Тойво Кайлы (Toivo Torsten Kailo), той адказаў, што адбылося непаразуменне. Прызнанне стала вынікам вялікай спешкі і адбылося без узгаднення з уплывовымі дзяржавамі, да якіх, напэўна, адносілася пазіцыя Вялікабрытаніі. Фінскі дыпламат прасіў польскага калегу, каб той паведаміў ураду сваёй краіны, што гэты акт ніякім чынам не накіраваны супраць Польшчы, і запэўніў яго, што ён не будзе мець ніякіх канкрэтных наступстваў. Як доказ гэтага Кайла паведаміў, што прызначаны беларускім урадам дыпламатычны прадстаўнік (К. Душэўскі) быў вымушаны пакінуць краіну і што ўвогуле фінскі ўрад не пагаджаецца на нейкае прадстаўніцтва БНР на тэрыторыі Фінляндыі. Самсон-Хімельштэрн казаў і пра тое, што калі К. Душэўскі звярнуўся да прадстаўніка польскага МЗС пры ўрадах Эстоніі і Латвіі Браніслава Боўфала з просьбай аб візіраванні беларускіх пашпартоў, яму ў гэтым было адмоўлена без спецыяльнага дазволу польскага ўрада. У тэлеграме адзначалася, што гэта не першы выпадак недарэчных паводзін фінскага ўрада[614].

13 студзеня 1920 г. лорд Актон паведамляў у Форын офіс, што польскі прадстаўнік у Фінляндыі (меўся на ўвазе паверанам у справах Самсон-Хімельштэрн) падчас сустрэчы з міністрам замежных спраў Рудольфам Холсці растлумачыў, што «няма такіх рэчаў, як Беларуская, Заходнеруская ці Мінская рэспублікі; Мінск зараз акупаваны і ўпраўляецца палякамі»[615]. Холсці адказаў, што прызнанне гэтай рэспублікі адбылося ў выніку памылкі фінскага прэм'ер-міністра, які прыняў Душэўскага і вёў з ім перагаворы. Аднак цяпер ён пастараўся б адмовіцца ад прызнання[616]. Кароткі змест тэлеграмы быў пераказаны ў Паўночным дэпартаменце сказам, што прызнанне БНР Фінскай рэспублікай з'яўляецца памылкай, а ў заўвагах супрацоўнікаў дэпартамента прасочвалася думка, што прызнанне цяжка адмяніць і невядома, якім чынам саюзнікі падтрымаюць Холсці ў гэтых яго планах[617]. Як вядома, афіцыйнай адмовы ўрада Фінляндыі ад прызнання БНР не адбылося, але К. Ду-

[614] Raport chargé d'affaires RP w Helsinkach Mikołaja Samsona-Himmelstjerny do Ministerstwa Spraw Zagranicznych RP w kwestiach białoruskich // Archiwum Instytutu Józefa Piłsudskiego w Ameryce, Adiutantura Generalna Naczelnego Wodza, t. 701/2/31, k. 346–347. Апубл.: Węzel polsko-białoruski. Dok. 216. S. 363–363.

[615] TNA. FO 371/4044. Telegram of lord Acton to FO 13.01.1920. P. 163.

[616] Ibidem.

[617] Ibid. Minutes. P. 162.

шэўскі быў вымушаны пакінуць краіну, а фінскі ўрад адмовіўся прымаць прадстаўніцтва БНР.

Яшчэ адно пытанне, звязанае з прызнаннем БНР, было накіравана ў Лондан урадам Даніі. 1 красавіка 1920 г. дацкае прадстаўніцтва звярнулася з запытам у Форын офіс у сувязі з просьбай прадстаўніка БНР ў балтыйскіх дзяржавах (так называлі шэфа Вайскова-дыпламатычнай місіі БНР пры ўрадах Латвіі і Эстоніі К. Езавітава) у адрас урада Даніі аб прызнанні незалежнасці «Нацыянальнай Беларускай Рэспублікі» (так называлі БНР дацкія дыпламаты) і акрэдытацыі яе прадстаўніка з Капенгагена. У запыце ставіліся два пытанні: 1) Ці прызнаў урад Вялікабрытаніі дэ-факта Нацыянальную Беларускую Рэспубліку (National White Russian Republic)? 2) Ці мае гэтая рэспубліка прадстаўніка дэ-факта ў Лондане? Адказы супрацоўнікаў Форын офіса на пытанні былі наступныя. Першы напісаў: «1. Не прызнаў. 2. Я нічога не чуў пра т. зв. прадстаўніка». Другі: «Наколькі я ведаю, у нас тут няма ніякага прадстаўніка»[618].

13 красавіка намеснік міністра замежных спраў Вялікабрытаніі даў афіцыйны адказ дацкаму прадстаўніку ў Лондане Г. Гравенкоп-Кастэнскёльду, дзе гаварылася, што «Урад Яго Вялікасці не прызнаў ніякім чынам незалежнасць Нацыянальнай Беларускай Рэспублікі і не мае інфармацыі аб прысутнасці ў Лондане якога-небудзь яе прадстаўніка дэфакта, які б дзейнічаў ад яе імя»[619]. Праз некалькі дзён, 16 красавіка, МЗС Дацкага каралеўства накіравала ліст шэфу Вайскова-дыпламатычнай місіі БНР пры ўрадах Латвіі і Эстоніі К. Езавітаву ў адказ на яго ліст ад 20 студзеня, дзе гаварылася: «Па звычаю, да гэтага часу прынятаму ў Даніі ў адносінах да дзяржаў, міжнароднае становішча якіх яшчэ канчаткова не ўрэгулявана, Каралеўскі Урад шкадуе, што ён у гэты момант не можа зрабіць ніякіх крокаў да прызнання Беларускай Народнай Рэспублікі»[620]. Такім чынам, урад Даніі пасля атрымання інфармацыі з Лондана аб непрызнанні БНР і адсутнасці там яе афіцыйнага прадстаўніка адмовіўся прадпрымаць нейкія крокі да прызнання БНР.

7 студзеня 1920 г. прастаўнік урада БНР у Балтыйскіх дзяржавах К. Душэўскі і К. Езавітаў накіравалі мемарандум (на французскай мове) міністру замежных спраў Вялікабрытаніі Керзану, дзе змяшчаліся звесткі пра становішча Беларусі, яе ўзаемаадносіны з суседнімі дзяржавамі і планы федэрыравання з імі, а таксама просьба аб прызнанні

---

[618] TNA. FO 371/4044. Telegram of lord Acton to FO 13.01.1920. P. 212.

[619] Ibid. P. 215.

[620] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. С. 719. Цытата дадзена ў адпаведнасці з правіламі сучаснага беларускага правапісу.

БНР і ўключэнні Беларусі ў сферу англійскага ўплыву разам з дзяржавамі Балтыі[621]. Да дакумента прыкладаліся карта БНР, польская карта рассялення беларусаў, брашура М. Доўнар-Запольскага «Асновы дзяржаўнасці Беларусі» (на французскай мове)[622]. Ва ўваходным дакуменце Форын офіса пад назвай «Беларуская Рэспубліка. Мемарандум» змяшчалася пратакольная заўвага Гроншалка ад 27 студзеня «Гэтая рэспубліка не існуе, і мы не прызналі яе»[623].

**Лондан і спробы стварэння беларускага войска.** Між тым энергічны Езавітаў, кіруючыся дырэктывай урада Ластоўскага аб актывізацыі сувязей з дзяржавамі Антанты, працягваў дыпламатычны наступ на Лондан[624]. 20 студзеня ён накіраваў новы мемарандум брытанскаму міністру замежных спраў. У гэтым дакуменце з 12 пунктаў гаворка ішла аб падтрымцы Беларусі ўсімі неабходнымі сродкамі для працягу барацьбы з бальшавікамі, аказанні дапамогі беларускім вайсковым аддзелам у Літве і Эстоніі, і перш за ўсё аб стварэнні войска БНР у Марыенбургу (на тэрыторыі Латвіі) пад камандаваннем С. Булак-Балаховіча і аказанні яму тэрмінова ўсялякай дапамогі (узбраеннем, амуніцыяй, вопраткай і харчаваннем), якая магла б транспарціравацца праз Рыгу ці Лібаву[625]. Дакумент, верагодна, быў складзены спехам, аб чым сведчыць шэраг граматычных памылак, на што звярнулі ўвагу ў Лондане. У пратакольным запісе адзначана амаль поўнае няведанне адпраўцелем англійскай мовы[626]. Гэта таксама было раздражняльным фактарам, які разам з іншымі, несумненна, больш сур'ёзнымі прычынамі не садзейнічаў пазітыўнаму стаўленню англічан да настойлівых просьбаў дыпламатычных прадстаўнікоў яшчэ адной новаабвешчанай дзяржавы.

У снежні 1919 г. вялікую актыўнасць разгарнуў супрацоўнік Вайсковадыпламатычнай місіі БНР пры ўрадах Латвіі і Эстоніі генерал Алег Васількоўскі, які пачаў перагаворы з урадам Фінляндыі і прадстаўнікамі ваенных місій Антанты ў Прыбалтыцы, пераконваючы іх у неабходнасці прызнання незалежнасці Беларусі і дапамогі ў арганізацыі беларус-

---

[621] *Ціхаміраў А. В.* Беларусь у сістэме міжнародных адносін ... С. 213. Ён спасылаецца на дакумент з і адзначае, што падобны мемарандум быў накіраваны дзяржаўнаму сакратару ЗША Д. Лансінгу.

[622] TNA. FO 371/4044. A Son Excellence Monsieur le Ministre des Affairs Etranĝeres du Gouvernment Royale d'Angleterre. 07.01.1920. P. 178–184.

[623] Ibid. Minutes. P. 177.

[624] *Ціхаміраў А. В.* Беларусь у сістэме міжнародных адносін ... С. 210–213.

[625] TNA. FO 371/4044. P. 202–203 адв.

[626] Ibid. P. 201.

кай арміі[627]. 19 снежня латвійскі прадстаўнік у Хельсінках інфармаваў брытанскага ваеннага аташэ, што Васількоўскі, паводле яго ўласнай заявы, прызначаны Вярхоўным галоўнакамандуючым сіламі Беларускай, ці Мінскай, рэспублікі з усімі паўнамоцтвамі і жадае набіраць жаўнераў у сваю армію з тэрыторыі Латвіі. Ён таксама сцвярджаў, што генералы Эцівенд і Нісэль знаёмы з яго прапановай і разглядаюць Юдзеніча як рэакцыянера.

Ваенны аташэ правёў размову з Васількоўскім і высветліў, што той жадае прасіць дапамогі ў Антанты, а калі яна адмовіць, збіраецца звярнуцца да Германіі. Яго мэтай было павелічэнне арміі да 100 тыс. чалавек, каб адваяваць Беларусь, якая знаходзілася пад бальшавіцкім дамінаваннем. Васількоўскі пакінуў дрэннае ўражанне на латвійскага і польскага прадстаўнікоў у Хельсінкі, а брытанскі ваенны аташэ пісаў, што мае моцныя падазрэнні наконт яго здзелак з немцамі[628]. Кароткі змест тэлеграмы быў сфармуляваны ў Паўночным дэпартаменце Форын офіса наступным характэрным сказам: «План генерала Васількоўскага стварыць армію для атакі на Саветы», а заўвага неўстаноўленага супрацоўніка гэтага дэпартамента выказвала апасенні, што генерал зараз не шукае вялікай дапамогі ад Антанты[629]. Гэта магло б разглядацца як нейкі знак з боку Лондана для аказання такой дапамогі, аднак далейшая інфармацыя, сабраная брытанскай разведкай і дыпламатамі, была не на карысць Васількоўскаму.

Пасля высвятлення асобы падазронага генерала брытанскі пасол у Варшаве Румбальд 31 снежня 1919 г. інфармаваў Форын офіс, што ні І. Пілсудскі, ні польскае ваеннае міністэрства не ведаюць нічога пра стварэнне ўзброеных сіл у зоне «Белай (так у тэксце), ці Мінскай, рэспублікі». Ніхто з іх не чуў пра зашыфраванага (ці не падлягаючага расшыфроўцы) генерала Сілкоўскага (меўся на ўвазе Васількоўскі. – *У. С.*). Падчас нямецкай акупацыі Літвы палкоўнік Езавітаў спрабаваў стварыць нешта падобнае на беларускі ўрад, але справа не ўдалася. Канстатавалася, што польскае ваеннае міністэрства разглядае гэтыя спробы як нямецкую інтрыгу, а іх ініцыятараў – як авантурыстаў тыпу Бермонта[630]. Кароткі змест (subject) тэлеграмы быў сфармуляваны ў наступных тэзах: «Мінскі белы ўрад; Польскія ўлады не ведаюць аб існаванні нібыта ўзброеных сіл; Гэта нямецкая інтрыга»[631].

---

627 *Ціхаміраў А. В.* Беларусь у сістэме міжнародных адносін ... С. 211.
628 TNA. FO 371/4044. Telegram of lord Acton to FO 19.12.1919. P. 159.
629 Ibid. Minutes. P. 158.
630 Ibid. Telegram of Rumbold to FO 31.12.1919. P. 161.
631 Ibid. Minutes. P. 160.

Гэтая і іншая інфармацыя аб адносінах польскіх улад да БНР, пра якую яны нібыта нічога не ведалі, выклікала пытанні ў Лондане. 19 студзеня 1920 г. лорд Актан са здзіўленнем паведамляў у Форын офіс, што польскі ўрад адмаўляе ўсе звесткі пра «гэтую кволую арганізацыю» (мелася на ўвазе БНР), нягледзячы на той факт, што брытанскі ваенны аташэ ў Хельсінкі атрымаў інфармацыю з Лондана, паводле якой «Беларуская рэспубліка – гэта не што іншае, як польская арганізацыя, кіруемая з Варшавы дзеля таго, каб выклікаць раздражненне з боку Расіі»[632]. Васількоўскі, паводле звестак ад польскага пасланніка ў Гельсінгфорсе, перададзеных Актану, «не з'яўляецца беларусам, быў губернатарам Петраграда пры Керэнскім, а цяпер сцвярджае, што яго вайсковая экспедыцыя атрымала падтрымку саюзнікаў»[633].

У выніку далейшай распрацоўкі брытанскай разведкай і дыпламатыяй пытання пра БНР і яе ўзброеныя сілы з'явіўся першы ўрадавы даклад пра Беларусь. 20 студзеня 1920 г. шэф брытанскай ваеннай разведкі накіраваў у МЗС і Ваеннае міністэрства даклад, падрыхтаваны капітанам ваеннай разведкі брытанскай місіі ў Балтыйскіх дзяржавах Камдэнам, – «Нататка аб схемах удзелу Васількоўскага і Балаховіча ў стварэнні так званай Беларускай Рэспублікі» (Note on Schemes on the part of Vassilkovsky and Balachovich for the Formation of a so-called White Russian Republic)[634]. У ім гаварылася, што Беларуская, Беларутэнская ці Мінская Рэспубліка прэтэндуе на вялікую тэрыторыю на ўсход ад Дзвінска, аднак яна і яе ўрад «з'яўляюцца чыста тэарэтычнымі». Пра ўзнікненне БНР падавалася наступная інфармацыя. У пачатку расійскай рэвалюцыі 1917 г. Беларуская Рада сабралася ў Мінску і 17 снежня абвясціла Беларускую Народную Рэспубліку (White Russian Popular Republic). Склад яе ўрада, які не валодае ні ўладай, ні тэрыторыяй, невядомы. Сярод вядомых асоб згадваліся прозвішчы К. Душэўскага і К. Езавітава, пры гэтым заўважалася, што пра мінулае гэтых дзвюх асоб нічога невядома»[635]. Трэба адзначыць, што аўтар даклада памылкова звязваў заканчэнне Першага Усебеларускага з'езда з абвяшчэннем БНР, якое на самой справе адбылося ў Другой Устаўной грамаце, а абвяшчэнне незалежнасці – у Трэцяй Устаўной грамаце БНР. Склад урада (Народнага сакратарыята) БНР, як вядома, быў апублікаваны ў Першай Устаўной грамаце.

---

632 Telegram of lord Acton to FO 19.01.1920. P. 164A.

633 Ibid. Telegram of lord Acton to FO 13.01.1920. P. 163.

634 TNA. FO 371/4044. Baltic States and Finland. Confidential. Director of Military Intelligence to FO (received January 21, 1920). P. 166–167.

635 Ibid. P. 166.

Наступная, галоўная, частка даклада была прысвечана дзейнасці Васількоўскага і Булак-Балаховіча, пры тым пра першага паўтаралася інфармацыя, якую брытанскі ваенны аташэ паведамляў у Лондан раней. У склад 25-тысячнага войска, якое Васількоўскі нібыта сабраў пад сваім камандаваннем, увайшоў і атрад Балаховіча, хоць апошні адмаўляў сувязь і сваё знаёмства з Васількоўскім. У сувязі з дзейнасцю гэтых двух генералаў Езавітаў звяртаўся з просьбай да шэфа брытанскай місіі ў балтыйскіх дзяржавах аб падтрымцы і экіпіраванні ўзброеных сіл БНР.

Даклад брытанскай ваеннай разведкі заканчваўся наступнай высновай: гэта папяровая рэспубліка з яе папяровым урадам, які не мае ніякай тэрыторыі пад сваім кантролем, наняў на службу Балаховіча, «жаўнера ўдачы», з атрадам каля двух тысяч чалавек. Гэта не выглядала б так небяспечна, калі б не моцныя доказы таго, што тут дзейнічае нямецкі ўплыў, накіраваны на стварэнне другога Заходнерускага ўрада, каб кампенсаваць крах авантуры Бермонта. Латвійскія і польскія ўлады, верагодна, падзялялі гэтую думку. У дадатку да даклада змяшчалася інтэрв’ю з Балаховічам[636].

Высновы: 1. Белая Русь як пэўная палітычная праблема, звязаная з вывадам акупацыйных нямецкіх войскаў і пагрозай бальшавізму для яе жыхароў, перш за ўсё палякаў, з’явілася ў кабінетах Форын офіса ў лістападзе 1918 г. Там са спачуваннем сустрэлі інфармацыю сваіх дыпламатаў з Берна і Капенгагена наконт зваротаў прадстаўнікоў Рады БНР і польскіх колаў у сувязі з бальшавіцкай небяспекай, аднак у пасылцы брытанскіх войскаў у Белую Русь рашуча адмовілі. БНР усур’ёз не ўспрымалі, разглядаючы яе як чарговага кандыдата ў новаабвешчаныя дзяржавы, які просіць прызнання, грошай і падтрымкі. Разам з тым першыя кантакты з прадстаўнікамі БНР выклікалі ў Лондане інтарэс да краіны, якую яны прадстаўлялі і якая была да гэтага часу тэра інкогніта для брытанскіх палітычных і навуковых колаў.

2. Каб задаволіць гэты інтарэс, з’явілася некалькі інфармацыйна-даведачных з элементамі аналітыкі прац пра Белую Русь. Напісаныя дыпламатамі, гісторыкамі і разведчыкамі, яны грунтаваліся, як паказваў змест, не на беларускіх крыніцах, якіх да таго ж было зусім мала ці яны былі невядомыя англічанам, а на матэрыялах суседніх краін (Расіі, Польшчы, Літвы). Зразумела, што яны адлюстроўвалі погляды і ацэнкі беларусаў, распаўсюджаныя ў гэтых краінах, што адпавядалі іх бачанню гэтага народа. Адсюль пайшлі характарыстыкі аб адсталым і непісьменным народзе са слабай нацыянальнай свядомасцю, моцна

[636] TNA. FO 371/4044. Baltic States and Finland. Confidential. Director of Military Intelligence to FO (received January 21, 1920). P. 166–167.

звязаным з рускім народам, этнічна і канфесіянальна падзеленым, са слабым нацыянальным рухам і залежнасцю ад Расіі, якому далёка да незалежнасці. Шэраг з гэтых сцвярджэнняў у прынцыпе не вельмі разыходзіліся з рэчаіснасцю, аднак у сваёй сукупнасці яны стваралі непрывабны ці нават негатыўны вобраз народа і краіны, якія заяўлялі аб сваіх дзяржаўных імкненнях і імкнуліся атрымаць падтрымку і дапамогу Вялікабрытаніі і іншых дзяржаў Антанты.

3. Брытанскі ўрад негатыўна паставіўся да пытання аб прызнанні БНР, лічачы яе «папяровай рэспублікай», «тэарэтычным утварэннем», «дзяржавай, якая нікога не прадстаўляе», «нямецкай ці польскай інтрыгай» і г. д. Прызнанне Фінляндыяй БНР дэ-факта выклікала незадавальненне ў Лондане, дзе гэта разглядалі як паспешлівы і неабдуманы крок, аднак практычных сродкаў уздзеяння на фінскі ўрад там не выкарысталі, разумеючы, што адклікаць назад рашэнне аб прызнанні амаль немагчыма. Як паказалі наступныя падзеі, пад уплывам Варшавы і Лондана ўрад Фінляндыі, па сутнасці, дэзавуіраваў сваё рашэнне аб прызнанні БНР, адмовіўшы ў акрэдытацыі яе прадстаўніку ў Гельсінфорсе. Больш пэўную пазіцыю па пытанні прызнання БНР Форын офіс заняў, адказваючы на зварот урада Даніі, адзначыўшы, што Вялікабрытанія не прызнала БНР дэ-факта, а ў Лондане няма яе прадстаўніка. Гэта стала падставай для дацкага ўрада, каб адмовіцца ад прызнання БНР.

4. Да палітычных і ваенных дзеячаў БНР брытанская дыпламатыя і разведка ставіліся нясцярожана, падазрона і недаверліва. Там нічога не ведалі пра іх мінулае, а іх тагачасная палітычная, дыпламатычная і ваенная дзейнасць не выклікала ў Лондана сімпатый. Васількоўскага разглядалі як авантурыста, Булак-Балаховіча як «жаўнера ўдачы», Езавітава і Душ-Душэўскага як людзей з невядомым мінулым. А шэфу Вайскова-дыпламатычнай місіі БНР у Рызе дасталася яшчэ ад брытанскіх дыпламатаў за дрэннае веданне англійскай мовы. Сваю ролю ў негатыўным вобразе БНР, які сфарміраваўся ў Лондане, адыгралі таксама антыбеларускія дзеянні польскіх, літоўскіх і расійскіх палітыкаў, але гэта асобны сюжэт для даследчыцкай працы. Таму зразумела, чаму ўсе просьбы аб прызнанні, аказанні палітычнай падтрымкі, эканамічнай, фінансавай і ваеннай дапамогі ўраду БНР аказаліся незадаволенымі.

5. Суровы рэалізм брытанскай дыпламатыі адносна дзяржаўных памкненняў беларускага нацыянальнага руху не павінен выклікаць у сучаснікаў маральнага асуджэння ці крытыкі. Форын офіс дзейнічаў па палітычных і дыпламатычных правілах тагачасных міжнародных адносін. БНР не была выключэннем сярод шматлікіх паў- ці квазідзяржаўных антысавецкіх утварэнняў на тэрыторыі былой Расійскай

імперыі, якія не атрымалі спадзяванай падтрымкі з боку Вялікабрытаніі. Украінская Народная Рэспубліка з яе больш моцным патэнцыялам і ўласным прадстаўніцтвам у Лондане таксама не здолела дасягнуць прызнання з боку брытанскага ўрада. Негатыўны вобраз БНР у вачах Лондана – гэта яшчэ адно сведчанне таго, якой цяжкай была дарога да незалежнасці, па якой «бацькі-заснавальнікі» БНР зрабілі ў 1918 і наступныя гады першыя, часта няўпэўненыя, крокі.

## 4.4. Ад Думбартон-Окса да Сан-Францыска: шлях Беларускай ССР у Арганізацыю Аб'яднаных Нацый[637]

У савецкай гістарыяграфіі галоўнымі прычынамі ўключэння Украінскай ССР і Беларускай ССР (менавіта ў такім парадку, усталяваным на Ялцінскай і пацверджаным на Сан-Францыскай канферэнцыях, ішлі тады назвы гэтых дзвюх саюзных рэспублік) у склад першапачатковых дзяржаў – членаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый лічыліся вялікія ахвяры, якія яны панеслі ў выніку нападу нацысцкай Германіі на СССР, і істотны ўклад украінскага і беларускага народаў у барацьбу Аб'яднаных Нацый супраць фашызму. Гэта аргументацыя, упершыню выкарыстаная народным камісарам замежных спраў СССР В. М. Молатавым на Ялцінскай канферэнцыі, да канца 1980-х гг. вызначала трактоўку савецкай, у тым ліку беларускай і ўкраінскай, гістарыяграфіяй пытання аб першапачатковым членстве савецкіх саюзных рэспублік у ААН. Савецкія гісторыкі як з цэнтральных, так і рэспубліканскіх навуковых устаноў гэтае пытанне адмыслова не даследавалі і выкарыстоўвалі напрацоўкі спецыялістаў у галіне міжнароднага права, якія закраналі гэтую тэматыку ў публікацыях па гісторыі стварэння ААН[638]. Прычым першым сярод савецкіх юрыстаў-міжнароднікаў, які ў 1963 г. прысвяціў

[637] Друкуецца паводле артыкула: *Снапкоўскі У. Е.* Ад Думбартон-Окса да Сан-Францыска: этапы ўключэння Беларускай ССР у склад першапачатковых членаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый // Беларусь в геополитических процессах XX – начала XXI в. : сб. науч. ст. / редкол.: А. А. Коваленя (гл. ред.) [и др.]. Минск, 2017. С. 162–178.

[638] *Коровин Е. А.* Конференция Объединенных Наций и международная безопасность (От Думбартон-Окса до Сан-Франциско). М., 1945 ; *Крылов С. Б.* История создания Организации Объединенных Наций. Разработка текста Устава ООН (1944–1945 гг.). 2-е изд., доп. М., 1960.

спецыяльны навуковы артыкул пытанню аб першапачатковым членстве Беларускай ССР у ААН, быў беларускі вучоны Ю. П. Броўка[639]. У 1966 г. украінскі даследчык міжнароднага права К. С. Забігайла апублікаваў артыкул пра ўдзел Украінскай ССР у выпрацоўцы Статута ААН[640]. Сярод савецкіх гісторыкаў прыярытэт у даследаванні тэматыкі першапачатковага членства УССР і БССР належаў украінскім вучоным В. С. Кавалю і М. М. Белавусаву, якія апублікавалі свае працы таксама ў сярэдзіне 1960-х гг.[641] У 1994 г. у рэчышчы запаўнення «белых плям» айчыннай гісторыі з'явілася першае манаграфічнае даследаванне ў гістарыяграфіі постсавецкіх дзяржаў, прысвечанае апісанню складанага і цярністага шляху БССР і УССР у ААН, выкананае беларускім аўтарам[642]. Дадзеная ў гэтым і іншых навуковых[643], вучэбных[644] і энцыклапедычных[645] выданнях трактоўка першапачатковага членства савецкіх саюзных рэспублік у новай міжнароднай арганізацыі і на пасляваенных міжнародных канферэнцыях падзяляецца сёння беларускай акадэмічнай супольнасцю, а прыярытэт беларускай гістарыяграфіі ў распрацоўцы праблемы з гісторыі міжнародных адносін Другой сусветнай вайны прызнаецца за мяжой[646].

**Прычыны канстытуцыйных змен у 1944 г.** Разгледзім асноўныя падзеі дыпламатычнай гісторыі Другой сусветнай вайны, звязаныя з праблемай першапачатковага членства савецкіх саюзных рэспублік у ААН. Савецкае кіраўніцтва пачало рыхтавацца да выхаду саюзных рэспублік на міжнародную арэну і стварэння іх уласных наркаматаў замежных спраў з вясны 1943 г., калі вызначыўся карэнны паварот у ходзе Другой сусвет-

---

[639] *Броўка Ю. П.* Да пытання аб удзеле Беларускай ССР у стварэнні Арганізацыі Аб'яднаных Нацый // Вес. АН БССР. Сер. грамад. навук. 1963. № 2. С. 115–125.

[640] *Забигайло К. С.* К истории участия Украинской ССР ... С. 123–133.

[641] *Коваль В. С.* Міжнародний імперіалізм і Украіна. 1941–1945. Киïв, 1966 ; *Білоусов М. М.* Рішення Ялтинськой конференціі про участь УРСР та БРСР в ООН // Украін. ист. журн. 1965. № 2. С. 117–119.

[642] *Снапковский В. Е.* Путь Беларуси в ООН ...

[643] *Снапкоўскі У. Е.* Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі ... ; *Яго ж.* О советском требовании включить ряд союзных республик в состав Комиссии Объединенных Наций по военным преступлениям (июль – декабрь 1943 г.) // Труды факультета международных отношений : науч. сб. Минск, 2011. Вып. 2. С. 29–32.

[644] *Снапкоўскі У. Е.* Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі. Ч. 2. С. 149–157 ; *Яго ж.* История внешней политики Беларуси. С. 320–329.

[645] *Снапкоўскі У. Е.* Беларусь – адна з заснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый // Беларус. энцыкл. Т. 18. Кн. 2. С. 713–716.

[646] *Lindner R.* Рецензия на кн. *Снапковский В. Е.* Путь Беларуси в ООН. 1944–1945 гг. // Jahrbűcher fűr Geschichte Osteuropas. 1997. № 2. S. 335–336.

най вайны на карысць антыгітлераўскай кааліцыі. У сувязі з распрацоўкай планаў пасляваеннага ўладкавання свету, якая актыўна вялася ў ЗША і Вялікабрытаніі, перад Савецкім Саюзам рэальнай станавілася небяспека аказацца ў бліскучым адзіноцтве ці ў лепшым выпадку мець толькі некалькі саюзнікаў як у будучай Міжнароднай арганізацыі бяспекі, так і на канферэнцыях па пытаннях пасляваеннага мірнага ўрэгулявання. Каб умацаваць пазіцыі СССР на міжнароднай арэне, савецкае кіраўніцтва вырашыла дабівацца, як пішуць у замежнай літаратуры, «множнага прадстаўніцтва» саюзных рэспублік у міжнародных арганізацыях і асамблеях[647].

Першая спроба легалізацыі «множнага прадстаўніцтва» СССР была зроблена 26 ліпеня 1943 г., калі савецкі ўрад праз ноту Наркамата замежных спраў СССР, падпісаную Молатавым, папрасіў у Камісіі Аб'яднаных Нацый па ваенных злачынствах (КАНВЗ) асобнае членства для сямі саюзных рэспублік, што падвергліся нямецкай акупацыі і панеслі найбольшыя страты ў вайне (Украіны, Беларусі, Малдавіі, Літвы, Латвіі, Эстоніі і Карэла-Фінскай ССР). Савецкая прапанова была зроблена ў адказ на просьбу брытанскага ўрада ад 6 сакавіка 1943 г., каб у Камісіі былі прадстаўлены англійскія дамініёны[648]. У адказ на ноту Молатава англійскі ўрад 29 верасня 1943 г. заявіў, што саюзныя рэспублікі СССР не могуць быць прадстаўлены ў КАНВЗ на роўных правах з брытанскімі дамініёнамі, паколькі паводле Канстытуцыі СССР 1936 г. толькі Саюз ССР упаўнаважаны прадстаўляць федэратыўныя рэспублікі ў міжнародных адносінах, якія не маюць індывідуальнага міжнароднага статусу і таму не могуць самастойна ўдзельнічаць у працы будучай Камісіі[649]. З гэтым рашуча не пагадзіўся савецкі ўрад, які 17 кастрычніка 1943 г. накіраваў новую ноту НКЗС у адрас брытанскага Форын офіса, у якой сцвярджалася, што савецкія рэспублікі з'яўляюцца не менш суверэннымі дзяржавамі, чым брытанскія дамініёны[650]. Пра спрэчку паміж саюзнікамі па антыгітлераўскай кааліцыі стала вядома амерыканцам, якія параілі англічанам залагодзіць гэтае пытанне і не дапусціць публічнага яго абмеркавання[651].

[647] *Aspaturian V.* Op. cit. P. 101.

[648] АЗПРФ. Ф. 06. Воп. 5. П. 17. Спр. 166. Л. 12–13 ; СССР и германский вопрос. 1941–1949: Документы из Архива внешней политики Российской Федерации : в 4 т. М., 1996–2012. Т. 1 : 22 июня 1941 г. – 8 мая 1945 г. 1996. С. 231–232.

[649] СССР и германский вопрос. 1941–1949 ... Т. 1. С. 675.

[650] Там жа. С. 324.

[651] Foreign Relations of the United States. Diplomatic Papers (FRUS). 1943. Vol. I : General. Washington, 1963. P. 436–437.

Справа з членствам саюзных рэспублік у КАНВЗ скончылася тым, што ЗША і Вялікабрытанія адхілілі просьбу СССР, матывуючы сваю адмову адсутнасцю ў рэспублік канстытуцыйных паўнамоцтваў для вядзення знешнепалітычнай дзейнасці, а савецкі ўрад адмовіўся ўдзельнічаць у працы Камісіі. Аднак няўдача з легалізацыяй «множнага прадстаўніцтва» СССР на міжнароднай арэне падштурхнула савецкае кіраўніцтва да таго, каб вярнуць рэспублікам знешнепалітычныя паўнамоцтвы, якія яны дэлегавалі Цэнтру пры ўступленні ў Саюз ССР[652].

1 лютага 1944 г. Вярхоўны Савет СССР прыняў Закон «Аб прадастаўленні саюзным рэспублікам паўнамоцтваў у галіне знешніх зносін і аб пераўтварэнні ў сувязі з гэтым народнага камісарыята замежных спраў з агульнасаюзнага ў саюзна-рэспубліканскі народны камісарыят». Саюзныя рэспублікі атрымалі права ўступаць у непасрэдныя зносіны з замежнымі дзяржавамі, заключаць з імі пагадненні і абменьвацца дыпламатычнымі і консульскімі прадстаўнікамі. Закон унёс адпаведныя змены ў Канстытуцыю СССР 1936 г., дапоўніўшы яе артыкулам 18-а[653].

24 сакавіка 1944 г. Вярхоўны Савет БССР унёс змены ў Канстытуцыю рэспублікі 1937 г., паводле якіх БССР атрымала адпаведныя знешнепалітычныя правы (артыкул 16-а). Тады ж быў прыняты закон аб стварэнні Народнага камісарыята замежных спраў БССР. 30 сакавіка намеснік старшыні СНК БССР К. В. Кісялёў быў прызначаны народным камісарам замежных спраў БССР[654]. На працягу 1944 г. у саюзных рэспубліках былі створаны наркаматы замежных спраў і прызначаны іх кіраўнікі. Рашэнні Вярхоўнага Савета СССР прадугледжвалі таксама стварэнне вайсковых фарміраванняў саюзных рэспублік і рэспубліканскіх наркаматаў абароны, якія, аднак, не былі выкананы[655].

Галоўнай прычынай прадастаўлення, а дакладней вяртання, саюзным рэспублікам знешнепалітычных праў былі разлікі старшыні СНК СССР І. В. Сталіна і іншых членаў савецкага кіраўніцтва атрымаць у асобе 16 рэспублік СССР дадатковыя галасы ў новай Міжнароднай арганізацыі бяспекі (будучай ААН) і на пасляваенных міжнародных

---

[652] *Снапковский В. Е.* О советском требовании ...

[653] X сессия Верховного Совета СССР 1-го созыва. Доклады и законы, принятые Верховным Советом СССР. Сыктывкар, 1944. С. 38–46.

[654] Шостая сесія Вярхоўнага Савета БССР. 21–24 сакавіка 1944 г. : стэнаграфічная справаздача. Мінск, 1946. С. 273.

[655] Там жа ; *Гриневич В. А.* Утворення Наркомату оборони УРСР у 1944 р.: з історії однієї політичної гри // Украин. іст. журн. 1991. № 5. С. 29–37.

канферэнцыях. Менавіта так зразумелі схаваны сэнс нечаканай канстытуцыйнай рэформы ў СССР пасол ЗША ў СССР А. Гарыман, а таксама вядомыя амерыканскія журналісты Д. Рэстан і У. Ліпман, якія апублікавалі каментары ў «The New York Times» і «The New York Gerald Tribune»[656]. Гарыман назваў стварэнне двух рэспубліканскіх наркаматаў (замежных спраў і абароны) «дубальтоўкай», дзякуючы якой Масква вырашала б пагранічныя пытанні Украіны з Польшчай і Чэхаславакіяй і праводзіла б інкарпарацыю прыбалтыйскіх рэспублік у склад СССР[657].

**«Справа ікс» і яе вырашэнне ў Ялце.** Нягледзячы на то што англа-амерыканская прэса з трывогай і падазронасцю ўспрыняла рашэнні Крамля аб перадачы саюзным рэспублікам знешнепалітычных паўнамоцтваў, палітычныя колы ў Вашынгтоне і Лондане не прыдалі гэтаму сур'ёзнага значэння. Гэта паказала падрыхтоўка да канферэнцыі прадстаўнікоў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі ў Думбартон-Оксе (прыгарадзе Вашынгтона), якая адбылася ў жніўні – верасні 1944 г. Паводле амерыканскага праекта стварэння новай міжнароднай арганізацыі яе першапачатковымі членамі, г. зн. заснавальнікамі, павінны былі стаць дзяржавы, што падпісалі Дэкларацыю Аб'яднаных Нацый 1 студзеня 1942 г. і пазней далучыліся да яе, а таксама іншыя нацыі, якія будуць вызначаны Аб'яднанымі Нацыямі. Зразумела, што з пункту гледжання Дзяржаўнага дэпартамента ні пад адну з гэтых трох катэгорый дзяржаў савецкія саюзныя рэспублікі не падпадалі.

Аднак гэта зусім не збянтэжыла савецкую дыпламатыю. 10 жніўня 1944 г. Палітбюро ЦК ВКП(б) разгледзела і зацвердзіла дырэктывы савецкай дэлегацыі да перагавораў аб стварэнні Міжнароднай арганізацыі бяспекі, у пункце 9 якіх пазначалася: «При обсуждении вопросов о составе организации необходимо в соответствующий момент заявить, что, как это само собой разумеется, к числу первоначальных участников организации должны быть отнесены все Союзные Советские республики. Однако настаивать на том, чтобы этот вопрос был окончательно решен на этой стадии переговоров, не следует»[658].

Выконваючы пастаўленую задачу, кіраўнік савецкай дэлегацыі на канферэнцыі ў Думбартон-Оксе, пасол СССР у ЗША А. А. Грамыка 28 жніўня 1944 г. вылучыў патрабаванне аб уключэнні ўсіх 16 савецкіх саюзных рэспублік у лік першапачатковых удзельнікаў новай міжнароднай арганізацыі. Гэта аказалася поўнай нечаканасцю для кіраўнікоў

[656] *Снапковский В. Е.* Путь Беларуси в ООН ... С. 24–29.
[657] FRUS. 1944. Vol. IV : Europe. Washington, 1956. P. 821–822.
[658] РДАСПГ. Ф. 17. Воп. 162. Спр. 37. Л. 131.

дэлегацый ЗША і Вялікабрытаніі, якія выказалі вялікія сумненні ў магчымасці рэалізацыі заявы Грамыкі[659].

Супраць яго катэгарычна выступілі прэзідэнт ЗША Ф. Рузвельт і дзяржаўны сакратар К. Хэл. Сур'ёзную занепакоенасць пастаноўкай пытання аб членстве 16 рэспублік у новай арганізацыі выказаў Рузвельт у пасланні да Сталіна 1 верасня 1944 г. У ім адзначалася, што савецкае патрабаванне можа паставіць пад пагрозу ўвесь праект заснавання міжнароднай арганізацыі, і выказвалася гатоўнасць абмеркаваць яго пасля яе стварэння[660]. Савецкі кіраўнік у пасланні ў адказ да прэзідэнта ЗША 7 верасня падкрэсліў выключна важнае значэнне, якое Савецкі Саюз надаваў пытанню аб пашырэнні праў саюзных рэспублік на міжнароднай арэне. «Вам, конечно, известно, что, например, Украина и Белоруссия, входящие в Советский Союз, по количеству населения и по их политическому значению превосходят некоторые государства, в отношении которых все мы согласны, что они должны быть отнесены к числу инициаторов создания Международной организации»[661], – гаварылася ў тэлеграме Сталіна. Такім чынам, сустрэўшы рэзкае супрацьдзеянне ЗША максімальнаму задавальненню савецкай просьбы, Сталін зазначыў УССР і БССР у ліку першых рэспублік-кандыдатак на першапачатковае членства ў міжнароднай арганізацыі.

Пытанне аб першапачатковым прадстаўніцтве саюзных рэспублік атрымала ў дакументах Дзяржаўнага дэпартамента ЗША, а пасля ў заходняй літаратуры назву «пытанне Х», ці «справа ікс». Кіраўнік дэлегацыі ЗША на канферэнцыі ў Думбартон-Оксе, намеснік дзяржаўнага сакратара Э. Стэцініус завёў спецыяльную папку, у якой захоўваліся пратаколы канферэнцыі, якія датычыліся «справы Х». Аб яе існаванні ведалі толькі Рузвельт і Хэл. Прэзідэнт загадаў Стэцініусу трымаць у вялікім сакрэце гэтае пытанне, у якім праявіліся рознагалоссі паміж саюзнікамі[662].

---

[659] Советский Союз на международных конференциях периода Великой Отечественной войны 1941–1945 гг. : сб. док. : в 6 т. М., 1978–1984. Т. 3 : Конференция представителей СССР, США и Великобритании в Думбартон-Оксе (21 авг. – 28 сент. 1944 г.). 1984. С. 131 ; FRUS. 1944. Vol. I : General. Washington, 1966. P. 737, 742–743, 751–753.

[660] Переписка Председателя Совета Министров СССР ... Т. 2. С. 166.

[661] Там же. С. 167.

[662] Советский Союз на международных конференциях периода Великой Отечественной войны ... Т. 4 : Крымская конференция руководителей трех союзных держав – СССР, США и Великобритании (4–11 февр. 1945 г.). 1984. С. 141 ; *Бережков В. М.* Страницы дипломатической истории. М., 1987. С. 402.

Пытанне аб першапачатковых членах будучай арганізацыі ў Думбартон-Оксе вырашыць не ўдалося, паколькі ЗША і Вялікабрытанія рашуча пярэчылі членству савецкіх рэспублік. Накіроўваючыся на канферэнцыю ў Крым, Рузвельт падчас размовы з групай сенатараў заявіў, што ў выпадку вылучэння Сталіным просьбы аб членстве 16 рэспублік ён запатрабуе членства для ўсіх 48 амерыканскіх штатаў[663].

Да Ялцінскай канферэнцыі, якая адбылася 4–11 лютага 1945 г., урады СССР і ЗША падрыхтавалі кампрамісныя патрабаванні па працэдуры галасавання ў Савеце Бяспекі і першапачатковым прадстаўніцтве дзяржаў у міжнароднай арганізацыі. Прапановы Вашынгтона па працэдуры галасавання ўлічвалі пазіцыю Масквы аб безумоўным аднагалоссі пастаянных членаў Савета Бяспекі па ўсіх важнейшых рашэннях. Савецкі ўрад, у сваю чаргу, адмовіўся ад патрабавання прадстаўніцтва для ўсіх 16 саюзных рэспублік і вылучыў просьбу аб уключэнні ў лік заснавальнікаў арганізацыі трох ці па меншай меры дзвюх рэспублік: Украіны, Беларусі і Літвы. Аргументуючы яе, Молатаў на пасяджэнні кіраўнікоў урадаў 7 лютага сказаў, што гэтыя рэспублікі панеслі найвялікшыя страты ў вайне і былі першымі тэрыторыямі, што падвергліся нямецкаму нашэсцю[664]. Уключэнне Літвы ў формулу «тры ці дзве савецкія рэспублікі» мела для савецкага кіраўніцтва мэтай атрымаць прызнанне Захадам інкарпарацыі Балтыйскіх краін у склад СССР. Аднак паколькі ЗША і Вялікабрытанія па-ранейшаму адмаўляліся прызнаваць уключэнне Літвы, Латвіі і Эстоніі ў склад СССР, што разглядалася імі як незаконная інкарпарацыя, яны адмоўна аднесліся да прапановы аб допуску Літвы ў першапачатковыя члены арганізацыі. У далейшым яе кандыдатура савецкім урадам больш не вылучалася[665].

Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі У. Чэрчыль падтрымаў савецкую прапанову і папрасіў Ф. Рузвельта зрабіць тое ж. Ён лічыў, што пазіцыя Брытанскай Садружнасці з яе шасцю галасамі (Вялікабрытаніяй, Аўстраліяй, Канадай, Новай Зеландыяй, Паўднёва-Афрыканскім Саюзам і Індыяй) у арганізацыі ўзмацніцца з-за таго, што іншая вялікая дзяржава таксама будзе валодаць некалькімі галасамі[666]. Чэрчыль

---

[663] *Шервуд Р.* Рузвельт и Гопкинс. Глазами очевидца : в 2 т. М., 1958. Т. 2. С. 574.

[664] АЗПРФ. Ф. 056. Воп. 1. П. 1. Спр. 2. Л. 108 ; Советский Союз на международных конференциях периода Великой Отечественной войны ... Т. 4. С. 111–112.

[665] *Materski W.* Narodziny ONZ. Idea międzynarodowej organizacji bezpieczeństwa w polityce zagranicznej ZSRR 1941–1945. Warszawa, 1982. S. 250.

[666] Советский Союз на международных конференциях периода Великой Отечественной войны ... Т. 4. С. 112, 114.

выслухаў прапанову савецкага ўрада з вялікай сімпатыяй і сказаў словы, што адносіліся непасрэдна да Беларусі: «Маё сэрца з Белай Руссю (Уайт Раша), якая, сцякаючы крывёю, нізрынула тыранаў»[667].

Прэзідэнт Рузвельт апынуўся на пасяджэнні ў адзіноцтве і быў вымушаны пагадзіцца з савецкай прапановай. Ён лічыў, што фактычная ўлада будзе ажыццяўляцца Саветам Бяспекі, і таму ўжо не разглядаў як зусім недарэчную прапанову Сталіна аб двух дадатковых галасах для Украіны і Беларусі. Рузвельт, як успамінаў пазней Стэцініус, таксама пайшоў насустрач Сталіну ў сувязі з просьбай апошняга аб тым, што голас для Украіны неабходны для захавання «савецкага адзінства»[668]. Згода Рузвельта на допуск дзвюх савецкіх рэспублік у арганізацыю сустрэла, аднак, незадавальненне шэрагу членаў дэлегацыі ЗША. Пад іх ціскам 10 лютага прэзідэнт звярнуўся да Чэрчыля і Сталіна з просьбай даць Злучаным Штатам таксама два дадатковыя галасы, каб ураўнаважыць іх становішча[669]. Кіраўнікі Вялікабрытаніі і СССР неадкладна падтрымалі яе. У тэлеграме Сталіна Рузвельту ад 11 лютага гаварылася: «Я совершенно согласен с Вами, что поскольку число голосов Советского Союза увеличивается до трех в связи с включением в список членов Ассамблеи Советской Украины и Советской Белоруссии, следует также увеличить количество голосов для США. Я думаю, что можно было бы довести количество голосов США до трех, как у Советского Союза и его двух основных Республик. Если это понадобится, я готов официально поддержать это свое предложение»[670].

Рузвельт і Чэрчыль падтрымалі просьбу Сталіна з улікам шырокага разумення міжнароднай палітыкі і неабходнасці захаваць саюзныя адносіны з СССР, які быў патрэбны для капітуляцыі Германіі і разгрому Японіі. Яны лічылі сваім маральным абавязкам дапусціць у арганізацыю дзве савецкія рэспублікі, якія першымі прынялі на сябе ўдар фашысцкай Германіі, не пакарыліся ворагу і ўнеслі значны ўклад у агульную справу антыгітлераўскай кааліцыі. Рузвельт і Чэрчыль таксама разумелі, што два дадатковыя галасы не будуць мець прынцыповага значэння на форуме Генеральнай Асамблеі Аб'яднаных Нацый, паколькі на момант правядзення канферэнцыі налічвалася ўжо каля сарака дзяржаў, што падпісалі Дэкларацыю Аб'яднаных Нацый.

---

[667] Цыт па: *Byrnes J.* Speaking Frankly. New York, 1947. P. 39.

[668] *Stettinius E. R.* Roosevelt and the Russians: The Jalta Conference. New York, 1949. P. 187.

[669] Переписка Председателя Совета Министров СССР ... Т. 2. С. 202.

[670] Там жа. С. 203.

У камюніке аб выніках Крымскай канферэнцыі, апублікаваным трыма саюзнымі дзяржавамі 12–13 лютага 1945 г., не згадвалася пра дамоўленасць наконт УССР і БССР. Яна была зафіксавана ў сакрэтным пратаколе работы Крымскай канферэнцыі, падпісаным міністрамі замежных спраў. У раздзеле I «Сусветная арганізацыя» пад пунктам «2в» гаварылася: «Когда будет происходить конференция о всемирной организации, делегаты Соединенного Королевства и Соединенных Штатов Америки поддержат предложение о допуске к первоначальному членству двух Советских Социалистических Республик, а именно Украину и Белоруссию»[671]. Пратакол быў апублікаваны на Захадзе (у ЗША) у 1947 г., у СССР – у 1955 г.

Дамоўленасць аб дзвюх савецкіх рэспубліках была ўключана ў сакрэтны пратакол Ялцінскай канферэнцыі па ініцыятыве Рузвельта і Чэрчыля. У Савецкім Саюзе аб ёй было вядома вельмі вузкаму колу асоб. Напэўна, аб ёй ведаў першы сакратар ЦК КП(б) Украіны, старшыня СНК УССР М. С. Хрушчоў, які ўваходзіў у склад Палітбюро ЦК ВКП(б), аднак у сваіх мемуарах ён нідзе пра гэта не згадвае. Верагодна, што даволі хутка аб сакрэтнай ялцінскай дамоўленасці стала вядома і кіраўнікам БССР, хоць першы сакратар ЦК КП(б) Беларусі П. К. Панамарэнка ніколі не казаў аб гэтым у сваіх успамінах. Украіна і Беларусь, якія Сталін называў «дзвюма асноўнымі рэспублікамі СССР», з'яўляліся аб'ектам сталінска-молатаўскай дыпламатычнай гульні, якая спачатку вялася за іх плячыма.

**Гістарычныя рашэнні ў Сан-Францыска.** Пасля Крымскай канферэнцыі савецкае кіраўніцтва вырашыла, што прыйшла чарга ўключыць у гульню самі зацікаўленыя рэспублікі. У сакавіку 1945 г. урады УССР і БССР, не атрымаўшыя запрашэнняў на ўстаноўчую канферэнцыю Аб'яднаных Нацый у Сан-Францыска, па ўказанні з Масквы заявілі, што накіруюць на яе свае дэлегацыі нават пры адсутнасці афіцыйных запрашэнняў[672]. Гэты крок савецкай дыпламатыі яшчэ больш абвастрыў рознагалоссі паміж СССР і заходнімі дзяржавамі, абвастрыў абстаноўку вакол падрыхтоўкі канферэнцыі ў Сан-Францыска. Адміністрацыя ЗША пры падтрымцы брытанскага ўрада энергічна пярэчыла супраць такога кроку, адзначаючы, што рашэнні Крымскай канферэнцыі не прадугледжвалі ўдзелу дэлегацый абедзвюх рэспублік у Сан-Францыскай канферэнцыі і што толькі яна можа прыняць рашэнне аб іх

---

[671] Советский Союз на международных конференциях периода Великой Отечественной войны ... Т. 4. С. 255–256.

[672] АЗПРФ. Ф. 06. Воп. 7-б. П. 63. Спр. 40. Л. 29, 78–80 ; *Забигайло К. С.* Пазнач. твор. С. 127.

запрашэнні[673]. С такім падыходам не пагаджаўся савецкі ўрад, аб чым сведчыў праект ноты НКЗС СССР у адрас дзярждэпартамента ЗША ад 24 сакавіка, ухвалены Сталіным. У ім гаварылася: «Советское Правительство настаивает на том, чтобы в соответствии с решением Крымской конференции Советской Украине и Советской Белоруссии было обеспечено участие в конференции в Сан-Франциско в качестве первоначальных членов»[674].

Перспектывы рэалізацыі ялцінскай дамоўленасці ўскладніліся пасля таго, як у ЗША ў канцы сакавіка стала вядома аб пагадненні наконт дадатковых галасоў для СССР і ЗША. У краіне выбухнуў палітычны скандал. Праціўнікі Рузвельта з асяроддзя рэспубліканцаў адхілялі, у прынцыпе, ідэю дадатковых галасоў, лічачы, што яна супярэчыць прыродзе міжнароднай арганізацыі і прынцыпу суверэннай роўнасці дзяржаў. Палітыкі і аглядальнікі ўказвалі на тое, што Беларусь і Украіна, як і ўсе іншыя савецкія рэспублікі, не з'яўляюцца суверэннымі дзяржавамі[675]. Паплечнікі і сябры Рузвельта лічылі памылкай яго просьбу аб трох амерыканскіх галасах. За тыдзень да смерці, 5 красавіка 1945 г., прэзідэнт Рузвельт на сваёй апошняй прэс-канферэнцыі падрабязна спыніўся на праблеме дадатковых галасоў і заявіў, што яго ўрад не будзе прасіць у Сан-Францыска трох галасоў для ЗША, паколькі яны нічога не вырашаюць[676].

Пры падрыхтоўцы да канферэнцыі ў Сан-Францыска савецкая дыпламатыя павінна была вырашыць дзве задачы: 1) дабіцца ўключэння УССР і БССР у склад першапачатковых членаў міжнароднай арганізацыі; 2) атрымаць запрашэнні для ўдзелу дэлегацый абедзвюх рэспублік ва ўстаноўчай канферэнцыі Аб'яднаных Нацый. Як паказалі далейшыя падзеі, гэтыя дзве задачы былі паспяхова вырашаны, аднак для іх дасягнення савецкім дыпламатам (Молатаву, Грамыку і інш.) спатрэбілася прыкласці шмат намаганняў, выкарыстоўваючы ціск, шантаж, ультыматумы, узаемныя саступкі і іншыя сродкі ўздзеяння на сваіх заходніх партнёраў.

---

[673] Советский Союз на международных конференциях периода Великой Отечественной войны ... Т. 5 : Конференция Объединенных Наций в Сан-Франциско (25 апр. – 26 июня 1945 г.). М., 1980. С. 76–88 ; FRUS. 1945. Vol. I : General. The United Nations. Washington, 1967. P. 143, 150–151.

[674] АЗПРФ. Ф. 06. Воп. 7-б. П. 63. Спр. 40. Л. 2.

[675] *Vandenberg A.* The Private Papers of Senator Wandenberg. Boston, 1952. P. 159.

[676] The Public Papers and Adresses of Franklin Delano Roosevelt. Vol. XIII : 1944–1945: Victory and the Threshold of Peace. New York, 1950. P. 545, 610–611.

На канферэнцыі ў Сан-Францыска, якая адкрылася 25 красавіка 1945 г., на пасяджэнні кіраўнікоў дэлегацый (Кіраўнічага камітэта) 27 красавіка кіраўнік дэлегацыі СССР наркам замежных спраў Молатаў выступіў з заявамі ад імя ўрадаў Украінскай ССР і Беларускай ССР. Ён згадаў рашэнне Крымскай канферэнцыі наконт дзвюх савецкіх рэспублік, спаслаўся на канстытуцыйныя змены ў СССР, падкрэсліўшы, што саюзныя рэспублікі з'яўляюцца суверэннымі дзяржавамі, адзначыў важную ролю народаў Украіны і Беларусі ў змаганні з агульным ворагам і заклікаў дэлегатаў падтрымаць рашэнне, адобранае Крымскай канферэнцыяй, і далучыцца да яго[677]. У заяве ўрада БССР, падпісанай старшынёй СНК БССР П. К. Панамарэнкам і наркамам замежных спраў К. В. Кісялёвым, выказвалася жаданне беларускага народа прыняць удзел у стварэнні міжнароднай арганізацыі па падтрыманні міру і міжнароднай бяспекі ў якасці першапачатковага члена-заснавальніка, а таксама быць прадстаўленай на канферэнцыі ў Сан-Францыска[678].

Савецкую прапанову падтрымалі кіраўнікі дэлегацый ЗША, Вялікабрытаніі, Кітая, а таксама Ірана, Францыі, Бразіліі, Чэхаславакіі і Аўстраліі. Пасля гэтага пасяджэнне кіраўнікоў дэлегацый аднагалосна прыняло рашэнне аб уключэнні Украінскай і Беларускай савецкіх сацыялістычных рэспублік у лік першапачатковых членаў арганізацыі. Гэтае рашэнне было аднагалосна пацверджана ў той жа дзень другім пленарным пасяджэннем канферэнцыі і сустрэта апладысментамі[679].

30 красавіка Кіруючы камітэт аднагалосна ўхваліў прапанову Выканаўчага камітэта аб неадкладным дапушчэнні ўкраінскіх і беларускіх прадстаўнікоў на канферэнцыю. У гэты ж дзень таксама аднагалосна на пленарным пасяджэнні ўсе 47 краін – удзельніц канферэнцыі прагаласавалі за запрашэнне дэлегацый УССР і БССР на ўстаноўчы форум Аб'яднаных Нацый[680]. Як адзначаюць англа-амерыканскія даследчыкі гісторыі стварэння ААН, рашэнні па дзвюх савецкіх рэспубліках былі прыняты аднагалосна, «хоць і без энтузіязму»[681].

Генеральны сакратар канферэнцыі А. Хіс 1 мая накіраваў з Вашынгтона тэлеграму наркаму замежных спраў БССР Кісялёву. Яна інфармавала ўрад БССР аб рашэнні канферэнцыі Аб'яднаных Нацый запрасіць

[677] Советский Союз на международных конференциях периода Великой Отечественной войны ... Т. 5. С. 130, 325–326.

[678] Там жа. С. 403–404.

[679] Там жа. С. 336.

[680] Там жа.

[681] *Goodrich L. M.*, *Hambro E.*, *Simons A. P.* Charter of the United Nations. Commentary and Documents. New York ; London, 1962. P. 84.

Беларускую ССР стаць раўнапраўным членам ствараемай міжнароднай арганізацыі і выклікаць яе прадстаўнікоў для ўдзелу ў канферэнцыі[682].

Складаным аказалася пытанне аб кіраўніку і складзе беларускай дэлегацыі. У першапачатковым праекце, які старшыня СНК БССР Панамарэнка прадставіў Молатаву 12 сакавіка, у склад дэлегацыі былі ўключаны пяць наступных асоб: «Жебрак А. Р. – академик, глава делегации БССР, Байдуков Г. И. – член правительства Белорусской ССР, Азаренко Е. К. – общественный деятель Белорусской ССР, Ромашко К. И. – общественный деятель Белорусской ССР, Перцев В. Н. – заслуженный деятель науки». Прадстаўляючы гэтыя кандыдатуры, Панамарэнка ўказаў на сур'ёзныя цяжкасці ў падборы кандыдатаў, якія валодалі б неабходнымі данымі: «Крупные общественные деятели Белоруссии не могли быть включены в число кандидатур ввиду незнания языков»[683].

Даючы кароткую характарыстыку кожнаму з іх, кіраўнік беларускага ўрада адзначаў, што А. Р. Жэбрак з'яўляецца буйным грамадскім дзеячам БССР, мае навуковыя працы, якія прызнаны за мяжой, добра ведае англійскую мову; плануецца яго вылучэнне на пасаду прэзідэнта Акадэміі навук БССР. «Политически грамотен, разбирается в вопросах международной политики». Наркам будаўнічых матэрыялаў Г. І. Байдукоў і загадчык сектара Аддзела агітацыі і прапаганды ЦК КП(б)Б Е. К. Азаранка добра валодалі англійскай мовай. К. І. Рамашка працаваў намеснікам начальніка Другога ўпраўлення Наркамата дзяржаўнай бяспекі БССР, быў спецыялістам у «оперразведработе», аднак англійскую мову ведаў здавальняюча. Гісторык акадэмік У. М. Перцаў характарызаваўся як «вполне советский ученый», які слаба валодаў англійскай мовай, але добра ведаў нямецкую і французскую. У якасці яшчэ адной дадатковай кандыдатуры рэкамендавалася асоба загадчыка секцыі археалогіі АН БССР К. М. Палікарповіча, які добра валодаў англійскай, нямецкай і французскай мовамі, ведаў іншыя мовы і на якога не было кампраметуючых матэрыялаў[684].

29 красавіка пасол СССР у ЗША Грамыка звярнуўся з просьбай да дзяржаўнага сакратара Стэцініуса аб выдачы амерыканскім пасольствам у Маскве ўездных віз для членаў дэлегацый УССР і БССР, што накіроўваліся на канферэнцыю ў Сан-Францыска паўночным маршрутам праз Сібір і Аляску[685]. На наступны дзень Стэцініус даручыў дзяржпартаменту выдаць візы.

[682] НАРБ. Ф. 907. Воп 1. Спр. 7. Л. 16.
[683] Там жа. Л. 78.
[684] Там жа. Л. 78–80.
[685] АЗПРФ. Ф. 06. Воп. 7-б. П. 63. Спр. 40. Л. 29.

Прапанаваныя Панамарэнкам кандыдатуры былі ўхвалены саюзным НКЗС і менавіта для іх Грамыка прасіў візы ў Стэцініуса 29 красавіка. Аднак 30 красавіка Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР па ўзгадненні з бюро ЦК КП(б)Б прызначыў дэлегацыю БССР на канферэнцыю ў іншым складзе: К. В. Кісялёў (кіраўнік дэлегацыі), А. Р. Жэбрак, У. М. Перцаў, Г. І Байдукоў і Ф. П. Шмыгаў. У склад тэхнічнага персаналу дэлегацыі ўвайшлі: В. І. Формашэў (кансультант), М. Т. Лынькоў (карэспандэнт), М. І. Пятрова (перакладчыца), Несцерава (перакладчыца-стэнаграфістка). Дэлегацыя атрымала паўнамоцтвы падпісаць канчатковы тэкст Статута Усеагульнай міжнароднай арганізацыі для падтрымання міру і бяспекі пры ўмове яго наступнай ратыфікацыі ў парадку, прадугледжаным законамі БССР[686].

Змены ў складзе дэлегацыі адбыліся за кошт увядзення двух прадстаўнікоў НКЗС: наркама Кісялёва і начальніка палітычнага аддзела наркамата Шмыгава. Кандыдатуры Азаранкі і Рамашкі былі адхілены. Дэлегацыю ўзначаліў новы кіраўнік, што было абгрунтавана, паколькі Кісялёў узначальваў знешнепалітычнае ведамства і менавіта міністры замежных спраў кіравалі дэлегацыямі на канферэнцыі ў Сан-Францыска. Украінскую дэлегацыю таксама ўзначальваў наркам замежных спраў УССР Д. З. Мануільскі.

6 мая 1945 г. урадавыя дэлегацыі УССР і БССР прыбылі ў Сан-Францыска і актыўна ўключыліся ў працу канферэнцыі. 25 чэрвеня яны разам з іншымі 48 дэлегацыямі – удзельніцамі канферэнцыі падпісалі Статут ААН, які быў ратыфікаваны Прэзідыумам Вярхоўнага Савета БССР 30 жніўня 1945 г. Ратыфікацыйныя граматы СССР, УССР і БССР былі здадзены 24 кастрычніка 1945 г., і ў гэты ж дзень Статут ААН уступіў у сілу. На гэтым юрыдычна быў завершаны працэс міжнароднага прызнання абедзвюх савецкіх саюзных рэспублік у якасці першапачатковых членаў ці заснавальніц, ААН.

Так, можа быць, нечакана Беларуская ССР апынулася ў ліку 51 краіны – заснавальніцы ААН. Вярхоўныя органы рэспублікі не ставілі перад І. Сталіным і савецкім кіраўніцтвам пытання аб выхадзе на міжнародную арэну ці ўключэнні ў склад міжнароднай арганізацыі. Такая «смеласць» магла дорага каштаваць у тыя часы. Уключэнне БССР у склад першапачатковых дзяржаў – членаў ААН стала магчымым дзякуючы агульнасаюзнай дыпламатыі, якая такім чынам вырашала праблему «множнага прадстаўніцтва» саюзных рэспублік на міжнароднай арэне ў сваіх палітычных інтарэсах.

---

686 НАРБ. Ф. 907. Воп 1. Спр. 7. Л. 17–18.

Аднак адной з прычын, якія прывялі Беларусь у ААН, быў уздым беларускага нацыянальнага руху ў час вайны, які праяўляўся на франтах, у партызанскай і падпольнай барацьбе. Гэта прымусіла Сталіна шукаць сродкі кампенсацыі за самаахвярнае змаганне беларускага народа супраць фашызму, што было зроблена ўключэннем БССР у склад заснавальнікаў ААН. Гэта важнае дасягненне беларускай дзяржаўнасці было ў значнай ступені дэвальвавана не зусім пачэсным статусам дэлегацыі БССР, як і УССР, у ААН як «дадатковага голасу» для агульнасаюзнай дэлегацыі ў 1946–1990 гг.

Разам з тым уваходжанне Беларусі ў ААН мела вялікае гістарычнае значэнне, цалкам адпавядала нацыянальным інтарэсам беларускага народа. Подпіс БССР пад Статутам ААН азначаў, што сусветнае супольніцтва прызнавала яе суверэннай і незалежнай дзяржавай, якой яна фактычна не была, паколькі з'яўлялася саюзнай рэспублікай у складзе звышцэнтралізаванага Савецкага Саюза. БССР атрымлівала ўсе прывілеі і імунітэты ААН, права выбірацца ў яе галоўныя органы, у тым ліку ў Савет Бяспекі, што было здзейснена ў 1974–1975 гг. Урад рэспублікі атрымаў магчымасць удзельнічаць у абмеркаванні сусветных праблем, даводзіць сваю пазіцыю да міжнароднай супольнасці, уносіць на яе разгляд свае прапановы і заўвагі. Больш за 40 гадоў ААН, па сутнасці, была для Беларусі адзіным акном у знешні свет, дзякуючы чаму пра рэспубліку збольшага ведалі ў Еўропе і свеце.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Гісторыя знешняй палітыкі – важная, неад'емная частка гісторыі беларускай дзяржаўнасці і гісторыі Беларусі ўвогуле. У адпаведнасці са сваім аб'ектам і прадметам яна накіравана на даследаванне і вывучэнне знешніх праяў (кірункаў, форм, сродкаў і метадаў) палітычнай дзейнасці беларускіх дзяржаў. У гэтым сэнсе знешняя палітыка мае сваім антыподам унутраную палітыку, якая ахоплівае значна шырэйшае кола прадметна-аб'ектных адносін (эканамічная, сацыяльная, культурная і іншыя віды палітыкі). Дзяржаўная палітыка ўяўляе сабой сукупнасць унутранай і знешняй палітыкі, пры гэтым, як правіла, унутраная палітыка мае прыярытэт над знешняй, што абумоўлена многімі прычынамі, перш за ўсё згаданым вышэй шырэйшым колам прадметна-аб'ектных адносін і яе першасным значэннем для захавання палітычнага рэжыму, які пануе ў дзяржаве. У пэўныя гістарычныя моманты, асабліва ў час войнаў ці сур'ёзных міждзяржаўных канфліктаў, знешняя палітыка можа адыгрываць дамінуючую ролю ў дзяржаўнай палітыцы, аднак у больш працяглыя перыяды ўнутраная палітыка вяртае сабе прыярытэт над знешняй.

У гісторыі розных дзяржаў суадносіны паміж унутранай і знешняй палітыкай не былі аднолькавымі і прапарцыянальнымі. Некаторыя буйныя і моцныя дзяржавы, як, напрыклад, ЗША ў часы свайго станаўлення ці імператарскі Кітай, з'яўляліся самадастатковымі ў сілу геапалітычнага становішча і маглі ўпэўнена развівацца без актыўнай знешняй палітыкі, праводзячы палітыку ізаляцыянізму ці самаізаляцыі ад знешняга свету. Праўда, XX стагоддзе, асабліва яго другая палова з моцнай тэндэнцыяй да глабалізацыі і ўзаемазалежнасці, зрабіла праўдзенне такой палітыкі немагчымым. Прыклад сучасных сярэдніх еўрапейскіх дзяржаў, блізкіх па памерах да Рэспублікі Беларусь, паказвае важную ролю знешняй, у тым ліку знешнеэканамічнай, палітыкі ў іх развіцці. У Бельгіі і Нідэрландах доля знешняга гандлю ў нацыянальным

валавым прадукце складае больш за 60 %, і гэта моцна ўплывае на іх унутраную і знешнюю палітыку.

Для першых гістарычных форм беларускай дзяржаўнасці (зямельных княстваў і ВКЛ) вонкавае асяроддзе мела важнае значэнне, што было абумоўлена перш за ўсё іх геапалітычнай пазіцыяй. Узнікненне і развіццё гэтых дзяржаў адбывалася ў выніку складанага ўзаемадзеяння ўнутраных і знешніх фактараў, якое дэманстравала іх супярэчлівае перапляценне і ўзаемаўплывы, а роля ўнутранай і знешняй палітыкі на розных гістарычных этапах мянялася. ВКЛ у перыяд станаўлення і росквіту (XIV–XV стст.) праводзіла актыўную, наступальную знешнюю палітыку, а вонкавае асяроддзе пасля разгрому Тэўтонскага ордэна пад Грунвальдам не ўяўляла для дзяржавы нейкай істотнай небяспекі. Становішча змянілася ў XVI ст., калі пагроза з усходу ў выглядзе Маскоўскай дзяржавы стала сур'ёзным выклікам для існавання Вялікага княства. Каб зменшыць яе, правячыя колы ВКЛ уступілі ў федэратыўны саюз з Польшчай, што было для іх меншым злом у параўнанні з рэальнай перспектывай пройгрышу ў Лівонскай вайне і наступнага захопу тэрыторыі ВКЛ маскоўскім войскам.

Падзелы Рэчы Паспалітай і далучэнне беларускіх зямель да Расійскай імперыі засведчылі перавагу знешняга фактару (трох «дзяржаў-заборцаў») над унутраным (іманентнай слабасцю польска-літвінскай федэратыўнай дзяржавы). Развіццё беларускіх тэрыторый (губерняў) у складзе Расійскай імперыі, якую сучасная беларуская гістарыяграфія ў выглядзе пяцітомнай «Гісторыі беларускай дзяржаўнасці» залічвае да адной з гістарычных форм беларускай дзяржаўнасці, таксама дэманструе супярэчлівае ўзаемадзеянне ўнутраных і знешніх фактараў. З аднаго боку, ішлі аб'ектыўныя працэсы фарміравання беларускай нацыі і нацыянальнага руху з яго стратэгічнай мэтай дасягнення нацыянальнай аўтаноміі для Беларусі ў складзе Расійскай федэратыўнай дэмакратычнай дзяржавы. Гэта супярэчыла асновам расійскага дзяржаўнага існавання з яго бачаннем беларусаў і ўкраінцаў у складзе адзінага рускага суперэтнасу. З другога боку, землі былога ВКЛ (беларускія, літоўскія, украінскія) выконвалі ролю стратэгічнага фарпоста Расіі на заходнім кірунку гэтай еўраазіяцкай дзяржавы, што праявілася падчас напалеонаўскіх войнаў і Першай сусветнай вайны). Аднак, як аказалася, «малодшыя» славянскія браты (украінцы і беларусы) не зусім добра выконвалі гэтую «місію», падтрымліваючы ў часы небяспекі для Расійскай дзяржавы ў масавым парадку Напалеона ці германскага імператара.

Першыя дзве формы нацыянальнай дзяржаўнасці (БНР і БССР) узніклі дзякуючы перш за ўсё спрыяльнаму збегу міжнародных абставін: БНР у выніку распаду Расійскай імперыі і адыходу бальшавікоў

з большай часткі Беларусі; БССР – палітыкі савецкай Расіі. Гэтымі спрыяльнымі абставінамі скарысталіся па меры магчымасці беларускія, унутрыпалітычныя сілы: Беларуская сацыялістычная грамада – у выпадку БНР, нацыянал-камуністы – у выпадку БССР. Канстытуяванне БНР ішло больш натуральным шляхам (ад Усебеларускага з'езда праз тры Устаўныя граматы да абвяшчэння незалежнасці 25 сакавіка 1918 г.), і ўнутраны фактар (нацыянальныя адраджэнцы, прыхільнікі незалежнасці) адыгрываў вырашальную ролю ў абставінах, калі ў Мінску пасля адыходу бальшавікоў узнік вакуум улады.

Зусім іншым шляхам ішоў працэс канстытуявання БССР, узнікненне якой было рэакцыяй РСФСР на абвяшчэнне і дзейнасць БНР, і таму палітыка ленінскага ўрада (знешні фактар) адыграла вырашальную ролю ў стварэнні беларускай савецкай рэспублікі. Пазней знешні фактар паказаў сваё дамінуючае значэнне ў палітыцы і лёсах БНР (адыход нямецкіх войскаў з тэрыторыі Беларусі, вяртанне бальшавікоў, двайстая палітыка Польшчы, непрызнанне з боку дзяржаў Антанты). Знешні фактар (залежнасць ад савецкай Расіі) дыктаваў унутраную і знешнюю палітыку БССР і прывёў рэспубліку ў склад СССР. Зразумела, што апісаная вышэй схема ўзаемадзеяння і ўзаемаўплыву ўнутраных і знешніх фактараў у працэсах нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва на тэрыторыі Беларусі ў 1917–1922 гг. з'яўляецца вельмі спрошчанай і не можа адлюстраваць усяго багацця вектараў дзейнасці ўнутраных і знешніх сіл, накіраваных унутр Беларусі ці па-за яе межы і пры гэтым цесна пераплеценых паміж сабой.

Развіццё беларускага этнасу і фарміраванне беларускай нацыі ў Расійскай імперыі і Савецкім Саюзе ішло марудна і супярэчліва, а станаўленне нацыянальнай ідэнтычнасці хісталася паміж рускасцю/савецкасцю і беларускасцю. Гэты ўнутраны фактар, цесна звязаны са знешнім (культурна-цывілізацыйнай раз'яднанасцю беларусаў), што выражалася ў дыхатаміі «паміж Усходам і Захадам», вельмі моцна ўплываў і працягвае ўплываць на ўнутры- і знешнепалітычную гісторыю Беларусі XIX – пачатку XXI ст. Нацыянальныя формы беларускай дзяржаўнасці (БНР, БССР і Рэспубліка Беларусь), якія знаходзіліся на мяжы дзвюх вялікіх цывілізацый (усходнеславянскай і заходняй), не здолелі вытрымаць належны баланс раўнавагі паміж Усходам і Захадам. Да гэтага беспаспяхова імкнулася БНР, БССР засталася ў савецкай, а Рэспубліка Беларусь застаецца (бачна ці нябачна) у расійскай сферы ўплыву.

Мегатрэнд гісторыі беларускай дзяржаўнасці і знешнепалітычнай гісторыі Беларусі XIX – пачатку XXI ст. вызначаецца вырашальным уплывам усходняга, знешняга фактару – Расійскай імперыі, Савецкага Саюза, Расійскай Федэрацыі. Фармальна незалежная Беларусь

існуе ў розных формах і ступені залежнасці ад усходняй суседкі (інстытуцыянальнай праз праект саюзнай дзяржавы, палітычнай, ваеннай, эканамічнай, культурнай, камунікацыйнай і інш.).

Знешнепалітычная гісторыя Беларусі як навуковы кірунак і адукацыйная дысцыпліна сфарміравалася ў незалежнай Беларусі. Яе з'яўленне ў гістарычнай навуцы і вышэйшай адукацыі было адказам на грамадскапалітычную і навукова-адукацыйную запатрабаванасць у ведах, навыках і ўменнях, якімі павінны былі валодаць айчынныя спецыялісты ў галіне міжнародных адносін. Гэтая новая навукова-адукацыйная дысцыпліна мела свае традыцыі вывучэння гісторыі міжнародных адносін і знешнепалітычнай дзейнасці беларускіх дзяржаў. Яны былі закладзены ў пачатку ХХ ст. заснавальнікамі беларускай гістарычнай школы (Ластоўскім, Ігнатоўскім, Доўнар-Запольскім, Пічэтай і інш.), якія адлюстроўвалі гэтую тэматыку з пазіцый нацыянальнай канцэпцыі гісторыі Беларусі, фундамент якой яны ж самі і заклалі. Новыя метадалагічныя падыходы праяўляліся ў трактоўках знешнепалітычных сюжэтаў гісторыі Полацкага княства, ВКЛ, Рэчы Паспалітай, знаходжання Беларусі ў складзе Расійскай імперыі.

